КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 48 (369) ◂ 20 снежня ◂ 2013 г.
www.novychas.info

# Новы Час

З КАЛЯДАМІ І НОВЫМ ГОДАМ!

**2013 — ВЫНІКІ І ЧАКАННІ**

Вядомыя ў Беларусі людзі падзяліліся з чытачамі НЧ меркаваннямі пра тое, якую падзею яны лічылі галоўнай у 2013 годзе і чаго чакаюць ад года надыходзячага

Стар. 6

**АЛІГАРХІ НА МАЙДАНЕ**

Чым больш цягнецца стаянне на Майдане, тым часцей ва ўкраінскай прэсе агучваецца тэзіс пра тое, што да арганізацыі акцыі датычныя фракцыі алігархаў, уключаючы прадстаўнікоў данецкага клану.
Ці так гэта на самай справе?

Стар. 29

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–24

ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10048

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!**

**НАСТУПНЫ НУМАР ГАЗЕТЫ «НОВЫ ЧАС» ВЫЙДЗЕ 10 СТУДЗЕНЯ!**

НОВЫ ГОД

# З ЧЫМ ВАС І ВІНШУЕМ!

Сяргей ПУЛЬША

**Новы год не за гарамі. Краіна ўжо марыць пра мандарыны і шампанскае. Але шмат для каго гэта час падвядзення вынікаў. Відавочна, што асабліва над гэтым працуюць у Адміністрацыі прэзідэнта, рыхтуючы навагодняе віншаванне Аляксандру Лукашэнку. Паспрабуем ім дапамагчы.**

Як звычайна, Аляксандр Рыгоравіч пачне з таго, што 2013 год быў няпросты. «Простых» гадоў у нас не існуе. Узгадаем, з чым мы ў яго ўступілі. З раздражнёнай пазіцыяй Расіі, выкліканай махлярствам з распушчальнікамі-растваральнікамі ў 2012-м, у выніку чаго ў 2013-м нафту нам давалі паквартальна. З моцнымі дэвальвацыйнымі чаканнямі — эксперты ўвесь год меркавалі пра магчымы зрыў рубля ў прорву. З шалёнымі выплатамі па знешніх пазыках — на абслугоўванне доўгу краіна аддала больш за 3 мільярды долараў. Але з маштабнымі планамі на развіццё ў выглядзе праграм утаймавання інфляцыі да 12%, ростам ВУП да 8,5% (казка, у якую не верыў ніхто) і мадэрнізацыі вядучых прадпрыемстваў.

Гэтыя выклікі мы павінны былі пераадолець. І нельга сказаць, што анічога ў нас не атрымалася.

Найперш падзякуем за фінансава-грашовую палітыку Нацбанку Беларусі. Ордэн за заслугі перад Айчынай атрымлівае Надзея Ермакова. У той час, калі ўсе чакалі дэвальвацыі, яна пакрысе адбываецца, але гэтага ніхто не заўважае. Глядзіце самі: на 1 студзеня курс долара быў 8 570 беларускіх рублёў. На момант падрыхтоўкі гэтага матэрыялу — 9 460. Зніжэнне долару за год склала 890 рублёў, альбо крыху больш за 10%. Нагадаем, што ў дэвальвацыю 2009 года долар «знізілі» на 20%, і гэта выклікала сацыяльны выбух. Зараз «у Багдадзе ўсё спакойна».

Ганаровую грамату за барацьбу за нафту атрымлівае Уладзімір Сямашка. Кожны квартал яму прыходзілася ездзіць і дамаўляцца пра пастаўкі. Але ж Беларусь у выніку не тое што не пацярпела — нават пасля скандалу з Баўмгертнерам нафта ў Беларусь ішла. Не адбылося нават значнага скарачэння паставак у сувязі з гэтым скандалам, чым пужала нас Масква. У выніку Беларусь у 2013 годзе атрымлівае 20,7 мільёна тон нафты. Гэта ў нечым «залатая сярэдзіна», бо жадалі б мы атрымаць 23 мільёны тон, а Расія хацела б паставіць 18,5 мільёна тон. То бок, краіна тут у выйгрышы.

Галоўны правал года — безумоўна, мадэрнізацыя. Выкінутыя на яе грошы можна лічыць змытымі ў прыбіральні. Як пачалася гэтая праграма на «Барысаўдрэве», дык там жа яна і скончылася. Як у 2012-м Лукашэнка «разнёс» кіраўніцтва прадпрыемства, так і давялося тое ж рабіць у 2013-м. Мадэрнізацыя цэментных заводаў таксама вынікаў не дала — беларускі цэмент застаўся дарагім і няякасным. Затое ўсіх павесяліў Ляхавіцкі льнозавод, які за кошт мадэрнізацыйных грошай закупіў абсталяванне, якое проста не змяшчаецца ў будынак цэху.

Беларуская прадукцыя не карысталася попытам на знешніх рынках, што паказаў «складскі крызіс» вясны ўжо амаль мінулага года. Усе спробы вырашыць праблему адміністратыўнымі метадамі і прымусіць паслоў прадаваць калій па мяху сваім калегам з іншых пасольстваў, пацярпелі паразу. Тым больш, што ў зараз крызіс у ЕС і стагнацыя ў Расіі: неабдуманыя траты на нашы трактары ўжо ніхто дазволіць сабе не можа.

Паразай скончылася і барацьба з інфляцыяй. Нягледзячы на ўсе высілкі Нацбанка, па выніках лістапада яна склала 13,8% замест запланаваных максімум 12%. Адзін толькі кошт праезду ў 2013 годзе павышаўся тройчы, хаця яшчэ пасля першага падаражання ў маі адмыслоўцы ад уладаў казалі, што больш падаражанняў не будзе.

Ну, і самае кепскае — паламаліся «геапалітычныя арэлі», на якіх раскочваўся Аляксандр Рыгоравіч, патрабуючы грошы ад Захаду за недалучэнне да Масквы, і ў Крамля за няласку да Еўропы. Еўропа не заўважыла выразнага сігналу аб размяшчэнні ў Беларусі ваенна-паветранай расійскай базы, і не кінулася перакупаць Беларусь. Не прайшоў у Расіі «шантаж Баўмгертнерам» — сто мільёнаў долараў за яго так ніхто і не сплаціў. Вайсковыя вучэнні «Захад–2013» выклікалі звычайную заклапочанасць толькі ў Польшчы, дый тое гэтая заклапочанасць была, хутчэй, выкліканая неабходнасцю Польшчы атрымаць грошы ад NATO на мадэрнізацыю свайго войска, а не рэальнай «пагрозай з Усходу». Абвешчаная на саміце ў Вільні спадаром Макеем магчымасць змякчэння візавага рэжыму з ЕС у Расіі таксама не выклікала належнай рэакцыі — Масква сама гэтым шляхам прайшла ўжо значна далей за Беларусь.

І, канешне ж, папсавала, псуе і будзе псаваць нервы Украіна. Каб яна падпісала пагадненне з ЕС пра асацыяцыю, то Беларусь бы апынулася «ў атачэнні ворагаў» з усіх бакоў, акрамя расійскага. Кепска? Канешне. Але ж Януковіч гэтае пагадненне не падпісаў, і зараз Масква будзе больш актыўна перакупляць Украіну. Беларусі ў гэтым выпадку застануцца толькі крошкі з барскага караваю.

Складаны быў год. Але ў новы мы ўваходзім са старымі праблемамі. Як і ў 2013-м, у 2014-м нам належыць выплачваць знешнія запазычанасці ў тым жа памеры — больш за 3 мільярды долараў. Золатавалютныя рэзервы, па папярэдніх дадзеных, на 1 снежня склалі толькі 6 мільярдаў 465,2 мільёна долараў. Пры тым, што «падушка бяспекі» ў нас вызначаная ў памеры 8 мільярдаў долараў. Грошы ўзяць няма адкуль, акрамя як спадзявацца на Чэмпіянат свету па хакеі альбо «страсаць» іх са сваіх грамадзянаў у выглядзе падаткаў і збораў (больш падрабязна пра гэта на стар. 5). І да чаго гэта прывядзе — невядома.

Пра новую крэдытную лінію ані ад Атныкрызіснага фонду ЕўрАзЭС, ані ад МВФ, пакуль што нічога не чуваць.

Але мы жадаем вам шчасця і — у гэтай сітуацыі — асабістых поспехаў, калі ўжо глабальных поспехаў у дзяржавы няма. І не забывайце знаходзіць падставы хоць для маленькай, але ж радасці: у 2013-м не ўвялі ані «выязную пошліну» ў 100 долараў, ані «падатак на беспрацоўных».

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### БРЭСТ. ШЭСЦЕ Ў ПАДТРЫМКУ УКРАІНЫ НЕ ДАЗВОЛІЛІ

Арганізатарамі шэсця выступілі мясцовыя прадстаўнікі Аб'яднанай грамадзянскай партыі, якія такім чынам збіраліся выказаць сваю салідарнасць з украінскім народам у яго імкненні жыць у Еўрасаюзе.

Як паведаміў старшыня Брэсцкай абласной арганізацыі АГП Уладзімір Вуек, у адказе з гарвыканкама гаворыцца, што «правядзенне масавых мерапрыемстваў не дапускаецца на адлегласці менш за 50 метраў ад будынкаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых прадстаўнічых, выканаўчых і распарадчых органаў, дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў, судоў, органаў пракуратуры, тэрыторый арганізацый, якія забяспечваюць абараназдольнасць, бяспеку дзяржавы і жыццядзейнасць насельніцтва, на адлегласці менш за 100 метраў ад будынкаў арганізацый аховы здароўя».

Уладзімір Вуек лічыць такую прычыну адмовы беспадстаўнай, паколькі раней падчас святкавання 1 мая па такім самым маршруце брэсцкія прадстаўнікі дэмакратычных сіл ужо праводзілі дазволенае ўладамі шэсце.

«Больш за тое, гэтую забарону на правядзенне шэсця можна лічыць вызначэннем пазіцыі мясцовых уладаў да падзеяў, што адбываюцца зараз ва Украіне», — лічыць кіраўнік брэсцкай суполкі АГП. Шэсце планавалася правесці 21 снежня па праспекце Машэрава і вуліцы Леніна (пачынаючы з пляцоўкі каля цэнтральнага ўнівермага да плошчай Леніна).

**spring96.org**

### СЛОНІМ. «ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ХОЧУЦЬ ВЫСЕЛІЦЬ З ПАМЯШКАННЯ

Прадпрыемства «Партнёр-Слонім» (ТАА), якому належыць арандаванае рэдакцыяй памяшканне, прымушае газету вызваліць яго да 1 студзеня 2014 года.

У якасці прычыны называюць забарону пажарных службаў эксплуатаваць другі паверх будынка.

Рэдакцыя месціцца тут з 2008 года. На другім паверсе будынка «ГС» займае два памяшканні — пад рэкламны аддзел і непасрэдна пад рэдакцыю, дзе адбываецца ў тым ліку і вёрстка газеты.

Разам з газетай пакоі на другім паверсе арандуюць яшчэ некалькі прыватных прадпрыемстваў, у тым ліку і сама адміністрацыя «Партнёр-Слонім». Акрамя апошняй, усіх высяляюць. Тым не менш, галоўны рэдактар выдання Віктар Валадашчук сумняваецца ў самастойнасці прынятага арандадаўцамі рашэння і ўпэўнены, што дзеянні скіраваныя менавіта супраць «Газеты Слонімскай».

«Нам вядома, што прадстаўнікі ўлады не раз звярталіся да адміністрацыі будынка, каб нас выселілі. Але не атрымлівалася, — расказаў прэс-службе ГА «БАЖ» сп. Валадашчук. — У кастрычніку-лістападзе раптоўна распачалася комплексная праверка пажарных, якія вынеслі свой вердыкт — цалкам увесь другі паверх выселіць. Са спасылкай на гэтае рашэнне нам даслалі прадпісанне — вызваліць памяшканне да 1 студзеня».

Цяпер Віктар Валадашчук тэрмінова шукае ў горадзе новае памяшканне, каб не падвяргаць небяспецы выхад газеты. «Яны могуць і дзверы зачыніць, і святло адключыць. Як я гэта патлумачу чытачу?» — кажа рэдактар.

**Прэс-служба БАЖ**

### САЛІГОРСК. АКЦЫЯ СУПРАЦЬ ПАДАТКУ НА АЎТО

Салігорскія грамадскія актывісты падалі заяву ў выканкам на правядзенне мітынгу супраць дзяржаўнай пошліны на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху, якую плануецца ўвесці ў Беларусі з новага году.

Масавае мерапрыемства мусіць адбыцца 2 студзеня на стадыёне «Будаўнік». Заяўленая колькасць удзельнікаў мітынгу складае 200 чалавек. Арганізатары перакананыя, што ў выпадку атрымання дазволу на мерапрыемства ад мясцовых уладаў, сабраць такую колькасць мітынгоўцаў у Салігорску не будзе праблемай.

Зрэшты, заяўнікі прызнаюць той факт, што за апошнія некалькі год Салігорскі райвыканкам не даў практычна ніводнага дазволу на правядзенне пратэстных акцый ды сходаў. Тым не менш, арганізатары мітынгу лічаць неабходным звярнуць увагу ўладаў на несправядлівы характар новай дзяржаўнай пошліны.

**spring96.org**

### БАРЫСАЎ. НА «БАРЫСАЎДРЭВЕ» ГАРЭЎ ЦЭХ, ЯКІ МАДЭРНІЗАВАЛІ

Здарэнне ў Барысаве адбылося ўначы 18 снежня. Ледзь не згарэла абсталяванне на 2 мільёны долараў.

На месца прыехалі 7 падраздзяленняў выратавальнікаў, а пасля пачалі сцягваць спецтэхніку з іншых раёнаў Мінскай вобласці. Агулам у ліквідацыі пажару ўдзельнічалі 39 выратавальнікаў і 17 адзінак тэхнікі МНС.

Як паведамляе прэс-служба МНС, гарэў адкрытым полымем па ўсёй плошчы светлавы ліхтар на даху цэха па вытворчасці фанеры. Будынак цэха аднапавярховы, да яго прыбудаваны склад і адміністрацыйна-бытавы корпус. Цэх знаходзіўся на рэканструкцыі.

Пажар ліквідавалі толькі праз тры гадзіны — у 4.33 раніцы. У цэху пашкоджаныя тры дрэваапрацоўчыя станкі, светлавы ліхтар. Склад, у якім знаходзілася гатовая прадукцыя і новае абсталяванне, удалося выратаваць.

Пацярпелых няма. Прычына ўзгарання высвятляецца. Вядома, што ўвечары ў аўторак падрадная арганізацыя праводзіла ў будынку цэха агнявыя работы па дэмантажу абсталявання.

**Еўрарадыё**

---

МЕРКАВАННЕ

## РАСІЯ ПРАПЛАЧВАЕ РЭЖЫМ 20 ГАДОЎ

**На душу насельніцтва Беларусь атрымала ад Расіі больш, чым, да прыкладу, Польшча ад Еўрасаюза за апошняе дзесяцігоддзе, сцвярджае палітолаг Алесь Лагвінец.**

Але пры гэтым у беларускім грамадстве дастаткова заўважны праеўрапейскі сегмент, што вынікае з сацыялагічных апытанняў грамадскай думкі:

«Паводле апытанняў, ад 30 да 40 працэнтаў праеўрапейскія настроі могуць вагацца, але ўжо заўтра гэтыя людзі маглі б прагаласаваць за ўступленне Беларусі ў Еўрапейскі саюз. Гэта значыць, што еўрапейская інтэграцыя — гэта не толькі нейкія выплаты з фондаў Еўрасаюзу, але гэта таксама далучэнне да пэўнай прасторы каштоўнасцяў. І гэтыя каштоўнасці — відавочныя ў выпадку еўрапейскай інтэграцыі, чаго не можна сказаць пра так званую еўразійскую інтэграцыю. Тут выбар адначасова ёсць і эканамічны, і, я лічу, цывілізацыйны, ці маральна-палітычны», — падкрэслівае Алесь Лагвінец.

Праеўрапейская частка беларускага грамадства моцна звужацца не будзе з улікам таго, што яна ўжо перажыла многія гады аднаасабовай дыктатуры Лукашэнкі. І ў гэтай часткі грамадства даволі вялікі патэнцыял, дадае Лагвінец.

**Беларускае Радыё Рацыя**

---

ПРАБЛЕМА

## ЯРОМЕНАК БУДЗЕ СЯДЗЕЦЬ У БАРАНАВІЧАХ

**Жонцы актывіста «Маладога фронту» Уладзя Яроменка Валянціне паведамілі ў Дэпартаменце выканання пакаранняў МУС, што неўзабаве мужа перавядуць з «Валадаркі» для адбыцця пакарання ў арыштны дом у Баранавічах.**

«Заўтра яшчэ пайду на прыём да кіраўніцтва «Валадаркі», каб даведацца, чаму да Уладзя не даходзяць мае тэлеграмы наконт заявы аб сустрэчы з адвакатам. Тыдзень Уладзь на «Валадарцы», але да яго ўсё не пускаюць адваката, нібыта ён не напісаў заяву. Трэба разбірацца», — кажа Валянціна Яроменак.

Жонка актывіста ўжо атрымала ад яго ліст. «Напісаў, што яго прывезлі на «Валадарку» з Першамайскага РАУС толькі а 3 гадзіне ночы і яшчэ да абеду ніяк не маглі змясціць у камеру. Такім чынам, ён не спаў больш за суткі!»

Актывіст, былы палітвязень Уладзь Яроменак, асуджаны на 3 месяцы арыштнага дому за парушэнні правілаў адбыцця прэвентыўнага нагляду.

**Радыё «Свабода», mfront.net**

---

ПАРТЫІ

## БНФ ДА ВЫБАРАЎ ГАТОВЫ

Сяргей ПУЛЬША

**Літаральна праз дзень пасля абвяшчэння даты мясцовых выбараў Партыя БНФ заявіла, што да чарговай кампаніі яна гатовая.**

Пра гэта на прэс-канферэнцыі паведамілі старшыня ПБНФ Аляксей Янукевіч і ягоны намеснік Ігар Лялькоў.

Партыя БНФ вылучыць на мясцовыя выбары каля 150 партыйных кандыдатаў. Паасабовы спіс пакуль фармуецца. Гэта звязана з тым, што будзе адзіны спіс кандыдатаў у дэпутаты кампаніі «Народны рэферэндум». Таму зараз трэба ўзгадніць пазіцыі і разабраць акругі.

Вырашаць з персаналіямі ПБНФ будзе ўжо ў наступным годзе. Наўрад ці ў спіс кандыдатаў патрапіць кіраўніцтва структуры. Звязана гэта са зменамі ў Выбарчы кодэкс: зараз кандыдат у дэпутаты не можа быць даверанай асобай іншага кандыдата. Таму ПБНФ вырашае: ці зрабіць Янукевіча кандыдатам, альбо ён будзе больш карысны ў якасці даверанай асобы ўсіх кандыдатаў ад партыі.

Ужо пачалося вылучэнне кандыдатур у тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, і Лялькоў ужо высунуты ў Мінскую гарадскую камісію. Да 24 снежня ўсе кандыдаты ў камісіі ад партыі пададуць у адпаведныя структуры адпаведныя дакументы.

Як паведаміў Янукевіч, партыя пойдзе на выбары з пасланнем, якое грунтуецца на ўласнай партыйнай праграме, «Народнай праграме» і пасланні «Народнага рэферэндуму». У прыватнасці, кандыдаты ад партыі будуць выступаць супраць новага падатку на аўтамабілі і супраць стварэння ў Беларусі расійскіх ваенных баз. Кандыдаты нават правядуць адзіны дзень інфармавання насельніцтва, у адзін дзень выставіўшы пікеты па ўсёй Беларусі.

Чаго БНФ не плануе, дык гэта масавага зняцця кандыдатаў. Зараз кожны кандыдат паасобку будзе вырашаць, зняцца ці не. Гэта выклікана найперш тым, што выбары ў мясцовыя саветы ніяк не легітымізуюць уладу, у адрозненне ад парламенцкіх і прэзідэнцкіх. З іншага боку, зараз скасаваны парог яўкі на мясцовых выбарах, і таму кампанію байкоту правесці практычна немагчыма.

Але кандыдатам ад Партыі БНФ будзе яшчэ адна справа. Як паведаміў Янукевіч, «Народны рэферэндум» рушыць па графіку, і ўжо вызначыўся з тымі пытаннямі, якія будуць прапанаваныя грамадзянам на магчымым плебісцыце. Адпаведна, збор подпісаў за правядзенне рэферэндуму пачнецца яшчэ да Новага года, а актыўная фаза гэтага збору прыпадзе якраз на мясцовыя выбары. Так што хутка можна будзе падпісацца адначасова за дзве рэчы: за вылучэнне кандыдата ад БНФ у мясцовыя саветы і за патрабаванне аб правядзенні народнага рэферэндуму.

---

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

## ІНФАРМАЦЫЯ ПРА КАТАВАННІ — ТАЯМНІЦА

**Па выхадзе са следчага ізалятара КДБ у сакавіку 2011 года Алесь Міхалевіч заявіў пра шматлікія факты здзекаў і катаванняў і накіраваў скаргу ў пракуратуру, каб была праведзена праверка.**

Пакуль палітык быў у Беларусі, пракуратура не магла даць адказ, і толькі пасля яго ад'езду за мяжу, паведаміла, што па выніках праверкі прынята рашэнне адмовіць ва ўзбуджэнні крымінальнай справы.

«Аказваецца, матэрыялы праверкі, праведзенай па маёй заяве аб катаваннях, з'яўляюцца дзяржаўнай таямніцай. І таму адвакату не толькі не дадуць азнаёміцца з матэрыяламі, але нават не выдадуць копію пастановы аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы, — напісаў Алесь Міхалевіч на сваёй старонцы ў Фэйсбуку. — Будучы ў следчым ізалятары, мне ўжо казалі, што наяўнасць людзей у чорным, якія з нас здзекаваліся і катавалі, з'яўляецца «таямніцай следства». Цяпер іх павысілі да «таямніцы, якая ахоўваецца законам».

**spring96.org**

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# САПСАВАЛІ СВЯТА

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Падаецца, пад канец 2013 года ўлады вырашылі прыняць усе непапулярныя рашэнні, каб увайсці ў год сіняга драўлянага каня чысценькімі. Але, насамрэч, як год сустрэнеш, так яго і правядзеш. Калі перад Новым годам нарабіць непрыемнасцяў, то яны застануцца з табою і ў наступным годзе.**

Аляксандр Лукашэнка ўсё ж падпісаў указ №563 «Аб некаторых пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін». Гэты ўказ прадугледжвае фармаванне фонду жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання (арэнднае жыллё) шляхам пераходу дзяржаўнага жылля ў арэнднае. То бок, у арэнднае жыллё будуць перанесеныя ўсе дзяржаўныя і сацыяльныя — то бок непрыватызаваныя — кватэры.

У дзяржаўным фондзе застаюцца жылыя памяшканні сацыяльнага карыстання, спецыяльныя жылыя памяшканні, жылыя памяшканні камерцыйнага выкарыстання і жылыя памяшканні ў інтэрнатах. Жылыя памяшканні дзяржаўнага фонду, якія не прыватызаваныя грамадзянамі, будуць пераведзеныя ў камерцыйнае жыллё пасля 1 ліпеня 2016 года. Да гэтай даты грамадзяне змогуць скарыстацца правам на прыватызацыю. Пасля яе прыватызацыя спыняецца.

Вось табе і сацыяльная дзяржава! Немаведама, колькі ты жыў у сваёй кватэры, але калі ты яе не прыватызаваў — можаш з ёю развітацца назаўсёды.

Тое ж самае з падаткам на допуск аўтамабіляў да руху. Падаецца, год пяць таму адмянілі падатак у так званы «дарожны фонд», у які ўносілі грошы аўтааматары на рамонт тых самых дарог. Але аўтамабілісты плаціць не перасталі — гэты падатак быў перанесены на паліва: той самы акцыз на бензін. Зроблена гэта было дзеля справядлівасці — каб тыя, хто ездзіць больш, больш аддавалі б грошай на акцыз, а значыць, і на рамонт дарогаў.

Зараз падатак на аўто вярнуўся, а акцызы на паліва нікуды не падзеліся. Такім чынам, мы двойчы плацім за адно і тое ж. Але нікога ва ўладзе гэта не засмуціла. Аўтамабілісты ў інтэрнэце сабралі больш за 70 тысяч подпісаў пад петыцыяй супраць новага збору. Сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай Лазавік адказаў — петыцыі ў інтэрнэце не маюць юрыдычнай сілы, таму беларусы могуць падпісваць што заўгодна і колькі заўгодна.

Паводле яго слоў, подпісы ў інтэрнэце маюць выключна «пазнавальны характар» і не паўплываюць на ўвядзенне закона, нават калі іх будзе мільён. «Інтэрнэт-прастора свабодная, людзі могуць збіраць подпісы пад любым заклікам, няхай гэта будзе нават пратэст супраць прыгнёту руж зімой пад цэлафанам. Гэтыя пратэсты выкрываюць меркаванне грамадзян, за якім сочыць урад, аднак расцэньваюцца яны выключна як апытанне грамадскай думкі або сацыялагічнае даследаванне, не больш. Юрыдычнай сілы подпісы не нясуць, падстаў для рэферэндуму або працэдуры адмены закона не маюць», — паведаміў Лазавік.

Паводле яго словаў, грамадзяне маглі б выканаць працэдуры, прадугледжаныя выбарчым кодэксам, стварыць групу для правядзенне рэферэндуму і… нічога б не дамагліся! Улада надзейна перастрахавалася ад незадавальнення грамадзян. Згодна з новымі праўкамі ў Выбарчы кодэкс, пытанні, якія закранаюць бюджэтную палітыку дзяржавы, на рэферэндум выносіць нельга!

Але калі нават дамагчыся немагчымага і вынесці гэтае пытанне на рэферэндум, то назіраць за хадой галасавання не будзе каму. Старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына заявіла, што ад 17 снежня гэтага года любым назіральнікам давядзецца прайсці акрэдытацыю. Раней гэтае патрабаванне тычылася толькі замежных і міжнародных назіральнікаў. Цяпер акрэдытацыю будуць праходзіць і беларускія таксама.

«Норма аб абавязковай акрэдытацыі ўтрымліваецца ў адпаведнай пастанове, прынятай на пасяджэнні Цэнтральнай выбарчай камісіі ў Мінску 17 снежня. Інстытут акрэдытацыі назіральнікаў уводзіцца ў нас упершыню. Раней ім было дастаткова зарэгістравацца ў выбарчай камісіі», — паведаміла Ярмошына.

Па словах Ярмошынай, новаўвядзенне «вырашае цэлы шэраг пытанняў». Калі раней назіральніка, які «парушаў парадак», маглі толькі вывесці з участку, і тэарэтычна ён мог на яго вярнуцца, то зараз яго можна будзе пазбавіць акрэдытацыі назаўжды.

Пакуль што застаецца невядомым працэс акрэдытацыі назіральнікаў. Хто будзе гэтым займацца? Няўжо ЦВК? Невядомыя і крытэры прадастаўлення акрэдытацыі — усіх нязгодных можна выкрасліць на гэтым этапе без тлумачэння прычынаў. Невядома, якія правы дае акрэдытацыя, і невядома, ці могуць існаваць «неакрэдытаваныя» назіральнікі. Раней можна было прынесці дакументы для назірання на ўчастак у дзень выбараў, і сядзець сабе на ўчастку, а зараз за колькі дзён трэба прыносіць дакументы?

Карацей, назіраць за выбарчым працэсам здолеюць хіба што слепаглуханямыя сябры БРСМ. Астатнім пастановай ЦВК проста не дадуць акрэдытацыі.

А пакуль беларусы выключаныя з працэсаў бюджэтнай палітыкі, гэтая палітыка становіцца ўсё горшай. Выканаўчага савет дырэктараў Міжнароднага валютнага фонду паводле вынікаў пятага постпраграмнага маніторынгу прагназуе захаванне марудных тэмпаў эканамічнага росту ў Беларусі і цяжкую сітуацыю з плацежным балансам.

«Рызыкі істотна змешчаныя ў бок пагаршэння сітуацыі. У прыватнасці, далейшае пагаршэнне сальда рахунку бягучых аперацый ці фінансавага рахунку можа павялічыць ціск на рэзервы і беларускі рубель», — адзначаюць эксперты фонду.

То бок, стагнацыя нашага экспарту не прыносіць валюту ў краіну. У выніку мы выцягваем грошы «з заначкі» — золатавалютных рэзерваў, а заначка таксама не бясконцая. І гэта можа выклікаць падзенне курсу рубля — то бок, дэвальвацыю.

Эксперты МВФ у чарговы раз параілі ўзмацніць грашова-крэдытную палітыку, але зазначылі, што неабходная значна больш маштабная праграма рэформ, уключаючы комплексную лібералізацыю цэн, дэталёвую стратэгію і значныя захады па скарачэнні ролі дзяржавы ў эканоміцы і ўмацаванні мер сацыяльнай абароны.

Як з лібералізацыяй стасуюцца новыя падаткі, адыманне кватэраў і поўная немагчымасць грамадзян паўплываць на сітуацыю — гэта пытанне вялікае ёсць.

**Аўтамабілісты сабралі больш за 70 тысяч подпісаў пад петыцыяй супраць новага збору. Сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай Лазавік адказаў — петыцыі ў інтэрнэце не маюць юрыдычнай сілы**

ФІГУРЫ ТЫДНЯ

## РУСЛАН МІРЗОЕЎ

Апалітычны, у прынцыпе, чалавек можа стаць чарговым беларускім палітвязнем. Прынамсі, «Малады фронт» заклікае надаць такі статус Руслану Мірзоеву.

Руслан Мірзоеў — гэта самавучка-рэжысер, які здымае аматарскія міні-фільмы і выкладвае іх у інтэрнэт. Ён стаў вядомы пасля таго, як зняў фільм «Хронікі завода» на МАЗе пра сапраўднае становішча працоўных і вытворчасці.

13 снежня суд Кастрычніцкага раёна Мінска асудзіў Мірзоева да 1 года калоніі. Крымінальная справа на Руслана Мірзоева была ўзбуджана яшчэ ў верасні быццам бы за парушэнне парадку адбыцця хатняй «хіміі». Сам Руслан перакананы, што рэальнай падставай да пераследу сталі ягоныя відэаролікі пра жыццё МАЗу знутры і рэаліі мінскага мікрараёну Курасоўшчына.

Так, улетку, пасля з'яўлення ў інтэрнэце ролікаў пра побыт мазаўскіх рабочых, Руслана звольнілі з прадпрыемства, а за новыя відэаролікі пра наркаманаў і маладых злачынцаў у Курасоўшчыне ў жніўні аўтар быў затрыманы і асуджаны на 7 сутак арышту — нібыта за «непадпарадкаванне міліцыі».

Таму «Малады Фронт» перакананы, што галоўная прычына пераследу Руслана Мірзоева — ягоная грамадская дзейнасць, а крымінальная справа, па якой яго асудзілі, — відавочна сфальсіфікаваная.

## АЛЁНА ЛАНСКАЯ

Наш кандыдат на «Еўрабачанні» ўсё ж такі атрымала прэмію. Алёна Ланская названа пераможцам «Нацыянальнай музычнай прэміі» ў намінацыі «Лепшы поп-выканаўца».

Нацыянальная музычная прэмія ў галіне эстраднага мастацтва заснаваная дзяржавай з мэтай стымулявання развіцця музычнага эстраднага мастацтва Беларусі, стварэння ўмоў для прасоўвання творчасці таленавітых эстрадных выканаўцаў, кампазітараў, паэтаў-песеннікаў, аранжыроўшчыкаў, прадусараў і іншых прадстаўнікоў музычнага мастацтва.

На Еўрабачанні Алёна Ланская выступіла ў першым паўфінале 14 мая з песняй «Solayoh», напісанай еўрапейскімі аўтарамі Маркам Пелінкам і Марцінам Кінгам і запісанай у лонданскай студыі «Abbey Road». У паўфінале Алёна Ланская выступіла пад нумарам адзінаццаць і прайшла ў фінал. Алёна стала трэцім выканаўцам Беларусі, які прайшоў у фінал конкурсу «Еўрабачанне». Усяго ў фінал прайшлі 26 удзельнікаў. Па выніках лёсавання выступіла пад нумарам 8, і па выніках конкурсу Алёна Ланская заняла 16-е месца, атрымаўшы 48 балаў.

Аднак прэмію Ланская павінна была атрымаць не ад Беларусі. У час падрыхтоўкі да «Еўрабачання» яна шырока прыцягвала да працы над іміджам і кліпамі сербскіх, турэцкіх і грэцкіх спецыялістаў . Гэта Грэцыя павінна была даць ёй прэмію за маштабную дапамогу ў пераадоленні беспрацоўя і выхадзе з зацяглага эканамічнага крызісу.

## УЛАДЗІМІР ЖЫРЫНОЎСКІ

Скандальны расійскі палітык мае намер сапсаваць жыццё сотням тысяч беларускіх грамадзян. Жырыноўскі прапанаваў абкладаць падаткам грашовыя пераводы гастарбайтараў.

«За мяжой пераводы мігрантаў у сваю краіну абкладаюцца падаткам. Чаму мы прапускаем гэтыя грошы? Яны ж тут не плацяць падаткі сацыяльныя. Вось трэба праз плацеж, грашовы перавод гэта рабіць», — сказаў Жырыноўскі журналістам.

Ён таксама прапанаваў абкладаць падаткам тых жанчын, якія прыязджаюць у Расію спецыяльна для таго, каб нарадзіць дзіця. «Тое ж самае — роды. У нас яны прыязджаюць спецыяльна нараджаць, гэта трэба абкладаць падаткам. Мы ж не можам не прыняць парадзіху, гэта ўваходзіць у шэраг неадкладнай дапамогі. Яны гэтым карыстаюцца, атрымліваюць бясплатную дапамогу, нічога не марнуючы на сацыяльную структуру», — адзначыў старшыня ЛДПР.

З-за адсутнасці працы і нізкага ўзроўню даходаў на заробкі ў Расію выязджаюць дзясяткі тысяч беларусаў. Толькі ў 2011 годзе гастарбайтэры з нашай краіны легальна перавялі на радзіму каля 500 мільёнаў долараў.

Варта адзначыць, што, нягледзячы на сваю скандальнасць, за Жырыноўскім трывала ўмацавалася прымаўка: «Што ў Пуціна ў розуме, у Жырыноўскага на языку». Большасць нестандартных і малапапулярных ініцыятыў расійскай улады ў якасці «пробнага шара» агучвае Жырыноўскі, а пасля фракцыя ЛДПР у Дзярждуме гэтыя прапановы падтрымлівае.

НАШЫ ПРАВЫ — НАША БАГАЦЦЕ

# ЯК І ШТО ПАРУШАЕ ДЗЯРЖАВА

Міхаіл ПАСТУХОЎ,
Сяргей ПУЛЬША

**У мінулых артыкулах мы казалі пра тое, што правы ў беларусаў ёсць, але яны не выконваюцца. Дык што ж, няўжо правы чалавека ў Беларусі не абароненыя нічым і абараніць іх амаль немагчыма? Няпраўда, ёсць спосаб хаця б «націснуць» на дзяржаву, каб яна не зарывалася.**



Фото www.dogendocs.ru

Парушэнне якіх правоў адлюстраваў мастак?

У 1973 годзе Беларусь падпісала два фундаментальных дакумента ААН: Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП) і Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах. У 1992 годзе парламент ужо суверэннай Беларусі пацвердзіў сваю праваперaемнасць у ААН ад БССР і свае абавязкі па выкананні пактаў аб правах чалавека. Больш за тое, быў ратыфікаваны Першы факультатыўны пратакол да МПГПП, згодна з якім грамадзяне краіны маюць права падаваць скаргі на парушэнне іх правоў і свабод з боку ўладаў. Гэтыя скаргі разглядае спецыяльна створаны Камітэт ААН па правах чалавека.

## Першы пакт

Варта зазначыць, што, калі УДПЧ не мела «юрыдычнай моцы», то МПГПП з'яўляецца менавіта юрыдычным дакументам. Ён ужо не «дэкларуе», а абавязвае краін-падпісантаў Пакта выконваць агульнапрынятыя правы чалавека.

У Пакце канкрэтызуюцца правы і свабоды, якія замацаваныя ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Артыкул 2 Пакта ўсталёўвае абавязковы характар яго палажэнняў. У прыватнасці, ад кожнай дзяржавы патрабуецца (а не рэкамендуецца ці дэкларуецца) «паважаць і забяспечваць усім асобам, хто знаходзіцца ў межах яе тэрыторыі і пад яе юрысдыкцыяй, правы, якія прызнаюцца ў гэтым Пакце».

А паколькі гэты пакт фактычна поўнасцю ўтрымлівае ў сабе Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека, то ён і абавязвае яе выконваць!

Больш за тое, на дзяржавы, якія падпісалі Пакт, накладаецца абавязак «забяспечыць любой асобе, правы і свабоды якой парушаныя, эфектыўны сродак прававой абароны, нават калі гэта парушэнне здзейснена тымі, хто дзейнічаў у афіцыйнай якасці».

Гаворка ідзе пра любых службовых асобаў (уключаючы прэзідэнта краіны), якія парушаюць правы і свабоды чалавека. На іх дазваляецца падаваць пазовы ў суд або патрабаваць прыцягнення да іншай адказнасці.

Згодна Пакту, дзяржава не можа дапушчаць адступлення ад асноўных грамадзянскіх правоў, уключаючы права на жыццё, права не падвяргацца катаванням, права не ўтрымлівацца ў рабстве і паднявольным стане нават ва ўмовах надзвычайнага становішча (артыкул 4 Пакта). І нішто ў Пакце не можа тлумачыцца як тое, што азначае, нібы якая-небудзь дзяржава, якая-небудзь група асоб або адна асоба мае права ўчыняць дзеянні, накіраваныя на знішчэнне любых правоў і свабод або на абмежаванне іх у большай меры, чым прадугледжваецца Пактам (артыкул 5). Гэта значыць, дзяржава і яе прадстаўнікі не маюць права замахвацца на агульнапрызнаныя правы і свабоды грамадзян, а таксама празмерна іх абмяжоўваць нават ва ўмовах вайны альбо катаклізму.

## За што краіна нясе адказнасць?

Мы не будзем поўнасцю цытаваць МПГПП. У век інтэрнэту кожны можа знайсці тэкст дакумента. Засяродзімся толькі на найбольш відавочных пунктах, падкрэсліваючы іх абавязковасць для выканання дзяржавай.

Права на жыццё абвяшчаецца неад'ёмным правам кожнага чалавека, якое павінна ахоўвацца законам. Ніхто не можа быць адвольна пазбаўлены жыцця. Між тым, як вядома, Беларусь з'яўляецца адзінай з усіх еўрапейскіх краін, дзе захоўваецца гэты від пакарання, і адзінай з краінаў СНД, дзе такое пакаранне выконваецца. Пра гэта ўжо шмат казалі, і гэта тэма асобнай размовы. Дзеля адмены смяротнага пакарання быў распрацаваны Другі факультатыўны пратакол да Пакту, але нашая краіна (спадзяюся, пакуль) яго не падпісала.

> Найважнейшае грамадзянскае права — права на свабоду і асабістую недатыкальнасць. Ніхто не можа быць падвергнуты адвольнаму арышту або змяшчэнню пад варту

У Пакце, як і ў Дэкларацыі, падкрэсліваецца, што чалавек не павінен падвяргацца катаванням, жорсткаму, бесчалавечнаму або зневажальнаму яго годнасць абыходжанню або пакаранню.

Паколькі ў Пакце не канкрэтызуецца такое абыходжанне, а ў беларускім заканадаўстве паняцця катаванняў няма, то гэта дазваляе вельмі шырока трактаваць палажэнні дакумента. Бо, як мы бачылі, адзінае, што недапушчальна, — звужэнне межаў трактоўкі, а не іх пашырэнне.

Такім чынам, зняволеных альбо затрыманых (бо гэта таксама абмежаванне правоў асобы) не павінны катаваць, «выбіваць» паказанні, дапытваць начамі, шантажаваць. Міліцыя не павінна дубінкамі і ботамі разганяць людзей, замыкаць затрыманых у «малпоўніку» без харчавання і адпраўлення натуральных патрэб.

Артыкул 8 Пакта забараняе ўтрымліваць людзей у паднявольным стане і прыцягваць да прымусовай (абавязковай) працы. Што да прымусовай працы як разнавіднасці паняволенага стану, то тут ёсць шмат прыкладаў. Такія, як прымус да працы асуджаных да пазбаўлення волі ці праца па размеркаванні выпускнікоў дзяржаўных ВНУ. У больш шырокім сэнсе гэта і кантрактная форма працоўных адносін без права абароны інтарэсаў працоўных. А таксама тэрміновая служба ў войску, калі няма магчымасцяў ад яе адмовіцца па палітычных або рэлігійных меркаваннях альбо прайсці службу, альтэрнатыўную вайсковай.

Самае цікавае пытанне ў гэтым рэчышчы: што рабіць з Дэкрэтам прэзідэнта №9, які ўвёў прымусовую працу без звальнення на ўсіх мадэрнізуемых прадпрыемствах дрэваапрацоўчай галіны?

Найважнейшае грамадзянскае права — права на свабоду і асабістую недатыкальнасць. Ніхто не можа быць падвергнуты адвольнаму арышту або змяшчэнню пад варту. Кожны арыштаваны або затрыманы па крымінальным абвінавачванні ў тэрміновым парадку павінен быць дастаўлены да суддзі (або іншай службовай асобы, якой належыць права ажыццяўляць судовую ўладу) і мае права на судовае разбіральніцтва на працягу разумнага тэрміну або на вызваленне.

Падкрэслім: не да пракурора, а да незалежнага суддзі. А суддзя павінен зыходзіць з таго, што ўтрыманне пад вартай можа быць толькі крайняй мерай. У астатніх выпадках затрыманых трэба адпускаць, узяўшы ў іх абавязацельства з'яўляцца па выкліках органаў следства і суда.

Гэты стандарт стаў нормай жыцця ў еўрапейскіх краінах, у тым ліку ў Расіі і Украіне. Толькі Беларусь не жадае памяняць пракурора на суддзю (хоць у нашых умовах гэта адно і тое ж — Аўт.). У нас людзі гадамі сядзяць у следчых ізалятарах, чакаючы суду. Без судовага рашэння — яны невінаватыя ні ў чым. Вось вам і «адвольнае зняволенне» невінаватых без рашэння суда.

Кожны, хто асуджаны за злачынства, мае права на тое, каб ягоны прысуд быў перагледжаны вышэйстаячай судовай інстанцыяй. У выпадку судовай памылкі асоба, якая была несправядліва пакараная, павінна атрымаць кампенсацыю згодна з законам.

Ізноў вяртаемся да справы «мінскіх тэрарыстаў» Канавалава і Кавалёва. Адзінай, першай і вышэйшай інстанцыяй, якая іх асудзіла, быў Вярхоўны суд. Касацыйнай інстанцыі вышэй яго ў гэтым выпадку ў нас проста не існуе! Пададзеная «наглядная скарга» ў гэтым пытанні не з'яўляецца касацыйнай. Гэта стала адной з прычын трагічнага фіналу крымінальнай справы.

Варта таксама звярнуць увагу на арт. 17 Пакта, згодна з якім ніхто не можа падвяргацца адвольнаму або незаконнаму ўмяшанню ў яго асабістае і сямейнае жыццё, самавольны або незаконны замах на недатыкальнасць яго жылля або тайну яго карэспандэнцыі або незаконны замах на яго гонар і рэпутацыю. Пры гэтым кожны чалавек павінен мець права на абарону закону ад такога ўмяшання або такіх замахаў.

Разгляд крымінальных справаў кандыдатаў у прэзідэнты 2010 года паказаў, чаго вартыя абавязацельствы Беларусі ў гэтым кантэксце. Праслухоўванне тэлефонаў некаторых з іх, а таксама сачэнне за іх электроннай перапіскай «невядомыя спецслужбы» вялі аж з вясны 2010 года, калі і справы па падзеях снежня 2010 года не існавала ўвогуле! Так, санкцыя пракурора на гэтыя дзеянні ў матэрыялах справы маецца. Але яна з'яўляецца толькі фігавым лістком самавольства.

## У паўкроку да Камітэту

Такім чынам, можна канстатаваць, што ў беларускай рэчаіснасці назіраецца відавочны перабор з абмежаваннем правоў і свабодаў: не толькі палітычных, але і агульнаграмадзянскіх. Відавочна, што незаконная «праслушка» альбо сачэнне, утрыманне ў СІЗА альбо ў «малпоўніку» могуць прымяняцца да кожнага грамадзяніна, які патрапіў на вока беларускім органам правапарадку. Прымусовая праца стала ледзьве не палітыкай беларускай дзяржавы. Таксама як абмежаванне волі, катаванні і прымус да дачы паказанняў могуць быць прымененыя да любога чалавека, і задоўга да суда. І гэтак далей…

Але ж не будзем забывацца, што нормы Пакта маюць для дзяржаў абавязковы характар. За выкананнем гэтых правоў ажыццяўляецца кантроль з боку Камітэта ААН па правах чалавека. Пра арганізацыю і дзейнасць гэтага органа, а таксама пра практыку разгляду ім скаргаў ад грамадзян Беларусі пойдзе гаворка ў наступнай публікацыі.

СТРАТЫ

# ТРЭБА ПРЫМУСІЦЬ КУПЛЯЦЬ БЕЛАРУСКАЕ

Таццяна ЛІСІЧЭНКА

**Белстат крыху папсаваў святочныя настроі беларускіх уладаў: у выніку зніжэння экспарту шэрагу тавараў Беларусь недаатрымала амаль 10 мільярдаў долараў. Далей будзе толькі горш.**




## Мінус 10 мільярдаў

Пералік беларускіх тавараў, па якіх адбылося найбольш істотнае зніжэнне коштавага аб'ёму экспарту, сведчыць пра тое, што па 30 таварных пазіцыях пастаўкі на знешнія рынкі знізіліся на 9 мільярдаў 709 мільёнаў долараў.

Так, экспарт нафтапрадуктаў толькі ў студзені-кастрычніку скараціўся на 3,89 мільярда долараў у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам, раствараль-нікаў — амаль на 2,8 мільярда долараў, змазачных матэрыялаў — прыкладна на 1 мільярд долараў. Гэта зразумела: Расія ўсё ж дамаглася «прыкрыцця лавачкі», увёўшы на гэтую прадукцыю, выробленую з расійскай нафты, мытныя пошліны. Не абышоў нас бокам і скандал з «Уралкаліем» — экспарт калійных угнаенняў знізіўся на 543,4 мільёна долараў. «Свінячы грып» скараціў экспарт свініны — на 77,4 мільёна долараў. Карацей, няўдалы быў год.

Значную частку страціла машынабудаўнічая галіна. Экспарт грузавых аўтамабіляў скараціўся на 377 мільёнаў долараў, трактароў і седлавых цягачоў — на 301,1 мільёна долараў.

Таксама зменшыўся ў грашовым выражэнні і экспарт беларускай металапрадукцыі, шын, свініны, нафты, некаторых іншых тавараў. У прыватнасці, беларускі экспарт паўфабрыкатаў і пруткоў з нелегіраванай сталі скараціўся на 217,9 мільёна долараў, шын — на 72,1 мільёна, нафты — на 47,1 мільёна долараў.

Рост беларускага экспарту (на суму звыш 100 мільёнаў долараў) у студзені—кастрычніку зафіксаваны толькі па малаку і вяршках. У выніку, гадавое адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі сёлета можа скласці 2 мільярды 165,6 мільёна долараў.

## Мытны саюз не працуе

Варта зазначыць, што амаль усе пазіцыі, па якіх рэзка ўпаў экспарт, так ці інакш завязаныя на Расію. Зразумела, што нафтапрадукты, разбаўляльнікі і раствараль-нікі мы робім з расійскай нафты, хоць і прадаем у Еўропу. Беларускаму калію таксама не пашчасціла з расійскімі партнёрамі. Аўтамабілі, трактары, цягачы і шыны — ва ўсім гэтым вялізная доля расійскіх энергарэсурсаў.

Здавалася, што Мытны саюз з Казахстанам і Расіяй, наадварот, павінен стымуляваць беларускі экспарт у гэтыя краіны. Аднак «першую дудку» ў гэтым саюзе грае Расія. Уніфікацыя мытных пошлінаў і іншага заканадаўства ў Мытным саюзе, ідзе, перш за ўсё, па прыкладзе Расіі. То бок, мы ўводзім у сябе расійскія стандарты ў гандлі і экспарце.

Уступіўшы ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, Расія адчыніла свой рынак для канкурэнтнай сусветнай прадукцыі. І беларускія тавары па катэгорыі «кошт-якасць» сталі значна саступаць замежным аналагам. Мы б гэта перажылі, каб у Мытным саюзе ўніфікавалася ўсё. Але Расія і не думае ўніфікаваць кошты на энерганосьбіты.

Напрыклад, кошт газу для Беларусі, нягледзячы на ўсялякія «льготы» і субсідыі, усё роўна амаль у паўтара разы большы, чым у Расіі. У Расіі 1 тысяча кубаметраў газа па фіксаваных коштах ацэньваецца ў 106 долараў, для Беларусі ў будучым годзе закладзены кошт у 175 долараў. Кошт нафты для Беларусі — 380 долараў за тону, хаця ўнутраны расійскі кошт — каля 240 долараў.

Вось і атрымліваецца, што беларуская прадукцыя «пажырае» нятанныя расійскія энерганосьбіты, і каштуе толькі па энергарэсурсах разы ў паўтара больш, чым расійскія аналагі. Пра якую роўнасць у Мытным саюзе можа ісці размова?

## З надзеяй на насельніцтва

Нястачу ў 10 мільярдаў валютнай выручкі ўлада плануе кампенсаваць унутраным попытам і новымі падаткамі. Напрыклад, падатак за допуск аўтамабіля да дарожнага руху ўжо закладзены праекце бюджэту Беларусі на 2014 год. Улады плануюць зарабіць на аўтаўладальніках 1,6 трыльёна рублёў.

У 2014 годзе прапануецца павялічыць стаўкі акцызаў на ўсе групы падакцызных тавараў. Гэта прадугледжана праектам закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2014 год». У прыватнасці, у 2014 годзе прапануецца павысіць стаўкі акцызаў на моцны алкаголь у цэлым на 27,3% (з 1 студзеня — на 14,5%, з 1 ліпеня — на 11,1%), віно пладовае мацаванае — на 75,1% (з 1 студзеня — на 36,1%, з 1 ліпеня — на 28,7%), іншыя віды алкагольнай прадукцыі, у тым ліку піва, — у сярэднім на 20% (з 1 студзеня — на 13–15%, з 1 ліпеня — на 6–7%).

На тытунёвыя вырабы прапанавана павялічыць стаўкі акцызаў на 24–38% з захаваннем трох цэнавых сегментаў цыгарэт з фільтрам, што забяспечыць вялікую падатковую нагрузку на цыгарэты больш высокіх цэнавых сегментаў.

Стаўкі акцызаў на аўтамабільнае паліва прапануецца павялічыць у сярэднім на 14,5% з дыферэнцыяцыяй ставак акцызаў на бензіны аўтамабільныя і дызельнае паліва ў залежнасці ад іх экалагічнага класа (зніжэнне ставак акцызаў з ростам экалагічнага класа) замест утрымання актанавай лічбы, што будзе стымуляваць вытворчасць высакакласнага аўтамабільнага паліва.

На астатнія групы падакцызных тавараў стаўкі акцызаў плануецца павялічыць у сярэднім на 20% (з 1 студзеня — у сярэднім на 14,5%, з 1 ліпеня — у сярэднім на 5–6%), што ўлічвае параметры, прадугледжаныя планам сумесных дзеянняў урада і Нацыянальнага банка па структурным рэфармаванні і павышэнні канкурэнтаздольнасці эканомікі.

Але да чаго прывядзе ўмацаванне ўнутранага попыту для кампенсацыі стратаў у знешнім гандлі?

## Ударацъ па кішэні

«Перацягванне коўдры» са знешняга гандлю да насельніцтва, кажа эканаміст Леанід Злотнікаў, прывядзе да таго, што будзе зніжацца ўзровень дабрабыту насельніцтва. «Сітуацыя такая: калі няма валюты, то няма рэсурсаў для далейшай падтрымкі патрабаванняў дзяржавы і насельніцтва. Падтрымліваць той узровень жыцця, да якога мы прызвычаіліся, становіцца немагчымым, і заканамерна, што знізіцца ўзровень жыцця», — лічыць Злотнікў.

Па ягоных словах, эканамісты ў такой сітуацыі кажуць пра «зніжэнне попыту», хаця на самай справе гэта і ёсць зніжэнне ўзроўню жыцця. «Калі прадукцыя не прадаецца, заробак не павялічваецца. Але растуць падаткі, расце кошт жыллёва-камунальных паслуг, расце кошт праезду ў транспарце і акцызы, (а значыць, і кошты) на той жа бензін. А значыць, насельніцтву прыйдзецца зацягнуць паясы.

Дарэчы, Злотнікаў заўважыў: згодна з урадавымі прагнозамі, заробак у 2014 годзе для бюджэтнікаў павінен узрасці толькі на 3–4%, калі інфляцыя павінна скласці 11%. Прычым, 11% — гэта ўрадавы, а значыць, «аптымістычны» прагноз. На 2013 год урад планаваў «паталок» інфляцыі ў 12%, а на справе яго прышлося пераглядаць да 15–16% за год (вынікі яшчэ не падведзеныя). То бок, па самых аптымістычных падліках, інфляцыя ў 3–4 разы будзе апераджаць рост заробку.

Але тут ёсць і яшчэ адзін момант. Замежныя вытворцы аплату за імпарт у беларускіх рублях не бяруць. У выніку грамадзяне краіны будуць вымушана «купляць беларускае», бо іншага парасту не будзе. То бок, знізіцца не толькі ўзровень, але і якасць жыцця.

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# ГУЛЬНЯ Ў ХОВАНКІ

**Пакуль Міністэрства працы шчыруе над распрацоўкай кампенсацый кошту дзяржаўных сацыяльных паслуг, што атрымліваюць непрацуючыя грамадзяне, насельніцтва Беларусі не ведама куды знікае.**

Якую афіцыйную справаздачу ні вазьмі, патрэбнай у гэтай справе дакладнасці няма. Мноства дзяржаўных інстанцый займаюцца падлікам людзей, але ніхто не ведае, колькі дакладна беларусаў у гэты момант працуе за мяжой. Прыкладам, у Расіі. У лепшым выпадку, як, напрыклад, МУС, спасылаюцца на ацэнкі экспертаў. Маўляў, ці 500 тысяч, ці ўжо мільён.

Таму час ад часу Лукашэнка, а за ім прэм'ер, і далей па ланцугу — усе робяць выгляд, што шукаюць абібокаў. Як патлумачыла міністр працы Марыяна Шчоткіна, па Канстытуцыі беларускі грамадзянін не павінен працаваць ні на дзяржаву, ні на чорта лысага, ні на сабе нават. Але ж павінен плаціць дзяржаве, бо яна сваім грамадзянам, здараецца, дапамагае. Могуць апендыцыт выразаць, могуць у армію забраць. А на ўсё грошы патрэбны. Таму працуй — не працуй, а плаціць павінен!

Хаця ў нашай сацыяльнай дзяржаве ёсць катэгорыі людзей, якія жывуць, але, па логіцы, не павінны. Прыкладам, зарэгістраваныя беспрацоўныя. Як паведаміў Белстат, у кастрычніку сярэдняя дапамога па беспрацоўі на аднаго зарэгістраванага кліента службы занятасці склала 118,9 тысячы рублёў, ці 11,4% ад бюджэту сярэдняга пражытковага мінімуму.

Гэта ў нас называецца — дапамогай тым, хто страціў працу. Як па мне, дык гэта павінна называцца, напрыклад, «дапамогай на нежыццё». Добра вядома, што цяжка пражыць чалавеку за вызначаны дзяржавай пражыццёвы мінімум, але пражыць за 1/9 яго часткі немагчыма. Таму зразумела, што афіцыйныя беспрацоўныя маюць нейкія неафіцыйныя даходы. Прыкладам, беспрацоўныя былыя вучні і студэнты у большасці жывуць за грошы бацькоў. Ці не самай вялікай групай беспрацоўных з'яўляюцца жанчыны і асобы, якія працяглы тэрмін не мелі працы.

Афіцыйных беспрацоўных, якія самі з'яўляюцца для рэгістрацыі, лёгка падлічыць. Але ці паднімецца рука ў той жа Шчоткінай, Мясніковіча ці Лукашэнкі, каб увесці кампенсацыю для гэтых грамадзян, якія амаль не атрымліваюць ад дзяржавы ніякай дапамогі?

Афіцыйнага беспрацоўя ў Беларусі амаль няма. Як паведаміў Белстат, на канец кастрычніка колькасць зарэгістраваных беспрацоўных склала 21 тысячу і паменшылася на 21%. Такім чынам, узровень афіцыйнага беспрацоўя склаў 0,5% ад эканамічна актыўнага насельніцтва (гэта значыць, хто працуе і мае жаданне працаваць) супраць 0,6% на канец кастрычніка мінулага года. Таму на адну заяўленую свабодную вакансію ў службе занятасці ўмоўна выпадае 0,3 беспрацоўных. А ў сталіцы, згодна з дадзенымі Мінгарвыканкама, колькасць вакансій перавышае колькасць беспрацоўных амаль у 16 разоў!

Афіцыйнае беспрацоўе ў Мінску складае 0,1%. Гэта значыць, з тысячы эканамічна актыўных асоб толькі 1 чалавек лічыцца беспрацоўным. Хоць Мінск застаецца амаль адзіным горадам, дзе колькасць насельніцтва павялічваецца. Прыкладам, за 9 месяцаў бягучага года натуральны прырост у Мінску склаў 4027 чалавек, хаця ў цэлым па Беларусі працягваецца дэпапуляцыя — мінус 6247 чалавек.

Але атрымліваецца, што працаваць няма каму.

Як адзначалася, афіцыйна беспрацоўных няшмат, і жывуць яны не з дапамогі па беспрацоўю. Кормяцца з нефармальных крыніц. Іншыя, якія не маюць афіцыйнай занятасці (іх нашмат болей), таксама жыць хочуць, і не горай, чым астатнія. Таму не спяшаюцца з выплатай падаткаў дзяржаве, якая іх не бараніла і бараніць не збіраецца.

Колькі іх? Згодна Белстату, колькасць эканамічна актыўнага насельніцтва на 1 кастрычніка склала 4526,1 тысячы чалавек, што на 1,2% меней, чым за 10 месяцаў 2012 года. Гэта значыць, што колькасць работнікаў паменшылася на 54,3 тысячы чалавек. Хто памёр, што пайшоў на пенсію, хто паехаў на заробкі, а хто, як раней казалі, уладкаваўся «ў гультрэст». Як у колішняй камсамольскай песні — байцы знікаюць, а начальства не ведае куды. Бо статыстыка не ўлічвае занятых і беспрацоўных у «мікраарганізацыях і малых арганізацыях без ведамаснага падпарадкавання», дзе, быццам, працуюць 26,9% агульнай колькасці актыўнага насельніцтва, ці 1217,52 тысячы чалавек.

Хто з гэтых людзей займаецца бізнэсам і якім — гэта не вядома нават МУС. Магчыма, на аднаго Карэйку тут трапляецца некалькі Бендэраў і куды болей Панікоўскіх з Балаганавымі.

І ўсе стараюцца красці так, каб не папсаваць імідж.

НАДЗЕІ І ПРАГНОЗЫ

# 2013 ВЫНІКІ І ЧАКАННІ

Генадзь КЕСНЕР

**Вядомыя ў Беларусі людзі падзяліліся з чытачамі НЧ меркаваннямі пра тое, якую падзею яны лічылі галоўнай у 2013 годзе і чаго чакаюць ад года надыходзячага.**

**Алег Гулак, старшыня Беларускага Хельсінскага камітэта:**

— Сітуацыя ў гэтым годзе нагадвае «дзень сурка»: нібы ўсё ўжо сціраецца — гады і даты. Час ідзе, а сітуацыя ў горшым сэнсе закансерваваная. Гэта стабільнасць, але зусім без станоўчай ацэнкі, — балота, а не стабільнасць. Таму нават цяжка сказаць, ці было нешта выбітнае ў гэтым годзе. У жыцці кожнага чалавека бываюць радасныя і горкія моманты, але каб адбылося нешта глабальнае ў сферы правоў чалавека, то тут нічога не магу сказаць. Дзякуй Богу, нічога вельмі дрэннага не адбывалася, але і нічога добрага таксама не назаву. Хоць для нас яшчэ важна, што мы пачалі працаваць над новым накірункам — гэта дыскрымінацыя. Мы завяршаем год тым, што падрыхтавалі даклад, стварылі кааліцыю супраць дыскрымінацыі, і гэта, на мой погляд, вельмі важна.

Я б хацеў, каб у наступным годзе памянялася нечалавечае стаўленне да чалавека і да яго правоў, каб дзяржаўная сістэма пачала дзейнічаць, грунтуючыся на павазе да правоў чалавека. Хацелася б бачыць Чэмпіянат свету па хакеі без палітвязняў, ёсць спадзяванне, што ён можа быць такім фактарам, які паўплывае на тое, што людзі выйдуць на свабоду. Хацелася, каб выбары ў мясцовыя саветы прайшлі без эксцэсаў, у якіх могуць пацярпець людзі. Канешне, будзе цікава назіраць за падзеямі вакол заходняга вектару ва Украіне, і я думаю, што ўкраінскія падзеі будуць дастаткова ўплывовым чыннікам на сітуацыю ў Беларусі. А мы, праваабаронцы, будзем працягваць сваю працу.

**Аляксей Марачкін, мастацкая суполка «Пагоня»:**

— Для мяне самая галоўная падзея — гэта тое, што адбываецца ў суседняй Украіне, у Кіеве. Украінскі народ паказаў сваю моц, сваю еднасць, адстойванне сваіх дэмакратычных прынцыпаў, з арыентацыяй на еўрапейскія каштоўнасці. Гэта не разыходзіцца з нашымі поглядамі, з поглядамі нашых дэмакратычных лідараў, як і поглядамі нашага народа. Таму для мяне гэта найважнейшая падзея.



Што для мяне асабіста, дык я да гэтага доўга ішоў — я не малады чалавек, я малюю карціны, але недзе паралельна ішло маё пісанне, вершаскладанне, і рапам літаральна ў гэтым месяцы мяне прынялі ў Саюз беларускіх пісьменнікаў.

А на будучы год я хацеў бы, каб мы ўсе — творчыя людзі, мастакі, пісьменнікі — дачакаліся светлага дзянёчка, каб хмаркі, каторыя ўвесь час поўзаюць паміж намі і на небе, зніклі, каб неба ачысцілася, каб адбылося прасвятленне ў галовах, прасвятленне на радзіме. Напярэдадні сусветны чэмпіянат па хакеі. І я за тое, каб мы 25 сакавіка, перад гэтым чэмпіянатам, паказалі сваю моц, выйшлі на вуліцу і адсвяткавалі нашае свята ў гадавіну БНР — Дзень Волі, і хай паспрабуюць нас разагнаць. Я звязваю гэтыя падзеі, і мы павінны паказаць, што мы адзіны народ, што мы ёсць нацыя, і што мы ідзём тым жа шляхам, што і нашы браты і суседзі ўкраінцы.

**Алег Трусаў, старшыня Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны:**

— Вельмі важная падзея, што шэсць год існуе Белсат, які ахапіў мільён гледачоў. Для дэмакратыі, для мовы, для культуры, на маю думку, гэта самая знакавая падзея.

У наступным годзе, як і ўсе папярэднія гады, я чакаю змены культурнай і палітычнай сітуацыі ў краіне. Я чакаю, што павінна змяніцца і дзеючая сістэма культуры, адукацыі, і наогул у краіне. Я за палітычныя змены ў нашай дзяржаве, якія за сабою пацягнуць эканамічныя і асабліва культурныя змены.

**Святлана Калінкіна, намеснік старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў:**

— Мне падаецца, што самай галоўнай падзеяй, персонай ці асобай году стаў усё ж такі Папа Рымскі. Гэта тая асоба, якая ва ўсім свеце прыцягнула да сябе ўвагу і журналістаў, і звычайных людзей. І гэта, я б адзначыла, нейкая новая з'ява, якая ўзнікла ў нашым жыцці. Папа Францішак — незвычайная асоба, што паламала ўсе стэрэатыпы, якія ў нас былі, асабліва ў дачыненні да такіх вядомых людзей. Таму для мяне галоўнае ўражанне года — гэта Папа Рымскі Францішак.

Цяжка нешта прагназаваць на наступны год, калі не з'яўляешся ні астролагам, ні варажбіткай. Але ўсё паказвае на тое, што мы ўваходзім у год крызісны, і паколькі Беларусь з усіх крызісаў выходзіла ці не самай пацярпелай, то я нічога добрага ад наступнага года не чакаю. Бо, з аднаго боку, наша ўлада не хоча цвяроза паглядзець на тое, што зроблена, на свае памылкі, і ўвогуле на самую сябе, а гэта значыць, што проста зацягнецца пятля на шыі. Мне падаецца, што мы ўваходзім у цяжкі год, а заўсёды, калі ў краіны эканамічныя ці іншыя цяжкасці, то па завядзёнцы ў нас, у Беларусі, вінаватымі будуць журналісты, якія не так пісалі, не так распавядалі, ці штосьці яшчэ будзе не так. Дай Бог, каб мае прагнозы не збыліся, але я думаю, што будзе яшчэ адзін цяжкі год, але, як кажуць, самы цёмны час — гэта час перад світанкам.

**Аляксей Янукевіч, старшыня Партыі БНФ:**

— Галоўнай падзеяй года я назваў бы выхад на волю, хоць і не ўсіх, але некаторых палітычных вязняў. Тое, што на свабодзе апынуліся Павел Севярынец, Зміцер Дашкевіч, — гэта вельмі добрая і радасная навіна. Апроч таго, важная падзея — гэта 25-я гадавіна ўтварэння Беларускага народнага фронту, цягам усяго года мы яе адзначалі, святкавалі, і я думаю, што гэтая падзея важная не толькі для нас, але і для ўсіх прыхільнікаў свабоды, дэмакратыі, нацыянальных каштоўнасцяў. І, па вялікім рахунку, гэта значная дата для гісторыі ўсёй Беларусі.

Калі казаць пра наступны год, то хацелася б бачыць на волі ўсіх палітвязняў, хацелася б, каб не з'явіліся новыя. Наступны год яшчэ не будзе годам прэзідэнцкіх выбараў, але ўжо падрыхтоўкі да іх, таму хацелася б, каб мы з калегамі ў наступным годзе ўсё ж змаглі назваць імя адзінага кандыдата, каб ён быў вызначаны, і мы змаглі працаваць надалей.

А калі казаць у больш шырокім кантэксце, то наступны год — гэта 500-годдзе выбітнай перамогі нашых продкаў пад Оршай, і я думаю, што таксама вельмі важна будзе і да лета, і ўлетку шырока адзначыць гэтую падзею, і спадзяюся, што ў гэтым не толькі дэмакратычнае грамадства, але ўсе знойдуць сілу і матывацыю для таго, каб сёння супрацьстаяць расійскай экспансіі, якая сапраўды нясе небяспеку нашай краіне. Таму ўвесь 2014 год будзе вельмі важным годам у адстойванні нашай незалежнасці.

**Леў Марголін, эканаміст, намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі:**

— Адносна сыходзячага года, дык гэта ўсё ж, відаць, украінскі Майдан. Бо ўкраінскі народ ужо другі раз цягам непрацяглага часу дэманструе, што не дазволіць, каб нейкія лёсавызначальныя рашэнні прымаліся за ягонай спінай. Украінцы паказалі сябе сапраўднай нацыяй, чаго б я пажадаў і беларускаму народу.

Што тычыцца наступнага года, я чакаю ад яго не вельмі прыемнага — найхутчэй, у 2014 годзе варта чакаць яшчэ адну дэвальвацыю беларускага рубля, і добра, калі яна абмяжуецца памерам у 30 адсоткаў. А што б мне хацелася прыемнага ў наступным годзе, каб беларускія прыхільнікі пераменаў змаглі аб'яднацца і абраць сабе лідара, які быў бы бясспрэчным, аўтарытэтным. І, на мой погляд, гэта можна зрабіць толькі праз агульнанароднае, галасаванне кшталту праймерыз.

**Аляксандр Класкоўскі, палітолаг, публіцыст:**

— Для Беларусі гэта быў год няспраўджаных чаканняў. На жаль, не выйшлі на волю ўсе палітвязні, хаця на пачатку года ў часткі наглядальнікаў з'явіліся пэўныя спадзяванні, бо былі некаторыя варушэнні з боку ўладаў. Сітуацыя ў эканоміцы пагаршаецца, а ў становішчы, калі пануюць страх і апатыя, нарастання пратэстных настрояў у беларускім грамадстве пакуль што няма, таму і няма спадзяванняў, што ўлады пад ціскам вуліцы ці грамадзянскай супольнасці міжволі пайшлі б на пераўтварэнні. Так што нейкіх важных падзеяў, якія б узрушылі мяне асабіста, сёлета ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі не адбылося.

Самае рэальнае, што можа адбыцца ў наступным годзе, гэта тое, што «ляснецца» беларускі рубель. Рэсурсаў у беларускага кіраўніцтва ўсё меней, і калі нават удасца ўтрымаць ад рэзкага падзення нацыянальную валюту, то гэта за кошт вытрасання кішэняў звычайных грамадзян, а па-другое, узнікае рызыка здачы нейкіх важных элементаў суверэнітэту Маскве. Ужо сёння няма грошай для падтрымання абароназдольнасці, у Баранавічах ужо з'явіліся расійскія знішчальнікі, а, паводле словаў расійскага міністра абароны Шайгу, у наступным годзе з апераджэннем графіка ў нашай краіне можа з'явіцца і расійская авіябаза.

Віцэ-прем'еры ў асобе Уладзіміра Сямашкі зноў мусяць рапартаваць, што рухаюцца наперад інтэграцыйныя праекты, а калі казаць больш груба, то МАЗ, Мінскі завод колавых цягачоў і некаторыя іншыя прадпрыемствы могуць быць здадзены Расіі. Вось такая прыкрая перспектыва. На адсуду тут спадзявацца не выпадае, бо сёння і апазіцыйныя сілы не маюць дастатковага патэнцыялу, каб узяць у свае рукі ініцыятыву, і народ пакуль што не гатовы да масавых пратэстаў. Таму наперадзе Беларусь чакае паласа вельмі вялікіх выпрабаванняў, і ніякага лёгкага цудадзейнага шляху да лепшага жыцця не будзе. Хаця ўсё на сто адсоткаў непрадказальна.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 23 СНЕЖНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1 БЕЛАРУСЬ

**06.00, 07.20, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.50** Навіны.
**07.05, 08.05** Дзелавое жыццё.
**07.10, 08.10** Зона Х.
**09.10** У цэнтры ўвагі.
**10.00** Меладрама «Палюбоўнік для Люсі» (Украіна).
**12.10, 14.55, 18.35** Evrovision. Без каментароў.
**12.15** Лёс гігантаў.
**13.25** Клуб рэдактараў.
**14.10** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Журналісцкае расследаванне.
**15.55** Заўтра - гэта мы!
**16.25** Усё як мае быць!
**16.50** Лірычная камедыя «Моцны шлюб» (Расія).
**19.20** Арэна.
**19.40, 23.30** «Зона Х». Крымінальныя навіны.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45** Серыял «Сваты-6» (Расія - Украіна).
**22.55** «Лёс гігантаў».
**00.05** Дзень спорту.
**00.15** Крымінальны баявік «Пастка» (ЗША).

### Н

**06.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе. «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Шматсерыйны фільм «Матч».
**12.10** «Яны і мы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прысуд».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Зразумець. Прабачыць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Пазіцыя».
**22.05** Фільм «Ты сустрэнеш таямнічага незнаёмца».
**23.55** «Вячэрні Ургант».
**00.35** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.45** «Вялікі сняданак».
**10.40** «Прошаная вячэра».
**11.35** «Такі лёс».
**12.30** «Джэймі: «Калядная вечарынка».
**13.00** «Глядзець усім!».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** СТБ прадстаўляе: «Зорны рынг. Новы сезон.
**15.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Згодна з законам».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** «Вялікія таямніцы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**20.20** Фільм.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Ваенная таямніца».
**00.25** «Знахар: паляванне без правілаў». Серыял.

### 2 БЕЛАРУСЬ

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**10.10** Навіны надвор'я.
**10.45** Біяграфічны серыял «Хакейныя гульні» (Расія). 1-я серыя.
**12.20** «Імперыя песні». На біс.
**12.55** Лірычная камедыя «Тыя, што не паддаюцца» (СССР).
**14.35** Спартовая камедыя «Рыкі Бобі: кароль дарогі» (ЗША).
**16.40** Беларуская часіна.
**17.55** Серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**18.55** Ваенны баявік «Апостал» (Расія).
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.40** Серыял «Рэальныя мальцы» (Расія).
**23.45** Біяграфічны серыял «Хакейныя гульні» (Расія). 1-я серыя.

### 3 БЕЛАРУСЬ

**07.30** «Дабраранак».
**08.00** «Калейдаскоп».
**08.05** «Год у гісторыі».
**08.20** «Свет прыроды». Каля дрэва дружбы трох народаў.
**08.55** «Рэчавы доказ». Мы былі. Дакументальны фільм пра жыццё Якава Вілімавіча Бруса, нашчадка шатландскіх каралёў.
**09.20** «Росчырк часу». Мастачка Таццяна Арасланава.
**09.35** «Трамвай у Парыж». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
**10.25** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.55** «Вясёлыя рабяты». Мастацкі фільм.
**12.25** «Калейдаскоп».
**12.30** «Год у гісторыі».
**12.30** «Год у гісторыі».
**12.45** «Святло далёкай зоркі». Памяці акцёра, народнага артыста Беларусі М.Пятрова.
**13.10** «Аўтограф».
**13.45** «Збянтэжаны Саўка». Кароткаметражны фільм.
**14.15** «Палескі пачастунак». Бульба з курыцай.
**14.30** «Карані».
**15.00** «Музеум». Маляваныя дываны.
**15.15** «У жніўні 1944-га». Мастацкі фільм.
**17.10** «Наперад у мінулае».
**17.40** «Наша спадчына». Палац Валовічаў.
**17.55** «Масква-Мінск. Кінатранзіт». Барыс Плотнікаў. «Узыходжанне». Дак. фільм.
**18.30** «Цуды прыроды». Мадэйра. Тайвань. Балі.
**18.55** «Калейдаскоп».
**19.05** «Дзеці капітана Гранта». Мастацкі фільм.
**20.30** Калыханка.
**20.50** «Чалавек з чорнай «Волгі». Мастацкі фільм.
**22.25** «Дыя@блог». «Пра мову».
**22.50** «Пакуль мы жывыя». Мастацкі фільм. 1-я серыя.
**23.45** «Аўтограф».
**00.10** «Святло далёкай зоркі». Памяці акцёра, народнага артыста Беларусі Міхаіла Уладзіміравіча Пятрова.
**00.40** «Калейдаскоп».
**00.45** «Год у гісторыі».

### НТВ

**06.00** «НТБ раніцай».
**08.40** «Новыя рускія сенсацыі».
**09.35, 10.20** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа лекараў».
**15.10** «Гатуем».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**19.35** Серыял «Гаруноў».
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35** Серыял «Шахта».

### МИР

**05.00** Тэлесерыял «Таццянін дзень».
**06.40** Праграма «Нястарчаны Пецярбург».
**06.50** Мультфільмы.
**07.10** Праграма «Цік-так».
**07.20** Тэлесерыял «Заручальны пярсцёнак».
**09.00** Навіны Садружнасці.
**09.10** Мастацкі фільм «Цырк запальвае агні».
**10.50** Выніковая праграма «Разам».
**11.45** Праграма «Агульны рынак».
**12.00** Навіны Садружнасці.
**12.25** Тэлесерыял «Клон».
**14.10** Дакументальны фільм «У свеце каменных джунгляў».
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.20** Ток-шоў «Слова за слова».
**16.20** Тэлесерыял «Спадчына».
**18.00** Навіны Садружнасці.
**18.25** Праграма «Беларусь сёння».
**19.00** Тэлесерыял «Зорка эпохі».
**21.00** Навіны Садружнасці.
**21.25** Праграма «Акцэнты».
**21.40** Дак. фільм «Рэальны свет».
**22.05** Ток-шоў «Слова за слова».
**23.00** Мастацкі фільм «Новыя амазонкі».
**00.40** Мастацкі фільм «Цырк запальвае агні».
**02.10** Тэлесерыял «Клон».
**03.50** Дакументальны фільм «У свеце каменных джунгляў».

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Зона «Свабоды». Погляд на падзеі тыдня вачыма журналістаў радыё «Свабода».
**07.30** «Сыс пра Сыса», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**08.00** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**08.25** «Дом», серыял: 15 серыя.
**18.00** «Кароль-вінароб», серыял: 9 серыя.
**18.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.00** Навіны.
**19.15** Агляд медыяў.
**19.20** Агляд падзеяў культуры.
**19.25** Дэвайс.
**19.30** Навіны.
**19.40** Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова / С. Калінкінай.
**20.00** Навіны.
**20.30** Два на два: Сацыяльныя сеткі: Зміцер Галко і Яніна Мельнікава.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Фільматэка майстроў: «Два Месяцы», маст. фільм, 1993 г., Польшча.
**23.40** Невядомая Беларусь: «Зямля ў палоне», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**00.10** Аб'ектыў.

## 24 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

### 1 БЕЛАРУСЬ

**06.00, 07.20, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**07.05, 08.05** Дзелавое жыццё.
**07.10, 08.10** Зона Х.
**09.10** Серыял «Сэрца Марыі» (Расія).
**10.10** Серыял «Такое звычайнае жыццё».
**11.05** Дакументальны серыял «Містычныя гісторыі» (Украіна).
**12.10, 14.55** Evrovision. Без каментароў.
**12.15** Лёс гігантаў.
**13.25** Нашы.
**13.40** Серыял «Сваты-6» (Расія - Украіна).
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Серыял «Джамайка».
**16.30** Арэна.
**16.45** «Здароўе». Ток-шоў.
**17.35** Серыял «Сэрца Марыі» (Расія).
**19.20** Сфера інтарэсаў.
**19.40** «Зона Х». Крымінальныя навіны.
**19.55** Серыял «Такое звычайнае жыццё».
**21.00** Панарама.
**21.45** Святочная Калядная Імша. Прамая трансляцыя.
**23.30** Калядная служба з Ватыкана. Прамая трансляцыя.
**00.30** Меладрама «Мачаха» (ЗША).
**02.35** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе. «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольны закуп».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Шматсерыйны фільм «Матч».
**12.10** «Яны і мы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прысуд».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Зразумець. Прабачыць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Смешнае і яшчэ смешней».
**18.50** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Нюхач». Шматсер. фільм.
**23.25** Фільм «Саламяны капялюшык».
**01.45** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**09.00** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**09.05** «Вялікія таямніцы».
**10.00** «Глядзець усім!».
**10.40** «Прошаная вячэра».
**11.35** «Жаданая». Серыял.
**12.30** «Джэймі: «Калядная вечарынка».
**13.00** «Цэнтральны рэгіён».
**13.50** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**13.55** Фільм «Размаляваны вэлюм» (Кітай - ЗША - Канада, 2006 г.).
**16.10** «Далёкія сваякі».
**16.50** «Згодна з законам».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**18.35** «Дакументальны праект».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**20.20** Фільм «Мільён на Каляды» (Канада - ЗША, 2007 г.).
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** СТБ прадстаўляе: інтэлект-шоў «Разумней не прыдумаеш».
**23.50** «Аўтапанарама».
**00.15** «Знахар: паляванне без правілаў». Серыял.

### 2 БЕЛАРУСЬ

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**10.20** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**11.15** Біяграфічны серыял «Хакейныя гульні» (Расія). 2-я серыя.
**12.20** Ваенны баявік «Апостал» (Расія).
**14.20** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**15.35** Серыял «Рэальныя мальцы» (Расія).
**16.40** Беларуская часіна.
**17.55** Серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**18.55** Ваенны баявік «Апостал» (Расія). Заключныя серыі.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.40** Серыял «Рэальныя мальцы» (Расія).
**23.45** Біяграфічны серыял «Хакейныя гульні» (Расія). 2-я серыя.

### 3 БЕЛАРУСЬ

**07.30** «Дабраранак».
**08.00** «Калейдаскоп».
**08.05** «Год у гісторыі».
**08.20** «Настальжы». Музыкант, выканаўца на народных інструментах, заслужаны артыст Беларусі А.Крамко.
**08.50** «Скарбніца Магілёўшчыны». Палац Пацёмкіна. Падарунак Яе Вялікасці.
**09.20** «Росчырк часу». Шкляная нітка.
**09.35** «Пакуль мы жывыя». Мастацкі фільм. 1-я серыя.
**10.25** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**10.55** «Дзеці капітана Гранта». Мастацкі фільм.
**12.15** «Калейдаскоп».
**12.20** «Дзеці капітана Гранта». Мастацкі фільм.
**12.25** «Год у гісторыі».
**12.40** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Аляксандра Ісачова.
**13.05** «Аўтограф».
**13.35** «Цуды прыроды». Лаос. Ісландыя.
**14.05** «Я кахаю цябе.» Вершы Н. Мацяш.
**14.20** «Цуд-волаты». Дакументальны фільм пра ўзбраенне і абмундзіраванне рускай арміі пачатку XIX стагоддзя.
**14.45** «Камертон». Творчасць джазавага музыканта, піяніста, віртуоза Д.Крамера.
**15.15** «Чалавек з чорнай «Волгі». Мастацкі фільм.
**16.50** «Палескі пачастунак». Квашаная капуста.
**17.05** «Кінаіндустрыя Краіны Саветаў». Дакументальны фільм.
**18.00** «Карані».
**18.30** «Зорка на спражцы». Кароткаметражны фільм.
**19.00** «Калейдаскоп».
**19.10** «Свята святога Ёргена». Мастацкі фільм.
**20.30** Калыханка.
**20.50** «Блакітны карбункул». Мастацкі фільм.
**22.00** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**22.25** «Пакуль мы жывыя». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
**23.20** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Аляксандра Ісачова.
**23.45** «Калейдаскоп».
**00.00** «Год у гісторыі».

### НТВ

**06.00** «НТБ раніцай».
**08.40, 10.20** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа лекараў».
**15.10** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**19.35** Серыял «Гаруноў».
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35** Серыял «Шахта».

### МИР

**05.00** Тэлесерыял «Таццянін дзень».
**06.40** Праграма «Нястарчаны Пецярбург».
**06.50** Мультфільмы.
**07.10** Праграма «Цік-так».
**07.20** Тэлесерыял «Заручальны пярсцёнак».
**09.00** Навіны Садружнасці.
**09.10** Мастацкі фільм «Растанні».
**11.05** Праграма «Навіны Садружнасці. Культура».
**11.45** Праграма «Таямніцы Эрмітажа».
**12.00** Навіны Садружнасці.
**12.25** Тэлесерыял «Клон».
**14.10** Дак. фільм «У свеце цудаў».
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.20** Ток-шоў «Слова за слова».
**16.20** Тэлесерыял «Спадчына».
**18.00** Навіны Садружнасці.
**18.25** Праграма «Саюзнікі».
**19.00** Тэлесерыял «Зорка эпохі».
**21.00** Навіны Садружнасці.
**21.25** Праграма «Акцэнты».
**21.35** Дакументальны фільм «З нагоды».
**22.00** Прамая трансляцыя з Мінска і Ватыкана.
**00.00** Дак. фільм «У свеце цудаў».
**00.55** Мастацкі фільм «Растанні».
**03.10** Тэлесерыял «Клон».

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Інфармацыйна-публіцыстычны блок.
**08.30** Два на два: Сацыяльныя сеткі: Зміцер Галко і Яніна Мельнікава.
**08.55** Аб'ектыў.
**17.05** «Каляды, Каляды», святочны канцэрт.
**18.00** «Званы Беларусі», дак. фільм, 2008 г.
**18.30** Беларусы ў Польшчы.
**18.45** Калыханка для самых маленькіх: «Прыгоды і паходы»: Калядная гісторыя.
**19.00** Інфармацыйна-публіцыстычны блок.
**19.15** Агляд медыяў.
**19.20** Агляд падзеяў культуры.
**19.30** Навіны.
**19.40** Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова / С. Калінкінай.
**20.00** Навіны.
**20.30** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.45** Невядомая Беларусь: «Каханне па-беларуску», дак. фільм, 2013 г., Беларусь.
**22.00** «Нанэрль Моцарт», маст. фільм, 2010 г., Францыя.
**00.00** «Халасцякавічы», дак. фільм, 2010 г., Чэхія.
**01.00** «Каляды, Каляды», святочны канцэрт.
**01.55** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 25 СНЕЖНЯ, СЕРАДА

### 1 БЕЛАРУСЬ

**06.35** Прыгодніцкі фільм-фэнтэзі «Мой хатні дыназаўр» (ЗША - Вялікабрытанія-Аўстралія).
**08.20** Існасць. Святочная калядная праграма.
**08.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.10** Меладрама «Масква слёзам не верыць» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**12.10, 14.55** Evrovision. Без каментароў.
**12.15** Меладрама «Мачаха» (ЗША).
**14.30** БеларусьLIFE.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**17.25** Камедыя «Джэнтльмены поспеху» (СССР).
**19.00** Лірычная камедыя «Мамы» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.40** Серыял «Сваты-6» (Расія - Украіна).
**22.50** «Лёс гігантаў».
**23.25** Меладрама «Масква слёзам не верыць» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**02.00** Дзень спорту.

### НТВ

**07.00** АНТ прадстаўляе. «Наша раніца».
**08.00** , 09.00Нашы навіны.
**09.05** «Чароўны меч: Выратаванне Камелота». Анімацыйны фільм.
**10.30** «Першы дома».
**12.15** «Аліўе-шоў».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** «Аліўе-шоў». Працяг.
**17.30** «Ледавіковы перыяд».
**20.30** Нашы навіны.
**20.50** АНТ прадстаўляе: «Творчы вечар Леаніда Шырына».
**23.50** «Першы хуткі».

### СТВ

**06.40** Фільм «Мільён на Каляды» (Канада - ЗША, 2007 г.).
**08.25** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**08.30** «Прошаная вячэра».
**09.30** «Аўтапанарама».
**09.55** Фільм «Крама цудаў» (ЗША - Канада).
**11.40** «Джэймі: «Калядная вечарынка».
**12.10** «Мінск і мінчане».
**12.45** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**12.50** Фільм «Артыстка з Грыбава» (СССР, 1988 г.).
**15.30** «Прошаная вячэра».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**16.50** Фільм «Рэальнае каханне» (Вялікабрытанія - ЗША - Францыя, 2003 г.).
**19.30** «24 гадзіны».
**19.55** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**20.00** Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў «Нацыянальная музычная прэмія».
**23.00** Фільм «Рэальнае каханне-2» (Францыя, 2008 г.).
**00.40** «Вячэрні квартал».

### 2 БЕЛАРУСЬ

**06.55** Мультфільмы.
**07.35** Тэлебарометр.
**07.40** Фільм-казка «Снежная каралева».
**09.05** Калядная фантастычная гісторыя «Падарункі на Каляды» (ЗША - Канада).
**11.00** «Baby Cup». Міжнародны дзіцячы турнір па мастацкай гімнастыцы.
**12.45** Калядная сямейная камедыя «Санта Клаўс» (ЗША).
**14.40** Калядная камедыя «Санта Клаўс-2» (ЗША).
**16.35** Каляднае пасланне з Ватыкана.
**17.25** Калядная сямейная камедыя «Санта Клаўс-3: гаспадар полюса» (ЗША).
**19.20** Суперлато.
**20.10** Імперыя песні.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** Спортлато 5 з 36.
**21.30** КЕНО.
**21.35** Камедыйны баявік «Дыяментавы паліцыянт» (ЗША - Германія).
**23.25** Меладрама «Скрыжаванне» (Расія - Беларусь).

### 3 БЕЛАРУСЬ

**08.00** «Калейдаскоп».
**08.05** «Год у гісторыі».
**08.20** «Размовы пра духоўнае».
**08.30** «Перасячэнні ў прасторы і ў часе». Дак. фільм пра рымска-каталіцкі прыход.
**09.30** Мультфільм.
**10.25** «Пакуль мы жывыя». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
**11.15** «Палескі пачастунак». Куцця.
**11.30** «Доктар Айбаліт». Мастацкі фільм.
**12.40** «Калейдаскоп».
**12.45** «Год у гісторыі».
**13.00** «Размовы пра духоўнае».
**13.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці актрысы Ліліі Міхайлаўны Давідовіч.
**13.40** «Одры Хёпберн. Магія стылю». Дакументальны фільм.
**14.30** «Свята святога Ёргена». Мастацкі фільм.
**15.50** «Палескі пачастунак». Куцця.
**16.05** «Блакітны карбункул». Мастацкі фільм.
**17.20** «Шастаковіч буйным планам. Партрэт». Дак. фільм пра.
**18.25** Мультфільмы.
**18.45** «Калейдаскоп».
**18.55** «Год у гісторыі».
**19.05** «Размовы пра духоўнае».
**19.15** «Не забудзьце выключыць тэлевізар». Мастацкі фільм.
**20.30** Калыханка.
**20.45** Серыял «Майстар і Маргарыта». 1-я серыя.
**21.30** Пасланне «Граду і Свету» з Ватыкана з удзелам Найсвяцейшага Айца Францыска.
**22.20** Калядны канцэрт сімфанічнай музыкі ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Часткі 1-я і 2-я.
**00.20** «Святло далёкай зоркі». Памяці актрысы, народнай артысткі Беларусі Ліліі Міхайлаўны Давідовіч.
**00.50** «Калейдаскоп».
**00.55** «Год у гісторыі».

### НТВ

**06.00** «НТБ раніцай».
**08.40, 10.20** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа лекараў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**19.35** Серыял «Гаруноў».
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35** Серыял «Шахта».

### МИР

**05.00** Тэлесерыял «Таццянін дзень».
**06.40** Праграма «Нястарчаны Пецярбург».
**06.50** Мультфільмы.
**07.10** Праграма «Цік-так».
**07.20** Тэлесерыял «Заручальны пярсцёнак».
**09.00** Навіны Садружнасці.
**09.15** Мастацкі фільм «Спячы леў».
**10.55** Праграма «Агульны інтарэс».
**11.20** Праграма «Беларусь сёння».
**11.45** Праграма «Таямніцы Эрмітажа».
**12.00** Навіны Садружнасці.
**12.25** Тэлесерыял «Клон».
**14.10** Дак. фільм «У свеце цудаў».
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.20** Ток-шоў «Слова за слова».
**16.20** Тэлесерыял «Спадчына».
**18.00** Навіны Садружнасці.
**18.25** Праграма «Сакрэтныя матэрыялы».
**19.00** Тэлесерыял «Зорка эпохі».
**21.00** Навіны Садружнасці.
**21.25** Праграма «Акцэнты».
**21.40** Дак. фільм «Рэальны свет».
**22.05** Ток-шоў «Слова за слова».
**23.00** Мастацкі фільм «Спячы леў».
**00.25** Мастацкі фільм «Сямёра адважных».
**02.05** Тэлесерыял «Клон».
**03.35** Дак. фільм «У свеце цудаў».

### БЕЛСАТ TV BELSAT

**07.00** Інфармацыйна-публіцыстычны блок.
**08.30** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**08.55** Аб'ектыў.
**09.25** Казкі для дзетак.
**10.25** «Каралева Бона», тэлесерыял.
**12.05** «Каляды, Каляды», святочны канцэрт.
**13.00** «Дама з камеліямі», меладрама, 1995 г., Польшча.
**14.45** «Халасцякавічы», дак. фільм, 2010 г., Чэхія.
**15.45** «Нанэрль Моцарт», маст. фільм, 2010 г., Францыя.
**17.50** «Дзеці ксяндза Шаплевіча», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**18.20** «Магічнае дрэва», серыял: 1 серыя.
**18.45** Калыханка для самых маленькіх: «Занатоўкі натураліста».
**18.55** «Бабуля, тысячу разоў», дак. фільм, 2010 г., Аб'яднаныя Арабскія Эміраты–Катар–Ліван.
**19.50** Форум (ток-шоу): Беларускія міфы. Ці мы хрысціяне?
**20.35** Маю права (юрыдычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** «Ґосфард-Парк», драма, 2001 г., Вялікабрытанія–ЗША.
**23.30** «Планета «Кірсан», дак. фільм, 2010 г., Польшча–Расія.
**00.25** «Ноч святога Мікалая», маст. фільм, 2000 г., Польшча.
**01.20** Форум (ток-шоу): Беларускія міфы. Ці мы хрысціяне?
**02.05** Аб'ектыў.

## 26 СНЕЖНЯ, ЧАЦВЕР

### 1 БЕЛАРУСЬ

**06.00, 07.20, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.05** Навіны.
**07.05, 08.05** Дзелавое жыццё.
**07.10, 08.10** Зона Х.
**09.10** Меладраматычны серыял «Сэрца Марыі» (Расія).
**10.05** Серыял «Такое звычайнае жыццё».
**11.00** Серыял «Сваты-6» (Расія - Украіна).
**12.10, 18.35** Evrovision. Без каментароў.
**12.15** Лёс гігантаў.
**13.20** Камедыя «Джэнтльмены поспеху».
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Серыял «Джамайка».
**16.30** Каробка перадач.
**17.00** Таямніцы следствы.
**17.30** Серыял «Сэрца Марыі» (Расія).
**19.20** Сфера інтарэсаў.
**19.40, 23.45** «Зона Х». Крымінальныя навіны.
**19.55** Серыял «Такое звычайнае жыццё».
**21.00** Панарама.
**21.45** Серыял «Сваты-6» (Расія - Украіна).
**22.55** «Лёс гігантаў».
**23.30** Сфера інтарэсаў.
**00.25** Дзень спорту.
**00.35** Меладраматычны серыял «Джамайка» (Украіна - Расія).

### НТВ

**06.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе. «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольны закуп».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Шматсерыйны фільм «Матч».
**12.10** «Яны і мы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прысуд».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Зразумець. Прабачыць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Смешнае і яшчэ смешней».
**18.50** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Нюхач». Шматсерыйны фільм. Заключныя серыі.
**23.25** Фільм «Галоўнае - не баяцца!».
**01.25** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**09.00** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**09.05** «Дакументальны праект».
**10.05** «Глядзець усім!».
**10.40** «Прошаная вячэра».
**11.35** «Жаданая». Серыял.
**12.30** «Джэймі: «Калядная вечарынка».
**13.00** «Прыгоды дылетанта».
**13.50** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**13.55** Фільм «Рэальнае каханне». Вялікабрытанія - ЗША - Францыя, 2003 г.
**16.50** «Згодна з законам».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**18.35** «Дакументальны праект».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**20.25** Фільм «Падарунак» (ЗША, 2009 г.).
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».
**23.55** «Аўтапанарама».
**00.20** «Знахар: паляванне без правілаў». Серыял.

### 2 БЕЛАРУСЬ

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**10.15** Вышэй за дах.
**10.50** Біяграфічны серыял «Хакейныя гульні» (Расія). 3-я серыя.
**12.15** Ваенны баявік «Апостал» (Расія). Заключныя серыі.
**14.20** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**15.30** Серыял «Рэальныя мальцы» (Расія).
**16.40** Беларуская часіна.
**17.55** Серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**18.55** Меладрама «Скрыжаванне» (Расія).
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** «КЕНО».
**21.30** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.40** Серыял «Рэальныя мальцы» (Расія).
**23.45** Біяграфічны серыял «Хакейныя гульні» (Расія). 3-я серыя.

### 3 БЕЛАРУСЬ

**07.30** «Дабраранак».
**08.00** «Калейдаскоп».
**08.05** «Галасы з мінулага».
**08.15** «Год у гісторыі».
**08.25** «Летуценні Я.Драздовіча». Пра вядомага беларускага мастака.
**08.55** «Лабірынты». Камянец-Падольскі. Кветка на камяні.
**09.20** «Свет прыроды». Лось.
**09.35** Серыял «Майстар і Маргарыта». 1-я серыя.
**10.20** «Дыя@блог». «Пра вечнае».
**10.50** Калядны канцэрт сімфанічнай музыкі ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Часткі 1-я і 2-я.
**12.50** «Калейдаскоп».
**12.55** «Галасы з мінулага».
**13.05** «Год у гісторыі».
**13.20** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара, народнага артыста Беларусі і СССР Яўгена Карлавіча Цікоцкага.
**13.50** «Аўтограф».
**14.20** «Лабірынты». Маёнтак Талстых у Беларусі.
**14.50** «Карані».
**15.20** «Не забудзьце выключыць тэлевізар». Мастацкі фільм.
**16.35** «Камертон». Хор Турэцкага.
**17.05** «Майстры і чаляднікі». Саломапляценне.
**17.35** «Восеньская элегія». Вершы Сяргея Грахоўскага.
**17.50** «І смех, і бяда». Кароткаметражны фільм.
**18.30** «Росчырк часу». Мастакі Таццяна і Юрый Рудэнкі.
**18.45** «Калейдаскоп».
**18.55** «Галасы з мінулага».
**19.05** «Востраў скарбаў». Мастацкі фільм.
**20.30** Калыханка.
**20.50** Серыял «Майстар і Маргарыта». 2-я серыя.
**21.35** «Дыя@блог». «Пра вечнае».
**22.00** «Навагодні тыдзень». Канцэрт Ядзвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча.
**23.00** «Аўтограф».
**23.30** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара, народнага артыста Беларусі і СССР Яўгена Карлавіча Цікоцкага.
**23.55** «Калейдаскоп».
**00.00** «Галасы з мінулага».
**00.05** «Год у гісторыі».

### НТВ

**06.00** «НТБ раніцай».
**08.35, 10.20** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа лекараў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**19.35** Серыял «Гаруноў».
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35** Серыял «Шахта».

### МИР

**05.00** Тэлесерыял «Таццянін дзень».
**06.40** Праграма «Нястарчаны Пецярбург».
**06.50** Мультфільмы.
**07.10** Праграма «Цік-так».
**07.20** Тэлесерыял «Заручальны пярсцёнак».
**09.00** Навіны Садружнасці.
**09.15** Мастацкі фільм «Ад змяркання да світання».
**11.15** Праграма «Дыяспары».
**11.45** Праграма «Кыргызтан у асобах».
**12.00** Навіны Садружнасці.
**12.25** Тэлесерыял «Клон».
**14.10** Дак. фільм «У свеце мінулага».
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.20** Ток-шоў «Слова за слова».
**16.20** Тэлесерыял «Спадчына».
**18.00** Навіны Садружнасці.
**18.25** Праграма «Злачынства і пакаранне».
**19.00** Тэлесерыял «Зорка эпохі».
**21.00** Навіны Садружнасці.
**21.25** Праграма «Акцэнты».
**21.40** Праграма «Наша марка».
**22.05** Ток-шоў «Слова за слова».
**23.00** Мастацкі фільм «Уваход праз акно».
**01.15** Мастацкі фільм «Ад змяркання да світання».
**03.00** Тэлесерыял «Клон».
**04.40** Праграма «Кыргызтан у асобах».

### БЕЛСАТ TV BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Маю права (юрыдычная праграма).
**07.35** Форум (ток-шоу): Беларускія міфы. Ці мы хрысціяне?
**08.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**08.50** «Дзеці ксяндза Шаплевіча», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**09.25** «Паміж снегам і сёмым небам».
**09.50** «Магічнае дрэва», серыял: 1 серыя.
**10.25** «Агнём і мячом», серыял: 3 і 4 серыі.
**12.15** «Бабуля, тысячу разоў», дак. фільм, 2010 г., Аб'яднаныя Арабскія Эміраты–Катар–Ліван.
**13.15** «Вялікі звер», драма, 2000 г., Польшча.
**14.30** «Планета «Кірсан», дак. фільм, 2010 г., Польшча–Расія.
**15.25** «Ґосфард-Парк», драма, 2001 г., Вялікабрытанія–ЗША.
**17.40** Моўнік (лінгвістычная праграма): Сапернік ці супернік?
**17.50** «Рабінзоны Мантсінсаары», дак. фільм, 2008 г., Беларусь–Германія–Фінляндыя–Францыя.
**18.45** Калыханка для самых маленькіх: «Дзіўны свет ката Філімона».
**19.00** Інфармацыйна-публіцыстычны блок.
**19.15** Агляд медыяў.
**19.20** Агляд падзеяў культуры.
**19.30** Навіны.
**19.40** Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова / С. Калінкінай.
**20.00** Навіны.
**20.30** Рэпартэр.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Апошняя акцыя», трагікамедыя, 2009 г., Польшча.
**22.55** Форум (ток-шоу): Беларускія міфы. Ці мы хрысціяне?
**23.45** «Час гонару», серыял: 65 серыя.
**00.30** Аб'ектыў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №12 (88) (снежань)

www.lit-bel.org www. novychas. info

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


Анонс


«НАВІНЫ»: літаратурна-грамадскае жыццё снежня ..... с. 2.
«ГУТАРКА»: з Алесем ПАПЛАЎСКІМ размаўляе Наталля КАНДРАШУК ..... с. 3.
«ПАЭЗІЯ»: нізка вершаў «З лёгкім снегам!..» Васіля ЗУЁНКА ..... с. 4.
«ПРОЗА»: апавяданне «Ля краю» Віктара СУПРУНЧУКА ..... с. 5.
«ПАЭЗІЯ»: вершы Зміцера ВІШНЁВА ..... с. 6.
«ЧЫТАЛЬНЯ»: «Снежны дэтэктыў» Артура Конан ДОЙЛА — Калядны падарунак ад класіка жанра ..... с. 7–10.
«ПРОЗА»: казка «Каралеўскае паляванне» Зміцера ДЗЯДЗЕНКІ ..... с. 11.
«ДЗЁННІК»: «Татавы нататкі» Анатоля ІВАШЧАНКІ ..... с. 12.
«ГРАМАДА»: Анатоль СІДАРЭВІЧ пра гісторыі літміфаў ..... с. 13.
«АРХІВЫ»: Анатоль СЦЕБУРАКА пра «масонскія сляды» ў беларускіх сховах ..... с. 14.
«ДРУК»: агляд Леаніда ГАЛУБОВІЧА абласных літаратурных альманахаў ..... с. 15.
«СВЕТ»: навіны літаратурнага замежжа ..... с. 16.


ЛЁСЫ

# ГУРЫК ПІША ЛАРУЦЕ...

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

**Кніга так і называецца: «Лісты жыцця і кахання». Апрыёры адзначаецца такім чынам яе жанравая адметнасць і робіцца ўдакладненне, што шматгадовае ліставанне закаханых адрасантаў звязана непасрэдна, літарай і духам сваімі, з рэальным жыццём.**




Менавіта пра гэта сведчаць і першыя радкі прадмовы: «Жыццё аўтараў гэтай кнігі прыйшлося на пакутлівае XX стагоддзе, калі здарылася столькі цяжкіх і жудасных падзей для ўсяго чалавецтва і многіх людзей паасобку: дзве сусветныя вайны, рэвалюцыі, бальшавіцкі тэрор, галадамор». Тут жа аўтар прадмовы зазначае далей перадумову, маральна-псіхалагічную матывацыю ліставання — пачуццё вялікага, узаемнага, глыбокачалавечнага кахання. Ён піша пра суджэнцаў, як пра «дзве палавінкі аднаго цэлага», пра тое, што «супольная праца, блізкія імкненні і думкі выклікалі спачатку шчырую сімпатыю, якая неўзабаве перарасла ў сардэчнае прыцягненне і, нарэшце, у сапраўднае Вялікае Каханне, якое яны пранеслі праз усё жыццё і якое дапамагло перажыць усе ліхалецці».

Так, пад знакам Вялікага Кахання, пад светлаю Зоркай Венерай Гурык піша Ларуце, Ларута (Лара) піша Гурыку. Так яны адзін аднога завуць, так яны адзін да аднога звяртаюцца. З адпаведнымі, вядома ж, эпітэтамі, са словамі незвычайнай пачуццёвай моцы і духоўнай красы...

Колькі гадоў таму выходзіла вялікім накладам, расхоплівалася ў кнігарнях і з захапленнем, памятаю, чыталася кніга «Что движет солнце и ветрила?» з падзагалоўкам: «Каханне ў лістах вялікіх людзей». Мушу сказаць, што многія з тых лістоў блекнуць у параўнанні з «лістамі жыцця і кахання». Асабліва не ў меру высокамоўныя, з завучанымі, шаблоннымі зваротамі — пачатковымі і развітальнымі. Блекнуць, цьмянеюць перад героямі кнігі, нашымі рэальнымі сучаснікамі з іх каханнем, іх учынкамі, іх лёсам усе гэтыя літаратурна-казачныя Трыстаны ды Ізольды, Русланы і Людмілы, Дафнісы і Хлоі...

Уражвае ўжо сама геаграфія ліставання, тыя абставіны, пры якіх пісаўся той альбо іншы ліст. Чытаем: «8.VII.38. Мая любая, любая! Мая самая дарагая, самая харошая, мая чыстая, сьветлая Ларута! Вітаю цябе з нашым радасным днём, з пятнаццацігоддзем нашага сумеснага шчасьця, шчасьця, якое не праходзіць, а ўсё паглыбляецца і павялічваецца... Ня будзем сумаваць, гараваць. Загартуемся, панясем, захаваем нашае шчасьце ў нашых сэрцах глыбока-глыбока... Позьні час ужо. Не стэнаграфаванае пісаньне зацягваецца, думкі бягуць шпарчэй. Дабранач на сёньня, мая галубка, дабранач, мая сонечная, ласкавая. Твой Гурык». Гэта радкі з ліста, які быў напісаны драбнюткімі літарамі на тонкіх, для самакрутак, паперках у салавецкай турме. Потым адпраўляецца ліст «з-пад берагу Анежскага возера». Наступны — з Салікамска. На іншых, з цягам часу, пісьмах пазначаны мясціны, населеныя пункты, станцыі: Баравічы, вёска Вялікая Ніва, Чарэпавец, Уфа, Камышлоў, Вавож, вёска Рускі Задлуд, станцыя Кузіна, станцыя Пенза, Масква, Чунжыно, Порыш-Торыно, станцыя Кіраў, Горкі-вакзал, станіца Раманаўская, Мелітопаль, Керч, Гудаута, Масква, Тамань, Ялабуга, Дзедаўск, Чарнобыль (той самы!), Чабаксары — пасажырскае судна, Чаркеск, Растоў на Доне, Смаленск, Чырвоная Горка, Масты — поплаў Нёмана... «Широка страна моя родная (і г.д.)... От Москвы до самых до окраин, от южных гор до северных морей». Было дзе размахнуцца са сваім змушаным ліставаннем спачатку зэку, потым умоўна рэабілітаванаму «ворагу народа», савецкаму, беларускага паходжання, інжынеру-геолагу.

> Вось такія яны — «лісты жыцця і кахання». Вось такія яны — аўтары гэтых незвычайных лістоў. Яны пісалі, прамаўлялі гэтак, як жылі, словы ў іх не разыходзіліся з іхнімі справамі і ўчынкамі

Гурык піша Ларуце, Ларута (Лара) піша Гурыку. Як, якой мовай? У дадзеным выпадку гэта — асобная тэма, — для літаратуразнаўцы-тэкстолага. Ды не магу не сказаць усё ж некалькі слоў. Хаця б пра тыя самыя эпітэты, азначэнні, параўнанні. Рэч у тым, што Ларута для Гурыка не толькі адназначна «любая», «дарагая», «харошая», «родная» і «мілая». Яна для яго — і «само сонца», «само шчасце», і «Das Evigweibliche» («вечная жаноцкасць»), і «пралесачка дрыжучая, зелянёк кволы», і «Вераніка скромная, ціхая», і «званочак сінюткі», і «вялікае сэрца, верная мне Сольвэйг»), і «чабор пахучы», і «белы мятлік». І яшчэ — выдзелю асобна — «мой дарагі, мой любы Здрыжнічак». Гэтае нечакана адметнае азначэнне пераходзіць з ліста ў ліст. Давялося шукаць тлумачэння ў слоўніках, у адным, у другім. Знайшоў у «Краёвым слоўніку ўсходняй Магілёўшчыны» І.К.Бялькевіча: «ЗДРЫЖНІК, -а, м. бат. Здрыжнік, канапелькі, божыя слёзкі». Вось такі вобраз, такое дзівоснае параўнанне.

У адным з лістоў гучыць прызнанне: «Калі б я ня быў геолагам, дык стаў бы этнографам». Застаючыся геолагам, Гурык з'яўляецца адначасна і натхнёным песняром сваёй любай Ларуты. Мае рацыю Міхась Мушынскі, які, грунтоўна даследуючы тэму, зазначае: «Не будзе перабольшваннем сказаць, што паэты-рамантыкі ў сваім абагаўленні «чароўнай дамы» нават саступаюць прызнанням беларускага вучонага».

Каханне ўзаемнае, узаемнасцю прасякнутае наскрозь і ліставанне. Ларута піша Гурыку ў тым жа духу, з тымі ж пачуццямі, з тым жа суперажываннем. Ён для яе і «родны, дарагі Гурык», і «родны Гурынька», і «любы Гурэечка, зоранька далёкая», і «любы Гурэйка, зямлісты Гур», і «любачка дарагі, Гур-Гурэечка», і «адзіны праз усё жыццё»... Гэта зачыны, пачатковыя радкі пісьмаў. А вось звароты развітальныя: «Бывай, бывай, маё сонца, сэрца, жыццё... Хай будзе табе добра, хай задача вядзе твой крок, моцна б'ецца сэрца. Цалую цябе ўсяго, лашчу. Твая Лара», «Вельмі хачу мець твае лісты ўжо за гэты месяц. Радыё слухаем штодня. Многа трэба сілы і цьвёрдасьці, каб захаваць супакоенасьць. Цалую цябе, мой голубе, лашчу. Твая Лара», «Бывай здароў, мой родны, дарагі. Кожную хвіліну думкаю з табою. Твая Лара. Цалую, тулюся, шапчу табе аб любасьці сэрца майго»...

А калі ён, яе любы Гурык, паведамляе ў сваім лісце, напісаным ноччу ў нейкім Поныш-Торыно, пра сваё адчайнае, прынятае, пэўна, у мінуты душэўнага ўзрушэння рашэнне «аддаць усё за магчымасьць займацца самому дасьледваньнем Беларусі: самога сябе, каханьне, сям'ю», адрачыся дзеля справы «ад сябе, ад блізкіх, родных, любых, ад сэрца» (ліст датаваны 21.VII.44.) — то яна, Ларута, годна сустракае такую навіну і напраўду самаахвярна адказвае ў сваім лісце: «...вельмі разумею тваё жаданьне астатак жыцьця аддаць Бацькаўшчыне». Ды яшчэ дадасць ласкава, без ценю крыўды і дакору (Гурык жа просіць не крыўдаваць): «Цалую цябе, лашчу, абдымаю. Твая Лара» (ліст ад 11.VII.44 г.).

Вось такія яны — «лісты жыцця і кахання». Вось такія яны — аўтары гэтых незвычайных лістоў. Яны пісалі, прамаўлялі гэтак, як жылі, словы ў іх не разыходзіліся з іхнімі справамі і ўчынкамі.

Ну ды, мяркую, самы час «расшыфраваць» усё ж гэтыя памяншальна-ласкальныя, сямейныя «Гурык» і «Ларута» ды ўдакладніць — хоць чытач, пэўна, і без таго здагадаўся, — што кнігу «Лісты жыцця і кахання», якая сёлета пабачыла свет у выдавецтве «Тэхналогія», склалі пісьмы слыннага навукоўца і грамадскага дзеяча Гаўрылы Гарэцкага і яго жонкі Ларысы Парфяновіч-Гарэцкай. Падрыхтаваў жа кнігу да выдання акадэмік, доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар і аўтарытэтны грамадскі дзеяч Радзім Гарэцкі, г.зн. Гарэцкі-малодшы. Яго пяру належаць і цікавая прадмова і грунтоўныя каментары да кожнага з раздзелаў кнігі. Р. Гарэцкі надзвычай шмат зрабіў для захавання і ўвекавечання спадчыны свайго бацькі. Выданне кнігі «Лісты жыцця і кахання» — яшчэ адна ягоная высакародная, важная для ўсіх нас справа.

*7 снежня Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі адзначыў сваё 85-годдзе. «Літаратурная Беларусь» разам з аўтарам гэтага эсэ шчыра віншуюць юбіляра ды жадаюць яму радасці і здароўя!*

## ПАЛІЦА

### ДРУГІ «НОВЫ ЗАМАК»




Пабачыў свет другі нумар літаратурнага альманаха «Новы Замак», які выдаецца Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза беларускіх пісьменнікаў. Укладальнік выдання — Сяргей Астравец, рэдактар — Юрка Голуб.

У «Новым Замку» змешчаныя творы больш за двух дзясяткаў аўтараў: паэзія, проза, драматургія, пераклады, дзённікі, успаміны. У рубрыцы «Са спадчыны» публікуецца драматычная паэма «Каранацыя Міндоўга» Міколы Арочкі (1930–2013) і вершы Юрыя Кісялеўскага (1961–2008). Успаміны Алы Петрушкевіч пра Едруся Мазько і Сяргея Астраўца пра Юрыя Гуменюка можна знайсці ў раздзеле «In memoriam».

**Прэс-служба СБП**

САЮЗ

# ТВОРЦАМ СУЧАСНАЙ УКРАІНЫ

**Заява Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў**

Дарагія сябры, браты і сёстры! У гэтыя лёсавызначальныя дні і ночы ад імя пісьменнікаў Беларусі выказваем вам сваю шчырую павагу і падтрымку.

Увесь свет сочыць сёння за падзеямі ўкраінскага Майдану. Многія беларусы плячо да пляча стаяць разам з вамі ў шыхтах супраціву, сотні тысяч падтрымліваюць вас.

Салідарызуючыся са сваімі ўкраінскімі калегамі, беларускія пісьменнікі далучаюць свой голас да вольных украінскіх гімнаў і жадаюць братэрскаму народу-суседу вытрымкі, мудрасці і мужнасці на еўрапейскім шляху!

Будзьце годнымі памяці сваіх нацыянальных герояў!

Слава Украіне!

**10 снежня 2013 г.**

# СНЕЖАНЬСКАЕ ПАСЯДЖЭННЕ РАДЫ

**Чарговае пасяджэнне Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў адбылося 10 снежня. На ім акрамя сябраў Рады прысутнічалі кіраўнікі ўсіх абласных аддзяленняў СБП.**

Фота Алены Казловай, lit-bel.org

Прайшоў прыём у сябры грамадскага аб'яднання, а таксама быў абмеркаваны план святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 80-годдзю Саюза беларускіх пісьменнікаў.

13 літаратараў былі прынятыя ў шэрагі СБП: Святлана Абдулаева, Наталка Бабіна, Віктар Бяляцкі, Наталля Гардзіенка, Вольга Гронская, Алесь Емяльянаў-Шыловіч, Міхась Зізюк, Севярын Квяткоўскі, Алесь Мара (Аляксей Марачкін), Лідзія Мініч (Андрэева), Ганна Новік, Дзмітрый Строцаў і Сяргей Харэўскі.

Рада СБП таксама станоўча разгледзела заявы аб вяртанні ў старэйшую творчую арганізацыю Беларусі пісьменнікаў Алеся Наварыча і Андрэя Паўлухіна.

## СТУДЗЕНЬСКІЯ ЮБІЛЯРЫ

**У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:**

05.01.1949 — Уладзімір Уладзіміравіч Барысенка (Пасялкоў)
12.01.1929 — Дзмітрый Якаўлевіч Бугаёў
17.01.1964 — Андрэй Міхайлавіч Федарэнка
12.01.1979 — Андрэй Віктаравіч Барадушкін

Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!

СЯБРЫНА

# ДВА КРЫЛЫ ЛІТПАМЕЖЖА

**Ва ўкраінскім горадзе Луцк прайшла прэзентацыя кнігі перакладаў брэсцкіх пісьменнікаў на ўкраінскую мову і кнігі перакладаў валынскіх паэтаў і празаікаў на беларускую.**

Рэгулярныя стасункі паміж Валынню і Берасцейшчынай на ўзроўні літаратурных аб'яднанняў бяруць пачатак з верасня 1975 года, калі пісьменнікі Брэста, Луцка і Львова сустрэліся ў сялянскай сядзібе маці першага беларускага касманаўта Пятра Клімука Марфы Паўлаўны. Ад таго ўжо і няблізкага часу ладзяцца амаль штогадовыя літаратурныя сустрэчы берасцейцаў і валынян. У апошнія гады яны сталі яшчэ больш частымі, бо пісьменнікі Берасцейшчыны — заўсёды жаданыя госці на паэтычным свяце «Лісова пісня», якое апошнія дзесяць гадоў праходзіць на Ковельшчыне ў першую нядзелю жніўня (акурат гэтай парою ў 1911 годзе Лэся Украінка завяршыла напісанне сваёй знакамітай драмы-феерыі). Пасля такіх сустрэч у мінулыя гады звычайна з'яўляліся падборкі вершаў у літаратурна-мастацкіх часопісах краін-суседзяў. І вось нарэшце плёнам літаратурнага супрацоўніцтва сталі кнігі. У Луцку ў выдавецтве «Терен» іх выйшла адразу дзве: «Берестейське багаття» (творы паэтаў і празаікаў Берасцейшчыны ў перакладзе на ўкраінскую мову) і «Думы і песні Валыні» (творы паэтаў і празаікаў Валыні ў перакладзе на беларускую мову). Абодва выданні пабачылі свет пры фінансавай падтрымцы экспертнай рады па пытаннях выдавецкай справы Валынскай абласной дзяржаўнай адміністрацыі. Паспяховая рэалізацыя арыгінальнага праекта — знакавая падзея ў культурным жыцці беларуска-ўкраінскага памежжа.

…Трымаю ў руках з густам выдадзеныя томікі. На вокладцы кожнага з іх палескія краявіды: возера, чараты і сонечная дарожка на вадзе аздабляюць кнігу перакладаў на беларускую мову; сонечныя промні на лясной сцяжыне — на вокладцы ўкраінскамоўнай кнігі. Абодва выданні маюць прыкладна аднолькавы аб'ём — каля 230 старонак, у іх змешчаны фотаздымкі аўтараў і біяграфічныя звесткі, адлюстраваны найбольш яркія моманты літаратурных сустрэч. Анталагічны характар надае зборнікам і тое, што абодва забяспечаны прадмовамі ўкладальнікаў. Да ўсяго, у кнізе «Думы і песні Валыні» змешчаны артыкул Уладзіміра Калесніка пра творчасць найбольш вядомых майстроў слова Валынскага краю васьмідзясятых гадоў мінулага стагоддзя, большасць з якіх і да нашага часу актыўна працуе.

Берасцейцы пераклалі на беларускую мову вершы і апавяданні 34 валынскіх літаратараў, валыняне на ўкраінскую — 43 берасцейскіх. Нашы калегі палічылі неабходным уключыць у «Берестейске багаття» творы тых пісьменнікаў Прыбужскага краю, якія ўжо пакінулі гэты свет, але ў свой час многа зрабілі для ўмацавання братэрскіх сувязяў: Мікола Купрэеў, Ніна Мацяш, Міхась Рудкоўскі, Васіль Сахарчук, Яўгенія Янішчыц… І ўсё ж асноўнае месца ў зборніку займаюць творы сучасных берасцейскіх паэтаў і празаікаў.

Няма сумнення адносна таго, што новыя кнігі з цікавасцю будуць сустрэты філолагамі, усімі прыхільнікамі мастацкага слова. Яны дапамогуць чытачам па абодва бакі мяжы ўсвядоміць адметнасць сённяшняга літаратурнага жыцця Валыні і Берасцейшчыны. Творчасць яднае людзей не горш, чым дыпламатычныя пратаколы.

А наперадзе новыя праекты і дамоўленасці. У ідэале, усё лепшае, што напісана і выдадзена ў кожным з нашых рэгіёнаў, павінна быць перакладзена на мову суседзяў. То няхай яно так і будзе. Мы, літаратары-суседзі, блізкія тэмамі, нас хвалююць адны і тыя ж духоўныя праблемы, і ў той жа час у кожнага адметная манера пісьма, творчы почырк.

У цяперашняй Еўропе 50% кніжнага рынку — перакладная літаратура. Для нас, беларусаў, літаратура суседніх краін — гэта агромністы духоўны пласт, асваенне якога толькі пачынаецца. Рабіць гэта варта ў тым ліку і для таго, каб яшчэ больш палюбіць сваё, роднае. А дзве новыя кнігі — як два крылы, што прыўзнялі палескае (беларускае і ўкраінскае) слова на новую вышыню.

**Мікола СЯНКЕВІЧ**

# ЛІТАРАТУРНАЕ «БЯЗМЕЖЖА»

**У Старым Ляўкове, што на Беласточчыне (Польшча), адбыўся літаратурны семінар «Бязмежжа». У ім удзельнічалі пісьменнікі, перакладнікі, выдаўцы і журналісты з Беларусі і Польшчы.**

Выступае Яўген Вапа

«Большасць не можа існаваць без меншасці, меншасць не існуе без большасці, — сказаў арганізатар літаратурнага семінару «Бязмежжа» Яўген Вапа. — Семінар — гэта штогадовыя сустрэчы літаратараў і людзей, звязаных з літаратурнай дзейнасцю Польшчы і Беларусі. У час сустрэчы адбываюцца чытанні, даклады, разглядаюцца хвалюючыя актуальныя пытанні, датычныя літаратуры, прэзентуюцца радыёрэпартажы і стужкі… Бязмежжа — гэта, безумоўна, падзея ў літаратурным жыцці беларусаў. Мы, як беларусы, мусім гаварыць пра беларускую літаратуру ў непрымушанай атмасферы, у далечыні ад вялікіх цэнтраў, і, самае галоўнае, мы мусім не саромецца гэтага. Наша ідэя — каб беларусы маглі сустракацца ў нармальнай атмасферы на літаратурных сустрэчах і маглі дыскутаваць пра літаратуру. І гаварыць, што гэта — добрае, а гэта — слабое».

Удзельнікі «Бязмежжа» пазнаёміліся з дзейнасцю Саюза беларускіх пісьменнікаў (у прыватнасці — з выдавецкай серыяй «Кнігарня пісьменніка», часопісам «Дзеяслоў», штотыднёвікам «Новы час» і яго дадаткам «Літаратурная Беларусь»), а таксама з выданнямі кніжнай серыі «Гарадзенская бібліятэка» (каардынатар Павал Мажэйка). Яраслаў Іванюк выступіў з дакладам аб найвялікшай на сёння Беларускай Інтэрнэт-Бібліятэцы Kamunikat.org. Асобнае месца занялі дэманстрацыі дакументальных стужак Фонда «Villa Sokrates», прысвечаныя апошнім месяцам жыцця Сакрата Яновіча ды дзейнасці фонда, фільмы Радаслава Дамброўскага пра Віктара Шведа і Міколы Ваўранюка «Людвіка» — пра дзейнасць Сяргея Вітушкі і Людвікі Кардзіс у беларускай Вільні.

Па завяршэнні семінара ў Беластоку было падсумаванне вынікаў шаснаццатага літаратурнага конкурса «Дэбют», арганізаванага тыднёвікам «Ніва» і Беларускім саюзам у Польшчы.

**Радыё Рацыя**

# АРХІЎ ЛЮБОВІ ТАРАСЮК

**Ненадрукаваныя рукапісы і асабістая бібліятэка беларускай даследніцы, кандыдата філалагічных навук Любові Тарасюк — пад пагрозай знікнення.**

Уся матэрыяльная спадчына захоўваецца ў роднай хаце ў Пінкавічах, што пад Пінскам, дзе навукоўца правяла апошнія месяцы свайго жыцця. Яе 88-гадовы бацька Канстанцін Міхайлавіч расказаў, што кнігамі і рукапісамі застаўлены гараж, пакоі, а частку ён раздаў па бібліятэках і ў мясцовую школу. Бацька не супраць таго, каб усё пакінутае сабраць у адным месцы: «Я лічу, што трэба вызначыцца з яе бібліятэкай. Я ў музей Якуба Коласа шмат кніг і фотаздымкаў аддаў і ў дзіцячую бібліятэку таксама…»

За свае 50 гадоў Любоў Тарасюк напісала звыш 200 навукова-метадычных працаў на тэму нацыянальнай адукацыі і культуры. Выдала два паэтычныя зборнікі. Уваходзіла ў склад Рады Таварыства беларускай мовы, рэдкалегіі часопіса «Маладосць», з'яўлялася сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў.

**Пятро Савіч, Радыё Рацыя**

АСОБА

# Алесь Паплаўскі: «МАІМ НАТХНЯЛЬНІКАМ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЖЫЦЦЁ»

Сёлетняя кніга Алеся Паплаўскага «Скрыжалі душы» здзівіла незвычайнай вобразнасцю і паэтыкай прыгажосці. Большасць вершаў прасякнута сумам, шчырасцю. Такую паэзію трэба піць маленькімі глыткамі, смакуючы кожны радок, слупок, верш.

Алесь (Аляксандр Фядосавіч) ПАПЛАЎСКІ нарадзіўся ў 1958 годзе ў вёсцы Мазуры Кобрынскага раёна. Скончыў Полацкі лесатэхнікум і Беларускі тэхналагічны інстытут. Працаваў ў лясгасах Гродзеншчыны і Брэстчыны. Жыве і працуе ў Берасці. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў. Аўтар трох паэтычных зборнікаў і кніг прозы. Лаўрэат дзвюх літаратурных прэмій (апошнюю — «Залаты апостраф» — атрымаў за надрукаваную летась у часопісе «Дзеяслоў» аповесць «Lapido»).

Пасля знаёмства з творчасцю Алеся Паплаўскага ўзнікла жаданне даведацца пра яго больш. З'явіліся пытанні, за адказы на якія — шчырая ўдзячнасць аўтару.

**Наталля КАНДРАШУК**

***— Спадар Алесь, кожны пісьменнік некалі нарадзіўся. Я маю на ўвазе не фізічны сэнс, а першыя спробы пяра. Творчы старт — якім ён быў у Вас? З якім настроем рабіліся першыя крокі ў літаратуру?***

— Творчы старт, калі быць шчырым, быў для мяне не зусім удалым. Ва ўсякім разе, мой першы вершаваны зборнік «Спынены лістапад», які пабачыў свет, калі мне было далёка за трыццаць, амаль быў незаўважаны чытацкай грамадскасцю і цалкам праігнараваны крытыкамі. Дарэчы, другі — таксама. І не з-за таго, што вершы, надрукаваныя ў іх, былі слабыя, а з-за таго, што адсутнічала належная рэклама, а гэты фактар, безумоўна, у наш час вельмі актуальны і дзейсны. Ды што там казаць, я схільны лічыць, што як паэта мяне і сёння мала хто ведае ў краіне. І ўвогуле, мой шлях у літаратуру быў няпросты. Давялося, як я часта жартую, «уваходзіць» не праз дзверы, як гэта робіць пераважная большасць сучасных літаратараў, а праз фортку. Патлумачу, што я маю на ўвазе. Працяглы час мяне амаль не друкавалі на радзіме. Напрыклад, аповесць «Піраміды» гадоў пяць вандравала з часопіса ў часопіс, але так і не з'явілася на стронках аніводнага з іх. Я ўжо ні на што не спадзяваўся і працягваў пісаць у стол. І вось аднойчы, па прапанове Ніны Мацяш, я даслаў яе ў Польшчу Яну Чыквіну. Аповесць яму спадабалася, і ён надрукаваў яе ў сваім часопісе «Тэрмапілы». Гэта і быў мой першы крок у Літаратуру.

***— Што ці хто натхняе Вас на творчасць?***

— Творчасць — гэта, найперш, цяжкая, карпатлівая праца, якая патрабуе і ўседлівасці, і дысцыпліны, і шмат чаго іншага. Важна не толькі расказаць людзям нейкую гісторыю. Важна расказаць яе па-свойму, адметна, так, як ніхто яе да цябе не расказваў. Менавіта гэтай навізной ды адметнасцю ты становішся цікавым чытачу. Маім натхняльнікам заўсёды з'яўлялася жыццё. Я люблю назіраць і запісваць тое, што адбываецца навокал. Але гэтага недастаткова, каб быць пісьменнікам. Твор — гэта, найперш, фантазія, блізкая да сапраўднасці. Гэта правільна падабраны набор слоў, калі хочаце, які вымушае чалавека суперажываць і робіць яго іншым.

***— Бывае, што аўтар доўга выношвае нейкую задумку і наперад прадумвае, што будзе ў канцы твора. А здараецца і так, што пісьменнік нават і не ўяўляе, дзе апынуцца і што будуць рабіць героі пад росчыркам яго пяра. Алесь, як гэта адбываецца ў Вас? Ці ведаеце зараней, чым скончыцца твор?***

— Для мяне твор пачынаецца з першай фразы. А далей — слова за словам, сказ за сказам. Гісторыя, якую ты расказваеш, нешта накшталт ніткі. І ты старанна, сантыметр за сантыметрам, змотваеш яе ў цэльны клубок. У Марыны Цвятаевай ёсць такія радкі: «Поэт — издалека заводит речь. Поэта — далеко заводит речь». На маю думку, гэтая творчая аксіёма актуальная не толькі для паэта, але і для празаіка таксама. Ва ўсякім разе, для мяне яна актуальная.

***— Ці бывае ў Вас такое, што кніга пабачыла ўжо свет, а хочацца яшчэ нешта дапісаць, паправіць?***

— Бывае... Мінае пэўны час — і ты глядзіш на свой тэкст зусім іншымі вачыма. Паўсюль мроящца хібы, непісьменнасць, прымітыў. І тады ўзнікае натуральнае жаданне правіць тэкст. Але правіць яго можна бясконца, і пра гэта таксама трэба памятаць. Сёння мы адны, заўтра — іншыя. Я над тэкстам, як мне здаецца, працую вельмі многа. Але ўсё роўна спадзяюся на кампетэнтнасць і талент свайго рэдактара. Як толькі твор напісаны, імкнуся хутчэй ад яго пазбавіцца. Свае надрукаваныя тэксты па магчымасці стараюся не перачытваць.

***— Што Вы робіце для самаразвіцця як пісьменнік?***

— Заўсёды кажу: быць пісьменнікам для такой катэгорыі людзей, як я, — вялікая раскоша. Бо для таго, каб быць заўжды «ў форме», трэба шмат чытаць, шмат падарожнічаць і мець шмат сустрэч ды зносін з людзьмі. На ўсё гэта патрэбен час. Шмат часу. А я свой час вымушаны палавініць, і гэта ў лепшым выпадку. Кожны дзень мне даводзіцца думаць найперш пра хлеб надзённы, і толькі потым пра творчасць. І ўсё ж, нягледзячы ні на што, я шмат чытаю і хоць адзін раз у год стараюся, як кажуць, мяняць «и широту, и долготу». Змена месца жыхарства, няхай сабе і на тыдзень, вельмі станоўча ўздзейнічае на творчы працэс.

## Бліц-апытанка

***Прадоўжыце фразу:***

***Я ніколі не дазволю сабе…*** насміхацца і здзекавацца з іншых.

***Я ўсё зраблю для таго, каб…*** паспець дапісаць свой апошні твор.

***Самае галоўнае ў жыцці — гэта…*** здароўе.

***Больш за ўсё я баюся…*** сэнсу паняцця «я баюся».

***Я мару напісаць…*** пра беларускага Гамлета.

***Калі-небудзь я нарэшце…*** удосталь пасмяюся над сваімі недахопамі.

***Я веру, што…*** жыццё — цуд, дадзены нам Некім звыш.

***Самае галоўнае ў чалавеку — гэта…*** яго ўнутраны свет.

***Я аддам любыя грошы за…*** магчымасць радавацца заўтрашняму дню.

***Калі б у мяне быў час, абавязкова навучыўся б…*** разбірацца ў людзях.

***Дарогу здужае той, хто ідзе, а літаратуру…*** таленавіты.

***— Аднойчы мне давялося пачуць такую фразу: «Пісьменнікам можа стаць кожны, трэба толькі захацець». Ваша меркаванне з гэтае нагоды.***

— Пісьменнікам можа стаць чалавек, надзелены адпаведным талентам. Людзей, якія пішуць, — шмат; пісьменнікаў — адзінкі.

***— Алесь, назавіце якасць характара, без якой чалавек, які прыйшоў у літаратуру, не можа стаць сапраўдным пісьменнікам.***

— На маю думку, толькі настырнасць, уніклівасць і мэтанакіраванасць могуць дапамагчы стаць таленавітаму чалавеку пісьменнікам.

***— У чым Вы бачыце сваё прызначэнне як аўтара?***

— Я імкнуся, наколькі гэта ў мяне атрымліваецца, пісаць не так, як пішуць іншыя. Мне хочацца ўнесці ў беларускую літаратуру нешта новае, адметнае, сваё.

***— На маю думку, няма сапраўднага пісьменніка, які не любіў бы чытаць іншых аўтараў. Калі ласка, назавіце сваіх улюбёных пісьменнікаў. А можа, сярод іх ёсць тыя, на творах якіх Вы вучыліся пісаць?***

— Маімі настаўнікамі, тымі, што вучылі мяне пісаць, былі пераважна замежныя літаратары. Я захапляўся з юнацтва і захапляюся цяпер амерыканскай літаратурай. Гэта найперш Уільям Фолкнер, Эдгар По, Сол Белоу, Эрнест Хэмінгуэй. З сучасных — Піліп Рот, Кормак Макарці, Дон Деліло. Люблю таксама і еўрапейскую літаратуру. Імёны і прозвішчы пісьменнікаў можна пералічваць доўга. Назаву толькі некаторых аўтараў: Музіль Роберт, Іэн Бэнкс, Мішэль Уэльбек, Гюнтер Грас. Не праміну таксама ўзгадаць і маіх «любімчыкаў» Салмана Рушдзі і Джона Максвэла Кутзэе. Спіс можна доўжыць. Прапусціў вось Кафку, Сартра, Камю. Але калі б перада мною стаяў выбар, якую кнігу ўзяць з сабой на незаселеную выспу, безумоўна, узяў бы Біблію. На беларускай мове…

***— На Ваш погляд, ці ёсць будучыня ў беларускай кнігі і чаму?***

— Безумоўна, мне не зусім падабаецца наша беларуская ментальнасць. Дакладней, наша аптымістычная ўпэўненасць, што ўсё ў нас як у людзей. І ў літаратуры таксама. Таму іншы раз у Сеціве на беларускіх літаратурных форумах я наўмысна іранізую, што беларуская літаратура мне нагадвае нечым біблейскага Лазара, якога імкнуцца ўвесь час ажыўляць, а яму даспадобы маска смерці. Мне б вельмі хацелася верыць, што гэта не так. Я пільна сачу за сучасным творчым працэсам у краіне. Мне гэта цікава. І я бачу на алімпе шмат таленавітых, творчых і, галоўнае, неабыякавых людзей. Асабліва радуе, што сярод іх шмат моладзі. Гэта значыць, што ў беларускай літаратуры ёсць будучыня.

***— Прагрэс не стаіць на месцы, і Інтэрнэт усё напорыстей урываецца ў жыццё чалавека. Ці важна ў наш час пісьменніку прысутнічаць там? Я маю на ўвазе ў першую чаргу творы.***

— Важна. Сеціва — гэта тая незалежная пляцоўка, дзе кожны можа разлічваць, што яго абавязкова пачуюць. Безумоўна, калі мы і нашы думкі адметныя і цікавыя іншым.

***— Мяркую, што амаль для кожнага пісьменніка яго літаратурная творчасць — гэта не проста захапленне, гэта частка ягонага жыцця, калі не само жыццё. Але калі гэта так, то павінна быць месца і для нейкага хобі. Чым захапляецеся Вы?***

— Акрамя літаратуры, я захапляюся яшчэ музыкай. Яна займае ў маім жыцці адмысловае месца. Калі шчыра, ёй я надаю куды больш увагі, чым літаратуры. Музыкай прасякнута і ўся мая творчасць. У некаторых творах яна нават выступае ў якасці галоўнай гераіні. Адкуль такая любоў? Лічу, гэта геннае. Бацька мой быў вясковым музыкантам, у маці таксама быў някепскі голас, і сёстры мае спяваюць. Думаю, калі б у дзяцінстве мне выпала магчымасць навучацца ў музычнай школе, жыццё б маё склалася інакш. Безумоўна, я стаў бы прафесійным музыкантам. Болей таго, я, напэўна, пісаў бы музыку. Якой бы яна была па жанру? Не ведаю. Толькі не бардаўскай. Магчыма, я б захапіўся класікай, а магчыма, пачаў бы пісаць нешта ў стылі нью-эйдж.

***— Алесь, у дзяцінстве мы ўсе марым, але, на жаль, вельмі рэдка нашы мары становяцца рэчаіснасцю ў дарослым жыцці. Ці спраўдзілася Ваша дзіцячая мара?***

— Мая дзіцячая мара не збылася. Мне хацелася стаць капітанам. У мяне нават матроска і бескозырка была з лентамі і надпісам «Балтыйскі флот». На жаль, пасля заканчэння школы я скончыў тэхналагічны інстытут, атрымаў дыплом інжынера лясной гаспадаркі і дзесяць гадоў баразніў бязмежныя абшары «зялёнага мора».

***— У гэтым годзе Вы адзначылі юбілей. 55 год — дата паважная. За гэты час, напэўна, усталяваліся нейкія жыццёвыя прынцыпы. Ваша творчае крэда і дэвіз жыцця — ці супадаць яны?***

— Я перакананы, што ў кожнага з нас павінен быць свой любімы занятак. Чалавек без занятку — небяспечны чалавек. Мой любімы занятак — творчасць, якая для мяне ёсць найперш барацьба са злом, не з тым вонкавым, якога праз край у грамадстве, а з тым унутраным, глыбока схаваным у кожным з нас. Мой дэвіз: чалавек — сам сабе творца. Са сказанага выцякае, што маё творчае крэда і жыццёвы дэвіз супадаюць.

**Гутарыла Наталля Кандрашук**

ВЕРШЫ

# З ЛЁГКІМ СНЕГАМ!..

Васіль ЗУЁНАК



Фота Э.Акуліна

***

*У пыл пераціраюцца шляхі.*
*А кожны з іх — адным жыццём не змерыць.*
*Глядзіць жыццё: «Грахі мае, грахі…»*
*Чакае смерць: хутчэй бы іх праверыць…*

*А паміж імі — вечны чалавек:*
*Як я, як ты, — жывы, але смяротны.*
*І кожны грэх — як неўміручы здзек,*
*І кожны грэх — спакусна-незваротны…*

## З лёгкім снегам!..

*На палку дубовы венік*
*Шчыраваў —*
*Ад грудзей і да каленяў*
*Цалаваў!*

*Дух у каменцы — звер зверам, —*
*Якатаў,*
*Вырываў з завесаў дзверы,*
*Дол хістаў.*
*І агнём каранаваны —*
*Бегма зух*
*Нёс ушчэнт зацалаваных*
*Маладух.*

*А насустрач — ахалонаць,*
*Сцерці медзь —*
*Сам сумёт іх браў на ўлонне,*
*Як мядзведзь.*

*Маладзік брывом юначым*
*Бліскацеў,*
*Як пабачыў шал гарачы*
*Гнуткіх цел.*

*А пакінуў на прыкмеце*
*Стан адной:*
*Як русалку ў срэбнай сеці*
*Снегавой.*

*Зноў парыльшчыцы нырнулі*
*Ў цеплыню,*
*А яна ў падскокі-гулі —*
*Ажно іскры сыпанулі, —*
*Як з агню!*

*Смешкі коцяцца на сцежку, —*
*Ды не схопіш: не купіў!*
*Стан бялее, а ў прамежку —*
*Быццам хтосьці чорнай снежкай*
*Уляпіў!..*

## Пясочны гадзіннік

*Гадзіннік пясочны —*
*Станік жаночы,*
*Перахоплены, як нітачкай, —*

*Па-жаночы*
*Час адлічвае.*

*За хвілінаю хвілінка —*
*У пясок,*
*За пясчынкаю пясчынка —*
*У гадок.*

*Праз націнку*
*Час бруіцца,*
*Прасыпаецца, —*
*Як з дзяўчынкі*
*Маладзіца*
*Прачынаецца.*

*А праз пяць хвілін —*
*Праз пяць! —*
*Перавернецца*
*І малінкаю з малін,*
*Як у сорак пяць —*
*Не хвілінак,*
*А гадоў, —*
*Баба ягадка ізноў!*

*Зноў дзяўчынка*
*З маладзіцай —*
*Зноў! —*
*Спрачаюцца:*
*Дзе той мусіць час*
*Спыніцца,*
*Дзе ён пачынаецца?!.*

*Долю высочвае*
*Стварэнне пясочнае…*

## Лыжня

*Лыжня ілжывая*
*З лясной нажываю:*
*Бяжы, бяжы —*
*У міражы.*
*Бяжы па следзе —*
*У маладосць.*
*За лесам недзе*
*Шчасце ёсць.*

*Вядзе, заве —*
*Не знае жалю,*
*Бо не мяне:*
*Лыжня —*
*Чужая.*

*Імчыць*
*Лыжня —*
*Як успамін.*
*Маўчыць*
*Лыжня —*
*У сэрца клін.*

## З-пад зямной бярозы…

*Гэта я… — ці не пазналі, зоры? —*
*З-пад зямной бярозы гавару, —*
*Вечнасцю закінуты ў прастору*
*На паслугі часу-ліхвяру.*

*Не, яна яшчэ не над магілай —*
*Вецце нахінае над страхой*
*Сноў маіх і думак берагіняй,*
*Патаемкай у журбе ліхой.*

*Гэта яшчэ толькі іх сяброўка,*
*Тых бяроз, над смуткам векавым,*
*І мой голас толькі трэніроўка,*
*Тэст: ці пагаворыце з жывым?*

*Ці не прыадчынеце заслону:*
*Як я з вамі буду побач жыць —*
*Па нябесных ці зямных законах*
*Тую службу вечнасці служыць?..*

*Ці яе — без часу і прасторы —*
*Можа, і няма, і не было, —*
*І дарма на роспыты й на зборы*
*Дзівака зямнога павяло?..*

*Бо якая ж вечнасць без бярозы,*
*Без шпака і, зрэшты, без мяне, —*
*А такая ёсць усё ж пагроза:*
*Я не я, як песня абміне…*

*Што і як у вас цяпер? А потым,*
*Калі я прыйду, — што будзе там?*
*Ці паўсюль — маўклівыя пустоты?*
*Ці паўсюль — усесусветны храм?..*

*Ці прастора часу ў вас не мае,*
*Ці ў прасторы час згубіў сляды?..*
*Маўчыць… Ну што ж, я пачакаю…*
*Ды й спяшацца мне няма куды…*

***

*Калі на ўбытак месяц пахіляўся,*
*Штораз скрылёк танюткі ў цень хаваўся.*
*Так поўні і маёй наканавана*
*У цень сыходзіць з сонечных экранаў, —*
*Пакуль не застанецца горкі ветах —*
*Як развітанне з незваротным светам.*

*Сярпом тупым ён век мой дажынае,*
*І горш за ўсё, што я ўсё гэта знаю.*
*Бо маладзік у месяца настане,*
*А мой — не ўзнае новага вяртання.*
*Таму й гляджу самотліва на поўню*
*І ў светлы маладзік пра ветах помню…*

***

*Маска, я цябе знаю! —*
*І люблю, і кляну —*
*Не развеешся снамі,*
*Не збяжыш у труну.*

*Як сябе ні выкручвай —*
*Знак гарыць на ілбе.*
*Як табе ні балюча —*
*Знаю ўсё пра цябе.*

*Чым жывеш і чым грэшная,*
*Дзе нявінных судзіла,*
*І хвалою пацешнаю*
*Каму дагадзіла…*

*Дзе на продаж схіляеш*
*Гонар свой ліхвяру… —*

*Маска, я цябе знаю… —*
*Сам сабе гавару…*

***

*Калі ўсё тое здарыцца —*
*О, каб жа ды знацце!.. —*
*Я б з кожным з вас па чарачцы*
*Узняў за небыццё —*

*За ўласнае, за вечнае, —*
*Не ўнікнеш жа яго,–*
*Каб не чапляць на плечы вам*
*Груз адбыцця свайго.*

*І словы ўсе апошнія*
*Я, пэўна б, сам сказаў, —*
*Няйнакш, як зняў бы пошліну,*
*Што сам жа й навязаў…*

*Ну, і яшчэ па поўненькай —*
*За грэшную душу —*
*Усіх з маім ахоўнікам —*
*Па поўненькай! — прашу!..*

*Дальбог, пакуль не пляснула*
*Жалобнай хвалі медзь,*
*Як вып'е Юда ўласны мой —*
*Цікава паглядзець!..*

*А што не ўспеў патрэбныя*
*Ён выведкі прадаць —*
*Я маю трыццаць срэбнікаў,*
*Каб зажыва аддаць.*

***

*Млечны Шлях, дарога скразная, —*
*Ні канца не відно, ні пачатку:*
*І адкуль, і куды ён — не знаю,*
*Толькі тайную маю здагадку.*

*Гэта ён падказаць, пэўна, хоча*
*Мне — смяротнаму чалавеку:*
*«Не насільвайся рыфмай прарочыць,*
*Прамаўляй для сябе — не для веку.*

*Сам з сабою ідзі на споведзь.*
*Гэта звабна — агучваць зоры,*
*Ды з табой мы — імгненная повязь,*
*І няма ў ёй ні заўтра, ні ўчора.*

*Што зямны твой наіўны наступ! —*
*Сам пазнаць я не блаславёны*
*Зор маіх усясветны насып, —*
*Сам не ведаю іх імёнаў.*

*Адкрывай сябе даастатку —*
*Тым бліжэй да майго парога.*
*Абыякавасць зор — не загадка, —*
*Гэта дум незямных дарога…»*

## О, як бы…

*О, як бы верш мне напісаць*
*Аб вечным шчасці*
*І па крывіначцы раздаць,*
*Як на прычасці, —*

*На ўтыль адразу б рыфмы здаў,*
*Сціло — тым болей:*
*Няхай бы іншы спавядаў,*
*А мне — даволі!..*

***

*Мне кожны дзень амаль як родны брат.*
*Што ні даю — усё бярэ з ахвотай.*
*А наўзамен, нібы чуллівы кат,*
*Ён зычыць мне вяроўку з пазалотай.*

*Ён пакідае мне на ўсё правы:*
*Сам разбірайся і лічы правіны,*
*І сам сябе судзі, пакуль жывы…*
*Жыву: злачынца з катам — сам-адзіны…*

*Штоночы тайны чорнае крыло*
*Над допытамі сны мае гайдае…*
*Я знаю ўсё: што будзе, што было,*
*А вось што ёсць — ніяк не разгадаю.*

## Будучыня

*Гісторыкі сцвярджаюць:*
*Спазніўся мой народ*
*Здзяржавіць на скрыжалях*
*Свой шлях і радавод.*

*А я гляджу іначай:*
*А што, хіба крывіч*
*Нам крэўнасць не пазначыў*
*У храмах на крыві?*
*Ці не крышыў радзіміч*
*Прышэльцаў на жарству,*
*Не шанаваў Радзіму,*
*Не мацаваў Літву?*

*Ці дрыгавіч-балотнік*
*Лёс у дрыгве праспаў?..*

*Не! — край мой не гаротнік —*
*Мой край з вякоў паўстаў.*

*Народ мой старажытны —*
*І волат, і ратай, —*
*І з ворагам быў квіты,*
*І даваяраў братам.*

*Ні ў кога, апроч нівы,*
*Ён хлеба не прасіў…*
*Ды юную наіўнасць*
*Заўжды ў душы насіў.*

*Па славу на скрыжалях*
*Не шастаў да багоў, —*
*Таму й параскрадалі*
*Гісторыю ў яго.*

*Цяпер — цяпер з братамі*
*Мужуе пакрысе —*
*Гісторыю вяртае,*
*Ды аддаюць не ўсе…*

*Ну што ж, мы не з драпежных,*
*Але зважай, сусед,*
*Што нас да ўласных сцежак*
*Вяртае запавет.*

*Яшчэ не вечарэе —*
*Узвесняцца грамы! —*
*Бо памяць не старэе,*
*А разам з ёй і мы.*

*І не ў чарзе па труны*
*Мы ў вечнасці стаім:*
*Народ мой самы юны,*
*І — будучыня з ім!..*

АПАВЯДАННЕ

# ЛЯ КРАЮ

Віктар СУПРУНЧУК



Фота з архіва аўтара

Зранку нешта круцілася ў паветры. Яно абрынулася на галаву, на душу. Было адчуванне, нібыта на цела апусціўся камень. І ён спакваля цісне, цісне да зямлі, няма сіл скінуць яго…

Слабое цьмянае сонца выглядвала праз аблокі і расцякалася ўваччу фіялетавай плямай. Гукі вуліцы, горада былі глухія, быццам гаману шматлікіх аўтамабіляў забіраў у сябе магутны фільтр, якім накрылі ўвесь горад, усё наваколле.

…Сцяпан адышоў недалёка ад свайго дома. Цяжка дыхалася. Так з ім яшчэ ніколі не было. Ён прыпыніўся, агледзеўся: на стадыёне, радасна галёкаючы, бегалі з мячыкам дзеці, па тратуары гулялі маладыя маці з каляскамі, пад дрэвам мужчыны з ягонага пад'езда дзялілі бутэльку віна. Усё было як звычайна, толькі ён адчуваў сябе не так, як учора, пазаўчора, тыдзень назад. Узнік цяжар у грудзях, і Сцяпан падумаў: няйнакш сэрца? Хоць, здаецца, ніколі не балела. Валідола з сабой у яго не было: ні разу не меў у ім патрэбы.

У душы нарастаў неспакой, нават страх. І раптам Сцяпан успомніў, як некалі, гадоў дваццаць назад, галоўны інжынер іхняга праекта дзяліўся з імі, маладымі хлопцамі пасля інстытута, сваім жыццёвым вопытам: «Калі, не дай Бог, прыцісне сэрца, трэба глынуць грамаў сто гарэлкі. Паверце: самае надзейнае лякарства».

Крама была недалёка. Сцяпан памалу дацягнуўся да яе і купіў бутэлечку гарэлкі. На святы ён піў толькі чырвонае віно, хоць яно і здавалася кіслым, нясмачным. Адышоўшы трошкі ўбок за куст бэзу (з думкай, што робіць, нібы апошні алкаголік) Сцяпан заплюшчыў вочы і з цяжкасцю выпіў пякучку.

У галаве адразу зашумела, забалела патыліца. Ён ледзь не выпусціў з рукі сумку, пастаяў, такі пачуўшы ад нейкай жанчыны, што ад п'яніц і алкаголікаў паратунку няма. Яму хацелася нешта сказаць у сваё апраўданне, але адняло мову. У галаве мітусіліся думкі, цяжар на плячах, які спярша зменшыўся, цяпер раптам павялічыўся.

Сцяпан, чапляючы нагу за нагу, пайшоў па дарозе, нават не ўяўляючы, куды ідзе. Сонца зусім знікла за бясконцым палатном аблокаў. Вакол быў шэры колер, які зрэдзь рассякалі чырвоныя іскры. Ля дарогі расло высокае, да самага неба, дрэва, вельмі тоўстае. Абысці яго Сцяпан не здолеў...

Ён ачуўся гэтак жа раптоўна, як і страціў прытомнасць. Пад ім — быццам мяккая пасцель, пахне травой. Сцяпан правёў рукой збоку ад сябе. Так, гэта была трава. Ён ляжаў на траве пад дрэвам ля дарогі, па якой ехалі машыны, ішлі людзі.

— Глянь: алкаш ляжыць! — да Сцяпана падышлі два хлопцы гадоў дваццаці-дваццаці пяці.

— Але ж пры гальштуку, і касцюм неблагі. Гэй, мужык! — крыкнуў яму амаль у вуха чарнявы, у дарагіх джынсах і жоўтай скураной куртцы. Сцяпан паспрабаваў таксама крыкнуць, што яму кепска, але не было моцы адкрыць рот. Ён адчуў, як чужая рука палезла ў ягоны пінжак і выцягнула кашалёк, убачыў, як грошы знікаюць у кішэні чарнявага.

Яны агледзелі і сумку, у якой ляжалі бутэрброды, пашпарт і ўчарашнія газеты. На шчасце, пашпарт не забралі, кінулі пад ногі Сцяпану і пайшлі, задаволена смеючыся, што на халяву будзе ім сёння рэстаран.

«Свалата, поскудзь. Яны ж маладыя, як сыны… Мова ў іх інтэлігентная, не бамжы… Гэта такое новае пакаленне. Грошы, грошы… Каб вы паздыхалі ў гэтым рэстаране… Хто вас выхаваў, такіх пачвараў? Якія ў вас… Хто ў вас?.. Грошы?.. Свалата, поскудзь…»

Здалося, проста на яго кацілася дзіцячая каляска, якую штурхала маладая маці, а побач з ёй ішла пажылая. Мабыць, бабуля. Яны на хвіліну прыпыніліся ля Сцяпана.

— Зранку ўжо набраўся, — абурылася пажылая жанчына. — Каб яны ўсе паздыхалі, гэныя алкаголікі! Няма ад іх спасу.

— Навошта ты гэтак, мама? — перапыніла маладая. — А мо, чалавеку блага? Бач: у касцюме, пры гальштуку…

— Яны цяпер усе алкашы: пры гальштуку і без гальштука, — адрэзала бабуля. — Няма на іх Сталіна, няма.

Сцяпан чуе, пра што яны гамоняць, але адказаць не можа. І такая ў яго крыўда на душы — здаецца, заплакаў бы. Ён гэтым цёткам сказаў бы, чаго яны самі вартыя. І пажадаў бы ім гэтак жа калі-небудзь легчы ля дарогі… У старой, у самой, чырвоны, бы бурак, азызлы нос. Няйнакш цішком ад дачкі папівае чарніла ў туалеце альбо ў ванне. Бачыў ён у сваім жыцці такіх праведнікаў. На словах адно, а ў шкарлупінні зусім іншыя…

Ён не мог такое прысніць нават у страшным сне. Каб хтось са знаёмых сказаў, што ён, Сцяпан Іванавіч Далецкі, кандыдат навук, выкладчык інстытута, будзе ляжаць у траве ля дарогі, — не дараваў бы таму, рукі б больш не падаў. А які сорам!.. Даведаюцца калегі, жонка, дзеці. Як будзе глядзець ім у вочы? Яго так любіць дачушка Алёнка, а ён? Дванаццацігадовы сын Паўлік лічыць бацьку ледзь не героем, таму што Сцяпан у студэнцкія гады шабашыў на Калыме. Божа ж, мой Божа… Відаць, гэта пакаранне яму за грахі. Каб лёг ён тут, ля дарогі, і ніводны чалавек не прыйшоў на дапамогу. Значыцца, заслужыў. Заўсёды ўяўляў сябе дужым, адважным, самым разумным. Ён нібыта дасягнуў вышынь, узяў Бога за бараду. Кандыдат навук, напісаў некалькі падручнікаў. Ну і што? Ці мала такіх людзей у горадзе? Дый ці любіў ён каго-небудзь, акрамя самога сябе. Некалі было вялікае каханне. Пасля інстытута ён амаль тры гады пражыў з Галінай, Галачкай. Яна ўсё яму лепшае: мяса, новы касцюм, імпартнае паліто. Як жа ж, яе каханы — аспірант, будучыня навукі, пахваліў сам дырэктар інстытута. Галя баялася кашлянуць у ягоны бок: хто яна — майстар цэха, а ён — вучоны, свяціла!

Яна нарадзіла дзіця, і Сцяпан нават не пайшоў забіраць яе з бальніцы. З Галінай кватэры перабраўся на прыватную да бабулькі, у якой была ўнучка — ягоная цяперашняя жонка Марыля. Больш Галіну Сцяпан не бачыў, баяўся, каб раптам не паскардзілася ў парткам… Апошнім часам яна пачала яму сніцца. На руках маленькая дзяўчынка, якая плача і кліча яго: «Тата, тата, дапамажы мне…»

Яму балела сэрца, штурхала кроў з перапынкамі, то хуткахутка, то зусім марудна. Здаецца, вось-вось спыніцца. І тады — канец. Край дарогі, чужыя людзі… Мо знойдзецца ва ўсім свеце хоць адна спагадлівая душа, якая выкліча «хуткую дапамогу»? А што «хуткая дапамога»? Летась у іхнім інстытуце па выніках года праходзіў справаздачны сход. Доктару навук Яцэвічу зрабілася блага. Як-ніяк семдзесят пяць гадоў. Сцяпан сам выклікаў «хуткую». Ад станцыі «хуткай дапамогі» да інстытута пяць хвілін язды. Яны прыехалі праз пяцьдзясят, калі Яцэвіч ужо схаладнеў…

Шумела дрэва, раз-пораз крэкчучы пад націскам ветру. Сыпануў густы порсткі дождж, які абмыў Сцяпанаў твар, намачыў валасы. Стала лягчэй дыхаць. З вачэй знікаў туман. Сцяпан паварушыўся, падумаў узняць галаву. Аднак было боязна. Каб не страціць прытомнасць. Колькі ж тут яму яшчэ ляжаць?

Сцяпан пачуў, як побач спынілася машына. Цяжкія крокі, гамонка з мацюкамі. Ён павярнуў галаву: да яго ішлі два мажныя, высокія міліцыянты. Патрэсквала рацыя.

Вось і дачакаўся. Што рабіць цяпер? Як падняцца з зямлі, ці хоць адпаўзці ад дарогі і схавацца, як ваўку ў гушчар, у кусце бэзу за чырвоным цагляным домам?

Міліцыянты падышлі, абыякава агледзелі яго.

— Наш кліент, — сказаў сяржант прапаршчыку. — Давай уставай! — ён нагой, небалюча, але адчувальна, ляпнуў у бок Сцяпану. — Што мы яго — насіць будзем? Уставай, зараза! Яшчэ гальштук нацягнуў. Відаць, каб зручней ляжаць было. Гы-гы-гы, — зарагатаў, рэзка хапаючы рукой за плячо. Ад пранізлівага болю ў Сцяпанавых вачах мільгнула маланка. Ён адчуў, як задрыжэлі ногі, скаланулася ўсё цела.

Праз імгненне Сцяпан стаяў, абапершыся спінай аб дрэва, і няўцямна глядзеў на міліцыянтаў. Яны падабралі ягоную сумку, пашпарт.

— Давай, пайшлі ў госці, — махнуў галавой прапаршчык. — У нас будзе табе цяплей і мякчэй.

Яны зноў засмяяліся, здаровыя, задаволеныя жыццём. Відаць, што не жывуць на адну зарплату. Харчуюцца не так, як ён, сухімі бутэрбродамі з таннай кілбасой і гарбатай. Жываты наелі, пысы чырвоныя. Правільна, у калгасе на трактары за капейкі зямлю араў бы, а тут… Гаспадары жыцця… Свалата… Сцяпан уздыхнуў, адчуваючы, як страх яшчэ мацней, здаецца, пранікае ў кожную клетачку, і нечакана для самога сябе загаварыў:

— Я захварэў, мне баліць сэрца. Мне кепска, вельмі кепска…

— Таму напіўся гарэлкі і прылёг ля дарогі, — здзекліва прамовіў сяржант. — Не дуры галавы, пайшлі ў машыну, бо зараз пачастую дземакраткай, — узмахнуў ён дубінкай. — Няма часу з табой валэндацца…

…Нібы ўчора гэта было. Ён з Васілём Карповічам і Генадзем Кузьміцкім сядзяць у кафэ. Атрымалі прэмію за распрацоўку новай тэхналогіі. Узялі каньяку, шашлык, салатаў. Размова, як заўсёды, аб рабоце, хто разумнейшы, больш таленавіты. Маўчыць Васіль. Пасля чацвёртай ці пятай чаркі расказвае, што тыдзень назад вяртаўся дамоў нападпітку і на аўтобусным прыпынку да яго прычапіліся міліцыянты: маўляў, п'яны. Зацягнулі ў аддзяленне. Магло не быць ні прэміі, ні працы, калі б паперу накіравалі ў інстытут. Дапамог знаёмы маёр міліцыі, зямляк з вёскі, які яго вызваліў. Дапамога абышлася Васілю ў тры бутэлькі гарэлкі і палку кілбасы.

— Шаноўныя таварышы міліцыянты, хвіліначку, — сказаў Сцяпан. —Мяркую, вы ведаеце палкоўніка Акінчыца з гарадскога ўпраўлення ўнутраных спраў? — Ён нечакана ўспомніў, як два гады назад быў на дні нараджэння ў сябра дзяцінства Міколы Разумовіча і там сядзеў з гэтым палкоўнікам побач за сталом. Яны тады добра пагулялі, павесяліліся. На развітанне палкоўнік, ледзь стоячы на нагах, мо дзесяць разоў паўтарыў: «Слова палкоўніка Акінчыца для кожнага міліцыянта ў сталіцы — закон!»

— Ну і што? — прапаршчык адпусціў правую Сцяпанаву руку. — Ведаем, канечне, палкоўніка Акінчыца. Ён нам — не начальнік. У нас ёсць свой камандзір. Што нам ваш Акінчыц? Ён хутка пойдзе на пенсію.

— У мяне недзе тут ягоная візітоўка, — Сцяпан палез у кішэню, хоць ніякай візітоўкі там не было. — Зараз я яму патэлефаную…

Прапаршчык адышоў убок, аб нечым пагаварыў па рацыі, потым задуменна паглядзеў на Сцяпана. Нечаму свайму ўсміхнуўся і гукнуў:

— Мікалай, паехалі, тэрміновы выклік!

Яны перазірнуліся і пайшлі да машыны. Сцяпану адразу стала радасна, і страху як не было. І ён у нейкай незразумелай самому эйфарыі, што яго не забралі ў выцвярэзнік, што настолькі магічнымі аказаліся словы «палкоўнік Акінчыц», гукнуў услед міліцыянтам, каб падвезлі да бальніцы ці, край, у паліклініку. Сяржант памахаў кулаком, і яны з'ехалі, пакінуўшы Сцяпана.

…Недзе блізка зараўла сірэна. Усё гучней, гучней. Ужо зусім побач. «Вось і мой паратунак, — падумаў Сцяпан. — Можа, яшчэ паспею на працу… Хоць якая цяпер праца… Застацца б жывым…»

Белыя халаты рухаліся да яго нетаропка. З імі прыспешвала, спатыкаючыся бабулька. Яе доўгія сівыя валасы разбэрсваў вецер. Яна махала рукой на Сцяпана і нешта гучна гаварыла. Слоў было не разабраць.

Белыя халаты былі ўжо ля яго. Маладая жанчына, прыгожая, але са стомленым тварам, нахілілася да Сцяпана:

— Фу, фу!.. Ён п'яны, як свіння! Налізаўся зрання. Тут нашая дапамога непатрэбна. Паехалі!

— А, можа… — уставіла свае пяць капеек яе напарніца.

— Паехалі! — паўтарыла. — Нармальных людзей трэба ратаваць. Гэты дзядзька яшчэ сто гадоў пражыве.

— Дык ён жа — не п'яны! Ён жа хворы! — закрычала бабулька. — Людцы, што гэта такое!.. А калі быў бы гэта мой сын…

— Ладна, забіраем, а пасля — у міліцыю, — рашуча прамовіла прыгажуня.

Сцяпан сяк-так даклыпаў да «хуткай дапамогі», ускараскаўся на сядзенне. У вачах яшчэ плыло, але ён адчуваў ужо сябе значна лепш. «Навошта яму ў бальніцу? Дамоў… Толькі дамоў! Свалата…»

— Падвязіце мяне дамоў, — папрасіў ціха, але яго не чулі. — Падвязіце мяне дамоў… — закрычаў ён. — Тут побач… Не трэба ў бальніцу. Вось за той дом. Мне ўжо лепш…

Калі Сцяпан, хістаючыся, падымаўся на ганак, ля дома на лавачцы сядзелі некалькі мужчын, вясёлых, расчырванелых. Было відаць, што падзялілі ўжо не адну бутэльку віна.

— Бач ты, малайчына, прафесар! Казалі, не п'е…

— Ага, не п'е. Ён такі ж, як і мы, як і ўсе, толькі пры гальштуку і ў касцюме.

— Бач, ледзь ногі цягне.

— Маладзец, прафесар! У нашай краіне ўсе п'юць. Усе мы роўныя, аднолькавыя. Мы ходзім у адным статку і ў нас адзін пастух… Так і кажы сваім студэнтам…

«Свалата… Вам што да маіх студэнтаў… Яны — людзі, не такія, як вы… Здаецца… Не такія… Што за час?.. Якія людзі?.. Які я?.. Божа ж, мой Божа...»

— Ай, малайчына, малайчына! Не перажывай: заўтра палечымся…

Так, на жаль, ён, як усе… Як усе, як усе… Як усе… Толькі б дайсці да дзвярэй, да дзвярэй кватэры… Ён, як усе… Усе… Дайшоў… Дайшоў…

Назаўтра, раным-рана, баючыся спаткаць каго-небудзь з суседзяў, Сцяпан выскачыў з дому. Здавалася, нехта вось-вось скажа штосьці агіднае, крыўднае. Але ніхто на яго не звяртаў увагі. Ён нікому не быў патрэбен. Усе былі заняты сваімі справамі, сваімі праблемамі.

Па дарозе да аўтобуснага прыпынку ледзь не наступіў на мужчыну, які раскінуўшы рукі і ногі, ляжаў на тратуары. Сцяпан абышоў яго, проста інстынктыўна грэбліва плюнуўшы, і нават рукі выцер аб насоўку. Што яму да гэтага чалавека: п'яны ён ці хворы. Ён, Сцяпан Далецкі, — такі ж, як амаль усе… Божа ж, ты, мой Божа…

ВЕРШЫ

# E2 — E4

Зміцер ВІШНЁЎ

Фота з архіва аўтара

***

***Прысвячаецца Тадэвушу Рэйтану***

*не пі — будзеш козлікам*
*кожны памятае з дзяцінства*
*не забывайся на спадчыну — будзеш вослікам*
*бясспрэчны лозунг ліцвінаў*

*цвіль на маіх далонях*
*перапаўзае быццам лахнесскае дзіва*

*дзідай кіну ў ворага*
*рагаты чорт паскача конем*

*б'ецца сэрца ў грудзях параненым*
*зверам-поні*
*веру ў перамогу вечнага*

*пырскі дажджу кладуцца на твары*
*высушваюцца слёзы стагоддзяў у творах*
*варта ў дарогу*

*крок за крокам будзем рушыць*
*да слаўных перамог*
*грукатам ног і молата*
*шок — для чорных ваўкоў*

*раструшчым шыхты чужынскіх волатаў*

**18 жніўня 2013, Грушаўка**

## [лектарацыі бягуць у Баранавічы]

*холад як плед*
*голад як хлеб*
*перад вачыма дзед*
*на ягоным плячы — змеяед*

*чырвоныя вяроўкі*
*чорная гарбата*
*калючае горла*
*горныя акрабаты*

*пазіраю на моцных канатаходцаў*
*раздумваю пра паэтычныя опцыі*

## [напярэдадні сонечных бураў]

*Галубы*
*да палубы прымацоўваюць трубы*

*трупы*
*магчыма таксама труны*

*таемныя руны*
*ртуць перацякае на раны*

*нары*
*не лепш за жабрацкія норы*

*бяру нож*
*рэжу кавун наўсцяж*

*дождж*

**21 жніўня 2013**

## [слодыч грыбной мовы]

*канцэптуальны грыб*
*галюцынагенны грыб*
*амаль фантастычнае ЛСД*
*слухаю музыку ДДТ*

*давайце танчыць!*
*давайце танчыць!*

*грыб — гумовыя рыбы*
*пластыкавыя рыфы*
*віртуальны гамак*
*на дэсерт — феерычны мак*

*давайце танчыць!*
*давайце танчыць!*

*канцэптуальны грыб*
*гэта — у голаў штык*
*гэта — файны штрых*
*гэта — проста брык*
*гэта — танец-фрык*
*гэта — штонікі-штроксы*
*ў кветачкі флоксы*

*давайце танчыць!*
*давайце танчыць!*

*падаем на дно!*
*на самае самае самае*
*сомам*
*словам*

*у паветры волава сола*
*слодыч грыбной мовы*

**17 жніўня 2013, Грушаўка**

## Ад Карабаса Барабаса

***(для дзяцей, якія перашкаджаюць на пленэры мастакам)***

*свісток — у зубы*
*у рукі — базуку*
*усім разысціся!*
*вас іст дас?*
*мастацву патрэбны ціхі час!*
*чыстае сіняе неба!*
*і пакунак цукерак!*
*той, хто не збег, — той вораг!*
*і тады на стале вараны насарог!*
*зараз сядаю ў танк!*
*я не мастак — я панк!*
*усім разысціся — фак!*
*вядзьмару на раз, два, тры — факт!*
*выцягваю з-пад стала чароўную катрынку!*
*выпіваю злосную малочную скрынку!*
*УСЁ — ІДУ!*

*(друіды цягнуць з вадой бітон)*
*іду гуляць у бадмінтон*

**16 жніўня 2013, Грушаўка**

***

*з бліскучым німбам над галавой*
*трушчыш кабінеты чыноўнікаў рукой*
*кідаешся чорнай халвой*
*а калі на небе бахне навальніца феерверкам*
*і распусціцца чырвона-жоўтай кветкай*
*разам з паўночным калючым ветрам*
*выплюнеш джала на два метры*

*надыходзіць разуменне*
*што ты — звычайная хімера*
*у апельсінавых гетрах*

**26.05.2013, Ворша**

## E2 — E4

*серпанцінамі раскручваюцца дарогі*
*спружынамі скокаюць дрэвы*
*спіралямі едуць машыны*
*хмары набываюць формы пірацкіх фрэгатаў*
*ты выпрастаў руку серпам — па ёй збягае*
*злая гіена*
*(раздумваеш пра сезон, пра дождж, пра*
*скрадзеную фуру)*
*з усходу ідзе посвіст салаўя-злачынца*
*што выклікае буру*
*(у нататніку запісваеш дыягназ*
*пацыента: «гангрэна»)*
*з захаду куляюцца цацачныя напалеоны і*
*ператвараюцца ў какосавыя пірожныя*
*какафонія-какаін*
*сімфонія-кокан*
*сканаў сюррэалістычны фон*
*на кардон наклеілі супрэматычны*
*партрэт фон барона*
*летні ўраган у высакосны год абяцае*
*фіялетавага бульдога*
*у аўтобусе — усе грызуць з сабакі смачныя*
*хот-догі*
*скажам гучна кіроўцу вясёлае:*
*«Буль! Буль! Хочам грога!*
*Гары гарам дарога! З гары е2 — е4 — ахвота!»*

**26 траўня 2013, Забалацце**

***тут некалькі радкоў, якія праплываюць перад тварам паэта і ствараюць какафонію жыцця і сімфонію суму ў кубку для гарбаты***

*часам дрэвы міргаюць нібы дарожныя*
*светлафоры*
*чалавек у форме рухаецца на фронт*
*паміж небам і зямлёй пампуецца стронцый*
*гайдаецца песня над жоўтым полем*

*плюхаецца сонца ў начным кацялку*
*пасыпай яго расцёртымі сухарамі*
*пасыпай яго перцам*
*пасыпай яго грыбной і часнычнай пудрай*
*палівай радаснымі аповедамі пра дзяцінства*
*трушчы над ім успаміны ветра*

*сам насам абудзі верхавіны кучаравых дрэваў*
*рэкі змеямі аплятуць навакольную прастору*
*крыкі птахаў як нешта*
*патаемна-рыцынавае*
*крокі крокі кропкамі пульсуюць на*
*серабрыстых сопках*
*але запаленыя вусны вайскоўца адліваюць*
*змрочным крывавым лакам*
*ён разгрызае горкія цукеркі пад назвай*
*«салёны ласун»*

*пальцы пальцы цягнуцца да клавішаў*
*фартэпіяна*
*пальцы выцягваюцца ў нерэальныя*
*бялюткія кіўбаскі*
*і вось яны ўжо ператвараюцца ў*
*струны-спагеці*
*піяніст засмоктвае гэтую ежу з апетытам*
*і прымушае дадзены краявід набрыняць*
*музыкай*
*што грыміць бубеньчыкамі пад абцасамі*
*з падкоўкамі*

*часам чалавек адпраўляецца на вайну*

**9 сакавіка 2013**

## Марфалогія чалавека

*— Куку, — сказала ружовая галава. — Я прыйшла да вас у госці. Налівайце мне спірту. Давайце пупырысты хрусткі заінелы агурок. Я буду адрыгваць быццам паравоз дымам. Але самае галоўнае, што я буду вас кантраляваць. Спірт — увесь мне! Каб у вас не ўзнікала спакусы напіцца, не шкадуйце — налівайце! Залівайце! Вось у вас стаіць цудоўны алюмініевы кубак — плёскайце туды чарадзейную вадкасць! «Куку», — і прыйшоў кірдык вашай нелегальнай каністры. Кірдык кантрабандзе. Паленага напою тут няма. Тут ёсць ружовая галава. Яе можна падкідваць накшталт футбольнага мяча, займацца гульнёй у валейбол, можна згадаць і боўлінг. Дзякаваць богу, паўсюдна процьма пустых пляшак з-пад піва. Ёсць куды кідаць шар галавы. Але «куку» можа быць значна горшым за патрабаванне алкаголю. «Ружовае куку» нічым не лепшае за «чорнае куку», а калі цябе напаткае «экалагічнае зялёнае куку», можна і загнуцца.*
*Галава зашпіліла нашыя дзверы ў вагоне — нам няма выратавання; мы не выйдзем у Менску — давядзецца ехаць да сонечнай Караганды. Ты падрыхтаваны? Ці трэба зрываць стоп-кран?*
*«Куку» — і хтосьці пстрыкнуў курком пісталета. Чуеш? А язык галавы нагадвае заліўное на талерцы. Ножык даць? Дадаць перцу і солі? Думаеш такія галюцынацыі могуць напаткаць пасля грыбоў ці травы? Гарантую — гэта не так.*

*куку — пальцамі выцягні вочы з галавы — куку — язык самая смачная частка — грызі — куку — ножыкам адпілі левае вуха — куку — правае вуха адкусі — куку — можна ўтыркнуць у нос відэльцам — к-у-к-у — пацалуй галаву ў засмок — запі вадой — амін*

*На далягляддзе кацілася крывавае сонца і выкалупвала з рота жоўтыя зубы.*

**24. 02. 2013**

***

*— у цябе атрымалася? —*
*гэтае рытарычнае пытанне*
*выпаўзала чорным бліскучым танкам*
*ранкам ты паліў эфемерную цыгарэту*
*агрэст хрумсцеў на зубах*
*— у цябе атрымалася? —*
*зноўку плыло па прашпектах*
*канспекты абвяшчалі канцэпцыю*
*кепскі настрой забівалі армянскім*
*каньяком*
*снежны ком*
*качаўся нібыта стрэлка компаса*
*космас вакол распускаўся зоркамі*
*корак-вока выцягвалі замёрзлымі пальцамі*
*пляшка чырванела вараным ракам*
*каньяк размаўляў малочным шакаладам*
*— у цябе атрымалася? —*
*гучала пранізліва і падбухторвала*
*да палёту над шпілямі мацярыковых гор*
*Выдыхні! Выдыхні!*
*гучным хрыпам праз піянерскі горн!*

**22. 02. 2013**

***

*топіш страх не ў віне*
*топіш страх чужымі рукамі*
*ствараеш ліпавыя краіны*
*скачаш на кані перад войскам*
*гучна абвяшчаеш: «Слухай маю каманду!»*
*звіняць шашкі*
*блішчаць какарды*
*бледныя твары скрыўляе крык*
*гэта — рокат мінулых страхаў*
*горная рака разбівае лодку і ейных*
*смелых пасажыраў*
*страхі закручваюцца ва ўніформу*
*яны нацягваюцца паміж тэлефоннымі*
*слупамі*
*яны падаюць забітымі вайскоўцамі каля*
*тваіх ног*
*на эпалетах застаюцца пырскі крыві*
*— сляды былых слоў...*

**26 жніўня 2012**

***

*ці абмяжоўвае турма свабоду?*
*што ёсць свабода?*
*часам — гэта філасофскае паняцце*
*магчыма ў фізічным плане і абмяжоўвае*
*што тычыцца маральнага, духоўнага...*
*тут не так усё проста*
*пасадзі паэта ў клетку*
*пасадзі філосафа ў бочку*
*пасадзі мастака на алкагольную дыету*
*і што атрымаецца?*
*ОХ-ХО-ХО! — будзе гучаць паўсюль рэхам*
*але ж чэрап — гэты ўнікальны прыродны*
*арт-аб'ект —*
*часам мае ўласціваць захоўваць мазгі...*
*шэрае рэчыва са сваімі кратэрамі і*
*вулканамі...*
*магмай бягуць думкі...*
*тут свабода аднаўляецца ва ўсёй сваёй*
*прыгажосці!*
*у рознакаляровасці фарбаў,*
*у разнастай насці бруду*

**26.08.2012**

ПЕРАКЛАД

# БЕРЫЛАВАЯ ДЫЯДЭМА

АРТУР КОНАН ДОЙЛ (1859–1930)

**Паважаныя чытачы!**

**Набліжаюцца Калядныя святы, якія шчыра жадаем вам правесці ў радасці і здароўі. А яшчэ — у чытанні. І ў якасці своеасаблівага падарунка прыміце ад класіка жанра гэты «снежны дэтэктыў»…**

— Глядзіце, Холмс, вунь бяжыць нейкі вар'ят, — аднаго ранку сказаў я, стоячы ў эркеры і вызіраючы на вуліцу. — Не падабаецца мне, што родныя выпусцілі яго на вуліцу аднаго.

Мой сябра лянотна падняўся з фатэля і, засунуўшы рукі ў кішэні халата, стаў за маёй спінай, каб зірнуць вонкі. Была ясная і марозная лютаўская раніца, і на зямлі ўсё яшчэ ляжаў, ярка пабліскваючы на зімовым сонцы, глыбокі ўчарашні снег. У сярэдзіне Бэйкер-стрыт экіпажы распаласавалі яго вязкімі карычневымі каляінамі, але з абодвух бакоў дарогі і на заваленых краях ходніка ён усё яшчэ быў такі ж белы, як пасля снегападу. Шэры тратуар вышкраблі і пачысцілі, але ён усё яшчэ заставаўся небяспечна слізкім, а таму людзей на вуліцы было менш, чым звычайна. Ад метро ў наш бок не ішоў ніхто, апроч таго самотнага джэнтльмена, чые эксцэнтрычныя паводзіны і забралі маю ўвагу.

Гэта быў мужчына гадоў пяцідзесяці, высокі, мажны і самавіты, з буйным і выразным тварам і прадстаўнічай паставай. Апрануты ён быў у някідкі, але дарагі сурдут, бліскучы капялюш, ахайныя карычневыя гетры і добра пашытыя жамчужна-шэрыя нагавіцы. Паводзіны яго, аднак, самым бязглуздым чынам кантраставалі з паважнымі рысамі і касцюмам — дзівак з цяжкасцю бег па вуліцы, час ад часу трошкі падскокваючы, як стомлены чалавек, які не прызвычаіўся загружаць ногі надмернай працай. На бягу ён сутаргава размахваў рукамі, хітаў галавой і самым неверагодным чынам грымаснічаў.

— О Божа, што там з ім здарылася? — спытаў я. — Ён шукае нейкі дом.

— Думаю, ён ідзе да нас, — сказаў, пацёршы рукі, Холмс.

— Да нас?

— Безумоўна. Думаю, яму патрэбная мая прафесійная парада. Я пазнаю сімптомы… Ха! Ну што я вам казаў?

У гэты момант джэнтльмен, сапучы і цяжка дыхаючы, падскочыў да нашых дзвярэй і пачаў тузаць званок, напоўніўшы бразгатаннем увесь дом.

Праз некалькі хвілінаў ён ужо быў у нашым пакоі, усё яшчэ сапучы і жэстыкулюючы. У вачах яго застыла такое гора і такі адчай, што нашы ўсмешкі адразу ж уступілі месца выразу трывогі і спачування. Некаторы час ён не мог вымавіць ні слова, а толькі ўсім целам хістаўся і тузаў сябе за валасы як чалавек, які падышоў да мяжы здаровага розуму і ўжо гатовы яе пераступіць. Раптам ён падскочыў да сцяны і пачаў з такой сілай біцца аб яе галавой, што мы паспяшаліся адцягнуць яго на сярэдзіну пакоя. Шэрлак Холмс штурхануў яго ў фатэль, сеў побач, паляпаў па руцэ і загаварыў мяккім і суцяшальным голасам, якім добра ўмеў карыстацца ў такіх сітуацыях.

— Вы прыйшлі да мяне, каб расказаць сваю гісторыю, праўда? — спытаў ён. — Спешка вас вельмі прытаміла. Таму прашу: прыйдзіце трохі ў сябе, і тады я буду рады дапамагчы вам з любой праблемай, якую вы мне даверыце.

Госцю спатрэбілася хвіліна ці дзве, каб супакоіць цяжкое дыханне і перамагчы свае эмоцыі. Потым ён выцер лоб насоўкай, сціснуў вусны і павярнуўся да нас.

— Вы, несумненна, прынялі мяне за вар'ята, — зазначыў ён.

— Я заўважыў, што ў вас сур'ёзныя праблемы, — адказаў Холмс.

— Бог — сведка, сур'ёзнейшых не бывае! Яны такія нечаканыя і жахлівыя, што можна з'ехаць з глузду. Грамадскую пагарду вытрываць яшчэ можна, хаця ніколі раней мая рэпутацыя не была заплямленая. Прыватнае гора можа здарыцца з любым чалавекам, але вытрымаць і першае, і другое, ды яшчэ і ў такой пачварнай форме — гэтага для маёй беднай душы занадта! Да таго ж няшчасце зачапіла не мяне аднаго. Калі ніхто нас у гэтай жахлівай справе не ўратуе, пацерпіць адна з самых высакародных асобаў у каралеўстве!

— Прашу вас, супакойцеся, — сказаў Холмс, — і зрабіце ласку, раскажыце, хто вы такі і што з вамі здарылася.

— Маё імя вы, магчыма, чулі раней, — адказаў наш наведнік. — Мяне завуць Аляксандр Холдэр, і я з банку «Холдэр і Стывенсан» на Трэднідл-стрыт.

Мы і праўда чулі гэтае імя раней: яно належала старэйшаму партнёру другога па велічыні прыватнага банка ў лонданскім Сіці. Што магло давесці аднаго з самых паважных жыхароў Лондана да такога жалю вартага стану? Мы нецярпліва чакалі, пакуль ён збярэцца з сіламі і паведаміць нам сваю гісторыю.

— Я разумею, што час вельмі дарагі, — пачаў ён, — і таму адразу паспяшаўся сюды, як толькі інспектар паліцыі прапанаваў мне папрасіць у вас дапамогі. Я дабраўся да Бэйкер-стрыт падземкай, а адтуль усю дарогу бег, бо ў такім снезе кэбы рухаюцца надта марудна. Вось чаму маё дыханне так збілася — фізічных практыкаванняў я амаль не раблю. Цяпер мне ўжо лепей, а таму зараз я як мага карацей і дакладней выкладу перад вамі ўсе факты.

Вы, безумоўна, добра ведаеце, што паспяховая праца банка залежыць як ад умення выгадна ўкладваць капітал, так і ад пашырэння сувязяў і кліентуры. Адзін з самых рэнтабельных спосабаў распарадзіцца грашыма — выдаваць пазыкі пад надзейнае забеспячэнне. Апошнія некалькі гадоў мы шмат у гэтым кірунку зрабілі, і многія высакародныя сем'і пазычаюць у нас вялікія сумы, давяраючы ў якасці закладу карціны, каштоўныя кнігі ці фамільны посуд.

Учора раніцай я сядзеў у сваім кабінеце ў банку, і адзін з клеркаў прынёс мне візітоўку. Калі я ўбачыў імя наведніка, то ўздрыгнуў, бо гэта быў не хто іншы, як… Але не, мабыць, нават вам я нічога казаць не буду, адзначу толькі, што імя гэтае вядомае ва ўсім свеце, бо належыць адной з самых высокіх, паважных і годных сем'яў у Англіі. Я быў агаломшаны такім гонарам і, калі візітант увайшоў, паспрабаваў выказаць яму ўсю сваю павагу, але ён з выглядам чалавека, які спяшаецца як мага хутчэй разабрацца з непрыемнай неабходнасцю, адразу ж перайшоў да справы.

— Містэр Холдэр, — сказаў ён, — я чуў, што вы пазычаеце грошы.

— Банк дае пазыкі пад добры заклад, — адказаў я.

— Мне проста неабходна зараз жа атрымаць 50 тысяч фунтаў, — сказаў ён. — Такую пусцяковую суму, і нават у дзесяць разоў большую, я, безумоўна, магу ўзяць у сяброў, але мне хочацца падысці да справы па-дзелавому, прычым разабрацца з ёй самастойна. Вы цудоўна разумееце, што ў маім становішчы браць на сябе нейкія абавязацельствы неразумна.

— Ці магу я пацікавіцца, на які час вам патрэбныя грошы? — спытаў я.

— У наступны панядзелак мне вернуць вялікую пазыку, і я абавязкова аддам вам усю суму з любымі працэнтамі, якія вы ад мяне запатрабуеце. Але мне проста неабходна атрымаць гэтыя грошы зараз жа.

— Я быў бы рады без далейшых пытанняў пазычыць іх вам са сваёй уласнай кішэні, — сказаў я, — але, баюся, яна гэтага можа і не вытрымаць. Калі ж я зраблю вам пазыку ад імя канторы, то дзеля справядлівасці ў дачыненні да майго кампаньёна я мушу настойваць на выкананні ўсіх дзелавых патрабаванняў.

— Другі падыход задавальняе мяне нашмат больш, — сказаў ён, паказваючы мне квадратны футарал з чорнага саф'яна, які перад гэтым паклаў побач. — Вы, безумоўна, чулі пра берылавую дыядэму?

— Яна — адзін з найкаштоўнейшых нацыянальных скарбаў нашае імперыі, — адказаў я, перабіваючы містэра Холдэра.

— Менавіта, — адказаў банкір і працягнуў. — Ён адчыніў футарал, і там на мяккім цялеснага колеру аксаміце ляжала згаданая вамі шыкоўная каштоўнасць.

— Тут трыццаць дзевяць вялізарных берылаў, — сказаў ён. — Кошт залатой аправы разлічыць немагчыма. Цана дыядэмы нават паводле самых сціплых разлікаў удвая перавышае тую суму, якую я хачу пазычыць. Я гатовы пакінуць каштоўнасць у якасці закладу.

Я ўзяў бясцэнны футарал у рукі і, трохі збянтэжаны, перавёў погляд на свайго знакамітага кліента.

— Вы сумняецеся ў яго каштоўнасці? — спытаў ён.

— Ніякім чынам. Я сумняюся…

— …ці варта пакінуць камусьці такую дарагую рэч? На гэты конт можаце не турбавацца. Я б і не думаў пра гэта, калі б не быў абсалютна ўпэўнены, што праз чатыры дні змагу вярнуць яе назад. Гэта чыстая фармальнасць! Вас такі заклад задаволіць?

— Больш чым.

— Але, містэр Холдэр, вы ж разумееце, што я перадаю вам у рукі доказ свайго найглыбейшага даверу, заснаванага на ўсім тым, што я пра вас чуў. Я веру не толькі ў абачлівасць, з якой вы ўстрымаецеся ад балбатні пра нашу ўмову, але перадусім на здольнасць з усёй асцярожнасцю зберагчы дыядэму — не мне вам тлумачыць, што знікненне каштоўнасці выкліча страшэнны публічны скандал. Любую нанесеную ёй шкоду можна прыраўняць да поўнай страты, бо іншых такіх берылаў у свеце няма і замяніць пацярпелы камень будзе немагчыма. Аднак я з усім даверам пакідаю дыядэму вам, каб у панядзелак ранкам уласнаручна забраць яе.

Бачачы, што мой кліент спяшаецца, я нічога больш не сказаў, а толькі паклікаў касіра і загадаў яму выдаць тысячнымі банкнотамі пяцьдзясят тысяч фунтаў. Аднак застаўшыся сам-насам з каштоўным футаралам, я не без нейкай асцярогі задумаўся над узваленай на мяне празмернай адказнасцю. Дыядэма — сапраўдны нацыянальны скарб, і няма сумневаў, што калі з ёй здарыцца нешта дрэннае, выбухне жахлівы скандал. Я ўжо шкадаваў пра сваю згоду. Але было позна штосьці мяняць, таму я замкнуў футарал у сваім прыватным сейфе і вярнуўся да працы.

Калі надышоў вечар, я падумаў, што было б безразважна пакінуць у банку такую дарагую рэч. Банкаўскія сейфы неаднаразова ўзломваліся, чаму мой мусіць зрабіцца выключэннем? Калі такое раптам здарыцца, у якой страшнай сітуацыі я апынуся! Таму я вырашыў, што бліжэйшыя некалькі дзён я заўсёды буду насіць футарал з сабой, каб ён увесь час быў у межах маёй дасягальнасці. Прыняўшы гэтае рашэнне, я выклікаў кэб і разам з дыядэмай адправіўся дадому, на Стрытхэм. Я не мог спакойна ўздыхнуць, пакуль не падняўся да сябе і не замкнуў футарал у бюро, што стаіць у гардэробнай.

А цяпер некалькі словаў пра маіх хатніх. Я хачу, містэр Холмс, каб вы цалкам ўяўлялі сітуацыю. Мой конюх і хлопчык-слуга начуюць у сябе, таму пакінем іх убаку. Ужо шмат гадоў у мяне служаць тры пакаёўкі, чыя абсалютная надзейнасць вышэйшая за любыя падазрэнні. Яшчэ адна служанка, Люсі Пар, паступіла да мяне толькі некалькі месяцаў таму, аднак у яе цудоўная рэкамендацыя і яна добра спраўляецца са сваёй працай.

Працяг на стар. 16 (8) ▸

ПЕРАКЛАД

# БЕРЫЛАВАЯ ДЫЯДЭМА

Працяг. Пачатак на стар. 15 (7).

Люсі — прывабная дзяўчына, і ў яе шмат прыхільнікаў, якія часам бадзяюцца вакол майго дома. Гэта адзіны яе недахоп, і я ўпэўнены, што яна з усіх бакоў вельмі добры чалавек.

Гэта што тычыцца слуг. Сям'я ж у мяне зусім маленькая, і яе апісанне не зойме шмат часу. Я ўдавец і маю адзінага сына, якога завуць Артур. Ён мяне расчараваў, містэр Холмс, вельмі расчараваў. Няма ніякіх сумневаў, што ў гэтым вінаваты я сам. Кажуць, я яго сапсаваў. Так яно, відаць, і ёсць. Калі памерла мая дарагая жонка, я зразумеў, што ён — мая адзіная любоў. Калі з яго твару знікала ўсмешка, я не мог вытрымаць гэтага нават імгненне. Я ніколі яму ні ў чым не адмовіў. Можа, калі б я быў больш строгі, для нас абодвух усё склалася б лепш, але ж я так дзеля яго стараўся!

Я, натуральна, хацеў, каб мой сын паспяхова прадоўжыў маю справу, але дзелавой жылкі ў ім не было. Ён вылучаўся свавольным і нястрыманым характарам: шчыра кажучы, вялікую суму грошай я б яму не даверыў. У юнацтве ён увайшоў у арыстакратычны клуб і неўзабаве дзякуючы цудоўным манерам блізка сышоўся з уладальнікамі вялікіх кашалькоў і нятанных звычак. Ён навучыўся зацята граць у карты і марнаваць грошы на скачках і быў вымушаны зноў і зноў звяртацца да мяне па грошы ў кошт будучых кішэнных расходаў, бо мусіў выплаціць доўг гонару. Шмат разоў спрабаваў ён парваць з небяспечнай кампаніяй, але кожны раз пад уплывам свайго сябра сэра Джорджа Барнвэла зноў браўся за старое.

Мяне, дарэчы, зусім не дзівіць, што такі чалавек, як сэр Джордж Барнвэл, мае на Артура моцны ўплыў — сын часта прыводзіў яго дадому, і я сам ледзь знайшоў сілы супраціўляцца абаяльнасці яго манераў. Ён старэйшы за Артура, свецкі чалавек да мозгу касцей, адзін з тых, што ўсюды пабывалі і ўсяго пабачылі, бліскучы суразмоўца і да таго ж знешне надзвычай прыгожы. Зрэшты, асэнсоўваючы сваё ўражанне на свежую галаву, калі чары абаяльнасці сэра Барнвэла трохі слаблі, і прыгадваючы яго цынічныя словы і падгледжаныя мной позіркі, я зрабіў выснову, што давяраць гэтаму чалавеку нельга. Такое ў мяне склалася меркаванне, і яго з усёй сваёй жаночай інтуіцыяй падзяляла мая маленькая Мэры.

Цяпер мне засталося апісаць толькі яе. Мэры — мая пляменніца. Калі пяць гадоў таму мой брат памёр і пакінуў яе адну, я ўзяў яе да сябе і даглядаў як родную дачку. У маім доме яна — як сонечны прамень, мілая, адданая, прыгожая і чароўная ахмістрыня і гаспадыня, такая пяшчотная, і ціхмяная, і клапатлівая, якой мусіць быць жанчына. Яна — мая правая рука. Не ведаю нават, што б я без яе рабіў. Толькі ў адным пытанні яна дзейнічае супраць маіх жаданняў. Ужо двойчы мой безнадзейна закаханы хлопчык рабіў ёй прапанову, і яна двойчы яму адмовіла. Мне здаецца, што яна — адзіны чалавек, які можа вывесці яго на правільную дарогу, і што гэтая жаніцьба магла б усё змяніць, але што тут, на жаль, зробіш — цяпер ужо позна, ах, цяпер ужо занадта позна!

Вось, містэр Холмс, вы і ведаеце людзей, якія жывуць пад маім дахам, а таму я магу працягваць сваю горкую гісторыю.

Калі тым вечарам мы ў гасцёўні пілі пасля вячэры каву, я расказаў Артуру і Мэры пра падзеі дня і пра тое, які скарб захоўваецца цяпер у нашым доме, апусціўшы толькі імя кліента. Я быў упэўнены, што Люсі Пар, якая толькі што прынесла каву, пакінула пакой, але што дзверы былі зачыненыя, прысягнуць не магу. Мэры і Артур вельмі зацікавіліся маім аповедам і захацелі зірнуць на знакамітую каштоўнасць, але я падумаў, што яе лепш не чапаць.

— Куды ты яе паклаў? — пацікавіўся Артур.

— У бюро.

— Спадзяюся, сёння ноччу наш дом не абрабуюць, — сказаў ён.

— Я ж яго замкнуў!

— Ох, ды гэтае бюро адчыніцца любым старым ключом. У дзяцінстве я часта адмыкаў твой тайнік ключом ад буфета ў каморы.

Гэта была яго звычайная манера весці размову, таму неўзабаве я выкінуў яго словы з галавы. Аднак тым вечарам ён праводзіў мяне да пакоя з вельмі змрочным тварам.

— Слухай, тата, а ты можаш пазычыць мне дзвесце фунтаў? — спытаў ён, апусціўшы вочы.

— Не, не магу! — рэзка адказаў я. — У грашовых справах я быў з табой занадта шчодры.

— Ты заўсёды ставіўся да мяне па-добраму, — пагадзіўся ён. — Але мне да зарэзу патрэбныя гэтыя грошы, інакш я больш ніколі не змагу паказацца ў клубе.

— Цудоўная перспектыва! — усклікнуў я.

— Але ты ж не хочаш, каб мяне лічылі несумленным? — працягнуў ён. — Ганьбы я не вытрываю. Так ці іначай я павінны здабыць гэтую суму, і калі ты мне не дапаможаш, я буду вымушаны шукаць іншыя спосабы.

Я моцна раззлаваўся, бо за апошні месяц гэта была ўжо трэцяя просьба.

— Ад мяне ты больш ні фартынга не атрымаеш! — ускрыкнуў я.

Артур пакланіўся і без лішніх словаў пакінуў пакой.

Калі ён сышоў, я адчыніў бюро, каб упэўніцца, што скарб у бяспецы, і зноў яго замкнуў. Потым абышоў увесь дом, правяраючы, ці ўсё ў парадку. Звычайна гэта абавязак Мэры, але ў той вечар я вырашыў узяць яго на сябе. Спусціўшыся ўніз, я ўбачыў і саму Мэры, якая акурат зачыняла ў гасцёўні бакавое акно.

— Тата, хіба ты сёння вечарам дазваляў Люсі сыходзіць? — з устрывожаным выглядам спытала яна.

— Канечне не!

— Яна толькі што ўвайшла ў дом праз чорны ход. Я не сумняюся, што ля бакавой брамы яна з кімсьці сустракалася, а гэта не так ужо бяспечна і мусіць спыніцца.

— Пагавары з ёй заўтра ранкам, ці, калі хочаш, я пагавару сам. Ты ўпэўненая, што ўсё зачыненае?

— Упэўненая.

Я пацалаваў яе і вярнуўся ў спальню, дзе амаль тут жа заснуў.

Містэр Холмс, я спрабую расказаць вам усё, што хоць нейкім чынам звязанае са справай, але прашу вас задаваць дадатковыя пытанні, калі нешта раптам падасца не зусім зразумелым.

— Не хвалюйцеся, ваш аповед надзвычай дакладны.

— Цяпер я пераходжу да той часткі, пра якую толькі так і трэба расказваць. Сплю я не вельмі моцна, да таго ж дзённае напружанне зрабіла мой сон яшчэ горшым, чым звычайна. Гадзіны ў дзве ночы я прачнуўся ад нейкіх дзіўных гукаў, якія сціхлі, перш чым я паспеў канчаткова прыйсці ў сябе. Але засталося ўражанне, што дзесьці ў доме вельмі акуратна зачынілі акно. Я ляжаў і напружана ўслухоўваўся ў цішыню. Раптам, на мой жах, у суседнім пакоі выразна пачуліся мяккія крокі. Дрыжучы ад страху, я выслізнуў з ложка і вызірнуў з-за дзвярэй у суседні пакой.

— Артур! — закрычаў я. — Ах ты нягоднік! Ах ты злодзей! Як ты насмеліўся ўзяць дыядэму?

Газавая лямпа стаяла гэтак жа, як я яе пакінуў, і ў цьмяным святле я ўбачыў свайго няшчаснага хлопчыка, апранутага ў адну кашулю і нагавіцы, які трымаў у руках дыядэму. Здавалася, ён з усяе моцы спрабуе яе зламаць альбо сагнуць. На мой крык ён выпусціў каштоўнасць з рук і павярнуўся ў мой бок, бледны, як смерць. Я схапіў дыядэму і агледзеў яе — не хапала аднаго залатога элемента з трыма берыламі.

— Ах ты паганец! — раз'юшана крычаў я. — Ты зламаў яе! Ты навекі зганьбаваў мяне! Дзе гэтыя камяні, якія ты скраў?

— Скраў? — пракрычаў ён у адказ.

— Скраў, злодзей! — рыкаў я, трасучы яго за плечы.

— Гэтага не можа быць, знікнуць нічога не магло, — здзівіўся ён.

— І ўсё ж тры камні зніклі! І ты ведаеш, дзе яны! Няўжо ты не толькі злодзей, але яшчэ і хлус? Думаеш, я не бачыў, як ты спрабуеш адламаць другі кавалак?

— Я ўжо дастаткова ад цябе наслухаўся, — сказаў ён, — і больш ні дня тут не застануся. Пра гэтую справу ты ні слова ад мяне не дачакаешся, калі ўжо вырашыў так мяне абражаць! Заўтра раніцай я пакіну дом і зажыву ўласным жыццём.

— З гэтага дома ты выйдзеш толькі разам з паліцыяй! — закрычаў я, ледзь не звар'яцеўшы ад гора і злосці. — Я дакапаюся ў гэтай справе да самай сутнасці!

— Ад мяне ты нічога не дазнаешся, — сказаў ён з нечуванай для яго жарсцю. — Калі хочаш выклікаць паліцыю — калі ласка, хай сабе шукаюць, колькі ім заманецца.

Я крычаў так, што хутка ўвесь дом быў на нагах. Першай у пакой убегла Мэры. Убачыўшы дыядэму і выраз Артурава твару, яна ўсё зразумела і, ускрыкнуўшы, звалілася без прытомнасці. Я адправіў пакаёўку па паліцыю і адразу ж перадаў ім справу. Калі інспектар і канстэбль увайшлі ў дом, Артур, які стаяў, насупіўшыся і склаўшы на грудзях рукі, пацікавіўся, ці збіраюся я абвінаваціць яго ў крадзяжы. Я адказаў, што справа з прыватных перайшла ў грамадскія, бо вядзецца пра нацыянальную ўласнасць. Я вырашыў, што самы час перадаць яе ў рукі закону.

— Не дай ім хаця б адразу мяне арыштаваць, — папрасіў Артур. — Для нас абодвух будзе лепш, калі я хвілін на пяць змагу пакінуць дом.

— Каб ты збег ці прынамсі схаваў скрадзенае? — спытаў я.

Яшчэ глыбей усвядоміўшы ўвесь жах свайго становішча, я нагадваў сыну, што на карту пастаўлены не толькі мой гонар, але і гонар асобы, нашмат за мяне вышэйшай, і што вось-вось выбухне скандал, які скалане нацыю. Усяго гэтага можна пазбегнуць, калі толькі ён раскажа, дзе схаваныя тры зніклыя камні.

— Паглядзі ты ўрэшце фактам у твар, — маліў яго я. — Цябе злавілі на месцы злачынства, і ніякае прызнанне віну агіднейшай не зробіць. Але ў тваіх сілах яе выкупіць, сказаўшы, дзе знаходзяцца берылы, і заслужыць такім чынам поўнае дараванне.

— Пакінь сваё дараванне тым, каму яно патрэбнае, — сказаў ён са з'едлівай усмешкай і адвярнуўся.

Я зразумеў, што ён занадта абыякавы, каб пачуць мае аргументы. Засталося толькі адно выйсце. Я паклікаў інспектара, каб той арыштаваў майго сына. Паліцыя абшукала не толькі яго самога, але і ўвесь яго пакой, а таксама рэшту дома, дзе магла быць схаваная каштоўнасць, але нічога не знайшла. Паскуднік гэты не сказаў нам ні слова, нягледзячы на ўгаворы і пагрозы. Ранкам яго адправілі ў турму, а я, прайшоўшы праз усе паліцэйскія фармальнасці, паспяшаўся сюды ў надзеі, што вы прыкладзяце ўсе свае здольнасці, каб разблытаць справу. Паліцыя адкрыта прызнае, што на сённяшні дзень яны больш нічога зрабіць не могуць. Я гатовы аплаціць любыя выдаткі. Я ўжо прапанаваў узнагароду ў тысячу фунтаў таму, хто знойдзе дыядэму. Божа, што мне цяпер рабіць? За адну ноч я страціў гонар, нацыянальны скарб і сына! Што мне цяпер рабіць?

Ён схапіўся за галаву і пачаў гайдацца з боку ў бок, мармычучы сабе нешта пад нос, як дзіця, не здольнае выказаць сваё гора словамі.

Некалькі хвілінаў Шэрлак Холмс маўчаў, нахмурыўшы бровы і ўтаропіўшыся ў камін.

— Госці ў вас бываюць часта? — урэшце спытаў ён.

— Ды не, хіба што мой кампаньён з сям'ёй і зрэдку — сябры Артура. Апошнім часам некалькі разоў зазіраў сэр Джордж Барнвэл. Болей, відаць, нікога.

— А вы самі дзе-небудзь бываеце?

— Толькі Артур. Мы з Мэры сядзім дома — нас візіты не цікавяць.

— Дзіўна чуць такое пра юную дзяўчыну.

— Яна чалавек спакойны. Дарэчы, не такая ўжо яна і юная — ёй дваццаць чатыры.

— З таго, што вы сказалі, я раблю выснову, што гісторыя моцна яе ўразіла.

— Проста жахліва! Больш нават, чым мяне.

— Сумневаў наконт віны Артура ў вас няма?

— Якія могуць быць сумневы, калі я ўласнымі вачыма бачыў у яго руках дыядэму?

— Я б гэта пераканаўчым доказам не назваў. Рэшта дыядэмы яшчэ неяк пашкоджаная?

— Так, яна ўся пагнутая.

— А вы не думаеце, што ён спрабаваў яе выпрастаць?

— Божа мой, вы хочаце вярнуць нам з сынам надзею, але баюся, гэта будзе занадта складана. Што ён там увогуле рабіў? Чаго маўчыць, калі яго намеры былі нявінныя?

— Вы, безумоўна, маеце рацыю. Але калі намеры ў яго былі злачынныя, чаму ён не пачаў маніць? Маўчанне хлопца, як на мяне, выключае абодва варыянты. У вашай справе засталося шмат незразуме-

лага. Што паліцыя думае пра гук, які вас абудзіў?

— Яны мяркуюць, што я пачуў, як Артур зачыняе дзверы сваёй спальні.

— Ага, яно і зразумела. Чалавек збіраецца здзейсніць злачынства і з гэтай нагоды ляпае дзвярыма так, каб падняць увесь дом. А што яны тады кажуць пра знікненне камянёў?

— Яны дагэтуль абстукваюць сцены і даследуюць мэблю, спадзеючыся знайсці прапажу.

— Пашукаць за межамі дома не спрабавалі?

— Ну канечне! Яны падышлі да справы вельмі энергічна і ўжо старанна абшукалі сад.

— Што ж, дарагі мой сэр, — сказаў Холмс, — хіба вы не бачыце, што праблема тут нашмат глыбейшая, чым на першы погляд здаецца і вам, і паліцыі? Вы ўпэўнены, што справа зусім простая, я ж сцвярджаю, што яна надзвычай складаная. Зірнем на яе вашымі вачыма: вы думаеце, што Артур падняўся з ложка, моцна рызыкуючы, прабраўся ў ваш пакой, адчыніў бюро, дастаў дыядэму, з вялікай цяжкасцю адламаў ад яе кавалак, выйшаў кудысьці яшчэ, схаваў тры з трыццаці дзевяці камянёў, прычым так, што цяпер іх ніхто не можа знайсці, потым з трыццаццю шасцю астатнімі вярнуўся ў пакой, дзе яго з неверагоднай лёгкасцю маглі выкрыць. Ну як, вельмі лагічная тэорыя?

— Але як тады вы гэта патлумачыце? — з жэстам адчаю ўсклікнуў банкір. — Калі яго намеры былі нявінныя, чаму ён нічога не гаворыць?

— Вось з гэтым і трэба разабрацца, — адказаў Холмс. — А таму цяпер, калі вы, містэр Холдэр, не супраць, мы адправімся на Стрытхэм і прысвецім гадзінку бліжэйшаму азнаямленню з дэталямі.

Мой сябар настойваў, каб я яго суправаджаў, і тут нашы жаданні супадалі: пачутая гісторыя абудзіла ўва мне цікаўнасць і спачуванне. Я не мог не прызнаць, што віна Артура падавалася мне такой жа відавочнай, як і яго няшчаснаму бацьку, тым не менш, я заўсёды давяраў меркаванню Холмса, а таму верыў, што, калі прапанаванае тлумачэнне яго не задавальняе, надзею траціць рана. Пакуль мы ехалі на паўднёвую ўскраіну Лондана, ён не сказаў ні слова, а толькі сядзеў, глыбока занураны ў думкі, апусціўшы галаву і насунуўшы на вочы капялюш. Кліент наш, здавалася, трохі акрыяў — перад ім бліснуў слабы прамень надзеі, і містэр Холдэр паспрабаваў нават завязаць са мной досыць бязладную размову пра свае банкаўскія клопаты. Кароткая паездка чыгункай і яшчэ карацейшая прагулка пехам прывяла нас неўзабаве да Фэрбэнка — сціплага жытла вялікага фінансіста.

Фэрбэнк, масіўны квадратны будынак з белага каменю, стаяў ад вялікай дарогі трохі ўбаку. Да цяжкой жалезнай брамы, якая перапыніла наш шлях, вёў пад'езд для экіпажаў з газонам, прысыпаным снегам. Справа мы заўважылі невялікую купу хмызоў, за якой праглядалася аточаная жывой агароджай вузкая сцяжынка да кухонных дзвярэй — відаць, чорны ўваход. Злева пачыналася дарожка, якая вяла да стайні. Сядзібе яна не належала і лічылася грамадскай уласнасцю, хаця ёй амаль ніхто не карыстаўся.

Холмс пакінуў нас каля дзвярэй і марудна прагуляўся вакол дома, прайшоў міма фасада, потым — сцяжынкай да чорнага ўваходу, а затым — самай аддаленай часткай сада да стайневай дарожкі. Адсутнічаў ён так доўга, што мы з містэрам Холдэрам адправіліся чакаць яго ў гасцёўню, бліжэй да каміна. Мы моўчкі сядзелі ля агню, як раптам дзверы адчыніліся і ў пакой увайшла маладая лэдзі. Росту яна была хутчэй сярэдняга, зграбная, з цёмнымі валасамі і вачыма, якія на фоне светлай скуры здаваліся яшчэ цямнейшымі. Не думаю, што калі-небудзь раней я сустракаў такі смяротна бледны жаночы твар. Вусны яе былі зусім бяскроўныя, затое вочы блішчэлі ад слёз. Калі яна бязмоўна ўвайшла ў пакой, мяне ўразіла яе гора, якое падалося яшчэ глыбейшым, чым ранішнія пакуты банкіра, і ўражвала яшчэ больш, бо перамагло, відаць, жанчыну з моцным характарам і бязмернай вытрымкай. Не зважаючы на мяне, яна адразу ж скіравалася да свайго дзядзькі і з мілай жаночай клапатлівасцю правяла рукой па яго валасах.

— Тата, вы ж папрасілі, каб Артура вызвалілі? — спытала яна.

— Не, мая дзяўчынка, не, у гэтай справе трэба дакапацца да самай сутнасці.

— Але я ўпэўненая, што ён ні ў чым не вінаваты. Ты ж ведаеш, жанчыны гэта адчуваюць. Я веру, што нічога кепскага ён не зрабіў, і потым ты сам пашкадуеш, што так жорстка з ім абышоўся.

— Калі ён невінаваты, чаму ж тады маўчыць?

— Хто ведае?.. Можа, яго раззлавалі твае падазрэнні.

— Як жа мне ад іх пазбавіцца, калі я на ўласныя вочы бачыў яго з дыядэмай у руках?

— Ох, ну ён мог дастаць яе, каб проста паглядзець. Павер мне на слова, ён ні ў чым не вінаваты! Нічога больш не кажы — і хай справа закрыецца! Як гэта жахліва, што наш дарагі Артур у турме!

— Я ніколі не дазволю закрыць гэтую справу, пакуль каштоўнасць не знойдзецца — чуеш, Мэры, ніколі! Любоў да Артура засціць табе вочы, і ты забываеш, чым мне ўсё гэта пагражае. Нічога замоўчваць я не збіраюся і нават запрасіў джэнтльмена з Лондана, каб яны таксама ўзяліся за дэталёвае расследаванне.

— Якога джэнтльмена? Гэтага? — спытала яна, паварочваючыся да мяне.

— Не, яго сябра. Але той папрасіў пакінуць яго самога і цяпер аглядае сцяжынку, што вядзе да стайні.

— Сцяжынку, што вядзе да стайні? — яна падняла свае цёмныя бровы. — Што ён спадзяецца там знайсці? А, вось, відаць, і ён! Я веру, сэр, што вы паспяхова даведзяце справядлівасць маіх словаў, бо я не сумняюся ў невінаватасці майго стрыечнага брата Артура.

— Я цалкам з вамі згодны і ўпэўнены, што змагу сваю правату даказаць, — пагадзіўся Холмс, вяртаючыся да дыванка ля дзвярэй, каб абтрэсці з абутку снег. — Мяркую, я маю гонар гаварыць з міс Мэры Холдэр. Магу я задаць вам адно-два пытанні?

— Прашу вас, сэр, задаваць колькі заўгодна, калі гэта дапаможа вам разабрацца з нашай жудаснай гісторыяй.

— Мінулай ноччу вы самі што-небудзь чулі?

— Нічога да таго моманту, пакуль дзядзька не закрычаў. Я пачула яго голас і спусцілася ў дзядзькаў пакой.

— Вечарам вы зачынялі ўсе вокны і дзверы. Яны былі надзейна замкнутыя?

— Канечне.

— З раніцы таксама ўсё было зачынена?

— Так.

— У адной з вашых пакаёвак ёсць прыхільнік? Калі я не памыляюся, мінулым вечарам вы казалі дзядзьку, што яна выходзіла з ім сустрэцца.

— Так, прычым менавіта яна падавала нам учора каву і магла падслухаць дзядзькаў аповед пра дыядэму.

— Зразумела. Думаеце, яна магла расказаць пра гэта свайму сябру, і яны разам задумалі крадзеж?

— Але які сэнс ва ўсіх гэтых вашых версіях, — нецярпліва ўсклікнуў банкір, — калі я не раз казаў вам, што сам бачыў Артура з дыядэмай у руках?

— Трошкі пачакайце, містэр Холдэр. Да гэтага мы яшчэ вернемся. Цяпер пра тую дзяўчыну, міс Холдэр: я правільна разумею, што вы бачылі, як яна праз кухню вяртаецца дадому?

— Усё правільна. Я пайшла праверыць, ці замкнёныя тыя дзверы на ноч, і ўбачыла, як яна праслізнула ў дом. Мужчыну ў паўзмроку таксама заўважыла.

— Вы яго ведаеце?

— Безумоўна! Гэта быў гандляр агароднінай, які прыносіць нам зеляніну. Яго завуць Фрэнсіс Проспэр.

— І стаяў ён злева ад дзвярэй, то бок нашмат далей ад сцяжынкі, чым трэба для таго, каб увайсці ў дом? — удакладніў Холмс.

— Так.

— І ў яго была драўляная нага?

У чорных выразных вачах юнай лэдзі прамільгнула нешта, падобнае на страх.

— Ды вы сапраўдны чарадзей! — усклікнула яна. — Як вы даведаліся?

Яна ўсміхнулася, але на худым энергічным твары Холмса ўсмешкі ў адказ не з'явілася.

— Цяпер было б някепска падняцца наверх, — сказаў ён. — Магчыма, давядзецца яшчэ раз абысці вакол дома. Але пакуль мы яшчэ тут, я, мабыць, зірну на вокны.

Ён імкліва пералятаў ад акна да акна, прыпыніўшыся толькі каля аднаго ў гасцёўні, вялікага, якое выходзіла на стайневую дарожку. Холмс адчыніў яго і вельмі ўважліва агледзеў падаконне з дапамогай вельмі моцнай лупы.

— А цяпер наверх, — урэшце скамандаваў ён.

Гардэробная банкіра выявілася сціпла мэбляваным пакойчыкам з шэрым дыванам, вялікім бюро і доўгім люстэркам. Холмс адразу падышоў да бюро і старанна агледзеў замок.

— Якім ключом яго адчынілі? — спытаў мой сябар.

— Тым самым, пра які ўспомніў мой сын — ад буфета ў каморы.

— Дзе ключ цяпер?

— Вось ён — ляжыць на туалетным століку.

Шэрлак Холмс узяў ключ і адамкнуў бюро.

— Замок бясшумны, — сказаў ён. — Не дзіўна, што злодзей вас не абудзіў. У гэтым футарале, як я разумею, ляжыць дыядэма. Зараз мы на яе зірнем.

Ён адчыніў футарал, дастаў адтуль дыядэму і паклаў на стол. Гэта быў шыкоўны ўзор ювелірнага мастацтва — камянёў, прыгажэйшых за гэтыя трыццаць шэсць, я яшчэ ніколі не бачыў. Адзін з зубцоў дыядэмы, дзе мусілі быць астатнія тры берылы, быў адламаны.

— Ну, містэр Холдэр, — сказаў Холмс, — гэты зубец нагадвае той, які ў вас самым ганебным чынам скралі. Магу я вас папрасіць таксама яго адламаць?

— Божа барані! — з жахам адхіснуўся банкір.

— Тады я сам, — нечакана прамовіў Холмс і паспрабаваў адламаць зубец, але беспаспяхова. — Трохі, здаецца, паддаўся, аднак, баюся, што нягледзячы на ўсю маю сілу, часу б спатрэбілася нямала. Звычайны чалавек тут бы рады не даў. Але як вы думаеце, містэр Холдэр, што, калі б я яго ўсё ж такі адламаў? Безумоўна, вы пачулі б гук, падобны да пісталетнага стрэлу. Скажыце, няўжо такое магло адбыцца ў некалькіх ярдах ад вашага ложка, а вы нічога і не пачулі?

— Не ведаю, што і сказаць. Для мяне ўсё гэта — цёмны лес.

— Можа, мы здолеем трохі яго асвятліць. Што вы, міс Холдер, пра гэта думаеце?

— Мушу прызнацца, што я раздзяляю дзядзькаву разгубленасць.

— Калі вы ўбачылі сына, былі на ім чаравікі ці хатнія туфлі?

— Не, толькі нагавіцы і кашуля.

— Дзякуй. У расследаванні нам відавочна спадарожнічае неверагодная ўдача, і калі мы не даб'емся поспеху, то толькі праз нас саміх. Містэр Холдэр, з вашага дазволу я працягну пошукі вонкі.

Выконваючы загад Холмса, мы засталіся дома, бо лішнія, як ён сказаў, сляды толькі ўскладняць задачу. Гадзіну ці каля таго ён шчыраваў у садзе і ўрэшце вярнуўся, увесь у снезе і з яшчэ больш загадкавым выразам твару, чым звычайна.

— Думаю, містэр Холдэр, я ўжо ўбачыў тут усё, што мог, — сказаў ён. — Каб працягнуць расследаванне, я мушу цяпер адправіцца дадому.

— Але містэр Холмс, дзе ж гэтыя камяні?

— Пакуль сказаць не магу.

Банкір зноў заламаў рукі.

— Я больш ніколі іх не ўбачу! — крычаў ён. — А што з маім сынам? Ёсць хоць нейкая надзея?

— Маё меркаванне пра яго не змянілася.

— Божа мой, дык што ж урэшце мінулай ноччу адбылося?

— Калі вы зможаце заўтра ранкам паміж дзевяццю і дзесяццю зазірнуць да мяне на Бэйкер-стрыт, я буду рады трошкі вам гэтую справу праясніць. Як я разумею, вы даяце мне карт-бланш пры ўмове, што я вярну камяні, і не ставіце ніякіх абмежаванняў у сродках?

— Я гатовы аддаць усё, што маю, толькі б атрымаць гэтыя берылы назад.

— Цудоўна. А я тым часам падумаю над праблемай. Да пабачэння! Магчыма, да вечара мне давядзецца яшчэ раз сюды забегчы.

Я разумеў, што ў думках майго кампаньёна ўжо выспела нейкая ідэя, але не меў нават цьмянага ўяўлення, да якіх высноваў ён дайшоў. На зваротным шляху я некалькі разоў паспрабаваў завязаць з ім размову, але ён кожны раз мякка пераходзіў на іншую тэму, пакуль я ўрэшце не адчаяўся і не кінуў спробы. Калі мы вярнуліся дадому, не было яшчэ трох гадзінаў. Холмс паспяшаўся ў свой пакой і праз некалькі хвілінаў спусціўся да мяне, апрануты, як звычайны валацуга. У зношаным і зашмальцаваным паліто з паднятым каўняром і чырвоным шалікам і ў старых чаравіках ён выглядаў як тыповы прадстаўнік гэтага класа.

— Думаю, гэта тое, што трэба, — прамовіў ён, разглядаючы сябе ў люстэрку над камінам. — Шкада толькі, што вы, Ўотсан, не можаце да мяне далучыцца. Хутка я высветлю, правільны я ўзяў след ці проста ганюся за фата-марганай. Праз некалькі гадзінаў спадзяюся вярнуцца.

Ён дастаў з буфета кавалак ялавічыны, адрэзаў ад яго скрылік, паклаў паміж дзвюма лустамі хлеба і, засунуўшы гэтую няхітрую ежу ў кішэню, выправіўся на пошукі.

Я толькі дапіў гарбату, калі ён вярнуўся, у цудоўным, відаць, настроі, памахваючы нейкім старым штыблетам, які тут жа кінуў у кут і таксама наліў сабе гарбаты.

— Я тут проста праходзіў міма, — патлумачыў ён. — Зараз адпраўлюся далей.

— Куды?

— О, ажно на іншы канец Вэст-Энда. Вярнуся, мабыць, не зусім хутка. Калі буду позна, не чакайце мяне і кладзіцеся спаць.

— А як поспехі?

— Ну, нічога так, пажаліцца не магу. За гэты час я паспеў яшчэ раз пабываць на Стрытхэме, але ў дом не заходзіў. Праблемка вельмі цікавая, і я ні за што не хачу яе ўпусціць. Аднак няма часу пляткарыць, трэба гэтую ганебную апранаху скінуць і вярнуць урэшце свой рэспектабельны выгляд.

Паводзіны майго сябра сведчылі, што нагодаў сабой ганарыцца ў яго больш, чым можна было б меркаваць з яго словаў. Вочы Холмса блішчэлі, а на жаўтаватых шчоках з'явіўся нават нейкі намёк на румянец. Ён паспяшаўся наверх, і праз некалькі хвілінаў я пачуў, як ляснулі ўваходныя дзверы: значыць, ён зноў выправіўся на сваё паспяховае дагэтуль паляванне.

Я чакаў яго да апоўначы, але Холмса не было і духу, а таму я адправіўся ў свой пакой. Адсутнічаць некалькі дзён і начэй, узяўшы гарачы след чарговага злачынцы, было для яго справай звычайнай, а таму позняя адсутнасць мяне зусім не здзівіла. Не ведаю, а якой гадзіне ён вярнуўся, аднак калі раніцай я спусціўся на сняданак, ён ужо сядзеў за сталом з кубкам кавы ў адной руцэ і газетай у другой, свежы і падцягнуты, як заўсёды.

— Вы прабачыце мне тое, што я пачаў без вас, Ўотсан, — сказаў ён, — калі ўспомніце, што сёння нашаму кліенту прызначаны досыць ранні час.

— Ужо дзясятая, — заўважыў я. — О, здаецца, я чую званок! Не здзіўлюся, калі гэта будзе ён.

Гэта і праўда быў наш знаёмец-фінансіст. Мяне ўразіла змена, якая адбылася з ім за ноч: твар яго, дагэтуль буйны і шырокі, цяпер выцягнуўся і змарнеў, а валасы зрабіліся на цэлы тон бялейшымі. Сённяшняя яго стома і апатыя падаліся мне яшчэ жахлівейшымі, чым учарашняе шаленства. Я прапанаваў госцю фатэль, і ён цяжка ў яго паваліўся.

Працяг на стар. 18 (10) ▸

ПЕРАКЛАД

# БЕРЫЛАВАЯ ДЫЯДЭМА

Працяг. Пачатак на стар. 15 (7).

— За якія грахі так сурова карае мяне неба? — прастагнаў ён. — Толькі два дні таму я быў шчаслівым і багатым чалавекам без аніводнага ў свеце клопату. Цяпер жа мяне чакаюць доўгія самотныя і поўныя ганьбы гады. Бяда адна не прыходзіць. Учора Мэры мяне пакінула.

— Пакінула вас?

— Так. У сваім ложку яна сёння не начавала, пакой пусты, а на стале ў гасцёўні — цыдулка. Учора вечарам я ў роспачы, але зусім не ў гневе сказаў, што калі б яна выйшла за майго хлопчыка замуж, цяпер з ім усё было б добра. Мабыць, з майго боку гэта было безразважна, бо менавіта тыя словы яна згадала ў пасланні:

«Дарагі дзядзька! Мне здаецца, што я прынесла ў твой дом шмат турбот. Калі б я дзейнічала іначай, учарашняе няшчасце абышло б нас бокам. З такімі думкамі я ніколі больш не змагу быць пад тваім дахам шчаслівай. Думаю, мне трэба назаўсёды цябе пакінуць. Пра маю будучыню не хвалюйся, бо яна цалкам забяспечаная. Не спрабуй мяне адшукаць, бо праца гэтая будзе марнай і саслужыць мне кепскую службу.

З любоўю да самай смерці, Твая Мэры».

— Містэр Холмс, што яна хацела гэтым сказаць? Можа, задумала самазабойства?

— Не-не, нічога такога. Відаць, яна знайшла найлепшае выйсце з сітуацыі. Містэр Холдэр, я магу прысягнуць, што хутка вашыя пакуты скончацца.

— Ах, якія цудоўныя словы! Вы пра нешта дазналіся, містэр Холмс, вы да нечага дакапаліся! Скажыце, дзе цяпер камяні?

— Як вы думаеце, тысяча фунтаў за камень — кошт не надта непад'ёмны?

— Я гатовы заплаціць нават дзесяць!

— У гэтым няма неабходнасці. Трох тысяч цалкам дастаткова. Мяркую, спатрэбіцца таксама невялікая ўзнагарода. Чэкавая кніжка пры вас? Вось пяро. Лепш за ўсё выпішыце на чатыры тысячы.

Агаломшаны банкір выпісаў патрэбны чэк. Холмс падышоў да стала, дастаў невялічкі залаты трохкутнік з трыма берыламі і кінуў на стол.

Наш кліент ускрыкнуў ад радасці і схапіў каштоўнасць.

— Вы вярнулі іх! — ледзь не задыхаўся ён. — Я ўратаваны! Уратаваны!

Радасці ён аддаваўся гэтак жа горача, як учора аддаваўся адчаю. Знойдзеныя камяні ён пяшчотна прыціскаў да грудзей.

— Містэр Холдэр, вы павінныя вярнуць яшчэ адзін доўг, — сурова сказаў Шэрлак Холмс.

— Доўг? — банкір схапіўся за пяро. — Назавіце суму, і я з радасцю яе аплачу!

— Мне вы больш нічога не павінны, але вам трэба глыбока выбачыцца перад вашым высакародным сынам, які ў гэтай справе трымаўся так годна, што на месцы яго бацькі я не мог бы ім не ганарыцца.

— Дык іх узяў не Артур?

— Яшчэ ўчора я казаў вам, што не ён, і сёння гатовы паўтарыць.

— І вы мелі рацыю! Тады паспяшаемся да яго, каб паведаміць, што праўда раскрылася.

— Ён ужо ведае. Я паразмаўляў з ім, калі ўсё высветліў, і зразумеўшы, што ён нічога мне не скажа, сам усё яму расказаў. Ён пацвердзіў мае высновы і дадаў некалькі дробязяў, да якіх я яшчэ не зусім дакапаўся. Думаю, сённяшняя навіна развяжа яму язык.

— Малю вас, адкрыйце ўрэшце гэтую неверагодную таямніцу!

— Безумоўна, я гэта зраблю, больш за тое — раскажу, як я дабраўся да праўды. Але спачатку дазвольце сказаць нешта, што

мне будзе цяжка сказаць, а вам — пачуць: ваша пляменніца Мэры згаварылася з сэрам Джорджам Барнвэлам, і збеглі яны разам.

— Мая Мэры? Гэтага не можа быць!

— На жаль, гэта не толькі можа быць, але і ёсць. Ні вы, ні ваш сын не ведалі пра сапраўдную сутнасць чалавека, якога ўпусцілі ў сваё сямейнае кола. Гэта адзін з самых небяспечных у Англіі людзей: страшэнны гулец і абсалютна безнадзейны нягоднік, чалавек без сумлення і без сэрца. Ваша пляменніца нічога пра такіх людзей не ведае. Калі ён нашэптваў ёй свае клятвы — як сотням іншых жанчын да яе, — яна цешылася думкай, што здолела заваяваць яго каханне. Адзін чорт ведае, чаго ён ёй нагаварыў, аднак урэшце яна зрабілася яго паслухмянай цацкай і ледзь не кожны вечар бегала да яго на спатканні.

— Я не магу, не, я не хачу ў гэта паверыць! — твар банкіра пашарэў.

— А я раскажу вам, што мінулай ноччу адбылося ў вашым доме. Калі ваша пляменніца вырашыла, што вы адправіліся да сябе, яна праслізнула ўніз і праз акенца, што выходзіць на стайню, перагаварыла са сваім каханым. На снезе пад акном выразна бачныя яго сляды. Мэры расказала Барнвэлу пра дыядэму. Навіна распаліла яго заганную прагу да золата, і ён прымусіў яе падпарадкавацца гэтаму жаданню. Не сумняюся, што яна вас любіць, але бываюць жанчыны, у сэрцы якіх любоў да мужчыны выціскае ўсе астатнія прыхільнасці, і думаю, што Мэры — адна з іх. Ледзь паспела яна выслухаць яго план, як раптам убачыла, што вы спускаецеся ўніз, тут жа хуценька зачыніла акно і расказала вам пра аднаногага прыхільніка кагосьці з пакаёвак, што зрэшты было чыстай праўдай.

Артур жа адразу пасля вашай размовы адправіўся ў ложак, але з прычыны клубных даўгоў спаў вельмі дрэнна. У сярэдзіне ночы ён пачуў, як хтосьці мякка прайшоў міма яго пакоя, а таму падняўся і, вызірнуўшы вонкі, са здзіўленнем убачыў сваю стрыечную сястру, якая цішком крочыла па калідоры і раптам завярнула ў гардэробную. Збянтэжаны такой нечаканасцю, Артур нацягнуў нешта з адзення і стаіўся ў цемры, каб паглядзець, чым усё скончыцца. Неўзабаве Мэры выйшла з пакоя, і ў святле калідорнай лямпы ваш сын убачыў, што яна нясе каштоўную дыядэму. Яна пачала спускацца ўніз, і Артур, дрыжучы ад страху, праслізнуў за гардзіну ля вашых дзвярэй, адкуль мог добра бачыць, што адбываецца ў гасцёўні. Ён убачыў, як Мэры крадком адчыніла акно, перадала дыядэму камусьці, схаванаму ў змроку, а потым зачыніла яго і паспяшалася ў свой пакой, прабегшы зусім блізка ля месца, дзе хаваўся Артур.

У справу была ўцягнутая Мэры, а таму ваш сын не мог рашыцца на хоць нейкі крок, бо тады б яго каханай пагражала страшэннае выкрыццё. Але як толькі яна знікла, ён зразумеў, якой знішчальнай бядой зробіцца для вас гэты крадзеж і як важна як мага хутчэй з усім разабрацца. З гэтай думкай ён, апрануты, як і быў, басанож кінуўся ўніз, адчыніў акно, выскачыў у снег і сцяжынкай пабег да цёмнай фігуры, выхапленай з ночы месяцавым святлом. Сэр Джордж Барнвэл спрабаваў уцячы, але Артур яго злавіў, і паміж імі завязалася бойка: ваш хлопец спрабаваў вырваць дыядэму з рук свайго суперніка, той жа трымаў яе, як мог. У гэтым замяшанні Артур ударыў сэра Джорджа і трапіў таму ў вока. Раптам штосьці трэснула, хлопец адчуў, што дыядэма ў яго руках, тут жа пабег у дом, замкнуў акно, падняўся ў ваш пакой і толькі тады заўважыў, што ў бойцы каштоўнасць пацярпела. Калі вы ўвайшлі ў пакой, Артур акурат спрабаваў яе выпрастаць.

— Няўжо гэта магчыма? — выдыхнуў банкір.

— Абражаючы сына ў той момант, калі ён верыў, што заслугоўвае самай цёплай вашай удзячнасці, вы вельмі моцна яго распалілі. Расказаць усю праўду, не здраджваючы той, што была яго заступніцтва не вартая, ён не мог. А таму ён па-рыцарску захаваў таямніцу.

— Дык вось чаму яна ўскрыкнула і страціла прытомнасць, убачыўшы дыядэму! — выгукнуў містэр Холдэр. — О Божа мой! Якім сляпым дурнем я быў! А ён жа прасіў мяне дазволу выйсці з дому хаця б на пяць хвілін! Дарагі мой хлопчык хацеў пашукаць на месцы бою прапажу! Як жорстка я яго недаацаніў!

— Калі я прыехаў да вас, — працягваў Холмс, — то адразу ж вельмі старанна агледзеўся, каб знайсці на снезе сляды, якія маглі б мне дапамагчы. Я помніў, што ападкаў з мінулага вечару не было, а таму моцны мароз мусіў захаваць на снезе шмат цікавага. Я прайшоўся сцяжынкай да чорнага ўваходу, але ўсе адбіткі на ёй былі затаптаныя і нічога мне не далі. Аднак непадалёк ад кухонных дзвярэй я ўсё ж змог нешта расчытаць: там жанчына размаўляла з мужчынам, і круглыя сляды ўказвалі, што ў яго драўляная нага. Магу нават сказаць, што іх размову нехта перарваў, бо жанчына хутка заскочыла ў дом — пра гэта сведчыць адбітак наска, нашмат глыбейшы, чым след ад абцаса. Драўляная нага яшчэ трохі пачакала і таксама сышла прэч. У той момант я падумаў, што гэта мусілі быць пакаёўка са сваім прыяцелем, пра якіх вы расказвалі, і пазней мая думка пацвердзілася. Я абышоў увесь сад і не знайшоў нічога, апроч выпадковых адбіткаў, якія, відаць, належалі паліцыі, аднак калі я дабраўся да стайневай дарожкі, перада мной адкрылася доўгая і складаная гісторыя, напісаная на снезе.

На дарожцы былі дзве лініі слядоў мужчыны ў ботах і яшчэ дзве, пакінутыя, як я задавальненнем адзначыў, босымі нагамі. Успомніўшы вашы словы, я адразу ж упэўніўся, што другая пара адбіткаў належыць вашаму сыну. Мужчына ў ботах спакойна прайшоўся туды і назад, уладальнік жа босых ног паспешліва бег, а ўлічваючы, што сляды другога ідуць па адбітках першага, сын ваш, несумненна, кагосьці пераследаваў. Я пайшоў уздоўж гэтых лініяў і прасачыў іх да самага акна гасцёўні, пад якім боты ў чаканні вытапталі ледзь не ўвесь снег. Тады я прайшоў у адваротным кірунку і ярдаў праз сто ці каля таго ўбачыў, што боты павярнуліся. У гэтым месцы снег быў вытаптаны так, нібыта там адбылася бойка. Урэшце я знайшоў на снезе некалькі кропляў крыві, якія пацвердзілі, што я не памыліўся. Потым боты кінуліся прэч, і чарговая плямка крыві паведаміла мне, што іх уласніка ранілі. Ён выбег на вялікую дарогу, снег на якой быў счышчаны, а таму тут мая нітка абарвалася.

Увайшоўшы ў дом, я, калі памятаеце, з дапамогай лупы агледзеў падаконне і раму ў гасцёўні і адразу ж заўважыў, што праз акно хтосьці вылазіў. Заўважыў я таксама і абрысы адбітка, які застаўся там ад мокрай нагі. Тады ў мяне пачала вымалёўвацца ўява пра тое, што магло адбыцца. Нейкі мужчына чакаў за акном, пакуль нехта з дому перадасць яму каштоўнасць, ваш сын усё гэта падгледзеў і кінуўся за злодзеем у пагоню, пабіўся з ім, і калі кожны цягнуў дыядэму на сябе, разам яны нанеслі ўпрыгожанню такую шкоду, якую паасобку ніхто б нанесці не мог. Артур са здабычай вярнуўся ў дом, але ў руках яго суперніка застаўся адламаны фрагмент. Да гэтага моманту ўсё было ясна. Цяпер перада мной паўстала пытанне, кім быў рабаўнік і хто вынес яму дыядэму?

Я даўно трымаюся прынцыпу, паводле якога выключаю ўсё немагчымае, і тады застаецца толькі праўда, хай сабе і неверагодная. Я ведаў, што вы каштоўнасць вынесці не маглі, а таму застаюцца Мэры і пакаёўка. Калі б гэта была пакаёўка, навошта вашаму сыну падстаўляцца пад абвінавачванне? Ніякіх разумных прычынаў гэтаму няма. А сваю стрыечную сястру ён кахае, што бліскуча тлумачыць, чаму ён захоўваў таямніцу — таямніца гэтая была для Мэры ганебнай. Калі я ўспомніў, як вы сустрэлі яе ля акна і як яна страціла прытомнасць, убачыўшы дыядэму на месцы, мае падазрэнні перараслі ва ўпэўненасць.

Кім тады мог быць яе суўдзельнік? Відавочна, гэта яе каханак, бо што яшчэ, як не каханне, здольнае пераважыць тую любоў і ўдзячнасць, якую яна адчувала да вас? Я ведаю, што вы рэдка выязджаеце і што кола вашых сяброў вельмі абмежаванае. Але сярод іх быў і сэр Джордж Барнвэл. Я пра яго кепскую славу сярод жанчын чуў і раней. Менавіта ён мусіў стаяць у ботах пад акном і пасля забраць каштоўнасць. Ён мог цешыць сябе надзеяй, што нават калі Артур яго ўбачыць, то будзе маўчаць, каб не скампраметаваць сям'ю.

Ну, а цяпер ваш уласны здаровы сэнс падкажа, што я рабіў далей. Пад выглядам бадзягі я зазірнуў у дом сэра Джорджа, там пазнаёміўся з яго лакеем, даведаўся, што мінулай ноччу гаспадар параніў галаву і ўрэшце за шэсць шылінгаў здабыў пару яго старых чаравікаў. Разам з імі я скіраваўся на Стрытхэм і высветліў, што яны ідэальна супадаюць са слядамі.

— Учора вечарам я бачыў на сцяжынцы кепска апранутага валацугу, — сказаў містэр Холдэр.

— Усё правільна, гэта быў я. Я зразумеў, што злодзей у маіх руках, а таму вярнуўся дадому і пераапрануўся. Цяпер я мусіў заняцца вельмі далікатнай справай, бо ведаў, што суду і скандалу трэба пазбегнуць, а такі спрытны нягоднік абавязкова скарыстаецца тым, што рукі ў нас звязаныя. Я ўвайшоў у яго дом — сэр Джордж быў у сябе. Спачатку ён, безумоўна, усё адмаўляў. Калі я падрабязна яму ўсё апісаў, ён пачаў мне пагражаць і схапіў са сцяны цяжкую дубінку. Аднак я быў падрыхтаваны і таму перш, чым ён паспеў ударыць, прыставіў да яго скроні пісталет. Ён адразу ж зрабіўся лагаднейшы, і я сказаў, што мы гатовыя выкупіць камяні за 1000 фунтаў кожны. Тут на яго твары з'явіліся першыя прыкметы маркоты.

— Чорт вас падзяры! — вылаяўся ён. — Я ўжо аддаў усе тры за шэсцьсот фунтаў!

Паабяцаўшы крымінальную справу супраць яго не пачынаць, я выпытаў у сэра Джорджа адрас скупшчыка, адправіўся да яго і пасля доўгіх спрэчак вярнуў камяні па 1000 фунтаў за штуку. Потым зазірнуў да вашага сына, паведаміў яму, што ўсё ўладжана, і ў выніку каля дзвюх гадзінаў начы дабраўся да свайго ложка пасля цяжкога працоўнага дня.

— Дня, які ўратаваў Англію ад вялікага публічнага скандалу! — падымаючыся, сказаў банкір. — Я не магу знайсці словаў для падзякі, сэр, але вы ўпэўніцеся, што няўдзячным мяне не назавеш. Вашы здольнасці перавышаюць усё, што я пра іх чуў. А цяпер я мушу бегчы да майго дарагога хлопчыка і выбачыцца перад ім за свае падазрэнні. Што да маёй беднай Мэры, то яна ўразіла мяне да глыбіні душы. Баюся, нават вы не зможаце цяпер яе знайсці.

— Думаю, мы можам не сумнявацца, — адказаў Холмс, — што яна цяпер там, дзе і сэр Джордж Барнвэл. Няма сумневаў і ў тым, што, якімі б ні былі яе грахі, хутка яе чакае больш чым дастатковае пакаранне.

**Пераклад з англійскай Ганны Янкута**

КАЗКА

# КАРАЛЕЎСКАЕ ПАЛЯВАННЕ

Зміцер ДЗЯДЗЕНКА

Фота Ю.Дарашкевіч

— Ваша Каралеўская Мосць! — запыханы канцлер уварваўся ў спачывальню, збіўшы па дарозе слугу, які не паспеў дастаткова шырока адчыніць дзверы. Парык у канцлера збіўся набакір, праз пудру на твары праступілі чырвоныя плямы.

«Не так, — з уздыхам падумаў слуга, неўпрыкмет пацiраючы пабіты бок і размінаючы адтаптаную нагу, — не так павінен выглядаць дзяржаўны муж, які прыходзіць на прыём да караля. Драбнеюць сённяшнія саноўнікі...»

Ён засоп і стаў падумваць, як бы наступіць цяпер на нагу канцлеру. Пажадана, канечне, зрабіць гэта так, каб выглядала зусім нявінна, незнарок. А то помста такіх дробных зласлівых людзей, надзеленых да таго ж уладаю, бывае неапраўдана жорсткай...

Канцлер жа нават не заўважыў збітага ім слугу. Ён схіліўся ў паклоне перад каралеўскім ложкам, ад чаго скасабочаны парык з'ехаў яшчэ болей:

— Ваша Каралеўская Мосць! У нас надзвычайнае здарэнне!

— Вайна? — каралеўскі твар запраменіўся надзеяй

— Не, Ваша Мосць.

— Не вайна? — караля перасмыкнула. Цяпер ягоны твар паказваў адно толькі неўразуменне. — А чаго ж ты тады так крычыш? Якое яшчэ надзвычайнае здарэнне?

Канцлер наблізіўся да караля і сказаў даверлівым паўшэптам, выразна вымаўляючы кожнае слова:

— Цень, Ваша Мосць! Незвычайны цень над каралеўскім садам! Ён накрыў толькі каралеўскі сад, увесь замак і горад залітыя бліскучым сонцам.

Канцлер яшчэ раз пакланіўся й адышоў на крок далей.

— Цень... Хмм... І што ён робіць над маім садам?

— Накрывае яго, Ваша Каралеўская Мосць. Вось ужо некалькі гадзінаў, — канцлеру нарэшце ўдалося справіцца з сваім хваляваннем.

Яго Каралеўская Мосць выказаў жаданне пазнаёміцца з такой забаўнай прыроднай з'явай і на свае вочы ўбачыць дзівосны цень, які так беспардонна абыходзіцца з каралеўскім садам.

Дзеля такой незвычайнай нагоды апрануўся кароль надзвычай хутка — слугі справіліся за нейкія паўгадзіны. Праўда, крыху затрымаў каралеўскі куафёр: адзін локан усё не хацеў класціся паводле ягонае задумы. «Нават фрызура Вашае Каралеўскае Мосці выказвае сваю непахісную валадарскую волю», — ліслива зазначыў куафёр і ціхама паплёваў на руку, якой прыгладжваў непаслухмяны локан.

Падчас цырымоніі апранання слуга з адтаптанай нагой здолеўткі папомсціцца канцлеру. Перадаючы каралеўскія пантофлі, ён змудрыўся правесці падэшвай па канцлерскай вопратцы. Цёмная паласа на беласнежным жабо цяпер цешыла душу слугі. Асаблівай радасці дадавала тое, што канцлер не заўважыў вінаваўцу здарэння...

У садзе кароль пераканаўся, што сапраўды на ім ляжыць цень. Цень, якога не было на замку.

Цень накрываў і ўлюбёныя каралеўскія яблыні: салодкую медунічку і кіслую антонаўку, каштэлю і штрыфель. Цёмнае покрыва легла на каралеўскія грушы: на дзюшэс і сапяжанку, на цукроўкі і бэры. Замаркоціліся пад ценем ерусалімскія слівы й слівы-вянгеркі. Нават кустоўе ў каралеўскім садзе стаяла пад ценем: не пазбеглі яго ні парэчкі, ні маліны... Кароль уважліва агледзеў дрэвы і кусты — заўважнай шкоды цень ім пакуль што не ўчыніў, але ж ці мала што можа здарыцца!

— Ну, канцлер, і як вы гэта патлумачыце?

— Ваша Мосць, мы ўжо задавалі пытанне пра паходжанне гэтага ценю самым абазнаным навукоўцам нашага каралеўства — ніхто не можа даць пэўнага адказу. Кажуць — анамалія...

У гэты момант кароль пабачыў садоўніка, які стаў збоку:

— А ты што скажаш? Можа, ты ведаеш, адкуль узялася гэтая бяда на сад, даручаны твайму догляду?

Садоўніку дагэтуль не ўдавалася сказаць ніводнага слова: канцлер быў упэўнены, што неадукаваны стары не можа даць рады там, дзе спасавалі найлепшыя навуковыя розумы каралеўства. Цяпер у яго нарэшце з'явілася магчымасць выказацца.

Садоўнік павёў караля на ўскраек саду, да зарасніку глогу. Гэта было хіба адзінае месца, дзе злавесны цень не проста вісеў над садам, а рухаўся. Ён трапятаўся, нібы баяўся пакалоцца аб галінкі глогу. Менавіта на гэты рух і паказаў каралю стары садоўнік. А потым моўчкі тыкнуў пальцам у неба. Твар садоўніка ззяў радасцю — ягоны трыумф!

Над садам у небе вісеў цмок. Ягоныя тапазавыя вочы з вертыкальнымі зрэнкамі з зацікаўленнем назіралі за мітуснёй людзей унізе. Кармазынавыя крылы лёгка неслі цмока ў паветры, ён толькі зрэдку ўзмахваў імі, каб трымацца зверху. Гэтае ўзмахванне і бачылі знізу кароль і садоўнік, калі назіралі рух ценю.

— Гмм... А чым нам гэта пагражае, канцлер? — кароль задумаўся.

— Я думаю, Ваша Мосць, нам варта знішчыць гэтага нахабу.

Цмок выцягнуў шыю, прыслухоўваючыся да гаворкі ўнізе. Словы канцлера яму, відавочна, не спадабаліся: ён абурана чмыхнуў, пусціўшы лёгкі струменьчык дыму.

Канцлер махнуў рукой. Паслухмяныя ягонаму знаку ў сад выбеглі каралеўскія гвардзейцы на чале з капітанам. Караля зацікавілі іх чорныя кірасы.

— Чаму такі незвычайны колер? Навошта вы іх так пафарбавалі?

— Гэта не фарба, Ваша Каралеўская Мосць, — адрапартаваў капітан. — Гэта тэфлонавы слой.

**Не прагоніш цмока — зазлуе кароль. Прагоніш — трапіш у няміласць да прынцэсы... Але кароль важней: прынцэса мяне канцлерам не прызначыць. А кароль можа і прызначыць, і зняць...**

— Навошта? — у голасе караля гучала жывая зацікаўленасць такім новаўвядзеннем.

— Каб гвардзейцы ў сонечныя дні не прыгара... не спякліся, — выправіўся капітан. — Тэфлонавы слой, як вядома, аберагае ад апёкаў.

Па тварах гвардзейцаў, не зважаючы на тэфлонавыя кірасы, усё адно каціўся пот. Пераход у цмокаў цень яны прынялі як збавенне. Таму з вялікай неахвотай узнялі аркебузы, наставілі іх у неба...

— А можа, ён рэдкі від? — выказаў меркаванне садоўнік.

— Сапраўды, канцлер, магчыма, перад намі рэдкі від жывёлы. Мы яго зараз застрэлім, а суседнія каралеўствы нас потым засмяюць. Скажуць, не разабраліся і знішчылі апошняга цмока, — кароль вагаўся, прымерваючыся да міжнародных наступстваў такога палявання. — Ой, вы мяне прымусілі-ткі задумацца: у мяне ж так з'явяцца зморшчыны на лобе!

— А, можа быць, мы яго проста прагонім? — з канцлера проста біў фантан ідэяў. Кароль хітнуў галавой, літасціва пагаджаючыся з такім рашэннем.

Цмок апусціўся ніжэй над садам, выцягнуў шыю да каштэлі і злізнуў яблык. Пасля гэтага пакатаў яго на языку ды стаў павольна жаваць.

— Ты што? Гэта ж зеляпуха! Жывот балець будзе! — садоўніку не хапала словаў, каб суняць дурнаватую жывёлу.

Верагодна, цмоку таксама яблык падаўся занадта кіслым і няспелым. Ён сплюнуў недагрызак, пацэліўшы па канцлеру. Нядаўна папраўлены парык адразу ж зноў з'ехаў набок. Саноўнік пагразіў нахабе кулаком:

— Зараз ты ў мяне атрымаеш!

Не зважаючы на суперніка, цмок пакінуў у спакоі яблыні й стаў прымерваццa да сліваў.

На канцлерскі знак гвардзейцы адставілі аркебузы і ўзялі ў рукі рагаткі. Аднак усе намаганні стралкоў былі марнымі: зарады папросту не далятаці да цмока. Тады было вырашана скарыстацца надзвычайнай мерай: у сад выцягнулі велічэзную паўтарамятровую рагатку. Яе ўмацавалі пад нахілам, каб было зручней страляць уверх. Каралеўскае паляванне на цмока нарэшце пачалося!

Першы стрэл не нанёс цмоку ніякай шкоды, хаця й трапіў некуды ў жывот. На дыямантавай скуры не засталося нават следу.

— Ваша Мосць! Мы патрапілі! Толькі дзякуючы вашаму генію й непасрэднаму кіраўніцтву нашай вайсковай аперацыяй мы здолелі падстрэліць агрэсара. Цмок ужо смяротна паранены! — канцлер не мог схаваць радасці. — Яшчэ крыху — і перамога будзе за намі!..

— Што ў вас тут адбываецца? — прагучаў дзявочы голас аднекуль зверху. З высокага вакна выглядала прынцэса. Светла-рудыя валасы хваляй ліліся па плячах, не закрытых лёгкай шыфонавай сукенкай.

Дзяўчына ўважліва агледзела караля, канцлера, гвардзейцаў з рагаткай. І тут яна заўважыла цмока:

— Ой, які прыгожы!

Мяркуючы па задаволенай усмешцы, цмок быў цалкам згодны з такой ацэнкай. Ён павярнуўся ў палёце, бліснуўшы рубінавым бокам, каб паказаць, што ён прыгожы з усіх бакоў. Прынцэса з захапленнем сачыла за палётам дзівоснага звера.

І тут яна зноў паглядзела на рагатку.

— Дык вы збіраецеся ў яго страляць з гэтага? — у дзявочым голасе гучала абурэнне. — Гэтак нельга! Я забараняю! Я патрабую не рабіць так!

Кароль, які прадчуваў такі паварот сітуацыі, паспеў прадбачліва сыйсці, пакуль цмок кружляў, падстаўляючы бакі сонечным промням. У садзе засталіся толькі канцлер і гвардзейцы.

«Вось яна, цяжкая доля саноўніка! — падумаў канцлер. — Не прагоніш цмока — зазлуе кароль. Прагоніш — трапіш у няміласць да прынцэсы... Але кароль важней: прынцэса мяне канцлерам не прызначыць. А кароль можа і прызначыць, і зняць...»

Ён адчайна махнуў гвардзейцам заціснутай у руцэ карункавай батыставай хустачкай: працягвайце страляць па гэтым страшыдле!

Чарговы снарад з гіганцкай рагаткі пацэліў у цмока, якраз калі той падміргваў прынцэсе. Звер закрыў вочы і, склаўшы крылы, стаў валіцца ў сад — проста на канцлера і гвардзейцаў. З спалоханымі крыкамі тыя кінуліся ўцякаць і таму не бачылі, як за пару метраў ад зямлі цмок распрастаў крылы. Ён зноў узляцеў у неба і радасна запыхцеў.

Канцлер гэтага не бачыў: ён спяшаўся да караля. Гэта была яго, канцлерава, перамога. І паведаміць пра гэтую перамогу ён павінен быў сам, ніхто не мусіў перашкодзіць яму ў гэты момант трыумфу.

— Ваша Каралеўская Мосць! — закрычаў ён, забягаючы ў залу. — Вораг нізрынуты! Мы перамаглі! Гэта была слаўная бітва, пра якую напішуць песні й складуць легенды! Увесь гонар гэтай перамогі належыць вам!

Кароль скептычна паглядзеў на канцлера. Скрывіўся і паказаў на вакно:

— А гэта ты бачыў, *пе-ра-можца?*

У блакіце неба на кармазынавым цмоку ляцела прынцэса. Шчаслівы дзявочы смех было чуваць нават у замку.

ТАТАВЫ НАТАТКІ

# ПАЦАЛУНАК У НЕБА

Аднойчы мы гулялі ў мінскім парку-музеі валуноў з дзецьмі. Малодшая дачка папрасілася на рукі, бо стамілася. Я, вядома ж, падпарадкаваўся. Лежачы ў мяне на руках, яна глядзела ў неба, і мне вельмі захацелася яе пацалаваць. Але, калі паспрабаваў гэта зрабіць, дачка спрытна ўхілілася, сказаўшы: «Тата, ты калючы!» То бок спачатку ідзі пагаліся, а пасля ўжо з пацалункамі лезь. Яна працягвала ляжаць, гледзячы ў неба, і пасміхацца: «Толькі неба ты, тата, пацалаваў». Маўляў, у такім стане ўсё, што над ёй, было для яе небам…

Цягам некалькіх гадоў я занатоўваю розныя перліны, фразачкі, пацешныя слоўцы сваіх дзяцей. Калісьці ў ЖЖ, дзе шмат чаго падобнага змяшчалася пад тэгам «Гадуны» (такое слова прыдумалася для дзетак, калі яны яшчэ толькі-толькі пачыналі казаць свае першыя гукі), занатавалася наступнае: «Бацькі-песімісты бачаць у сабе абслуговы персанал. Бацькі-аптымісты вераць, што «дзесьці калісьці наперадзе» ўсё ВЕРнецца. Бывае, што цягам дня даводзіцца пабыць і адным, і другім». Вось жа, вяртаецца, і значна раней, чым уяўлялася тады, калі здавалася, што не скончацца ніколі вірусы і памперсы. І дзякуй Богу!

Такім чынам, галоўныя дзейныя асобы: Яна (на цяперашні час 8 гадоў), Данік (6 гадоў), Насця (4 гады), матуля і татуля.

**Анатоль Івашчанка**

## 2009 г.

**«Ціцёк»**

Ідзе рэклама пра «Аліварыю». Яна паказвае рукой на тэлевізар і кажа: «Тацін ціцёк» (Татаў сачок).

Калі Яне было 4 гады, яе непакоілі нервовыя цікі.

Яна (не жадаючы засынаць): «Ты ведаеш, мне ўжо новае вочка паставілі. Маргучае — каторае мыргае — другому хлопчыку аддалі…»

Яна: «Я так люблю кавун! Так люблю! Я яго ніколі не спрабавала».

Яна хоча дастаць канат з комплексу. Кажа: «Я абяцала пакатацца на канаце» «Каму ты абяцала?» Некалькі секундаў роздуму: «Я, я… сабе абяцала»

**Смак ката**

Адкрываю слоічак з дзіцячым харчаваннем. «Глядзі, якая смаката!» — кажу. Яна: «О, пюрэ са смакам коціка? Люблю!»

Яна (3 гады) на ўнітазе. Толькі нядаўна перасела з гаршка. «Ой, мне трэба памагчы». Я падаю ёй руку, яна грацыёзна сасковае на падлогу й кажа: «Дзякуй табе, мой друг-памочнік!»

Варыянт. Будуем з Янай канструктар. Яна: «Тата, што ты робіш?» «Памагаю табе будаваць» «Дзякуй табе, мой друг!»

Прыгадваем вершык пра Таню. Я (з паўзамі): Наша Таня громко… плачет. Уронила в речку… мячик. Тише, Танечка, не плачь… А далей як? Яна (з секундным замяшаннем): Прыгай в речку — достань мяч.

**2 пытанні і 1 адказ**

Сусед па кватэрным блоку бацькоў (гэткі тыповы прадстаўнік новае хвалі менскае ліміты, пажарнік, звычайна крыху нападпітку, з якім мы даўно не сустракаліся, а ў яго ўжо павырасталі сыны-дубкі, якіх я памятаю шчэ жалудамі), убачыўшы, што я вылажу з машыны (каб адшпіліць Яну і Даніка), з павагай у голасе і ўхвальным кіўком у бок аўто: «Што, тваё?..» Я, упэўнены, што гаворка пра дзетак: «Маё. А чыё ж»… Заходзім у пад'езд, ля ліфта ён зноў пытаецца (ужо з меншай павагай), указваючы на дзетак: «Што, твае?» Я (зразумеўшы, дарэчы, хвілінай раней тое квіпрокво): «Мае. А чые ж»…

**Паўтары**

Яна задуменна сядзіць за сталом. Проста сядзіць, нічога не робіць. Штосьці абдумвае. Я прашу: «Яна! Хадзем чысціць зубы» Нуль рэакцыі. Паўтараю просьбу. Нуль рэакцыі. Я пачынаю злаваць: «Добра. Цяпер, калі Яна будзе пра штосьці просіць, я таксама буду маўчаць у адказ». Яна спалохана: «Тата, добра-добра. Паўтары, пра што ты спытаў?..»

Варыянт: «Яна, колькі разоў цябе прасіць?..» Яна загінае пальцы: «Чатыры». Я без інтанацыі: «Яна, хадзем чысціць зубы» — 4 разы. Пасля чацвёртага разу Яна спакойна ўстае й ідзе выконваць просьбу…

**Мужык**

Яна засынаючы (спалоханым голасам): «Мама, Мама! Дзе мужык?..» Мама ў жаху, думаючы, што дачцэ ізноў штосьці прымроілася ў цемры: «Які мужык?» «Ну, тата, наш мужык»…

**Фікнэс і топлес**

Яна пасля садка: «Тата, запішыце мяне на фікнэс! Праўда, туды дзевачак не бяруць, але вы запішыце»…

Яна на гуртку народных спеваў развучвае новую песню, якую гучна спявае дома: «Раз, два, тры чатыры, мяне грамаце вучылі, не чытаць, не пісаць, толькі топлесам скакаць» І ве-ельмі не адразу разумеем, чаму насамрэч вучылі гераіню — поплесам скакаць.

Яна, калі маці кажа, каб даела кашу: «Не магу. У мяне засталася толькі кругленькая дзірачка ў зівоціку — для цукеркі-гароська»…

**Д.Н. рыбы**

Сёння зранку дзеці (Яне два з паловай, Даніку толькі годзік споўніўся) святкавалі дзень народзінаў гумовай рыбы. Засервіравалі паляну: дасталі пластмасавыя талерачкі, лыжачкі, «торт» са свечкамі, зрабілі фаерверк… А пасля Яна кажа: «Данік! А давай яе з'ядзім!..»

Жонка выгнала малых з кухні, каб не заміналі гатаваць. Яна — да Даніка: «І што ж нам цяпер есці? Алоўкі, машыны, шафу? Пайшлі з'ядзім шафу»…

## Восень 2010

Яна: «Ой, каштанчык! Я буду з ім спаць. Гэта каштан-волат. Я яго люблю». Я: «Любіш каштан?» Яна (не задумваючыся, цалкам сур'ёзна): «Так, гэта вельмі складанае пачуццё»…

Я: «Добрай ночы, рабяткі»
«Мы не крэветкі!»

Данік ляжыць у дзіцячым пакоі на маце й крычыць-паўтарае: «Тата! Тата! Ну, тата-а!» Я (з кухні гучна): «Што, Дані-ік?» Данік разгублена: «Нінаю» (не знаю).

Данік (2 гады, трымаецца за вока): «Яна, ты мне ў вока трапіла!» Яна: «Нічога страшнага». Данік (разгублена): «Калі хочаш, я табе гэта дарую».

**Падарунак**

Я ад'язджаў у Менск з Барысава на тры ўніверсітэцкія пары. Вярнуўся позна, высмактаны тэхнарамі і дарогай. Вядома ж, ніякіх падарункаў не прывёз, бо не было як штосьці набыць. Данік сустракае ў дзвярах традыцыйным: «Тата! Ты што прывёз?» А ў мяне ў руках — толькі пакецік з мылам і ручніком. Данік зазірае ў пакет і бачыць там чырвоную мыльніцу. «Тата прывёз нам мыла! Ура! Тата, ты маладзец, ты сапраўдны друг»… Увесь вечар мне дзячыў за такі цудоўны падарунак…

Яна: «Мама, Данік на мяне наляцеў. Як шалёная лягушка (паказвае, як). Давай яго пакінем у Бабы Наты?»

Яна некалькі дзён у Бабы Наты (хварэе). Данік, кладучыся спаць увечары, трагічным голасам нараспеў: «Мне сумна без мамы і таты. Я зноў адзін у цемнаце».

## 2011 г.

Данік (на гаршку, куды ён пагадзіўся сесці за цукерку з умовай станоўчага выніку): «Я канесна не хацеў сібе такіх маму і тату». Я: «А якіх жа ты хацеў?» «Такіф, сьтоб не піледлагалі мне какаць». Праз нейкі час паўтарыў гэтую ж тэзу.

Яна, забягаючы на кухню (за ёй Данік): «Дайце мне цукерку, не то я ад вас не адстану!»

Данік: «Яна, хадзем гуляць у дочкі-мацеры! Я буду мацерам». Яна: «Не, я буду мацерам. Таму што ў мяне чароўны посах».

Мы: «Яна, вас жа ў садзіку вучаць чытаць і пісаць?» Яна: «Не. Нас у садзіку толькі прымушаюць іграць».

У садку ў Данькавай групе «мясцовыя» дзяўчаты размаўляюць з Янай. Яна: «Я узе ў групе для бальшуноў…» Потым знаёмяцца. Адна дзяўчынка. «Мяне завуць Яна». Яна: «І мяне Яна. Толькі любімая»

**Чужынец**

Я пагаліўся. Яна: «А што — у цябе чолка вырасце вось так (паказвае), да? А ў мамы вось так (паказвае)?» «Чаму ты так вырашыла?» «Таму што мужчына павінен заўсёды ўсё бачыць. Каб ведаць, дзе вораг. Ну, каб абараніць нас, сваіх жанчын». Далей ідзе пантаміма з дапамогай кулачкоў: «Вот нападае на нас чужынец, а ты яму — на! Палучы!..»


Фота Аліны Века

Яна, Данік і Насця

Едзем з Данікам да лагапеда. Данік глядзіцца ў люстэрка задняга віду: «Чаму я бачу машыны, каторыя едуць ззаду?» Я: «А ты хочаш бачыць сябе?» Д.: «Не, я з сабой не дружу» «Чаму? Ты што — сабе не падабаешся» «Так» «Чаму гэта?» «Таму што я… кудравы» Я пачынаю запэўніваць яго, што кучаравасць — гэта вельмі добра, шмат хто марыць быць кучаравым. «Добра. А на каго ты хочаш быць падобным?» Маўчыць. «Напрыклад, на Арыстарха — не хочаш?» «Арыстарх таксама часам бывае кудравым» «Ну а на каго ты хочаш быць падобным?» Данік (цалкам сур'ёзна і не раздумваючы): «На Яну»…

Данік, гледзячы ў вакно ў садку восеньскім надвячоркам: «Мокрая ноч».

Я: «Данік, калі ж ты ўжо пойдзеш у садзік?!» (Данік тыдзень сімулюе). Д.: «Тата! Ну адкуль жа я ведаю, у колькі выздараўлю?!»

Я: «Яна, адзявайся скарэй, на службу спознімся» Яна: «На якую?» «На царкоўную» «Што, у цырк?» «Не, у царкву» «А, царкоўная падобна на цырковую»

## 2012 г.

Данік — на лесвіцы, просіць Яну падкласці яму мат. І далей: «Калі я ўпаду, я зусім буду шкілетам».

Данік: «Мне 5, Яне 6. Што, Яна першая паляціць на воблачка, і я буду жыць адзін? Без сястры?!..»

Яна (6 год): «Мне здаецца, што ўсе мы жывем у кнізе, якую хтосьці чытае…»

Данік: «Тата, а ты помніш сваё дзяцінства?» «Ну, так» «А ў цябе твар змяніўся?..»

Яна: «Я так сумую па моры»
Насця: «А я па дачы»
Данік: «А я па нашым будучым доме»…

Данік: «Мама, ты зараз глядзіш на мяне, быццам не любіш альбо быццам ад мяне дрэнна пахне».

**«Дзіцячыя» пытанні**

«Якая лічба апошняя?»
«Што ядуць у Раі?»
«А ў Раі спяць?»
«Хто стварыў Божаньку?»
«А ў Божанькі ёсць крыжык?»
«А што вышэй — сонца ці Бог?» (на гэта Яна не задумваючыся адказвае: ты што, канешне Бог вышэй).

**«Наш дом»**

Забіралі з Данікам жонку з Бараўлянаў (яна там у лякарні на стажыроўцы). Праязджаем міма цясцёвага дому. А там — будоўля, катлаваны, краны… Данік кажа: «Эх, шкада, што наш дзед Саша урачом працуе, а не на пад'ёмным кране». Я: «Чаму? Хочаш на кран залезці?» Данік (яшчэ скрушней уздыхнуўшы): «Не. Ён бы тады нам наш дом пабудаваў».

**Лекі**

Прабабуля Таіса раскладае на ложку пакецікі з лекамі. Падыходзіць Яна (7 год). Бабуля: «Вось гэныя ад нырак, гэныя ад печані, гэныя ад галавы»…

Яна: «Што, ліквідуюць усё гэта?»

**Пудзіла**

Едзем з дачкой па трасе, праязджаем міма фігуры кардоннага дэпээсніка на фоне яго кардоннай машыны. Яна: «Тата, гэта што — пудзіла міліцыянера?» «У прынцыпе, так»…

ЛЕКТОРЫЙ

# ДА ГІСТОРЫІ МІФА

Анатоль СІДАРЭВІЧ

**У нашай гісторыка-літаратурнай навуцы (як і ў гісторыях іншых літаратур) ёсць міфалагемы і міфы, якія бытуюць не ў вуснай традыцыі (анекдоты, пераказы чутага і да т. п.), а зафіксаваны ў друкаваных тэкстах.**

Мне даводзілася пісаць пра міфалагему «кажушок ад Янкі Купалы». Перш адзін аўтар расказаў, што Купала перадаў той кажушок у турму зняволенаму Антону Луцкевічу. Праз колькі часу другі аўтар (пэўна, не чытаўшы першага) напісаў, што Купала ў той самы час (хапун заходнебеларускіх дзеячаў) перадаў у турму яшчэ адзін кажушок — на гэты раз Аляксандру Уласаву.

Дзякуй Богу, байкі пра «кажушкі ад Купалы» ўдалося спыніць. Але няма ніякай гарантыі, што ніхто не ўзновіць, напрыклад, міф аб брашуры, якую да 50-годдзя Песняра нібыта выпусціла падпольная Камуністычная партыя Заходняй Беларусі. Міф гэты я сустрэў у двух выданнях: у энцыклапедычным даведніку «Янка Купала» і ў Поўным зборы твораў паэта. А выдумка гэтая абвяргаецца лёгка: не магла падпольная друкарня выпусціць брашуру з фотаздымкам, бо тады тэхніка вырабу клішэ была даволі складаная, і нават не ўсе легальныя друкарні мелі належнае абсталяванне. Электрагравіравальны ж апарат быў вынайдзены акурат у 1932 годзе. Для падпольнай друкарні гэта была даволі грувасткая прылада, якую правезці цераз нямецка-польскую мяжу у абход памежнай службы і мытні было практычна немагчыма. Да таго ж машыну належала падключыць да электрасеткі. Ды яшчэ патрабаваўся падрыхтаваны спецыяліст.

Няма сумневаў, што брашуру да 50-годдзя Янкі Купалы аддрукавалі ў Менску і перакінулі яе наклад у Заходнюю Беларусь. І было тое выданне своеасаблівым адказам на выдадзеную ў Вільні лекцыю Антона Луцкевіча «Янка Купала як прарок Адраджэння».

Яшчэ адзін міф датычыць асобы Браніслава Эпімаха-Шыпілы. Ён і Купалу ў Піцер запрасіў, і прытуліў яго на сваёй кватэры, і ўладкаваў на вучобу, і нават узяў яго на поўнае ўтрыманне, як сцвярджаў удзельнік Усебеларускага з'езда Язэп Сушынскі. З Эпімахавай ініцыятывы, кажа міф, была створана выдавецкая суполка «Загляне сонца і ў наша ваконца», а сам Эпімах-Шыпіла стаў яе фактычным кіраўніком.

Можна і трэба зразумець, чаму такое ці амаль такое друкавалася, напрыклад, у выдадзеным у 1986 годзе энцыклапедычным даведніку «Янка Купала» (с. 238, 676), але практычна тое ж сцвярджаецца і ў XXI стагоддзі. Каб упэўніцца ў гэтым, дастаткова пагартаць Беларускую Энцыклапедыю (т. 6, с. 496; т. 18, с.143–144). А тым часам да сярэдзіны 1990-х мы мелі ўкладзены Генадзем Кісялёвым зборнік дакументаў і матэрыялаў «Пуцявінамі Янкі Купалы» (1981) і ўгрунтаваныя на архіўных матэрыялах даследаванні Юрыя Туронка, з якіх вынікае, што Купалу ў Пецярбург запрасіў Вацлаў Іваноўскі, што першыя паўгода паэт быў прапісаны на кватэры выдавецкай суполкі «Загляне сонца...», што ініцыятарам стварэння суполкі і яе кіраўніком быў пачынальнік беларускай кнігавыдавецкай справы XX ст. В. Іваноўскі (7 снежня споўнілася 70 гадоў з дня ягонага забойства), што Б. Эпімах-Шыпіла ў складаны для суполкі час быў адышоў ад яе спраў і прапанаваў ёй пашукаць іншую кватэру для юрыдычнага адрасу...

Міф пра Эпімаха Шыпілу мае сваіх «бацькоў». І ў гэтым артыкуле я паспрабую паказаць, як гэты міф ствараўся.

Першы тэкст пра Эпімаха-Шыпілу апублікаваў, наколькі мне вядома, у адным-адзіным нумары часопіса «Варта» (1918) нехта Ант. Саросек. Можна было б думаць, што за гэтым псеўданімам хаваўся прамотар выдання Язэп Варонка, які ў дарэвалюцыйны час уваходзіў у беларускае кола ў Піцеры, але 9 кастрычніка г. г. у газеце «Наша слова» з'явіўся артыкул Яраслава Грынкевіча «1700-годдзе Міланскага эдыкту і Беларусь», з якога вынікае, што ў 1913 годзе ў Мастоўскай рыма-каталіцкай парафіі служыў ксёндз Й.-В. Саросек. Узяўшы пад увагу гэты факт і тое, што прозвішча Сарасек (менавіта гэтак вымаўляюць яго на Гродзеншчыне; Саросек — вымаўленне польскае) даволі распаўсюджанае, можна дапусціць, што Ант. Саросек — сапраўднае імя і прозвішча чалавека, які ведаў Эпімаха-Шыпілу і, не выключана, быў яго вучнем.

Тэкст Ант. Саросека неадназначны. <...> Ёсць у тым тэксце і няпэўнае. Так, Ант. Саросек пісаў, што Эпімах-Шыпіла — «летапісец і вартаўнік беларускага руху». Гэтыя словы трэба ўспрымаць хутчэй яе мастацкі прыём, бо, наколькі вядома, Эпімах Шыпіла не вёў летапісу беларускага руху і не быў яго актыўным удзельнікам (калі гаворка пра палітычны складнік гэтага руху). Цяжка сказаць, у чым канкрэтна выражалася роля Эпімаха-Шыпілы як вартаўніка беларускага руху, бо вядома, што ён не ўплываў на лёсавызначальныя рашэнні і Вялікай Беларускай Рады, і Усебеларускага з'езда, і Рады Беларускай Народнай Рэспублікі... Наўрад ці можна згадзіцца і з цверджаннем, што ад моманту заснавання суполкі «рука і вока» Эпімаха-Шыпілы «было ва ўсіх культурных беларускіх гуртках Пецярбурга і Вільні».

Нарэшце, у тэксце Ант. Саросека ўтрымлівалася непраўдзівая інфармацыя. Аўтар абвясціў Б. Эпімаха-Шыпілу «старшынёй вышэй памянёнай выдавецкай суполкі», а таксама старшынёй «Таварыства ізучэння культурна-прамысловага стану Беларусі» (пад апошнім, пэўна, меўся на ўвазе Беларускі літаратурна-навуковы гурток студэнтаў Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта).

Цяжка сказаць, чым кіраваўся Ант. Саросек, падаючы такую непраўдзівую інфармацыю. Затое можна цалкам патлумачыць прычыны непраўдзівых сведчанняў, якія ўтрымліваюцца ў артыкуле З. Ж. (Зміцера Жылуновіча) «Праф. Б. І. Эпімах-Шыпіла як піянер беларускага руху» («Савецкая Беларусь», 1924, 25 снежня). На гэтыя прычыны ўказвае ўзяты ў дужкі падзагаловак артыкула: «Да выдання пачэснай пенсіі СНК Бел. Рэспублікі». Дзеячы БССР, якія ведалі Эмімаха-Шыпілу ў дарэвалюцыйны час і якіх ён прывеціў, зрабілі ўсё належнае, каб сталаму дзеячу была прызначана пенсія. Мабыць, Зм. Жылуновіч лічыў, што дзеля гэтага можна пагрышыць супраць ісціны і прыпісаць Эпімаху-Шыпілу і тое добрае, чаго ён не рабіў.

Усім, хто вывучаў гісторыю беларускай літаратуры пачатку XX ст., вядома, што выдавецкая суполка «Загляне сонца і ў наша ваконца» выдавала таксама альманах «Маладая Беларусь». Вядома таксама, што да выдання альманаха непасрэднае дачыненне меў Я. Купала. Не менш вядома, што ў другім сшытку гэтага альманаха (1912) была змешчана першая аўтабіяграфія Цішкі Гартнага і нізка яго вершаў. На аснове гэтай падборкі ў 1913 годзе суполка выдала зборнік «Pie ni». Аднак пралетарскі паэт не мог пахваліцца ў БССР, што суполкаю, якая выпусціла яго першую кніжку, кіраваў сын памешчыка і цывільнага генерала, у дарэвалюцыйны час дацэнт Тэхналагічнага інстытута ў Пецярбургу, а ў той час, як пісаўся артыкул для «Савецкай Беларусі», — прафесар «панскага» Політэхнічнага інстытута ў Варшаве Вацлаў Іваноўскі. З палітычнага гледзішча больш выгадна было «паставіць» на чале суполкі палітычна нейтральнага і нават наёмнага работніка, ледзь не «пралетара разумовай працы» Эпімаха-Шыпілу (што гэты «пралетар» меў фальварачак і выкладаў у Духоўнай акадэміі, мэтазгодна было маўчаць).

Трэба мець на ўвазе, што ў грамадстве, афіцыйнай ідэалогіяй якога быў марксізм-ленінізм, панаваў вульгарна-сацыялагічны падыход да грамадскіх з'яў. У прыватнасці, свядомасць асобнага чалавека, яго светпогляд ледзь не аўтаматычна выводзіліся з яго сацыяльнага паходжання і стану, з «быцця». Праўда, у гэтай філасофіі было нямала фарысейства: вульгарна-сацыялагічны падыход стасаваўся да каго хочаш, але не да Карла Маркса з Фрыдрыхам Энгельсам і не да бальшавіцкіх бонзаў, бо ў такім разе і марксізм, і ленінізм, і бальшавізм можна было аб'явіць буржузна-памешчыцкімі плынямі. З тае прычыны, што старшыня выдавецкай суполкі В. Іваноўскі не быў бальшавіком-ленінцам, а ўваходзіў у склад Цэнтральнага Камітэта Беларускай Сацыялістычнай Грамады, называць яго сапраўдным кіраўніком суполкі «Загляне сонца і ў наша ваконца» не выпадала.

Вядома, што прырода не трывае пустаты. Таму, паводле логікі, камусьці належала заняць месца

Пачынальнікам беларускай кнігавыдавецкай справы быў В. Іваноўскі. Аднак Зм. Жылуновіч, кіруючыся «мэтазгоднасцю», у сваім артыкуле сцвярджаў, што ў працы Круга народнай прасветы «галоўны ўдзел прыняў праф. Б. І. Эпімах-Шыпіла» і такім чынам стаў піянерам беларускага руху XX ст.

Вацлаў Іваноўскі

В. Іваноўскага. Як і Ант. Саросек, Зм. Жылуновіч у сваім артыкуле старшынёю суполкі, а ў дадатак яшчэ і дырэктарам выдавецтва абвясціў Б. Эпімаха-Шыпілу.

Як мы памятаем, Ант. Саросек пісаў, што імя Эпімаха-Шыпілы стала вядома беларускай інтэлігенцыі ад часу заснавання суполкі. Удакладнім: пад беларускай інтэлігенцыяй аўтар разумеў сацыялістычную інтэлігенцыю, якая ў 1902 годзе заснавала Круг беларускай народнай прасветы і культуры, у наступным годзе — Беларускую Рэвалюцыйную Грамаду, а ў 1906-м — выдавецкую суполку і газеты «Наша Доля» і «Наша Ніва», інтэлігенцыю, якая ў 1903-м распачала беларускую кнігавыдавецкую справу.

Вядома, што пачынальнікам беларускай кнігавыдавецкай справы быў В. Іваноўскі. Аднак Зм. Жылуновіч, кіруючыся «мэтазгоднасцю», у сваім артыкуле сцвярджаў, што ў працы Круга народнай прасветы «галоўны ўдзел прыняў праф. Б. І. Эпімах-Шыпіла» і такім чынам стаў піянерам беларускага руху XX ст. Мала таго, усе вольныя сродкі, якія заставаліся ў яго («астатак»), Эпімах-Шыпіла, як запэўніваў сваіх чытачоў Жылуновіч, аддаваў гэтаму таварыству. А пра пазнейшы час ён пісаў так: «Уся беларуская калонія [ў Піцеры] жыве з дапамогі Б. І. Эпімаха-Шыпілы».

Артыкул Зм. Жылуновіча, як і хадайніцтвы за Эпімаха-Шыпілу іншых асоб, на нейкі час прынёс карысць і беларускай навуцы, і асабіста былому памочніку бібліятэкара Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта. З 1925 года ён працаваў у Інстытуце беларускай культуры ў Менску.

Сярод прац, якія рэдагаваў Браніслаў Эпімах-Шыпіла, быў і «Віцебскі краёвы слоўнік» (1927) Мікалая Каспяровіча. Гэты даследчык у сваёй працы «Матар'ялы да вывучэння Віцебскай краёвай літаратуры і мастацтва» («Маладняк», 1927, сш. 6) замацаваў тое, што пра Б. Эпімаха-Шыпілу напісаў Зм. Жылуновіч.

Як вядома, у ліпені 1930-га маскоўскія сатрапы арыштавалі Б. Эпімаха-Шыпілу ў «справе» «Саюза вызвалення Беларусі», а ў верасні таго ж года забаранілі яму жыць у Менску. Бездапаможны, даведзены да жалюгоднага стану, ён у 1934 годзе памёр у Ленінградзе.

Імя рэдактара першых двух зборнікаў Янкі Купалы вярнулася з нябыту ў значнай меры дзякуючы Рыгору Семашкевічу, аўтару кніжкі «Браніслаў Эпімах-Шыпіла» (1968) ды іншых прац з гісторыі беларускага грамадска-літаратурнага руху ў Пецярбургу пачатку мінулага стагоддзя. Але разам з тым вярнуўся і міф, створаны Ант. Саросекам ды Зм. Жылуновічам.

З тае прычыны, што на імя Вацлава Іваноўскага было накладзена табу (да ранейшых яго «грахоў» дадалося яшчэ абвінавачванне ў супрацоўніцтве з нацысцкімі акупантамі), Р. Семашкевічу нічога іншага не заставалася, як паўтарыць напісанае да вайны. Праўда, малады вучоны жыў у іншых абставінах, у іншы час. Ведаючы аб рэальнай ролі Б. Эпімаха-Шыпілы ў гісторыі беларускага руху, Р. Семашкевіч не паставіў яго на чале Круга беларускай народнай прасветы і культуры і не абвясціў яго старшынёю і дырэктарам выдавецкай суполкі. Гісторык назваў яго неафіцыйным кіраўніком гэтае ўстановы. Такім чынам, даследчык пайшоў за ксяндзом Адамам Станкевічам, які ў брашуры «Прафесар Браніслаў Эпімах-Шыпіла...» (1935) напісаў, што яго настаўнік быў душою суполкі.

Ад часу выхаду ў свет працаў Р. Семашкевіча прайшло нямала гадоў. У 2006-м у свет выйшаў ёмісты том Ю. Туронка «Мадэрная гісторыя Беларусі», у якім змешчаны ягоная праца «Дзейнасць беларускага выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца» ў Пецярбургу» і манаграфія «Вацлаў Іваноўскі і адраджэнне Беларусі». Аднак у літаратуры ўсё яшчэ чутны згукі міфа, створанага Ант. Саросекам, Зм. Жылуновічам, М. Каспяровічам і А. Станкевічам. Семашкевічавы словы пра тое, што Б. Эпімах-Шыпіла быў неафіцыйным кіраўніком суполкі, некаторыя разумеюць так, што памочнік бібліятэкара Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта быў яе фактычным кіраўніком. І тыражуюць гэтую выснову ў новых публікацыях. Гэтак жа тыражуецца міф і пра тое, што Б. Эпімах-Шыпіла запрасіў у 1909 годзе да сябе ў Пецярбург Янку Купалу і ўзяў яго на поўнае забеспячэнне. (Праўда, Зм. Жылуновіч, у адрозненне ад Я. Сушынскага, «удакладніў», што Б. Эпімах-Шыпіла вучыў і «сутрымоўваў» Я. Купалу не ўвесь час яго побыту ў Пецярбургу, а «каля двух гадоў».)

Міфы жывучыя і пераадольваць іх цяжка. Але пераадольваць іх трэба, проста неабходна.

ЗНАХОДКІ

# МІНСКІ СЛЕД МАРЦІНЭСА ПАСКУАЛІ

## ЗАХОДНЕЕЎРАПЕЙСКІЯ МАСОНСКІЯ АРХІВЫ І АТРЫБУТЫКА Ў БЕЛАРУСІ

**Анатоль СЦЕБУРАКА,**
**кандыдат гістарычных навук**

**Масонскія арганізацыі ў XVIII — XIX стагоддзях адыгрывалі значную ролю ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Еўропы і Новага Свету. Ахутаныя таямніцай і міфамі, масонскія ложы часцей за ўсё выконвалі функцыі дваранскіх клубаў, месцаў, дзе абмяркоўваліся і выспявалі палітычныя ідэі.**

У Беларусі франкмасоны мелі шэраг аб'яднанняў, падтрымлівалі актыўныя кантакты з паплечнікамі з Польшчы, Расіі, краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. (Падрабязней з мясцовымі вольнымі мулярамі можна пазнаёміцца ў кнізе прафесара В. В. Шведа «Масоны і ложы на землях Беларусі (канец XVIII — першая чвэрць XIX ст.)».)

Вялікі ўплыў на станаўленне сусветнанага масонства ў той час мелі ложы Англіі і Францыі.

У Беларусі захоўваецца калекцыя масонскіх рукапісаў, якія дазваляюць зазірнуць у таямніцы масонскага жыцця Францыі XVIII — першай трэці XX стагоддзяў. Адметна, што сярод дакументаў сустракаюцца сапраўдныя рэліквіі, значэнне якіх для еўрапейскай гісторыі масонства цяжка пераацаніць. Пакуль яны мала вядомыя зацікаўленым колам. Дадзены артыкул мусіць прыўзняць заслону і акрэсліць змест і характар «беларускага» комплексу заходнееўрапейскіх масонскіх рукапісаў.

Пытанне аб акалічнасцях з'яўлення масонскіх архіваў у Беларусі застаецца адкрытым. У час акупацыі Еўропы Гітлерам архівы франкмасонаў падлягалі канфіскацыі. Яны вывозіліся ў Нямеччыну, адкуль у 1945 г. трапілі ў СССР. У апошнія дзесяцігоддзі ў Расіі актывізаваліся працэсы рэстытуцыі, у выніку чаго ў Францыю была вернутая значная частка масонскіх архіваў. Аднак «беларускія» рукапісы вольных муляроў засталіся не закранутымі гэтымі працэсамі. Прыйшоў час зрабіць крок наперад і, прынамсі, абвясціць былым гаспадарам архіваў аб тым, што іх дакументы не загінулі і знаходзяцца ў нашай краіне.

Найбуйнейшы комплекс масонскіх дакументаў знаходзіцца ў навукова-даследчым аддзеле кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ). Пэўная колькасць рукапісаў ёсць і ў аддзеле рэдкай кнігі акадэмічнай бібліятэкі (ЦНБ НАН), а асобныя выданні з масонскімі экслібрысамі сустракаюцца нават у Прэзідэнцкай бібліятэцы РБ.

Памер калекцыі НББ дастаткова значны: 30 асобных рукапісаў і каля 600 архіўных дакументаў, аб'яднаных у справы па храналагічнай прыкмеце. Вывучэнне рукапісаў дазволіла вызначыць іх прыналежнасць да канкрэтных ложаў і месца паходжання

Пячатка «Французскай ложы Аквітаніі»

Патэнт МдП «Les quatres Portes du Temple étant ouvertes par le Pouvoire du G. A.», 1763.

(у каталозе такой інфармацыі няма). Абсалютная большасць дакументаў адносіцца да архіваў трох французскіх масонскіх лож з Бардо.

Больш за ўсё дакументаў звязана з адной са старэйшых лож Францыі — «Ангельская № 204» (Loge de Saint-Jean de Jérusalem sous le titre distinctif de Anglaise 204 à l'Orient de Bordeaux). Яна была заснавана яшчэ ў 1732 г. ангельцам Марцінам Келі і працягвае дзейнічаць да сённяшняга дня. У нашым распараджэнні ёсць некалькі кніг, якія ўтрымліваюць пратаколы пасяджэнняў ложы. Пры чым захавалася першая (!) кніга за 1732-1755 гг. У гэтым фаліянце, аздобленым вокладкай з белага пергамена, змешчаны статут ложы, спісы ўдзельнікаў, змест абмеркаванняў і сустрэч масонаў. Да 1743 г. запісы вяліся на ангельскай, а пасля на французскай мове. Сярод архіўных матэрыялаў ложы пераважаюць дакументы за 1811–1813, 1817–1822, 1823–1826 гг. Гэта перш за ўсё карэспандэнцыя, спісы ўдзельнікаў масонскіх лож Францыі (пераважна Аквітаніі), фінансавыя дакументы, выпіскі са статутаў, скаргі, абвесткі.

Марцінэс дэ Паскуалі (1727? – 1774)

Самы цікавы перыяд яе існавання абумоўлены дзейнасцю славутага Марцінаса дэ Паскуалі. Гэта легендарная асоба ў 1761 г. была прынята ў гэту ложу, а пазней заснавала ў горадзе храм Коэнаў.

Да архіва гэтай ложы належыць унікальны пергамен, звязаны з асобай Паскуалі. Па меркаванні мадам Мішэль Нахон, прэзідэнта «Цэнтра Марцінэса дэ Паскуалі», гэта копія «масонскага патэнта», які быў складзены Марцінэсам разам з афіцэрамі яго храма ва ўрачыстых абставінах 3 лютага 1763 г. Размова ў ім ідзе аб духоўнай уладзе, якую мае Паскуалі. Арыгінал на ангельскай мове быў накіраваны ў Вялікую Ложу ў Парыжы ў якасці доказу яго правоў, а копія на французскай мове засталася ў Бардо. Гэты дакумент быў вядомы раней і ў 1880 г. часткова апублікаваны, але з 1940-ых гг. лічыўся згубленым. Цяпер мы ведаем беларускае месца знаходжання гэтага дакумента і маем магчымасць вярнуць яго з нябыту!

> У час акупацыі Еўропы Гітлерам архівы франкмасонаў падлягалі канфіскацыі. Яны вывозіліся ў Нямеччыну, адкуль у 1945 г. трапілі ў СССР

### Біяграфічная даведка

**«Французская ложа Аквітаніі»** (Loge Francaise d'Aquitaine à l'Orient de Bordeaux). Адна з масонскіх арганізацый Бардо, заснаваная яшчэ ў сярэдзіне XVIII ст. У НББ ёсць шэраг асобных фаліянтаў з запісамі пратаколаў пасяджэнняў ложы за 1770-1786, 1786-1796, 1793-1798, 1849-1857 гады.

**Марцінэс дэ Паскуалі** (1727? — 1774) — вядомы тэург і тэосаф, які стаў адным з заснавальнікаў асобнага накірунку ў масонстве. У дактрыне Марцінэса спалучыліся элементы містычнай габрэйскай кабалістыкі і еўрапейскага містыцызму. Менавіта ён з'яўляецца адным з заснавальнікаў марцінізму.

У 1760-ыя гады Марцінэс дзейнічае ў Францыі, дзе засноўвае ўласны Ордэн рыцараў-масонаў Абраных Коэнаў Сусвету. Яго вучні-паплечнікі Сэн-Мартэн і Вілермоз развілі дактрыну і далі пачатак асобным плыням, якія існуюць і сёння.

Паходжане Марцінэса да гэтага часу да канца не высветлена, што прымушае працягваць даследаванне біяграфіі. Сёння аспрэчваецца яго габрэйскае паходжанне, выказваюцца і розныя версіі наконт радзімы: Гішпанія, Партугалія ці Францыя.

Адпаведна, любыя новыя матэрыялы, звязаныя з асобай Паскуалі, маюць вялікае значэнне. Вывучэннем яго біяграфіі актыўна займаюцца і сёння — як адэпты яго вучэння, так і не ангажаваныя ў масонства гісторыкі. Так, у 2011 годзе ў Бардо выйшла аб'ёмная манаграфія французскай даследчыцы Мішэль Нахон «Марцінэс дэ Паскуалі, загадкавы франкмасон тэург XVIII ст.».

**Марцінізм** — адна з праяваў містычнага эзатэрычнага хрысціянства. Дактрына абапіраецца на ўяўленне аб магчымасці вяртання чалавека да Бога праз Рэінтэграцыю. Яна прадугледжвала шлях унутранага самаўдасканалення, тэургічныя дзеянні і зносіны з ангелічнымі існасцямі.

**«Абраная Шатландская ложа» (Loge française Elue Ecossaise à l'Orient de Bordeaux).** Дзейнічала ў Бардо з 1740-ых гг. Да яе архіва належаць сотні разнастайных дакументаў, якія ахопліваюць перыяд за 1807–1814, 1822 гг.

Акрамя пералічаных масонскіх лож, чые дакументы складаюць абсалютную большасць «беларускай калекцыі», сустракаюцца і асобныя рукапісы іншага паходжання. Гэта рукапісныя масонскія слоўнікі, зборнікі тэалагічнага зместу, патэнты. Стан масонскіх рукапісаў надзвычай добры, фактычна няма ніякіх пашкоджанняў. У некаторых папках нават захаваліся ўнутраныя вопісы, зробленыя яшчэ французскімі архівістамі. На большасці дакументаў захаваліся пячаткі з чырвонага сургучу, арыгінальныя подпісы.

Перспектыўным для вывучэння падаецца масонскі рукапіс бельгійскага паходжання 1767 г. («L'Ordre de la Parfaite Union Verviers»). У Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, у калекцыі фалерыстыкі, захоўваецца больш за сто масонскіх знакаў рытуальнага прызначэння. Шмат з якіх паходзяць з гораду Вэрв'е. У музеі прадстаўлены нямецкія, бельгійскія, французскія масонскія знакі і элементы рытуальнай вопраткі. У прыватнасці, масонскі фартух, які, верагодна, паходзіць з ложы «Ангельская №204». Высветлілася, што да 1970 г. гэтыя рэчы знаходзіліся ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР, а пасля па вопісе (які захаваўся) былі перададзены ў музей.

Адпаведна, мы можам сцвярджаць, што ў НББ, ЦНБ НАН і Гістарычным музеі знайшлі прытулак «трафейныя» масонскія архівы і атрыбутыка. Безумоўна, далейшы лёс гэтых каштоўнасцяў мае вялікае значэнне для Беларусі і зацікаўленых краін Еўропы. У прыватнасці, «Цэнтр Марцінэса дэ Паскуалі» у Бардо выказаў зацікаўленасць у вывучэнні беларускіх масонскіх рукапісаў. У штогадовым бюлетэні Цэнтра мусіць у бліжэйшы час выйсці матэрыял аб беларускім масонскім архіве.

Далёка не ўсё зразумела з механізмам падзелу масонскіх архіваў паміж музеямі і бібліятэкамі ў БССР. Верагодна, у пэўных архівах існуюць адпаведныя справы, якія могуць праліць святло на дэталі перамяшчэння французскіх трафеяў…

Неафіцыйна супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі распавялі аб тым, што ў 1960-ыя гады частка масонскіх рукапісаў і атрыбутыкі, якая захоўвалася ў аўтэнтычных куфрах, была забраная асобамі ў штацкім і быццам бы далей была накіравана ў Рыгу. Гэты след пакуль праверыць не атрымалася.

Мяркую, што першая задача, якая павінна быць рэалізавана ў найбліжэйшы час, гэта ўсебаковае вывучэнне і апісанне калекцый і ўвядзенне іх у навуковы абарот. Амаль праз 70 гадоў пасля заканчэння вайны мы павінны вярнуць з нябыту «страчаныя» масонскія скарбы.

АГЛЯД

# «БРАМА НЕЎМІРУЧАСЦІ»

Леанід ГАЛУБОВІЧ

**Напэўна, людзі, блізкія да літаратурнага атачэння, заўважылі выдавецкае ажыўленне на прасторах, аддаленых ад сталіцы. Маю на ўвазе выхады ў свет літаратурных альманахаў на Берасцейшчыне, Гарадзеншчыне і Магілёўшчыне…**

Усё гэта гаворыць не пра агонію і заняпад, а пра так і нязможанае ліхімі ўладнымі сіламі нацыянальнае літаратурнае жыццё і выжыванне беларушчыны ўвогуле. Для тых, хто на сваёй скуры вычувае гэтае нацыянальнае *эміграцкае* наканаванне ва ўласнай краіне, нязменным застаецца даўні адраджэнцкі дэвіз: або мова будзе жыць, або памрэ разам з намі… На жаль, толькі так.

Таму, у звязку з моўнай і культурна-адукацыйнай сітуацыяй у краіне, прынамсі ў літарацкай справе, можна прагматычна кіравацца любымі метадамі адстойвання сваёй самасці, у тым ліку і паблажліва-зазыўнымі (не важны талент, а важная прысутнасць) з нарошчваннем кола беларускамоўных (свядомых, калі хочаце) грамадзян і, найперш, сярод маладых, але ёсць тут і адваротны бок праблемы. Скажам, а як жа быць з адпаведным мастацкім узроўнем літаратуры, каб і надалей прываджваць да яе (а значыць, і да роднай мовы) новых «элітных» тубыльцаў (і не толькі)? Ускосна пра гэтае «высокае неба ідэала» (вітанне Анатолю Вярцінскаму!) напамінае нам паэт з Жабінкі А. Ганчук у «Жырандолі»:

*Як мухі, пазлятаемся да хлеба*
*І хвалім, ганьбім гэты час.*
*Няма калі ў зажуранае неба*
*Зірнуць, якое моліцца за нас.*

Альманах **«Жырандоля»** выходзіць пяты год запар. Ужо, можна сказаць, вырас з пялюшак. Яго цяперашні стан я пазначыў бы як пашырэнне і нарошчванне літаратурных і калегіяльных мускулаў… Ажно 90 аўтараў вынеслі на чытацкія вочы свае тэксты!

Альманах укладзены пераважна ў адпаведных рубрыках (хоць, скажам, адна з публікацый А. Філатава выбіваецца з рубрыкі «Крытыка і Краязнаўства»), але ўнутраны хаас і незбалансаванасць зместу выдання час ад часу раздражняюць. Відавочна, што тэксты проста збіраліся «да кучы», а пасля ўжо «сартыраваліся» адпаведна густам і задумкам рэдактара(ў). Але відавочна, што рэдактарскі мастацкі густ нярэдка вывіхваецца і дае збоі, відаць, змушаныя, бо, па ўсім, на складальнікаў ціснула звышзадача: не пакрыўдзіць сталых літаратараў і адкрыць дыханне як мага шырэйшаму колу маладых і пачаткоўцаў… А самы важны чыннік літаратурнага працэсу — *чытач* — заставаўся як бы па-за ўвагай або фігурай другараднай. Шкада, бо такім чынам можна неабходную справу звесці да асабістых патрэбаў ці да чыста калялітаратурных стасункаў… Праўда, да гэтага яшчэ далёка і, спадзяюся, так і не дойдзе. Зразумела, што нацыянальна-выдавецкая дзейнасць у нас — справа няпростая: знайсці матэрыяльныя сродкі, сабраць і адабраць літаратурныя тэксты, адрэдагаваць і адкарэкціраваць іх альбо знайсці бескарыснага карэктара, вычытаць гранкі і г.д. І гэта ўсё за мажлівае «дзякуй», а то, як у нашым выпадку, яшчэ і нарвацца на незаслужаную, няхай і далікатна-сяброўскую, крытыку… Ці шмат знойдзецца ў літарацкіх шэрагах дзеля такой справы аматараў-бяссрэбранікаў?.. Была Ніна Мацяш. Хто наступны ахвярнік?

Альманах пачынаецца з рубрыкі «Памяць». Ідэя добрая, але чамусьці на зачын (наўмысна ці не?) абрана публікацыя пра пісьменніка А. Авечкіна разам з яго тэкстам «Кукла» (на рускай мове)… І толькі пасля ідуць матэрыялы і творы выбітных берасцейцаў: У. Калесніка, М. Купрэева, Н. Мацяш, В. Сахарчука, І. Лагвіновіча… Ніякія спасылкі на алфавітны парадак сітуацыю ў гэтым выпадку не выратоўваюць. Бо, у рэшце рэшт, выданне ж само па сабе беларускае. Але нельга, відаць, рабіць і так, як гэта зроблена ў дэбютным альманаху «Брама». Колькі часу таму прачытаў у Фэйсбуку захапленне С. Запрудскага тым, што ў магілёўцаў няма аніводнага выдрукаванага рускамоўнага тэкста. І яно насамрэч так, бо тыя, што меліся ў рэдкалегіі, былі перакладзены на беларускую мову. Паўстае пытанне: добра гэта ці кепска? Я думаю, тут ёсць нязграбная закамуфляванасць моўнай сітуацыі, бо натуральны працэс штучным замяніць можна толькі ў аўральным парадку і на кароткі тэрмін...

Але вернемся пад святло «Жырандолі», працягнуўшы гаворку пра ўзгаданую вышэй рубрыку «Памяць», публікацыі якой, па шчырасці кажучы, найчасцей скрашваюць менавіта творы саміх «герояў» рубрыкі — вершы М. Купрэева ды І. Лагвіновіча... Што праўда, «зацемкі» А. Філатава да постаці (і 90-гадовага юбілею) У. Калесніка таксама задаволілі мае чытацкія спадзяванні (гэта вельмі шчымлівыя, яркія і запамінальныя абразкі да




вобраза літаратурнага настаўніка). Тэкст заіскрыўся ўсімі гранямі жыццёвых і лёсавых дзей і выпрабаванняў Уладзіміра Андрэевіча...

Адны з лепшых чыста літаратурна-мастацкіх публікацый альманаха — гэта вершаваныя падборкі А. Дэбіша, А. Ігнацюк, А. Белага і М. Тэлычко (менавіта так, на ўкраінскі лад, хоць самі змешчаныя вершы аўтара рускамоўныя)… У рубрыцы «для дзетак-малалетак» цікавая паэтычная публікацыя В. Дэбіша пад назовам «Показкі дзеда Быльца». Варты ўвагі зварот да моўнай палескай спадчыны (сабраныя яго бацькам загадкі на паляшуцкай мове) В. Губарэвіча. Ну хоць бы такую, блізкую да нашай тэмы: *«Зымня біла, насіньння чорнэ, пятёро горуть, двое дывляцьця, одынь кыруе»* (бумага, чырніло, пальці, гочы, голова).

Шмат у берасцейскім выданні адметных і здольных аўтараў, якія падаюць пэўныя літаратурныя надзеі, у рубрыцы «Маладыя галасы». Сярод іх як беларускамоўныя, так і рускамоўныя. Запомніліся стылёвай неардынарнасцю некаторыя радкі Дзм. Рыбака:

*…Плохие времена для слов*
*настали вдруг, но мы-то с ними!*

У гэтым плане магілёўская «Брама» для шырокага кола маладых аўтараў пакуль яшчэ толькі прыадчынена. Як піша берасцеец А. Рызо:

*Я не Руссо. В тысячелетье*
*третьем,*
*хлебнув свободы, вновь сижу*
*на поводке.*

У рубрыцы «Крытыка. Краязнаўства» прыцягваюць увагу рэцэнзіі К. Папко (на кнігу У. Калесніка «Доўг памяці»), М. Сянкевіча (на зборнік А. Каско «Нічога больш») і З. Мельнікавай (на пасмяротны зборнік М. Мішчанчука «Струна надзеі»).

Адметнай навізной і падштурхоўваннем да палемікі і пашырэння размовы пра спадчыну і нацыянальную памяць вызначаецца артыкул М. Папекі «Зубр на пячатках Брэста». Ёсць у альманаху і гумар, у тым ліку і дасціпныя пародыі…

Агулам, чытаючы «Жырандолю», адчуваеш узгадаваны папярэднікамі немалы творчы патэнцыял літаратурнай Берасцейшчыны.

**Пасля прачытання альманахаў умацавалася перакананне, што сутнасная справа актыўнага натуральнага працэсу сучаснай беларускай літаратуры хоць і далёкая ад ідэала, усё ж не гібее, не стаіць на месцы, а мае як відавочныя, так і ўнутраныя зрухі…**

Мне падалося, што збядніла мастацкі каларыт «Жырандолі» адсутнасць твораў такіх выбітных берасцейскіх творцаў, як А. Паплаўскага, М. Шчура, В. Гапеева, Я. Дашынай, У. Глазава… Не думаю, што прычына ў ненапісаных тэкстах і пустых шуфлядах гэтых літаратараў… Здрабняе змястоўную важкасць альманаха і прабел з публікацыяй сур'ёзнай чытэльнай прозы. І гэта, бадай, самае балючае і малаасветленае месца «Жырандолі»…

Дэбютны выпуск **«Брамы»** ў сяброў магілёўскай філіі СБП атрымаўся «салідным», як любіць «казыраць» адзін шэф-рэдактар сваёй газетай. У адрозненне ад берасцейскага альманаха, тут выдрукаваны творы ўсяго толькі трыццаці літаратараў. Я назваў бы гэткае становішча «Брамы» арганізацыйным станаўленнем і творча-таварыскім збліжэннем яе чальцоў…

Альманах па сваім укладанні і структурнай выбудове блізкі да мастацка-літаратурнага часопіса. У параўнанні з «Жырандоляй», якую, здавалася б, можна было выцягваць проста на адным вопыце, тэксты для «Брамы» замаўляліся і падбіраліся згодна з папярэдняй задумкай. Калі ў «Жырандолі» не стае сапраўднай прозы, то якраз у «Браме» яна (у хаўрусе з публіцыстыкай) выратоўвае сітуацыю. Леглі на душу аповеды С. Украінкі, можа, залішне натуральныя, блізкія да грубай і сярмяжнай жыццёвай праўды, у адрозненне ад праўды мастацкай, і ўсё ж… чытэльныя і прымальныя. Уразіў аповед «Пара, пара!» В. Казакова (пра мужнасць гараджан Магілёва ў адстойванні сваёй самастойнасці ў змаганні з маскоўскімі стральцамі). Твор знаёмы мне па ранейшай публікацыі, але варты шырокай увагі і ўдумнага прачытання. На адным дыханні *зайшлі,* калі не ў сэрца, то недзе поруч, казытліва-гумарныя аповеды Т. Барысік. У іх, дарэчы, не надта глыбока прыхаваныя і зусім сур'ёзныя падтэксты. Цікавыя матэрыялы пра мясцовага мастака Базыля Камарова, як і адмысловыя вершы і лірычна-філасофскія запісы самога мастака. Арыгінальны аповед А. Санаценкі «Жорсткасць лёсу».

З паэзіі мне паклаліся на душу пераклады М. Булавацкім вершаў У. Высоцкага. Нязмушаныя, з захаваннем у беларускай транскрыпцыі адчування трагікалірычнай лёсавай ноты ўсім вядомага барда другой паловы XX стагоддзя. Дабротна і з густам пераствораны вершы вядомых польскіх паэтаў В. Еўмяньковым…

Ёсць што пачытаць і ў раздзеле «Спадчына. Успаміны. Дакументы», да прыкладу, артыкулы С. Чыгрына пра В. Ермаловіча і А. Пысіна, успаміны Н. Сандамірскага пра С. Грахоўскага, настальгічная храналогія С. Булавацкага «Пра гісторыю адной вёскі». Вельмі добра з унутраным веданнем прадмета напісаны артыкул даўно любімага мной аўтара В. Аўраменкі «Пра жыдоў, беларусаў ды іншыя тутэйшасці, або Чаму я не антысеміт». Як на маё разуменне, гэты тэкст варты публікацыі і ў больш масавым рэспубліканскім выданні. Пытанні, узнятыя аўтарам, яшчэ ўсё вельмі праблемныя і актуальныя, яны разгорнутыя ў спакойна-даверлівай танальнасці, выкладзеныя з досведам, са стылёвай аўтарскай арыгінальнасцю.

Адметны і раздзел «Літаратуразнаўства»; асабліва ўразіла эсэістычная развага Т. Аўсяннікавай вакол заўчаснага трагічнага сыходу з жыцця паэтэсы Яўгеніі Янішчыц…

У раздзеле «Сатыра і гумар» даволі ўдалыя вершы С. Украінкі і пародыі М. Яцкова.

Трэба аддзначыць, што ў «Браме» выдрукаваны «адборныя» тэксты пераважна вядомых аўтараў магілёўшчыны незалежна ад іх цяперашняга месца пражывання, тады як у берасцейцаў публікуюцца ўсе тамашнія-тутэйшыя і набліжаныя да іх *прымежнікі.*

Словам, ёсць што пачытаць, пра што пагаварыць-паразважаць і нават паспрачацца… А гэта ўжо знак пэўнай удачы адносна вартасці мастацкага напаўнення альманаха. Трапляюцца, праўда, і шараговыя публікацыі, але няма выпадковых, а тым больш бяздарных.

Калі на аснове гэтага майго агляду рабіць нейкую высновy, то хіба толькі станоўча-стрыманую. Так, ёсць асобныя ўдачы, напрацоўкі, намаганні… Пасля прачытання альманахаў умацавалася перакананне, што сутнасная справа актыўнага натуральнага працэсу сучаснай беларускай літаратуры хоць і далёкая ад ідэала, усё ж не гібее, не стаіць на месцы, а мае як відавочныя, так і ўнутраныя зрухі… Найперш інерцыйна-традыцыйныя, але сям-там з прагляднай перспектывай наватворчых канцэпцый. Усё гэта — цяжка, напружана, ахвярна, здаўна з'яднанае адной нязменнай беларускай ідэяй: быць і застацца… Пры падобных тужлівых развагах згадваюцца ўражлівыя радкі з верша маладога магілёўскага паэта А. Карпенкі:

*Не, лепей стаць прывідам, ценем,*
*ахвярай нябыту,*
*Няхай ужо вечныя здзекі, пакуты,*
*пагарда і жах,*
*Каб толькі не ўбачыць цябе*
*разарванай, раздзетай, разбітай,*
*Каб толькі над Краем і Мовай*
*ніколі не ставіць крыжа.*
……
*Няўжо ўсё святое — падман*
*і чыёсьці вар'яцтва?*
*І нехта прыдумаў і славу,*
*і рэкі крыві?*
*…Мы будзем з табою да смерці,*
*да Боскага царства,*
*І жыцці табе аддамо —*
*але толькі жыві!*

ЛІТСАЮЗ

# ЕЎТУШЭНКА І РЭФАРМАВАННЕ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ

**Паэт Яўгеній Еўтушэнка запатрабаваў рэфармаваць Саюз пісьменнікаў Расіі. Па яго словах, гэта арганізацыя павінна быць адзінай, з агульным кіраўніцтвам у Маскве і агульным Літфондам; яна павінна выконваць «адзіны этычны кодэкс» «з правам выключаць любых яе членаў, якія дапускаюць нацыяналістычныя ці палітычныя абразы сваіх калегаў».**



Фота: «РИА Новости»

Артыкул з прапановамі Я. Еўтушэнкі быў апублікаваны ў нумары «Литературной газеты» за 27 лістапада. Па меркаванні вядомага паэта, пасля распаду Саюза пісьменнікаў СССР на варагуючыя арганізацыі (маюцца на ўвазе Саюз пісьменнікаў Расіі і Саюз расійскіх пісьменнікаў), «колькасны ўзровень членаў саюзаў пісьменнікаў павялічыўся, а якасны ўпаў», дзякуючы чаму ў кіраўніцтве саюзаў заселі «безнадзейныя пасрэднасці». Канкрэтна Я. Еўтушэнка называе кіраўніка Міжнароднай супольнасці пісьменніцкіх саюзаў (праваперaемнік СП СССР) і Літфонда Івана Пераверзіна: «Хай мне хто-небудзь растлумачыць, што гэта за пісьменнік — Іван Пераверзін, за якія літаратурныя заслугі ён стаў кіраўніком адной з пісьменніцкіх арганізацый і дзе яго творы, прызнаныя нашым народам? Саюз пісьменнікаў — арганізацыя першым чынам творчая, а ён сябе вёў так, як быццам гэта арганізацыя адно камерцыйная, і за ўсё сваё знаходжанне не арганізаваў ні буйнай значнай канферэнцыі, ні міжнароднага сімпозіума, ніякага літаратурнага вечара вялікага маштабу, годнага расійскіх традыцый, які прыцягнуў увагу чытачоў і прэсы. Ён займаўся выключна прыбіраннем да рук рэштак уласнасці Саюза пісьменнікаў і Літфонда, распараджаючыся ёю па сваім меркаванні і пачуваючыся поўным гаспадаром».

Нагадаем, што некалькі гадоў таму пры ўдзеле згаданага Івана Пераверзіна, а таксама старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца і вышэйшых беларускіх ідэалагічных чыноўнікаў у Мінску быў заснаваны Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі…

На думку Я. Еўтушэнкі, цяпер «закінутае» тое, што першапачаткова было асновай Саюза пісьменнікаў: «правядзенне прафесійных абмеркаванняў новых вершаў, апавяданняў, раманаў у пісьменніцкім крузе, чыткі маладых, яшчэ нікому не вядомых пісьменнікаў». Па меркаванні паэта, прафесійныя літаратары павінны праводзіць «пісьменніцкія канферэнцыі і сімпозіумы па разнастайных праблемах — ад творчых да палітычных» з удзелам замежных калегаў, а таксама прэзідэнта і членаў урада.

Як лічыць Я. Еўтушэнка, неабходна аднавіць пісьменніцкія выступы па краіне — гэта не толькі «ўзняло б узровень густу, які цяпер жахліва знізіўся», але і дазволіла б «і пісьменнікам зарабляць, і чытачам мець зносіны з пісьменнікамі». Таксама ён прапанаваў ураду ўвесці бюджэтную пасаду пісьменніка пры дзяржаўным універсітэце, якая дазволіла б літаратарам жыць на прафесарскую зарплату і спакойна працаваць над вялікімі творамі, а заадно і выкладаць.

Па меркаванні паэта, для новага Саюза ў Расіі ёсць «духоўны генафонд сапраўдных таленавітых прафесіяналаў», «але гэта, на жаль, не суцэльнае энергетычнае ядро, а разрозненыя творчыя асобы, якія разышліся з-за палітычных рознагалоссяў у групы і групкі і якія часам займаюцца ўзаемаабразамі ці ўзаемаігнараваннем, а часам і ўзнагароджваюць адзін аднаго нейкімі сумніўнымі прэміямі».

Саюз пісьменнікаў СССР быў створаны ў 1934 годзе, а ў 1991-м распаўся разам з СССР на асобныя арганізацыі ў кожнай з дзяржаў. У Расіі іх з'явілася адразу дзве: «патрыятычны» Саюз пісьменнікаў Расіі і «дэмакратычны» Саюз расійскіх пісьменнікаў.

Тым часам журы нацыянальнай літаратурнай прэміі «Вялікая кніга» ўручыла Яўгенію Еўтушэнку адмысловую ўзнагароду «За гонар і годнасць». Паэт, які на той час знаходзіўся ў ЗША, у сваім звароце прызнаўся, што глыбока крануты такой высокай адзнакай сваёй працы, якая вялася на працягу апошніх 65 гадоў.

Уручаючы ўзнагароду, Міхась Сеславінскі, кіраўнік «Роспечати», выказаў падзяку пісьменніку за яго прозу і вершы, а таксама за шматгранную літаратурную дзейнасць, у прыватнасці, дыялогі з Саламонам Волкавым — дыскусіі сапраўды вялікіх людзей пра маральнасць і высокія матэрыі. У зваротным слове Яўгеній Еўтушэнка заявіў: «Наша нацыянальная ідэя даўно існуе і непарушная — яна выяўлена ў рускай літаратуры. Чалавек, які пазбаўлены любові да ўласнай нацыянальнай паэзіі, не з'яўляецца сапраўдным грамадзянінам сваёй краіны».

УЗНАГАРОДЫ

# АДЗНАКА ЛІНЫ КАСТЭНКА

**Вядомая ўкраінская пісьменніца Ліна Кастэнка, якой сёлета споўнілася 83 гады, стала лаўрэатам міжнароднай адзнакі імя Амяляна Каўча «за ўнёсак у развіццё дыялогу культур і народаў, міжрэлігійнага і міжнацыянальнага паразумення, дабрадзейнасці, за асабісты жыццёвы прыклад ахвярнасці і гуманізму».**

Цырымонія ўручэння ўзнагароды адбылася ў Рыме.

Адзнаку Блажэннага Свяшчэннамучаніка Амяляна Каўча аднайменны камітэт заснаваў у 2010 годзе. Ганаровым кіраўніком камітэта з'яўляецца кардынал Любамір Гузар. Праца камітэта здзяйсняецца пад патранатам Галавы Украінскай грэка-каталіцкай царквы.

Грэка-каталіцкі святар, блажэнны Амялян Коўч падчас нямецкай акупацыі Заходняй Украіны, імкнучыся ўратаваць габрэяў ад знішчэння, хрысціў іх і выдаваў адпаведныя метрыкі, не зважаючы на забарону гэтага акупацыйнай уладаю. Звярнуўся з лістом да Гітлера, у якім асудзіў нацысцкія масавыя чалавечыя забойствы. За тое вясной 1943 года быў арыштаваны і знішчаны ў канцлагеры «Майданэк».

# РУСКІ БУКЕР

**Лаўрэатам прэміі «Рускі Букер» у 2013 годзе стаў Андрэй Волас за раман «Возвращение в Панджруд».**

Акрамя таго, А. Волас атрымаў і прэмію «Студэнцкі Букер». Яе лаўрэата абіралі навучэнцы расійскіх ВНУ — пераможцы конкурсу на найлепшае эсэ, напісанае пра адзін з раманаў, якія ўвайшлі ў лонг-ліст Букераўскай прэміі.

Журы на чале з пісьменнікам Андрэем Дзмітрыевым, леташнім лаўрэатам, выбірала пераможцу з шасці фіналістаў. У шорт-лісце прэміі былі таксама Яўген Вадалазкін, Дзяніс Гуцко, Андрэй Іваноў, Маргарыта Хемлін і Уладзімір Шапко.

Лаўрэат прэміі атрымае грашовае ўзнагароджанне ў памеры 1,5 млн расійскіх рублёў. Усім фіналістам будзе прысуджана па 150 тысяч рублёў.

Літаратурная прэмія «Рускі Букер» упершыню прысуджалася ў 1992 годзе. У 2011-м праз цяжкасці са спонсарам аргкамітэт прэміі вырашыў уручаць «Рускага Букера дзесяцігоддзя» — прэміяй пасмяротна быў уганараваны Аляксандр Чудакоў за раман «Ложится мгла на старые ступени… ».



# ПРЭМІЯ ІМЯ ГЕДРОЙЦА

**Прэмію імя Ежы Гедройца атрымаў украінскі гісторык Яраслаў Грыцак за кнігу «Пророк у своїй вітчизні: Іван Франко і його спільнота».**

Як адзначыў сакратар Капітулы Прэміі імя Гедройца прафесар Івона Гофман, публікацыя Грыцака прысвечана ключавой для ўкраінскага народа постаці — Івана Франко: «Гэтая кніга прысвечана постаці, малавядомай у Польшчы. Гэта палітык, гісторык, грамадскі дзеяч. Важна, што аўтар малюе Франка на фоне вялікіх палітычна-гістарычных падзей, на фоне памежжа культур. Гэтая кніга — пра нараджэнне ўкраінскага народа».

Прэміяй імя Ежы Гедройца штогод ганаруюцца ўкраінскія творцы за даследаванні спадчыны парыжскай «Культуры» ці за творчы працяг ідэй Е. Гедройца. (Аднайменная прэмія заснаваная тры гады таму і ў Беларусі.)

Ежы Гедройц (1906–2000) нарадзіўся ў Мінску, польскі публіцыст, грамадскі дзеяч, заснавальнік і галоўны рэдактар часопіса «Kultura», які выдаваўся ў Парыжы, а таксама выдавецтва «Instytut Literacki». Гедройц быў актыўным прыхільнікам польска-ўкраінскага супрацоўніцтва. З яго ініцыятывы ў «Kultury» выйшла анталогія ўкраінскай літаратуры 1917–1933 гадоў «Розстріляне відродження».

ПАЛІЦА

## ГЕРКУЛЕСАВЫ БУРЛЕСКІ

**Пятро Васючэнка. Дванаццаць подзвігаў Геракла. Раман-бурлеск. — Мінск, Выдавецкі дом «Звязда», 2013.**

Зірнуўшы на вокладку кнігі, абазнаны чытач мусіць здзівіцца чарговай іпастасі аўтара, якога ўжо ведае як удумлівага літаратуразнаўцу, драматурга, празаіка з бездакорным стылем, паэта-гумарыста, эсэіста-культуролага…

Але здзіўленне хутка мінецца, калі згадае ён васючэнкавы казачныя аповесці «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі».

Не памыліцца ён, калі выкажа меркаванне, што гэта аніякім разам не акадэмічны пераказ старажытнагрэцкіх міфаў і легенд. Праўдзіваю будзе і здагадка, што ў дванаццаці навэлах прачытае ён пра подзвігі асілка, які змагаецца з нямейскім львом, лярнейскай гідрай, крыцкім быком і іншымі монстрамі, ліхадзеямі, разбойнікамі дый неадменна перамагае іх. Не схібіць кнігалюб, калі дапусціць, што чакае яго расповед у фірмовай васючэнкавай манеры: займальна, з іроніяй і гумарам. Будзе мець рацыю аматар прыгожага пісьменства, калі палічыць, што аўтар узяў пад увагу вопыт нацыянальнай класікі — як мінімум, парадыйных паэм «Тарас на Парнасе» Канстанціна Вераніцына і «Энеіда навыварат» Вікенція Равінскага, што абеларусіў і асучасніў антычныя сюжэты.

«Я ўявіў сабе тагачасную Грэцыю, — прызнаецца ў прадмове аўтар, — у сваёй свядомасці накрэсліў яе карту з яе гарамі і доламі, з вінаградніками, козамі і пастухамі, і яна падалася мне падобнай на маю радзіму — Полаччыну, або Крыўю, таксама старажытны і запаветны край, адкуль вытокі мудрасці і кніжнасці Беларусі».

Старажытны герой паводле Васючэнкі робіць і часткова выпраўляе свае памылкі, расце інтэлектуальна і маральна, а таму твор можна назваць і раманам дыдактычным.

Але чытач не павінен палохацца гэтага азначэння — той, хто любіць неверагодныя прыгоды, авантуры, метамарфозы і двубоі, у дастатку знойдзе іх у кнізе.

Беларуская літаратура заўсёды ўмела з пэўнай доляй іроніі дый гумару распавядаць пра мінулае, пра значныя і знакавыя рэчы. Тое самае робіць аўтар новай версіі Гераклавых прыгодаў, адрасаванай падлеткам.

Тактоўна і густоўна спрыяе яму ілюстратарка Галіна Хінка-Янушкевіч, чые лапідарныя малюнкі прымушаюць згадаць выявы на амфарах і на франтонах старажытнагрэцкіх храмаў.

**Уладзімір Сіўчыкаў**

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 27 СНЕЖНЯ, ПЯТНІЦА

### 1 БЕЛАРУСЬ

**06.00, 07.20, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 01.55** Навіны.
**07.05, 08.05** Дзелавое жыццё.
**07.10, 08.10** Зона Х.
**09.10** Серыял «Сэрца Марыі» (Расія).
**10.05** Серыял «Такое звычайнае жыццё».
**11.05** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**12.10, 14.55, 18.35** Evrovision. Без каментароў.
**12.15** Лёс гігантаў.
**13.25** Нашы.
**13.40** Серыял «Сваты-6» (Расія - Украіна).
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Меладраматычны серыял «Джамайка» (Украіна - Расія).
**16.30** Дак. цыкл «Без права на дубль».
**17.30** Серыял «Сэрца Марыі» (Расія).
**19.20, 01.20** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.50** Серыял «Такое звычайнае жыццё».
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы.
**21.55** Серыял «Сваты-6» (Расія - Украіна).
**23.10** «Лёс гігантаў».
**23.45** Камедыя «Каляды з няўдачнікамі» (ЗША).
**02.10** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 08.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе. «Наша раніца».
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольны закуп».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Шматсерыйны фільм «Матч».
**12.10** «Яны і мы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прысуд».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Зразумець. Прабачыць».
**17.00** «У наш час».
**18.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** Поле цудаў.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Вячэрні Мінск».
**22.25** Камедыя «Каханне злое».
**00.30** «Вячэрні Ургант».
**01.30** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**09.00** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**09.10** «Дакументальны праект».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.40** «Прошаная вячэра».
**11.35** «Жаданая». Серыял.
**12.30** «Джэймі: «Калядная вечарынка».
**13.00** «Добры дзень, доктар».
**13.50** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**14.00** Фільм «Рэальнае каханне-2» (Францыя, 2008 г.).
**15.40** «Якія людзі!».
**16.50** «Згодна з законам».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**18.40** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**20.20** Фільм «Бітлджус» (ЗША, 1988 г.).
**22.00** СТБ прадстаўляе: вячэрняе шоў «На тым жа месцы ў той жа час».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** СТБ прадстаўляе: вячэрняе шоў «На тым жа месцы ў той жа час». Працяг.
**23.55** «Ежа багоў».
**00.50** Еўрапейскі покерны турнір.
**01.40** Фільм «Дом васковых фігур» (Аўстралія - ЗША, 2005 г.).

### 2 БЕЛАРУСЬ

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**10.10** Цудоўная сямёрка. Другі эпізод. Фігурнае катанне.
**10.50** Біяграфічны серыял «Хакейныя гульні» (Расія). Заключная серыя.
**11.55** Пад грыфам «Вядомыя».
**12.30** Камедыйны баявік «Дыяментавы паліцыянт» (ЗША - Германія).
**14.20** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія).
**15.35** Серыял «Рэальныя мальцы» (Расія).
**16.40** «Імперыя песні». На біс.
**17.15** Беларуская кухня.
**17.55** Дэтэктыўны серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**18.55** Фантастычны фільм «Гатака» (ЗША).
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** «Бітва экстрасэнсаў». Шоў-праграма (Расія).
**22.40** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**23.30** Спартова-біяграфічны серыял «Хакейныя гульні» (Расія). Заключная серыя.
**00.25** Хакей. КХЛ.

### 3 БЕЛАРУСЬ

**07.30** «Дабраранак».
**08.00** «Калейдаскоп».
**08.05** «Год у гісторыі».
**08.20** «Майстры і чаляднікі». Разьбярства.
**08.55** «Незнаёмая песня». Кароткаметражны фільм.
**09.20** «Росчырк часу». Кніга Дамбавецкага. Пра Магілёўскую губернію ў XIX стагоддзі.
**09.35** Серыял «Майстар і Маргарыта». 2-я серыя.
**10.25** «Сіла веры».
**10.50** «Востраў скарбаў». Мастацкі фільм.
**12.15** «Калейдаскоп».
**12.25** «Год у гісторыі».
**12.35** «Святло далёкай зоркі». Памяці актрысы, народнай артысткі Беларусі і СССР Галіны Кліменцьеўны Макаравай.
**13.05** «Аўтограф».
**13.40** «Скарбніца Магілеўшчыны». Бабруйск. Дарогамі вытканы.
**14.05** «Адлюстраванні». Леў Сапега.
**14.25** «Цуды прыроды». Манголія. Гобі. Іярданія.
**14.55** «Непрыручаная птушка». Дакументальны фільм пра творчы і жыццёвы шлях паэтэсы Яўгеніі Янішчыц.
**15.15** «Навагодні тыдзень». Канцэрт Ядзвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча.
**16.20** «Запаведнай сцежкай». Заказнік «Галубіцкая пушча».
**16.50** «Масква - Мінск. Кінатранзіт». Уладзімір Гасцюхін. «Узыходжанне». Дакументальны фільм.
**17.15** «Рэчавы доказ». Палаш Ізмайлава. Дакументальны фільм.
**17.45** «Карані».
**18.10** «Палескі пачастунак». Бліны і зацірка.
**18.30** «Камертон». Піяніст, кампазітар, джазмен Сяргей Жылін.
**19.00** «Калейдаскоп».
**19.05** «Белеет парус одинокий...». Мастацкі фільм.
**20.30** Калыханка.
**20.50** Серыял «Майстар і Маргарыта». 3-я серыя.
**21.40** «Сіла веры».
**22.05** «Навагодні тыдзень». Вечар з Мікалаем Гнацюком.
**23.00** «Аўтограф».
**23.25** «Святло далёкай зоркі». Памяці актрысы, народнай артысткі Беларусі і СССР Галіны Кліменцьеўны Макаравай.
**23.55** «Калейдаскоп».
**00.00** «Год у гісторыі».

### НТВ

**06.00** «НТБ раніцай».
**08.40, 10.20** «Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа лекараў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**19.35** «Жыццё як песня».
**21.15** Фільм «Штукар».
**23.05** Фільм «Штукар-2».
**00.50** «Авіятары».

### МИР

**05.00** Тэлесерыял «Таццянін дзень».
**06.40** Мультфільмы.
**07.10** Праграма «Цік-так».
**07.20** Тэлесерыял «Заручальны пярсцёнак».
**09.00** Навіны Садружнасці.
**09.15** Мастацкі фільм «Тата».
**11.15** Праграма «Сардэчна запрашаем».
**11.45** Праграма «Рэспубліка сёння».
**12.00** Навіны Садружнасці.
**12.25** Тэлесерыял «Клон».
**14.10** Дакументальны фільм «У свеце цудаў».
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.25** Ток-шоў «Яшчэ не разам».
**16.20** Тэлесерыял «Спадчына».
**18.00** Навіны Садружнасці.
**18.25** Мастацкі фільм «Ой, Мароз, Мароз!».
**20.15** Мастацкі фільм «Ва-банк».
**22.00** Мастацкі фільм «Ва-банк 2».
**23.35** Мастацкі фільм «Ой, Мароз, Мароз!».
**01.20** Праграма «Прыгоды Македонскай».
**01.40** Тэлесерыял «Клон».
**03.30** Дакументальны фільм «У свеце цудаў».
**04.30** Праграма «Даведнік».

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Інфармацыйна-публіцыстычны блок.
**08.30** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**08.55** Аб'ектыў.
**18.00** «Ранча», серыял: 33 серыя.
**18.45** Калыханка для самых маленькіх: «Дзіўны свет ката Філімона».
**19.00** Інфармацыйна-публіцыстычны блок.
**19.15** Інфармацыйна-публіцыстычны блок: Агляд медыяў.
**19.20** Інфармацыйна-публіцыстычны блок: Агляд падзеяў культуры.
**19.25** Інфармацыйна-публіцыстычны блок: Дэвайс.
**19.30** Інфармацыйна-публіцыстычны блок: Навіны.
**19.40** Інфармацыйна-публіцыстычны блок: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова / С. Калінкінай.
**19.50** Інфармацыйна-публіцыстычны блок: рэпартаж Алеся Залеўскага.
**20.00** Інфармацыйна-публіцыстычны блок: Навіны.
**20.25** Невядомая Беларусь: «Зямля ў палоне», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Дом», серыял: 16 серыя.
**22.55** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**23.20** Аб'ектыў.

## 28 СНЕЖНЯ, СУБОТА

### 1 БЕЛАРУСЬ

**06.40** Існасць.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Зямельнае пытанне.
**09.35** Серыял «Сваты-6» (Расія - Украіна).
**10.40** Камедыйны серыял «Сваты-6. За кадрам» (Расія - Украіна).
**11.30** Заўтра - гэта мы!
**12.10** Здароўе.
**13.00** Усё як мае быць!
**13.35** Нашы.
**13.45** Таямніцы следства.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Дакументальны цыкл «Без права на дубль» (Расія).
**16.35** Давярай і правярай.
**17.00** Гісторыя «Славянскага базара».
**18.35** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**19.10** Камедыйная меладрама «Шукайце маму» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.40** Серыял «Сваты-6» (Расія - Украіна).
**22.50** «Лёс гігантаў».
**23.25** Містычны трылер «Хэлбой: герой з пекла» (ЗША).
**01.20** Дзень спорту.

### Н

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00** , 09.00 Нашы навіны.
**09.05** «Смешарыкі». Новыя прыгоды.
**09.20** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Ідэальны рамонт».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** Мультфільм.
**13.30** Фільм «Непапраўны хлус».
**15.00** «Два колеры запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Два колеры запалу». Шматсерыйны фільм. Працяг.
**17.20** «Бацькоў у школу!».
**18.30** «Песня года Беларусі-2013».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Песня года Беларусі-2013». Працяг.
**00.35** «Што? Дзе? Калі?».
**00.50** Камедыя «Адчайная хатняя гаспадыня».

### СТВ

**06.10** «Next-3». Серыял.
**07.00** «Анфас».
**07.15** Фільм «Бітлджус» (ЗША, 1988 г.).
**09.00** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**09.05** «Чыстая праца».
**10.00** «Іншая краіна».
**11.05** «Уявіце сабе».
**11.30** «Мінск і мінчане».
**12.05** «Прыгоды дылетанта».
**12.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**13.40** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**13.45** Фільм «Я крочу па Маскве» (СССР).
**15.20** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** «Дзіўная справа».
**18.35** Дзённік «ХОРаШОЎ».
**18.40** СТБ прадстаўляе: інтэлект-шоў «Разумней не прыдумаеш».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Інтэрв'ю з вампірам» (ЗША).
**22.30** «Зорны рынг. Новы сезон.
**23.45** Фільм «300 спартанцаў» (ЗША, 2006 г.).
**01.50** «Глядзець усім!».

### 2 БЕЛАРУСЬ

**07.20** Прыгодніцкі мультсерыял «Клуб Вінкс. Школа чараўніц» (Італія).
**08.30** Тэлебарометр.
**08.35** Музычная камедыя «Зімовы вечар у Гаграх» (СССР).
**10.20** Беларуская кухня.
**11.00** «СуперІнтуіцыя. Бітва палоў». Забаўляльная шоў- праграма (Расія).
**12.10** «Бітва экстрасэнсаў». Шоў-праграма (Расія).
**13.20** Гумарыстычная праграма «Жаночая ліга. Хлопцы. Грошы. Каханне» (Расія).
**13.55** Камедыйны серыял «Таксі» (Украіна).
**15.00** Рамантычная камедыя «Няня» (ЗША - Венгрыя).
**17.00** «Цудоўная сямёрка. Другі эпізод. Фігурнае катанне». Фінал.
**18.05** «Імперыя песні». Народнае караокешоў.
**19.15** Ваша лато.
**19.55** Латарэя «Пяцёрачка».
**20.15** Вышэй за дах.
**20.55** Тэлебарометр.
**21.00** КЕНО.
**21.05** Містычны трылер «Шкляны дом» (ЗША).
**23.10** «СуперІнтуіцыя. Бітва палоў». Забаўляльная шоў- праграма (Расія).
**00.10** Гумарыстычная праграма «Жаночая ліга. Хлопцы. Грошы. Каханне» (Расія).
**00.40** Камедыйны серыял «Таксі» (Украіна).

### 3 БЕЛАРУСЬ

**08.00** «Калейдаскоп».
**08.05** «Абіцель душы».
**08.35** «Кожны мае права быць розным».
**09.05** Дзіцячы фільм. «Залаты ключык».
**10.25** Мультфільм.
**10.55** «Сямейны альбом». Барыс Луцэнка.
**11.10** «Наперад у мінулае».
**11.40** «Калейдаскоп».
**11.45** Мультфільмы.
**12.25** «Купала і Колас. Два яблыкі на адной галінцы». Дакументальны фільм.
**12.55** «Полацк». Дакументальны фільм.
**13.10** Прэм'ера. «Шчасце Алены. Сцэнарыст і рэжысёр Алена Турава». Дак. фільм.
**13.30** «Адзін з многіх.». Дакументальны фільм пра Мікалая Гірыловіча - жыхара вёскі Дальва, якую спасціг лёс Хатыні.
**13.50** «Гэты дзіўны свет. Чэслаў Немен». Дакументальны фільм пра вядомага выканаўца з Беларусі.
**14.25** «Балада пра Свіцязь». Дак. фільм.
**14.45** «Одной звезды я повторяю имя.» Дакументальны фільм пра ўраджэнца Беларусі, двойчы Героя Савецкага Саюза, лётчыка-касманаўта СССР Пятра Клімука.
**15.20** «Навагоднія сюрпрызы ў Музычнай гасцінай». Канцэрт.
**16.55** «Калейдаскоп».
**17.00** «Караваджа». Мастацкі фільм. 1-я і 2-я серыі.
**18.40** «Калейдаскоп».
**18.45** «Караваджа». Мастацкі фільм. 1-я і 2-я серыі.
**20.30** Калыханка.
**20.50** Сусветнае кіно. «Баль».
**22.40** «Навагодні тыдзень». Канцэрт Ірыны Дарафеевай.
**23.40** Без права на дубль». Сяргей Бадроў.
**00.30** «АРТиШОК».
**00.55** «Калейдаскоп».

### НТВ

**06.25** Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль».
**08.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**08.20** «Агляд».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Лепшы горад Зямлі».
**14.10** Серыял «Груз».
**17.35** «Вочная стаўка».
**18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.50** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.55** «Ты не паверыш!».
**21.55** «Выспа». Фінал.
**23.25** Маст. фільм «Служу Айчыне!».
**01.05** «Прамень Святла».

### МИР

**05.00** Мастацкі фільм «Пітэр Пэн».
**07.35** Мультфільм.
**07.50** Праграма «Таямніцы Эрмітажа».
**08.05** Праграма «Мільён пытанняў пра прыроду».
**08.20** Праграма «Эксперыментатары».
**08.35** Праграма «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
**09.00** Навіны Садружнасці.
**09.10** Праграма «Свет Спорту».
**09.40** Праграма «Даведнік».
**10.05** Праграма «Зроблена ў СССР».
**10.30** Мастацкі фільм «Гэта вясёлая планета».
**12.15** Тэлесерыял «Дзяўчынкі».
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.10** Мастацкі фільм «Віват, Гардэмарыны!».
**17.40** Мастацкі фільм «Гардэмарыны 3».
**19.35** Праграма «Навіны Садружнасці. Культура».
**20.15** Мастацкі фільм «Са мною вось што адбываецца».
**21.40** Варвара. Музычны спектакль «Вытокі».
**23.25** Мастацкі фільм «Ва-банк».
**01.05** Праграма «Таямніцы Эрмітажа».
**01.20** Тэлесерыял «Дзяўчынкі».
**04.05** Дакументальны фільм «З нагоды».

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Інфармацыйна-публіцыстычны блок.
**08.25** Невядомая Беларусь: «Зямля ў палоне», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**08.55** Аб'ектыў.
**18.00** Беларусы ў Польшчы.
**18.15** «З крыжам на крыж», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**18.35** Моўнік (лінгвістычная праграма): Да якой ступені варта быць лянівым?
**18.50** Калыханка для самых маленькіх: «Пацукі».
**19.00** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**19.30** «Кар'ера Нікодэма Дызмы», серыял: 2 серыя.
**20.25** Зона «Свабоды» (аналітычная праграма). Погляд на падзеі тыдня вачыма журналістаў радыё «Свабода».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Happy New York», маст. фільм, 1997 г., Польшча.
**22.50** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 12 серыя.
**23.40** МакраФон: «Белая яблыня грому», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 1 і 2.
**00.05** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 29 СНЕЖНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1 БЕЛАРУСЬ

**07.15** Камедыя «Цыкуты, ці Сусветная гісторыя атручванняў» (Расія).
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.10** Арсенал.
**09.35** Серыял «Сваты-6» (Расія - Украіна).

**10.40** Камедыйны серыял «Сваты-6. За кадрам» (Расія - Украіна).
**11.35** БеларусьLIFE.
**12.10** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**12.40** Каробка перадач.
**13.15** «XXL WOMAN TV». Жаночы часопіс.
**13.45** Terra incognita. Беларусь невядомая.
**14.15** Клуб рэдактараў.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Медычныя таямніцы.
**16.10** Evrovision. Вынікі тыдня.
**16.30** Давярай і правярай.
**17.00** Камедыйны серыял «Сваты-6. За кадрам» (Расія - Украіна).
**18.00** Камедыйны серыял «Сваты-6. За кадрам» (Расія - Украіна).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Журналісцкае расследаванне.
**22.35** Меладрама «Вікі Крысціна Барселона» (Іспанія - ЗША).

### Н

**07.00** АНТ прадстаўляе. «Нядзельная раніца».
**08.00** Нашы навіны.
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** «Смешарыкі. ПІН-код».
**09.35** «Шалапутныя нататкі».
**09.55** «Пакуль усе дома».
**10.50** «Фазэнда».
**11.25** Мультфільм.
**11.50** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**12.55** Прэм'ера. «Раманавы».
**14.00** «Два колеры запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Юры Мікалаеў. «Не магу без ТБ».
**17.40** АНТ прадстаўляе: «Рассмяшы коміка».
**18.50** АНТ прадстаўляе: «Я люблю Беларусь!».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Ледавіковы перыяд». Фінал.
**00.15** Камедыя «Дванаццаць крэслаў».

### ТВ

**06.10** «Next-3». Серыял. Заключная серыя.
**07.05** «Жыць будзеце».
**07.50** «100 адсоткаў».
**08.20** Фільм «Скубі-Ду» (ЗША - Аўстралія, 2002 г.).
**10.00** «Аўтапанарама».
**10.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».
**11.30** «Вялікі сняданак».
**12.10** «Добры дзень, доктар».
**12.45** Фільм «Трэмбіта» (СССР, 1968 г.).
**14.35** «Тэрыторыя памылак».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** Канцэрт М.Задорнава.
**17.40** «Аўтапанарама».
**18.10** СТБ прадстаўляе: вячэрняе шоў «На тым жа месцы ў той жа час».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Целаахоўнік» (ЗША, 1992 г.).
**23.05** «Містычныя гісторыі».
**00.05** Фільм «Тэатр» (ЗША, 2009 г.).

### 2 БЕЛАРУСЬ

**07.40** Прыгодніцкі мультсерыял «Клуб Вінкс. Школа чараўніц» (Італія).
**08.50** Тэлебарометр.
**08.55** Фантастычны фільм «Гатака» (ЗША).
**11.00** Містычны трылер «Шкляны дом» (ЗША).



**13.05** Гумарыстычная праграма «Жаночая ліга. Хлопцы. Грошы. Каханне» (Расія).
**13.40** Камедыйны серыял «Таксі» (Украіна).
**14.45** Рамантычная камедыя «Няня-2» (ЗША - Францыя).
**16.45** Спартова-прыгодніцкі фільм «Пачатковец» (ЗША).
**19.15** Суперлато.
**20.25** Навіны надвор'я.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Камедыйны баявік «Разборкі ў стылі кун-фу» (Ганконг - Кітай).
**23.05** Гумарыстычная праграма «Жаночая ліга. Хлопцы. Грошы. Каханне» (Расія).
**23.45** Камедыйны серыял «Таксі» (Украіна).
**00.35** Хакей для ўсіх.
**01.20** Спорт-кадр.

### 3 БЕЛАРУСЬ

**08.00** «Калейдаскоп».
**08.05** «Таямніца душы».
**08.35** «Кожны мае права быць розным».
**09.00** «АРТиШОК».
**09.30** Мультфільмы.
**10.10** «Уладзімір Высоцкі. Беларускі след». Беларускія карані Уладзіміра Высоцкага.
**10.35** «Андрэй Бембель: Смерць, Перамога, Слава». Дакументальны фільм.
**11.05** «Сустрэча на Эльбе». Дакументальны фільм.
**11.30** «Карані».
**12.00** «Калейдаскоп».
**12.05** «Караваджа». Мастацкі фільм. 1-я і 2-я серыі.
**13.40** «Калейдаскоп».
**13.45** «Караваджа». Мастацкі фільм. 1-я і 2-я серыі.
**15.35** «Без права на дубль». Сяргей Бадроў.
**16.25** Дзіцячы фільм. «Залаты ключык».
**17.45** Мультфільм.
**18.15** «Культпрасвет».
**18.40** Сусветнае кіно. «Баль».
**20.30** Калыханка.
**20.50** «Навагодні тыдзень». Вечар з Дзмітрыем Калдуном.
**21.45** «Культпрасвет».
**22.15** «Несцерка». Спектакль Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі.
**00.00** «Калейдаскоп».

### НТВ

**06.25** Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль».
**08.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**08.20** «Медыцынскія таямніцы».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.20** «Дачны адказ».
**11.25** «Паедзем, паямо!».
**11.55** «Цуд тэхнікі».
**12.30** «Першая перадача».
**13.20** «Лепшы горад Зямлі».
**14.10** Серыял «Груз».
**17.35** «Следства вялі.».
**18.25** Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**19.50** «Анастасія Валачкова. Мая споведзь».
**20.50** Серыял «Груз».
**00.25** «Школа зласлоўя».

### МИР

**05.00** Мультфільмы.
**07.50** Праграма «Таямніцы Эрмітажа».
**08.05** Праграма «Ведаем рускую».
**09.00** Навіны Садружнасці.
**09.10** Праграма «Зямля і неба».
**09.35** Праграма «Прыгоды Македонскай».
**09.50** Праграма «Са свету па нітцы».
**10.10** Мастацкі фільм «Рам і Лакхан».
**13.00** Мастацкі фільм «Тата».
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.10** Ток-шоў «Яшчэ не разам».
**15.45** Тэлесерыял «Вяпрук».
**20.00** Выніковая праграма «Разам».
**21.30** Тэлесерыял «Вяпрук».
**00.20** Мастацкі фільм «Залаты аўтамабіль».
**02.00** Мастацкі фільм «Гэта вясёлая планета».
**03.45** Праграма «Цюркі Расіі».

### БЕЛСАТ TV BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Казкі для дзетак: «Пінгвінік Пік-Пок», «Прыгоды і паходы», «Занатоўкі натураліста».
**07.40** «Калі сэрца ў чаканні», серыял: 20-21 серыі.
**08.30** «Happy New York», маст. фільм, 1997 г., Польшча.
**18.00** Зона «Свабоды».
**18.30** Моўнік (лінгвістычная праграма): «Рускія» і «расейцы»: ці гэта сінонімы?
**18.45** Калыханка для самых маленькіх: «Пацукі».
**18.55** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**19.25** «Час гонару», серыял: 66 серыя.
**20.15** Дак. гадзіна: «Лікёра-гарэлачны завод», дак. фільм, 2010 г., Швецыя.
**21.10** Фільматэка майстроў: «Золата дэзерціраў», маст. фільм, 1998 г., Польшча.
**23.15** «Кароль-вінароб», серыял: 10 серыя.
**00.00** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).

---

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма купіць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час», і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў рэдакцыі і ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 930 79 22, Міхась
Бабруйск: (8 029) 628 75 01, Вольга
Мінск: (8 029) 178 31 68, Вольга
Слуцк: (8 029) 364 42 60, Зінаіда
Гомель (8 029) 697 82 75, Аляксандр

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ _____ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ _____
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС _____

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 _____
Время приема _____ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 3000 руб., аднаго месяца — 12000 руб.

Дзякуй вам за падтрымку!

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня _____

Всего _____

Кассир

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

НОВЫ ЧАС

www.novychas.info

ГЕАПАЛІТЫКА

# АРМЯНСКІ ВЫБАР

**Нечакана для ўсіх у верасні Серж Саргсян абвясціў пра намер Арменіі стаць сябрам Мытнага саюзу. Ці падтрымліваюць простыя армяне выбар свайго прэзідэнта? Пра сітуацыю ў Арменіі журналіст НЧ Алег Новікаў размаўляе з армянскай апазіцыйнай актывісткай Гаянэ Арустамян.**

***— Нават для расійскіх аглядальнікаў, якія стала выступаюць за еўразійскую інтэграцыю, рашэнне Саргсяна аказалася сюрпрызам. А што адчулі людзі ў самой Арменіі, калі даведаліся пра тое, што прэзідэнт зрабіў геапалітычны выбар на карысць Масквы?***

— З аднаго боку, сапраўды, ніхто не чакаў такога кроку ад улады. Як вядома, апошніх два гады ўрад актыўна рыхтаваў дамову аб асацыяцыі з ЕС, парафіяванне якой мела адбыцца ў Вільнюсе. І раптам за два дні геапалітычны вектар кардынальна змяніўся. На хвалі шоку ад навін з Масквы ў армянскай сталіцы прайшла спантанная маніфестацыя. З другога боку, трэба прызнаць, што на нешта падобнае ад нашых уладаў варта было спадзявацца. Трэба нагадаць, што ўвесну 2008-га ў нас прайшлі прэзідэнцкія выбары, якія закончыліся нашым армянскім Майданам. Прыкладна паўмільёна чалавек выйшлі на сталічную плошчу Свабоды пратэставаць супраць фальсіфікацый, за кошт якіх Саргсян стаў пераможцам. Праз нейкі час вайскоўцы жорстка разагналі маніфестантаў. Паводле падлікаў праваабаронцаў, каля 60 чалавек падчас зачысткі былі забітыя. Таму асаблівых ілюзій адносна Саргсяна грамадства не мае. Шмат хто лічыць яго ўвогуле нелегітымным. Рашэнне далучыцца да Мытнага саюзу адпавядае духу рэжыму, якому абыякава думка грамадства.

***— Чаму апазіцыі не падабаецца Мытны саюз? Масква абяцае, што далучэнне да МС палепшыць эканамічны стан армян. Называецца сума ў 15 мільярдаў долараў. Быццам, столькі грошаў будзе інвеставана ў армянскую эканоміку ў бліжэйшы час.***

— Эканамічная сітуацыя ў Арменіі даволі складаная. Зараз сярэдні заробак у краіне каля 100 долараў. Між тым, узімку рахункі за камуналку могуць даходзіць да 80 долараў. Аднак мала хто верыць, што ўваходжанне ў Мытны саюз пазітыўна паўплывае на стан рэчаў. Па сутнасці, Арменія даўно ўжо ў руках расійскага бізнэсу: для пагашэння знешняга доўгу перад Масквой урад у якасці кампенсацыі перадаў ёй практычна ўсе вядучыя аб'екты прамысловасці — ад АЭС да чыгункі.

Аднак, як бачым, гэта не прывяло да росквіту эканомікі. Затое ў нас пачалася новая хваля русіфікацыі. З'яўленне расійскіх менеджэраў у офісах армянскіх кампаній пацягнула перавод дакументацыі на рускую мову. Як следства — сярод нашых чыноўнікаў узнікла ідэя надання рускай мове статусу дзяржаўнай. Мы не супраць стратэгічнага партнёрства з Расіяй, аднак цяперашняя мадэль адносін з Масквой мала нагадвае партнёрскую схему.

***— Газеты пішуць, што Саргсян пагадзіўся на ўваходжанне ў МС з-за праблемы знешняй бяспекі. Патранат Расіі над Арменіяй гарантуе, што Азербайджан не будзе спрабаваць сілавымі сродкамі вярнуць сабе Нагорны Карабах.***

— Расія дыпламатычна падтрымлівае Арменію, пры гэтым адначасова пастаўляе зброю ў Азербайджан. Мне падаецца, што мэта Расіі — не дапусціць мірнага дыялогу паміж Арменіяй і Азербайджанам. Пагроза эскалацыі канфлікту відавочна дапамагае Маскве трымаць пад кантролем як Баку, так і Ерэван. У Маскве таксама ведаюць, наколькі тэма Карабаху важная для армянскага грамадства. Шмат хто ў Арменіі сапраўды кажа — трэба сціснуць зубы і пагадзіцца на ўваход у Мытны саюз дзеля захавання Карабаху.

***— Ці каментуюць армяне тое, што Лукашэнка таксама пачаў пастаўкі зброі ў Азербайджан?***

— Мы пра гэта ведаем, аднак асабліва шмат у грамадстве пра тыя пастаўкі не кажуць. Усім зразумела, што беларускія партыі зброі для Баку — гэта дробязь у параўнанні з расійскімі.

***— Уступленне Арменіі ў Мытны саюз не зразумелае з улікам існавання такога феномену, як моцная армянская дыяспара на Захадзе. Армянскія грамады ў той жа Францыі і ЗША — вельмі ўплывовыя, і ў тым ліку даўно займаюцца палітычным лабізмам.***

— На Захадзе, сапраўды, ёсць моцная армянская грамада, аднак значна больш краіна залежыць ад дыяспары ў Расіі. Гэта прыкладна паўтара мільёны грамадзян, прычым актыўных грамадзян, за кошт працы якіх выжываюць сем'і на радзіме. Некаторыя нават жартуюць, што сапраўдным прэзідэнтам армян з'яўляецца не Саргсян, а Пуцін. Масква цудоўна разумее залежнасць армян ад грашовых пераводаў з Расіі. Таму, калі патрэбна шантажаваць Ерэван, адразу пачынаецца ціск на армянскіх працоўных мігрантаў. Часам справа даходзіла да армянскіх пагромаў.

***— Рэакцыя Еўрасаюзу і ЗША на рашэнне Арменіі ісці ў Мытны саюз дастаткова спакойная. Каментары на гэты конт нельга параўнаць з эмацыйнымі каментарамі наконт рашэння Украіны не падпісваць дамову пра Асацыяцыю з ЕС. Чаму Захад здае Арменію?***

— Арменія даўно трапіла ў геапалітычную пастку, і тое, пра што вы кажаце, — толькі дзяжурная ілюстрацыя гэтай з'явы. Калі ў 2008 годзе войскі разганялі пратэстуючых, натоўп рушыў у бок дыпламатычнага кварталу, каб заходнія дыпламаты сталі сведкамі расправы. Аднак ніводзін МЗС у Еўропе не асудзіў учынкі Саргсяна. На Захадзе даўно пагадзіліся з тым, што Арменія — гэта сфера інтарэсаў Расіі, якая ў сваю чаргу традыцыйна разглядае Арменію як свой фарпост у Закаўказскім рэгіёне.

***— Наўрад ці заявы прэзідэнта Арменіі дастаткова для фармальнага ўступлення краіны ў Мытны саюз. Як мінімум, патрэбна згода парламента. Ці ёсць у армянскім парламенце дэпутаты — праціўнікі еўразійскай інтэграцыі?***

— У армянскім парламенце засядае прыкладна 130 дэпутатаў з якіх 7–8 можна назваць апазіцыянерамі. Такі расклад існуе не таму, што армяне ў масе падтрымліваюць Мытны саюз. Папросту ў краіне дамінуе так званы «карабахскі клан». Гэта групоўка, якая даўно кантралюе асноўныя сегменты эканомікі, адміністратыўную вертыкаль і, адпаведна, фармуе пад сябе дэпутацкі корпус. Не дзіўна, што ўсе апошнія прэзідэнты Арменіі выйшлі з Карабаху. Супрацьстаяць сістэме вельмі цяжка. Калі я спрабавала ісці ў дэпутаты, мяне проста збілі на вуліцы. Ніводны клан у самой Арменіі не здольны супрацьстаяць карабахцам. У тым ліку таму, што карабахцы звязаныя з расійскімі спецслужбамі. Увогуле, пасля 2008 года цэнтр апазіцыі знаходзіцца на вуліцы. Практычна кожны дзень праз інтэрнэт арганізуюць нейкія пратэсты. Менавіта такім чынам быў арганізаваны пратэст падчас нядаўняга візіту Пуціна.

***— У чым вы як прадстаўнік апазіцыі бачыце перспектыву?***

— Вымушана прызнаць, што ў якасці перспектывы людзі, як правіла, абіраюць эміграцыю. Няма нічога, што магло гаварыць пра нейкія хуткія змены да лепшага. Аднак я мяркую, што гэта чорная паласа павінна скончыцца. Напэўна, армяне — аптымісты, паколькі мы вельмі старадаўні народ, якому прыйшлося прайсці праз шмат выпрабаванняў. Думаю, прарвемся і зараз.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Калі атрымалася ўсталяваць адзіную валюту для 28 еўрапейскіх дзяржаў, то чаму немагчыма зрабіць тое ж самае ў дачыненні да Расіі і Беларусі? Пытанне ў іншым — узнікае праблема ліміту бюджэту. Праблема, звязаная з тым, што пытанне валюты — гэта пытанне бюджэту, ліміту бюджэту і магчымасці, як гаворыцца, націскаць на кнопку станку для друку. Гэта значыць, з таго моманту, як уводзіцца адзіная валюта, дзяржавы, якія ўцягнутыя ў гэту агульную валютную прастору, павінны будуць узгадняць сваю бюджэтную палітыку і націскаць кнопку на станку проста так яны больш не змогуць. На думку экспертаў, прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка не гатовы пазбавіцца магчымасці карыстацца друкарскім станком. А гэта давядзецца зрабіць, бо, у сілу рознасці эканамічных патэнцыялаў, рашэнні будуць прымацца ў Крамлі.

**«Накануне» (Расія)**

Гадавы паліўна-энергетычны баланс і бонус у выглядзе запытаных 23 мільёнаў тон нафты Беларусь атрымае толькі ў выпадку выканання даўно абяцаных сумесных праектаў па прыватызацыі. Ужо які год краіны-саюзніцы знаходзяцца ў стане перманентнага высвятлення адносін. Мінску шкада расставацца з даходнымі вытворчымі актывамі, якія сталі кармушкай для мноства чыноўнікаў. Крэмль, не асабліва спадзеючыся на перамогу на прыватызацыйным фронце, умела падхапіў беларускую гульню ў «прадам — не прадам», і за шуміхай вакол уразання нафтавых паставак працяскае іншыя свае праекты. У 2014 годзе Уладзімір Пуцін усё ж разлічвае на падпісанне дамовы аб Еўразійскім саюзе. Але нават калі ў Крамлі вырашаць у абмен за гэта «пазалаціць руку» Мінску новым трохмільярдным крэдытам ЕўрАзЭС, пытанне аб прыватызацыі беларускіх прадпрыемстваў на карысць расійскага бізнэсу з парадку дня не здымаецца.

**«Deutsche Welle» (Германія)**

Лукашэнка патроліў ворагаў «канцом дыктатуры». Выбары ў мясцовыя саветы будуць пачаткам дэмакратыі, а апагею так званая «дэмакратыя» дасягне ў прэзідэнцкія выбары, і скончыцца гэта парламенцкімі выбарамі. Паглядзіце відэа, калі ў кагосьці варухнуліся ілюзіі: абвяшчаючы пра канец дыктатуры з новага года, ён ціха пасмейваецца ў вусы. А то ж, дадуць вам з новага года дэмакратыю. Потым дагоняць і яшчэ раз дадуць.

**«Трейдер» (Расія)**

Так ці інакш, падзеі на Украіне з'яўляюцца гістарычна незваротнымі і вядуць да геапалітычных пераўтварэнняў. Хутчэй раней, чым пазней, Украіна па-сапраўднаму стане часткай дэмакратычнай Еўропы. Дзіўна, што нават у суседняй Беларусі, дзе кіруе аўтарытарны рэжым Лукашэнкі, пачынае праяўляцца такая ж заходняя арыентацыя... Кожная з гэтых краін усведамляе, што яе незалежнасць і культурная ідэнтычнасць усё больш актыўна паказваюць ім шлях на Захад.

**«Financial Times» (Вялікабрытанія)**

А што на выхадзе? Можа, новы СССР? Не будзе ніякага СССР! І гэтаму ёсць жалезабетонны доказ: 26 студзеня 2000 года ўступіў у сілу Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі. Гэта значыць, ужо 14 гадоў мы з вамі жывем у адзінай дзяржаве. За гэтыя 14 гадоў Мінску выдалі датацый амаль на 100 мільярдаў долараў. І што? Лукашэнка не пайшоў нават на такую дробязь, як прызнанне незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Расія не атрымала ні аднаго кавалка беларускай прамысловасці, якая ад яе залежыць. Што ўжо казаць пра Украіну!

**«Итоги» (Расія)**

Беларусь на ўсякіх міжнародных арэнах і на ўнутраным узроўні пастаянна падкрэслівае тое, што лічыць сябе сацыяльным раем, сацыяльнай дзяржавай, у якой сацыяльнае становішча грамадзян нашмат лепш, чым у суседзяў. Гэты сацыяльны рай, які так часта падае міжнароднай супольнасці беларускі ўрад, будуецца на пастаянным і паўсюдным парушэнні працоўных правоў грамадзян Беларусі і выразна выяўленых элементах прымусовай працы.

**«RFI» (Францыя)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### **ВЕНЕСУЭЛА.** АПАЗІЦЫЯ РОБІЦЬ СТАЎКУ НА НАЦЫЯНАЛІЗМ

Вынікі венесуэльскай апазіцыі на мясцовых выбарах (42 працэнты за апазіцыю супраць 54 працэнтаў у праўладных кандыдатаў) выклікалі дэбаты пра неабходнасць змены «адзінага». Нагадаем, што апошнія два гады лагер праціўнікаў Чавеса і яго палітычнага нашчадка Нікаласа Мадуры ўзначальваў Энрыке Капрылес. У прынцыпе, ён дэманстраваў някепскія вынікі ў параўнанні з былымі апазіцыйнымі правадырамі, аднак, так ці інакш, пры Капрылесе апазіцыя прайграла трэція выбары запар. Старшыня кааліцыі дэмакратычных сіл Венесуэлы ўжо паставіў пытанне пра магчымую адстаўку Капрылеса. Між тым, нечакана для ўсіх, адным з галоўных кандыдатаў на патэнцыйна вакантнае месца выступае дэпутат Рамон Авеледа.

**Паводле іспанскай прэсы**

### **УКРАІНА.** СЦЯГ ПРАПАНУЮЦЬ ПЕРАГАРНУЦЬ

Уразгар пратэстаў на Майдане нечакана адрадзілася дыскусія наконт таго, ці ў адпаведным парадку выяўленыя асноўныя колеры ўкраінскага сцяга. Нагадаем, што піянеры ўкраінскай незалежнасці (той жа першы прэзідэнт Міхаіл Грушэўскі) выкарыстоўвалі не сіне-жоўты, а жоўта-сіні штандар. Палосы пераставіў гетман Скарападскі. Спрэчка наконт правільнай паслядоўнасці колераў цягнулася да заканчэння Другой сусветнай вайны, калі ўкраінская дыяспара пачала выкарыстоўваць выключна сіне-жоўты сцяг. Калі ў 1991 годзе абвяшчалі ўкраінскую незалежнасць, большасць грамадства была згодная з такім варыянтам. Аднак зараз апазіцыя перайшла ў наступ. Справа ў тым, што прыхільнікі Януковіча таксама агітуюць пад сіне-жоўтым сцягам. У дадатак, прыхільнікі рэформы спасылаюцца на кітайскую філасофію, адпаведна якой дамінаванне сіняга над жоўтым ёсць «законам заняпаду». Аднак пакуль аматараў выкарыстоўваць жоўта-сіні сцяг практычна няма. Мяркуюць, што прычына ў сялянскай філасофіі ўкраінцаў, якія бачаць у сцягу не сакральнае пасланне, а выяву спелага жыта пад блакітным небам.

**Паводле ўкраінскай прэсы**

### **ГРУЗІЯ.** ЗАГАДКА СМЕРЦІ ЗУРАБА ЖВАНІЯ

У Грузіі адноўлена справа смерці Зураба Жванія — аднаго з арганізатараў «рэвалюцыі ружаў», прэм'ера Грузіі. 3 лютага 2005 года паліцэйскія знайшлі ў адной з кватэраў грузінскай сталіцы трупы Зураба Жванія і яго сябра. Афіцыйная версія сцвярджае, што яны памерлі ад атручвання ўгарным газам. Між тым, хапае неафіцыйных версій, паводле якіх смерць Жванії і яго сябра была гвалтоўнай: яны абодва, быццам, былі застрэленыя. Пры Саакашвілі альтэрнатыўныя версіі нікога не цікавілі, аднак пасля нядаўняй змены кіраўніцтва краіны яны зноў выклікалі інтарэс. Былыя апазіцыянеры не хаваюць намеру давесці, што менавіта Саакашвілі замовіў Жванію. Быццам, Саакашвілі заўсёды меў комплекс непаўнавартаснасці з-за таго, што малодшы Жванія — больш аўтарытэтны палітык, чым ён. Праўда, у такой версіі хапае крытыкаў. Грузія — краіна невялікая, і любы канфлікт, нават на такім высокім узроўні, адразу стаў бы ўсім вядомым. Магчыма, праўда ўсплыве хутка. Свае высновы камісія па даследаванні прычын смерці Жванії павінна апублікаваць у лютым 2014-га.

**Паводле грузінскай прэсы**

### **ФРАНЦЫЯ.** КРАІНА РАЗВАЛЬВАЕЦЦА

Уся Францыя ў шоку: упершыню французскі прэм'ер сказаў некалькі слоў на мове этнічнай меншасці, якая пражывае ў Францыі. 13 снежня падчас праграмнага выступу наконт сацыяльных пратэстаў у Брэтані прэм'ер нечакана сказаў пару фраз па-брэтонску. Такім чынам, чыноўнік намагаўся супакоіць брэтонскае грамадства, якое выйшла на вуліцы пратэстуючы супраць новага падатку на прыватны транспарт. У адказ урад прапанаваў маніфестантам т. зв. «Пакт за будучыню Брэтані», паводле якога ў краіне пачынаецца працэс дэцэнтралізацыі Францыі. Яго сутнасць, па словах прэм'ера, у тым, каб перадаць мясцовым уладам «новыя кампетэнцыі». Пакуль ніхто не разумее, што гэта значыць, аднак нейкія працэсы сапраўды адбываюцца.

**Паводле французскай прэсы**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# НОВАЯ ФОРМУЛА «УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА»

Алег НОВІКАЎ

**Нямецкі МЗС працуе над новай формулай «Усходняга партнёрства». Галоўная інавацыя будзе заключацца ў тым, што праграма «Усходняга партнёрства» павінна праводзіцца з улікам інтарэсаў Расіі.**

Як вядома, у Германіі сфармавана Вялікая кааліцыя. А знешнепалітычнае ведамства ўзначаліў сацыял-дэмакрат Франк-Вальтэр Штайнмаер.

Змена гаспадара МЗС абяцае вялікія перамены. Штайнмаер вядомы як лабіст тэорыі пра тое, што ўсе крокі на Усходзе Берлін мусіць узгадняць з Масквой. Менавіта такую палітыку Штайнмаер праводзіў у 1999–2005 гадах, калі адказваў у першай Вялікай кааліцыі эсдэкаў і хрысціянскіх дэмакратаў за замежнае ведамства.

І якраз менавіта таму навіна пра вяртанне Штайнмаера на пасаду дырэктара МЗС ФРГ выклікала занепакоенасць часткі нямецкага грамадства. Шмат хто лічыць, што пасіўная палітыка Берліна на Усходзе была адным з фактараў Каўказскай вайны: у Масквы пасля кантактаў са Штайнмаерам, быццам, склалася ўражанне, што Захад не гатовы да рашучых акцый і, як следства, расійскія танкі рушылі на Тбілісі. «Новы Час» ужо пісаў, што шэраг нямецкіх выданняў вялі кампанію супраць вяртання Штайнмаера на пасаду міністра. Аднак у выніку кааліцыянты засталіся вернымі нямецкай палітычнай традыцыі, паводле якой малодшы партнёр у кааліцыйным кабінеце атрымлівае крэсла кіраўніка дыпламатычнага ведамства.

Пра тое, што новы ўрад зробіць акцэнт на супрацоўніцтве з Масквой, кажа і вядомы нямецкі палітолаг Аляксандр Рар. Палітолаг упэўнены, што Германія будзе наладжваць дзелавыя адносіны з Расіяй. Гэта, на яго думку, неабходна Еўропе, паколькі ўся палітыка «Усходняга партнёрства» становіцца неэфектыўнай з-за моцнага ўплыву Расіі ў рэгіёне.

«Новы нямецкі ўрад у рамках «Усходняга партнёрства», хутчэй за ўсё, будзе шукаць шляхі наладжвання дыялогу з Расіяй, каб яна не тармазіла еўрапейскую інтэграцыю Украіны і іншых краін. Магчыма, калі-небудзь Расія сама пойдзе на збліжэнне з ЕС і падпіша дамову пра супрацоўніцтва», — сказаў Аляксандр Рар.

Ён таксама дадаў: «Пытанне супрацоўніцтва Украіны з ЕС не магчыма вырашыць без Расіі. Пры падпісанні дамовы з Еўропай, Украіна фактычна разарве гандлёвыя адносіны з Расіяй, а Расія, у сваю чаргу, з Украінай». На думку Рара, змяненне нямецкай палітыкі ў рэгіёне перш за ўсё будзе тычыцца перагляду фармату дзейнасці праекту «Усходняе партнёрства».

«Deutsche Welle» ў сувязі з гэтым адзначае: «Палітыка «Усходняга партнёрства» дагэтуль была накіравана на тое, каб вывесці Украіну, Грузію і Малдову з зоны ўплыву Расіі. У будучыні Брусэль павінен пераарыентавацца на больш цеснае супрацоўніцтва з Масквой. Жалезная заслона ў Еўропе будзе канчаткова прыбраная, калі ЕС і Расія замест спрэчак пра прыналежнасць гэтых дзяржаў падпішуць дамову пра асацыяцыю і стварэнне зоны вольнага гандлю. І па гэтым жа шляху пойдуць у канчатковым рахунку і краіны, якія размешчаны паміж ЕС і Расіяй».

Трэба прызнаць, што такога кшталту прапановы агучаныя ў вельмі зручны час. Пасля Вільнюскага саміту праект «Усходняга партнёрства» (УП) перажывае крызіс. Пра неабходнасць канцэптуальнай перазагрузкі УП не кажа толькі лянівы.

Як дакладна будзе выглядаць новае «Усходняе партнёрства», пакуль не надта зразумела. А вось нямецкі бізнэс не хавае, што хоча вяртання ў часы Шродэра, калі палітыкі з іх ідэямі правоў чалавека не заміналі ім рабіць бізнэс. Так, напярэдадні галасавання ў Бундэстагу па новай урадавай праграме Усходні камітэт германскай эканомікі выступіў з 10 тэзамі, адрасаванымі будучаму ўраду і цяперашняму расійскаму кабінету міністраў. Дзелавыя колы ФРГ мяркуюць, што палітыка новага нямецкага ўрада павінна быць накіравана на актывізацыю сыравіннага партнёрства абедзвюх краін. На практыцы гэта можа значыць, што прыярытэтам для Берліна стане нармальны транзіт праз Украіну і Беларусь, а не стан дэмакратыі ў гэтых краінах.

Расійская прэса, дарэчы, заўчасна вітала намечаную змену курсу нямецкай дыпламатыі. «Цяперашні трансатлантычны саюз, на які арыентуецца Еўропа, можа быць толькі адным элементам будучай еўрапейскай прылады. Без прывязкі Расіі Еўрапейскі кантынент застанецца нестабільным», — адзначае «Независимая газета».

Той факт, што такія прагматычныя заявы гучаць на фоне падзей у Кіеве, выглядае як мінімум не вельмі этычна з боку нямецкіх палітыкаў. Фактычна, Берлін ужо зараз дае сігнал, што Украіна не будзе прыярытэтам яго знешняй палітыкі ў гэтым накірунку. Як тут не згадаць, што менавіта Штайнмаер у 2007 годзе быў адным з тым, хто крытыкаваў жаданне Юшчанкі атрымаць для Украіны статус сябра NATO.

Магчыма, своеасаблівай маральнай кампенсацыяй і для ўдзельнікаў Еўрамайдану ёсць той факт, што Ангела Меркель, як сведчыць вопыт, заўсёды цікавілася знешняй палітыкай, і ў тым ліку ва Усходняй Еўропе. Пры гэтым экс-дысідэнтка ГДР намагалася, каб у аснове прынцыпаў дзейнасці МЗС была ідэя падтрымкі правоў чалавека. Такая прынцыповая пазіцыя каштавала ёй шэрагу канфліктаў са Штайнмаерам у 1999–2005 гадах.

Напрыклад, насуперак патрабаванням тагачаснага дырэктара МЗС, Ангела Меркель афіцыйна прыняла Далай Ламу. Таксама вядома, што хрысціянскія дэмакраты Германіі ледзь не наўпрост патранаваюць партыю Віктара Клічко «Удар» і, відавочна, маюць свае погляды на перспектыву Украіны і ўсяго ўсходнееўрапейскага рэгіёну.

Ёсць яшчэ адзін выклік для новага праекту «Усходняга партнёрства». Ён звязаны з відавочнай нестабільнасцю працы новага кабінета. У SPD сфармавалася вялікая фракцыя праціўнікаў Вялікай кааліцыі. Дастаткова сказаць, што супраць ідэі катрэлю выказалася ўся моладзевая секцыя партыі. Яны лічаць, што коштам дамовы з Меркель стане працяг крызіс іміджу SPD як левага суб'екта нямецкай палітыкі. Супраць кааліцыі выказаліся і маладыя кансерватары, якія патрабуюць ад Меркель больш ліберальнага курсу. Палітолагі кажуць пра праблемы ідэнтычнасці CDU. Гэта абяцае новаму ўраду няпростае жыццё. Не факт, што кабінет увогуле пратрымаецца пяць гадоў, якія па канстытуцыі адведзеныя яму пад працу. Гэта, як следства, выклікае сумневы, што цяперашні нямецкі праект новага «Усходняга партнёрства» паспеюць не тое што рэалізаваць, але нават і прыняць.

**Новы нямецкі ўрад у рамках «Усходняга партнёрства», хутчэй за ўсё, будзе шукаць шляхі наладжвання дыялогу з Расіяй, каб яна не тармазіла еўрапейскую інтэграцыю Украіны і іншых краін**

УКРАІНА — ЕС

# АЛІГАРХІ НА МАЙДАНЕ

**Чым больш цягнецца стаянне на Майдане, тым часцей ва ўкраінскай прэсе агучваецца тэзіс пра тое, што да арганізацыі акцыі датычныя фракцыі алігархаў, уключаючы прадстаўнікоў данецкага клану. Ці так гэта на самай справе? На пытанні журналіста НЧ Алега Новікава адказвае кіеўскі палітолаг Сяргей Маўчан.**




***— Версія пра нябачную руку алігархаў над Майданом з'явілася параўнальна нядаўна. Што прымусіла грамадства мусіраваць гэту тэму?***

— Дэталёвы аналіз падзей у ноч на 30 лістапада на Майдане, калі былі збітыя студэнты, паказвае на шмат супярэчнасцяў. Перш за ўсё, на кадрах відаць, што спачатку невядомыя спрабуюць правакаваць «Беркут». Але ніводны з тых, хто нападаў на спецназ, не прыцягнуты да адказнасці. Можна казаць пра тое, што ў гэтым кірунку следства наогул не вядзецца. Значыць, камусьці гэта трэба. Але галоўнае ў іншым. Варта зразумець: каму быў выгодны такі сцэнар развіцця падзей, як новая эскалацыя канфлікту, які на 30 лістапада ўжо быццам затух? Сярод варыянтаў адказаў ёсць і наступны: працяг масавых акцый патрэбны алігархам як нагода заявіць Януковічу пра свае правы і выказаць нязгоду з яго эканамічнай і кадравай палітыкай.

***— Што падштурхнула алігархаў на такі крок?***

— Па-першае, дэманстратыўнае парушэнне правіл і традыцый, усталяваных пасля вялікага перадзелу напрыканцы 1990-х гадоў. Гэта праяўляецца ў тым, што ключавыя пасады ў Кабміне занялі людзі Януковіча, а не прадстаўнікі розных фракцый данецкага клану. Лідары буйнога бізнэсу таксама не задаволеныя асабістымі амбіцыямі старэйшага сына прэзідэнта — Аляксандра Януковіча. Ёсць інфармацыя, што ён нефармальна кантралюе ключавыя інстытуты дзяржавы: МУС, Падатковую службу, Нацбанк, Міністэрства прыродных рэсурсаў. Па-другое, Януковіч відавочна праводзіць курс на знішчэнне канкуруючых фінансава-прамысловых груповак за кошт пашырэння бізнэс-імперыі сваёй сям'і. Каб нейтралізаваць гэтыя працэсы, або прынамсі шантажаваць Януковіча, буйному бізнэсу было лагічна падтрымаць пратэст на Майдане.

***— Найбольш часта, калі гаворка ідзе пра так званы «бунт алігархаў», згадваецца імя кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Сяргея Лёвачкіна.***

— Лёвачкін — бізнэс-партнёр аднаго з найбуйнейшых украінскіх прадпрымальнікаў Дзмітрыя Фірташа, які, уклаўшы грошы ў газавы транзіт, зрабіў стаўку на ўваходжанне Украіны ў ЕС . Ён даўно фінансаваў праеўрапейскія палітычныя структуры, як, напрыклад, партыю «Удар» Віктара Клічка. Менавіта Лёвачкін кантраляваў інфармацыйную палітыку ўлады, і ў прыватнасці, адказваў за прапаганду дамовы пра асацыяцыю з ЕС, якая стварыла ў грамадзян Украіны завышаныя чаканні адносна еўраінтэграцыі. Яго жонка асабіста ўдзельнічала ў арганізацыі першага студэнцкага Майдану, які хутчэй дэпалітазаваў пратэст.

Па адной з версій, Лёвачкін ведаў пра намер разагнаць Майдан у ноч на 30 лістапада, аднак дэманстратыўна самаўхіліўся, каб падставіць сваіх канкурэнтаў Клюева і Захарчанку. Каб цалкам не замазацца, ён нават падаў у адстаўку. Аднак Януковіч адстаўку не прыняў, паколькі ўсё гэта выглядала б як чыстая палітыка, якая пацвярджала адсутнасць маналітнасці ў Партыі рэгіёнаў.

***— У прэсе пішуць, што да змовы алігархаў нават датычны лідар данецкага клану Рынат Ахметаў — галоўны фундатар Партыі рэгіёнаў.***

— На днях Ахметаў публічна выступіў за ўладжванне канфліктаў з дапамогай перамоваў. Паколькі заява была зроблена пасля сустрэчы з амерыканскімі дыпламатамі, усё спісалі на вынік знешняга ціску. Насамрэч Ахметаў і так дзвюма рукамі падтрымлівае еўрапейскі выбар Украіны. У альтэрнатыўным выпадку — пры ўваходжанні ў Мытны саюз — індустрыяльныя магутнасці алігарха ў перспектыве пяройдуць пад кантроль Крамля. Не кажучы пра тое, што ён уклаў вялізарныя сродкі ў набыццё розных прадпрыемстваў у той жа Славакіі або Польшчы.

Цяжка сказаць, ці фінансуе Ахметаў Еўрамайдан непасрэдна, аднак алігархічны кансенсус, які прывёў Януковіча да ўлады, адназначна разбураны. Для гэтага дастаткова пагуляць з тэлепультам. Большасць каналаў, якія належаць алігархам, хутчэй сімпатызуюць Еўрамайдану. Алігархі зацікаўленыя ў спыненні экспрапрыяцыі чужога бізнэсу. Ім патрэбна легалізацыя іх капіталаў, а лепшы гарант — гэта сяброўства Украіны ў ЕС.

***— Ці гатовыя тыя, хто стаіць на Майдане, на саюз з Ахметавым?***

— Тут трэба зразумець адну рэч. Ёсць лідары апазіцыі, а ёсць Майдан. І самае парадаксальнае — тое, што галоўным фактарам рызыкі для бізнэсу Ахметава з'яўляецца не ўмацаванне тыраніі Януковіча, а якраз Еўрамайдан. Лідары апазіцыі на вачах губляюць кантроль над экзальтаванай масай, якая прагне рэальных змен, а не рытуальных танцаў пад крыкі «Слава Украіне». Самім удзельнікам Еўрамайдану карагоды надакучылі. Прыходзіць разуменне, што Майдан стаў часткай закуліснага гандлю. Стаяць людзям наканавана не да вырашальнай атакі на Кабмін, а датуль, пакуль прадстаўнікі буйных алігархічных груповак і кланаў канчаткова не перадзеляць сферы ўплыву на палітыку і найбуйнейшыя галіны эканомікі.

Уласна кажучы, апазіцыя і не хавае, што не супраць такога сцэнару. Пра магчымы саюз з д'яблам заявіў не так даўно Юры Луцэнка, адзін з лідараў Еўрамайдану. Па яго словах, алігархі — гэта сітуатыўны саюзнік, які дапаможа Украіне захаваць статус незалежнай дзяржавы. Але Януковіч таксама гатовы кінуць алігархам костку. Заяўлена, што да канца новага года склад Кабміну абновяць на 90 адсоткаў. Не выключана, што свае словы паспрабуюць сказаць сілавікі Зазарчанкі.

***— Атрымліваецца, што, так ці інакш, Еўрамайдан прыйдзецца разганяць? Пакуль, аднак, у такую перспектыву верыцца слаба.***

— У такім фармаце Еўрамайдан таксама асуджаны. Градус хваляванняў так ці інакш падае. Паводле сацыялагічных апытанняў, толькі 25 адсоткаў украінцаў вераць у тое, што вынікам Еўрамайдану будзе змена ўлады. Большасць лічаць, што ўсё скончыцца, як толькі спыніцца фінансаванне ці людзі канчаткова расчаруюцца ў стаянні на плошчы ў мароз.

Але нават калі гэты Еўрамайдан «рассмокчацца», усё адно пазіцыі ўлады ў вачах абываценяў, і перш за ўсё на перыферыі, падарваныя. Усе сталі сведкамі, па-першае, слабасці цэнтра. Падругое, нежадання сілавікоў усур'ёз ваяваць за ўладу. Патрэцяе, апартунізму апазіцыі. Таму цяперашні Майдан будзе мець працяг, і не факт, што яго наступныя выданні алігархі змогуць узяць пад кантроль.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### МАТЭА САЛЬВІНІ

Сальвіні — італьянскі палітык, абраны на пасаду лідара партыі «Паўночная ліга», праграма-мінімум якой — аўтаномія італьянскіх паўночных правінцый у рамках асобнай адміністратыўнай адзінкі Паданія. Заснавальнік партыі сепаратыстаў Умберта Босі пакінуў пасаду старшыні з-за карупцыйнага скандалу. Апошні партыйны кангрэс павінен быў адказаць на пытанне, куды пойдзе партыя. На гэта пытанне адказаў новы старшыня. На яго думку, партыя павінна патрабаваць не аўтаноміі, а поўнай незалежнасці для Поўначы. «Мы не прыпынім змагацца, пакуль не атрымаем поўную незалежнасць», — сказаў кіраўнік «Паўночнай лігі». Самае цікавае, што першым крокам у гэтым накірунку, паводле слоў Сальвіні, павінен быць выхад Італіі з зоны еўра. Па словах Матэа, еўра ёсць «злачынства супраць чалавецтва». Еўра прыдумана выключна для таго, каб не дапусціць выхаду Паданіі са складу Італіі. На партыйных зборах таксама заявілі, што выбары ў еўрапарламент наступнай вясной павінны стаць пачаткам канца еўрапейскай імперыі. Сябры «Паўночнай лігі» таксама папярэдзілі Брусэль, што ў выпадку фальсіфікацый на выбарах, яны пачнуць кампанію непадпарадкавання. Праўда, на думку аглядальнікаў, гэта ўсё дэмагогія, адрасаваная ўдзельнікам акцый супраць дыктату ЕС, якія апошнім часам ахапілі Італію. Найбольш гучная выхадка еўраскептыкаў мела месца ў Рыме, дзе экстрэмісты паспрабавалі зняць з офісу Еўрасаюзу сцяг ЕС і замяніць яго на італьянскі.

### РЭДЖЭП ЭРДАГАН

Нягледзячы на тое, што прэм'ер Турцыі мае імідж палітыка-ісламіста, зараз яго галоўным праціўнікам сталі менавіта ісламісты. Гаворка пра секту «Gülen», чый гуру жыве ў ЗША. Калі Эрдаган ішоў да ўлады, «Gülen» актыўна яго падтрымлівала, патрабуючы нават турэмнага асуджэння для праціўнікаў клерыкалізму. Аднак сёння іх шляхі разышліся. Эрдаган патрабаваў скасаваць сетку прыватных школ, заснаваных сектай. Некаторыя сцвярджаюць, што лідары «Gülen» незадаволеныя тэмпамі ісламізацыі грамадства, якую праводзіць Эрдаган. Іншыя лічаць, што прычына разборак — асабістая спрэчка паміж прэм'ерам і адным з лідараў секты. Так ці інакш, улада адказала на крытыку хапунамі. 50 чалавек, што звязаныя з «Gülen», — сярод якіх урадавыя службоўцы, вядомыя бізнэсмэны і сыны трох міністраў, — затрыманыя паліцыяй у рамках расследавання справы пра хабары пры размеркаванні дзяржзамоваў на тэндары. Эрдаган пры гэтым кажа, што ніякай палітыкі ў арыштах няма. Прэса прызнае, што «Gülen» мае мала шансаў перамагчы Эрдагана, за якім стаіць дзяржаўны і паліцэйскі апарат. Аднак пры гэтым ён сам сабе капае яму. Галоўная пагроза для Эрдагана — у тым, што мусульманская камуна ў Турцыі цяпер не будзе мець кансенсусу адносна фігуры лідара, якім раней быў Эрдаган. Раскол ісламскага лагера, на думку аглядальнікаў, дае кемалісцкай апазіцыі някепскі шанец, каб перамагчы на прызначаных на сакавік мясцовых выбарах.

### ІРАКЛІЙ ГАРЫБАШВІЛІ

Новы грузінскі прэм'ер ад партыі «Грузінская мара» толькі паспеў заступіць на пасаду, як яму прыйшлося сутыкнуцца з сур'ёзнай праблемай пад назвай «Сталін». Справа ў тым, што жыхары Горы (радзіма Джугашвілі) патрабуюць вярнуць на вуліцы гораду помнік правадыру ўсіх народаў. Манумент разбурылі яшчэ пры Саакашвілі з мэтай будаўніцтва на яго месцы скульптурнай групы з 11 мужчын, якія мусілі сімвалізаваць ахвяр расійска-грузінскай вайны 2008 года. Мясцовыя ўлады, быццам, не супраць вяртання Сталіна, маючы надзею, што гэты прыцягне за сабой турыстаў. Толькі ў мінулым годзе музей Сталіна наведалі каля 40 тысяч чалавек, з якіх 37 тысяч — замежныя турысты. Аднак ёсць адна перашкода. Гэта еўраінтэграцыя. Урады Прыбалтыкі, дзе камуністычная сімволіка забароненая, далі зразумець, што аднаўленне помніка бацьку ўсіх народаў негатыўна паўплывае на еўраперспектывы Грузіі. Не дапамагло нават тое, што грузінскі МЗС правёў сустрэчы з пасламі краін Балтыі, каб растлумачыць ім, што жыхары Горы не адмаўляюцца ад Еўропы, калі выступаюць за тое, каб аднавіць помнік свайму земляку. Хутчэй за ўсё, прэм'ер перавядзе стрэлкі. Кажуць, што пры МУС Грузіі неўзабаве будзе створана адмысловая камісія, якая павінна рэгуляваць выкананне зацверджанай ранейшымі ўладамі «Хартыі свабоды», якая забараніла ў Грузіі сімвалы камунізму. Магчыма, тады і вызначыцца лёс скандальнага помніка.

фота аўтара

# СВЯДОМЫЯ, НАПЕРАД!

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Неяк адзін вядомы музыкант выказаў задавальненне з таго факту, што ў нашым горадзе ён бачыць усё больш хлопцаў і дзяўчат з гітарамі. «Гэта добры знак. Значыць, ёсць падставы для свабоды творчасці», — акрэсліў ён гэты феномен.**

Так, у гэтым годзе «хлопцы з гітарамі» стварылі сапраўдны бум на новыя гурты. Але што гэта за каманды? Адны толькі назвы красамоўна сведчаць пра іх творчую накіраванасць, мары і памкненні. Вось некалькі з іх: «Clover Club», «Unsilent», «Plastic Angels of September», «Firespace», «Rili Dope», «Freelite», «The Blackmail»… І гэткіх экзатычных словазлучэнняў, якімі запаўняюцца афішы сталічных клубаў, можна прывесці цэлую каламажку з прычэпам!

Калі падвесці рысу асноўнай тэндэнцыі гэтага года, то можна гаварыць, што на айчынную рок-сцэну выйшла новае пакаленне, якое можна назваць «глабалісцкім». Гэтыя «хлопцы з гітарамі» бачаць сваю будучыню ні больш, ні менш як часткай сусветнага шоў-бізнэсу, як патэнцыяльных сусветных рок-зорак, без асаблівых сантыментаў да сваёй радзімы — Беларусі.

Вось толькі адна «закавыка»: многія прадстаўнікі «глабалісцкай» рок-генерацыі не вельмі добра валодаюць англійскай мовай, і гэта вынік трывожнага стану выкладання english у краіне. Да таго ж, няспраўджаныя «зоркі» не вельмі добра валодаюць і вакалам, бо ў школе ігнаравалі ўрокі спеваў і заняткі ў хоры. А галоўнае — сучасная русіфікаваная школа ў іх амаль адбіла ахвоту да нацыянальнага, беларускага, да якога яны прызвычаіліся ставіцца з непавагай, і нават з пагардай. Зрэшты, такіх «феноменаў» можна адшукаць і сярод тых, хто спецыялізуецца на тутэйшым перайманні «русского рока». Толькі мэта здабыцця папулярнасці і накірунак жыццёвых спадзяванняў — Расія.

Адзначу, што не ўсё гурты з англамоўнымі назвамі стойкія непрымальнікі беларускасці. Ёсць калектывы, якія нягледзячы на нязвычныя беларускаму вуху словазлучэнні, застаюцца цвёрдымі прыхільнікамі нацыянальнага. Гэта «Avias», «Martin S», «HandMade», «Re1ikt», «Stew Cramer Band», а такі гурт, як «Weeping Twilight», дык увогуле можна назваць адным з ветэранаў нацыянальнай metal-сцэны.

Ці ёсць будучыня ў «глабалізіраванай» генерацыі беларускага року? Думаю, што шанцы стаць міжнародна прызнанымі рок-зоркамі ёсць ва ўсіх, але толькі рэдкія адзінкі змогуць нейкім чынам «засвяціцца» на тле сусветнага шоў-бізнэсу. Асноўная ж маса каманд на працягу наступных двух-трох гадоў «кане ў Лету» (служба ў войску, вучоба, размеркаванне, сям'я і г.д.), не пакінуўшы пасля сябе і следу на «фанаграфічных дарожках» айчыннага рок-руху. Застаецца толькі пільна сачыць, каб здольныя музыканты, інструменталісты, таленавітыя меладысты і тэкставікі, якія цяпер граюць у гэтых камандах, не зніклі назаўсёды разам са сваімі праектамі, а змаглі сябе рэалізаваць у нацыянальным кірунку.



Зрэшты, гэтая праца вялася і раней. Праўда, не заўсёды з карысцю для беларускамоўнай плыні. Успомнім, да прыкладу, ранейшыя згубы ў выглядзе пераходу на англійскую мову гуртоў «Tesaurus» і «Deadmarsh», якія раней славіліся сваімі беларускамоўнымі кампазіцыямі. У гэты годзе нядобрым знакам стала адмова ад роднай мовы і альтэрнатыўнай стылістыкі гурта «Зьмяя», аб чым засведчыў новы дыск гурта «Попробуй». Вакалістка гурта Зоя Сахончык тлумачыць гэта тым, што большасць удзельнікаў «Зьмяі» за поп-песні на «обшчэпанятнам». А яна адна пакуль не можа пераканаць сваіх калегаў вярнуцца да таго, што нёс слухачам, напрыклад, альбом «Усё дзеля вас». Апошнім сваім альбомам музыканты паставілі на кон лёс сваёй каманды, і гэта не выклікае аптымізму. Бо новых прыхільнікаў дыск «Попробуй» не дадасць, а старых, хутчэй за ўсё, гурт згубіць…

Мінулы год не быў багатым на фанаграфічныя прэм'еры, але парадаваў некалькімі дзясяткамі рэлізаў, якія стануць добрым дадаткам для нацыянальнай фанатэкі. Напрыклад, гурт «KRIWI» прэзентаваў доўгачаканы альбом апрацовак народных мелодый «Traukamurauka», а гурт «Кашлаты Вох» унёс сваім фолк-панкам з альбома «Пазаўчора» кроплю разнастайнасці ў айчынную фолк-мадэрн-сцэну. Гэта можна сказаць і пра новы дыск гурта «PAWA» «Cristatus», які акрэсліў новы творчы напрамак гэтага таленавітага і арыгінальнага калектыву. Айчынную рок-плынь падтрымалі гурты «N.R.M.», якія ў гэтым годзе парадавалі сваіх прыхільнікаў дыскам «Д.П.Б.Ч.», выдадзеным музыкантамі на CD і на вініле. Прыцягнулі ўвагу беларускіх слухачоў новыя альбомы гуртоў «Litvintroll» («Czornaja Panna»), «Amaroka» («Pastka»), «Martin S» («Martin S»), «BosaeSonca» («Zalaty»). Аматары бардаўскай песні папоўнілі сваю калекцыю такімі набыткамі, як альбом «Зубы на далоні» А. Мельнікава, «Сьвятло і цені» Т. Беланогай, «Караблі» гурта «Верасень». Дыск «M1» ад дуэта «Аляксандра і Канстанцін» стаў сапраўдным падарункам тым слухачам, хто цэніць прафесіяналізм выканаўцаў у галіне папулярнай музыкі.

**Сенсацыяй гэтага канцэртнага сезону стаў аншлаг беларускага хіп-хоп-выканаўцы Макса Каржа, які сабраў поўную залу «Мінск-Арэны». Падзея стала нечаканасцю як для крытыкаў, так і для музычнай супольнасці краіны. Калі такую залу змог сабраць Макс, значыць, гэта могуць зрабіць і іншыя**

Аматараў складанак парадавала кампіляцыя маладых айчынных рэп-выканаўцаў, якія аб'ядналіся пад вокладкай дыска «Жалуды». Ну а тым, хто нераўнадушны да нацыянальных сімвалаў, хто ставіць свае подпісы за наданне гербу «Пагоня» і бел-чырвона-беламу сцягу статуса нацыянальнай спадчыны, адрасуецца складанка «Сімвалы волі і свабоды», на якім сабраны песні пра герб і сцяг вольнай і незалежнай Беларусі. У памятныя 90-я гады нашых артыстаў, як «афіцыйных», так «альтэрнатыўшыкаў» ніхто не прымушаў спяваць такія песні, яны нараджаліся з самой душы творцаў. Паспрабуйце цяпер назбіраць колькі песень пра сучасную дзяржаўную сімволіку, каб запоўніць імі хоць бы траціну такой складанкі…

Безумоўна, нельга абысці ўвагай разрэкламаваны першы беларускамоўны дыск «Грай» ад «Ляпіса Трубяцкога», які хутка з'явіцца ў продажы. Праграма гэтага дыска падтрымае тых, каму падабаецца думаць пра «Ляпіс Трубяцкой» як нацыянальна арыентаваны гурт, дапаможа ім забыцца пра іншы бок іх творчасці — «идейно-правильный», які так «кладзецца на сэрца» частцы саветызаванай публікі ў Расіі і Беларусі. Чаго тут больш: гульні з беларускімі слухачамі ці шчырых нацыянальных пачуццяў, пакуль зразумець цяжка. Час пакажа, ці стаў альбом «Грай» для гурта рубіконам, пасля якога вяртання назад ужо няма.

Не зусім безвыходнай, у параўнанні з мінулымі гадамі, складвалася сітуацыя з трансляцыяй беларускамоўных твораў у мясцовым FM-эфіры. Сёння ўжо можна цвёрда казаць, што прынамсі дзве станцыі пачалі звяртаць пільную ўвагу на навінкі беларускамоўнай рок-музыкі, а таксама трансляваць класіку беларускага року мінулых гадоў. Гэта «Радыё-Мінск» і «Радыё-Сталіца». Зрэшты, і там не ўсё добра са «сваімі»: беларускамоўныя творы з'яўляецца, у асноўным, пасля эфірнага прайм-тайму. Да таго ж, многае залежыць ад асобаў, якія знаходзяцца ў той час за апаратарскім пультам. Тым не менш, паслухаць старыя класічныя хіты ад «Уліса» ці новыя кампазіцыі «МутнагаВока» на іх хвалях — сапраўднае задавальненне! А вось астатнія станцыі на працягу года старанна займаліся фальсіфікацыяй — ставілі ў эфір расійскіх выканаўцаў з беларускімі каранямі, мясцовыя англамоўныя кавер-гурты, рускамоўныя каверы сусветнавядомых хітоў. І, хутчэй за ўсё, пазначалі іх у сваіх трэк-лістах у раздзеле «белорусские исполнители»…

Сенсацыяй гэтага канцэртнага сезону стаў аншлаг беларускага хіп-хоп-выканаўцы Макса Каржа, які сабраў поўную залу «Мінск-Арэны». Гэтая падзея стала нечаканасцю як для крытыкаў, так і для музычнай супольнасці краіны. Каментароў, у тым ліку і расійскіх выданнях (напрыклад Lenta.ru), з гэтай нагоды было шмат, асабліва тых што тычацца папярэдніх работ Макса Каржа. Сэнс іх прасочваўся відавочны: ён быў апазіцыйным (беларускамоўным) выканаўцам, своечасова адумаўся, перайшоў на «великий и могучий» — і адразу такі грандыёзны поспех!

Мы ж адкінем усю інфармацыйную пену з нагоды падзеі і адзначым тое, што вынік гэтага канцэрта відавочна аптымістычны: калі самую вялікую канцэртную залу змог сабраць Макс (якія б рэсурсы і рэзервы для гэтага ён ні выкарыстаў), значыць, гэта могуць зрабіць і іншыя беларускія артысты. Патрэбныя ідэя, арганізацыйныя намаганні, рэкламны крэатыў і тое, чаго ні ў аднаго выканаўцы не хапае, — адпаведных фінансавых сродкаў.

Ну, напрыклад, чаму б дзеля выканання любімых хітоў на час канцэрта ў «Мінск-Арэне» не аб'яднацца Лявону Вольскаму і легендарнаму «N.R.M.»? Да таго ж, запрасіць у госці «Мрою» з гітарыстам-віртуозам Віктарам Смольскім, які ў свой час граў у гэтым гурце. Не лішнімі былі б на гэтым музычным свяце «Крамбамбуля» і «ZET». А назва для гэтага мега-шоў магла б стаць лозунгам новага грамадскага руху — «Свядомыя, наперад!»

СПАДЧЫНА

# ПАЎСТАННЕ КАЛІНОЎСКАГА — НАГОДА ДЛЯ ГОНАРУ

Ігар МЕЛЬНІКАЎ

**У міжваеннай Польшчы быў зроблены вялікі акцэнт на захаванне памяці пра падзеі Паўстання 1863–1864 гадоў. Дзяржава не толькі арганізоўвала дагляд і ўшанаванне ветэранаў-паўстанцаў, выплачвала ім пенсію, але і сачыла за захаваннем месцаў, звязаных з тымі падзеямі.**

Узнагарода ветэранаў крыжом 70-годдзя паўстання, 1933 год

фота з архіва аўтара

Крыж 70-годдзя паўстання, 1933 год

## Ізноў у войску

18 снежня 1919 года польскі Сейм прыняў закон аб прысваенні ўдзельнікам паўстанняў 1831, 1848, 1863 гадоў, якія дажылі да моманту незалежнасці Польшчы, афіцэрскіх званняў. Пры гэтым ветэраны атрымалі права нашэння спецыяльнага вайсковага мундзіру (рагатыўкі, кіцеля-сурдута, шыняля цёмна-сіняга колеру), а загадам ад 7 лістапада 1922 года ўводзілася сістэма, па якой радавыя і афіцэры Войска Польскага павінны былі салютаваць двума пальцамі, паднесенымі да казырка галаўнога ўбора, кожнаму ветэрану-паўстанцу. Удзельнік паўстання 1863 года ці яго ўдава мелі права бясплатнага карыстання медыцынскімі паслугамі. У сваю чаргу, асоба, якая фінансавала пахаванне ветэрана, магла разлічваць на атрыманне ад дзяржавы грашовай дапамогі ў памеры адной пенсіі, якую атрымліваў памерлы. 2 жніўня 1919 года польскі Сейм надзяліў ветэранаў і ўдоваў былых паўстанцаў правам на атрыманне пенсіі. Першапачаткова гэтыя людзі атрымлівалі 27 500 польскіх марак, а пасля рэформы 1924 года памер грашовага ўзнагароджання склаў 125 злотых. У 1938 годзе ветэранская пенсія складала ўжо 200 злотых. Удовы атрымлівалі 50 працэнтаў ад гэтых сум.

Дзяржаўныя ўзнагароды, атрыманыя ветэранамі, таксама давалі права на льготы. Напрыклад, узнагароджаныя Крыжам Незалежнасці мелі права бясплатнага праезду на цягніках РКР. Для былых удзельнікаў Паўстання 186–1864 гадоў ствараліся Дамы ветэрана, якія фінансавала не толькі дзяржава, але і грамадскія арганізацыі (Таварыства сяброў ветэранаў 1863 года ў Варшаве). Акрамя гэтага, у II Рэчы Паспалітай дзейнічаў Фонд Таварыства ўзаемнай дапамогі ўдзельнікам паўстання 1863 года, які атрымліваў фінансавыя сродкі ад розных грамадскіх арганізацый. Дарэчы, Таварыства ветэранаў паўстання 1863–1864 гадоў мела свае прадстаўніцтва ў Варшаве, Кракаве, Тарнаве, Львове, Любліне, Кельцах і Седльцах.

Першая рэгістрацыя ўдзельнікаў Паўстання 1863–1864 гадоў адбылася ў 1919 годзе. Па яе выніках аказалася, што на тэрыторыі II Рэчы Паспалітай жыве 4 500 састарэлых паўстанцаў і 1 500 удоў. Аднак ужо праз некалькі гадоў (у 1923 г.) гэтая лічба паменшылася ўдвая і склала 2 012 ветэранаў. У год сямідзесяцігадовага юбілею Паўстання ў 1933-м у Польшчы жыло 230 ветэранаў, у 1937 годзе — 75, у 1938 г. — 53, а ў пачатку 1939 года іх засталося толькі 36 чалавек. Кожны з гэтых людзей у перыяд міжваеннага дваццацігоддзя быў вельмі паважанай асобай. Ветэраны Паўстання 1863–1864 гадоў у жыцці польскага грамадства выконвалі амаль тую ж ролю, што сёння адыгрываюць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі. Старых запрашалі на ўсе дзяржаўныя святы, урачыстасці, у школы.

Парад у гонар 70-годдзя паўстання ў 1933 годзе

## Паўстанне праз кіно, маркі і манеты

Урад II Рэчы Паспалітай разумеў, што гісторыя Паўстання 1863–1864 гадоў мела фундаментальнае значэнне для фармавання нацыянальнай свядомасці тагачаснага польскага грамадства. У 1922 годзе ў Польшчы выходзіць фільм «Год 1863», створаны паводле аповесці Стэфана Жыромскага, прысвечанай падзеям 1863–1864 гадоў. Тут варта ўспомніць, што на хвалі беларусізацыі ў БССР адбываліся працэсы абуджэння цікавасці жыхароў Савецкай Беларусі да «антыцарскага паўстання» другой паловы XIX стагоддзя. 14 жніўня 1928 года на экраны кінатэатраў БССР выйшаў фільм «Кастусь Каліноўскі», у якім лідар паўстання на Беларусі паказаны ў вобразе народнага мсціўца. Як бачым, польскі і беларускі савецкі кінематограф амаль адначасова прыцягнуў увагу грамадства да гісторыі Паўстання 1863–1864 гадоў.

Р. Траўгут. Манета ў гонар Р. Траўгута, выпушчаная ў 1933 г.

Польская дзяржава спрабавала рознымі спосабамі захаваць памяць пра паўстанне. Так, у 1933 годзе ў грашовы зварот была ўведзена манета наміналам 10 злотых з выявай дыктатара Паўстання 1863–1864 гадоў Рамуальда Траўгута. Праз 5 гадоў ужо Польская Пошта ў так званай «гістарычнай серыі» надрукавала марку, прысвечаную Студзеньскаму паўстанню, на якой была выява групы паўстанцаў на чале з усё тым жа Рамуальдам Траўгутам. Акрамя гэтага, прыватныя ювелірныя майстэрні выпускалі розныя памятныя знакі і «патрыятычную біжутэрыю» з выявамі сімвалаў Паўстання 1863–1864 гадоў. У польскіх гарадах, у тым ліку і на тэрыторыі заходнебеларускіх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай, з'явіліся вуліцы ў гонар герояў Паўстання 1863–1864 гадоў.

## Павага да паўстанцкіх магіл

Важным момантам захавання памяці пра Студзеньскае паўстанне ў міжваеннай Польшчы з'яўлялася прывядзенне ў парадак пахаванняў і памятных месцаў, звязаных з гэтымі падзеямі. Гутарка, перш за ўсё, ішла пра могілкі паўстанцаў. Праблема была ў тым, што за той час, які прайшоў з моманту паўстання, за паўстанцкімі пахаваннямі (асабліва на Усходзе) не было належнага дагляду. Восенню 1927 года пачалася агульнапольская акцыя па пошуку магіл і помнікаў, звязаных з нацыянальнымі войнамі і паўстаннямі. У рамках гэтай ініцыятывы павятовыя старасты павінны былі збіраць неабходную інфармацыю, што мела дачыненне да гэтай тэматыкі.

У канцы 1920-х — пачатку 1930-х гадоў праца ў дадзеным накірунку адбывалася і ў Заходняй Беларусі. Так, у 1928 годзе ў мястэчку Косава на могілках быў пастаўлены Крыж на магіле паўстанцаў, загінуўлых у баі з царскімі войскамі. На 70-я ўгодкі Студзеньскага паўстання ў мястэчку Мілавіды на месцы бою паўстанцаў з царскімі войскамі была ўзведзена капліца. Варта нагадаць, што ў сярэдзіне мая 1863 года пад Мілавідамі сканцэнтраваліся атрады са Слонімшчыны, Ваўкавышчыны, Гродзеншчыны, Навагрудчыны і Пружаншчыны (усяго каля 800 паўстанцаў). У канцы траўня 1863 года гэтыя атрады інспектаваў Кастусь Каліноўскі. 22 мая 1863 года да Мілавідаў падышлі рускія войскі на чале з падпалкоўнікам Булгарыным. У выніку бою рускім пяхотнікам так і не ўдалося знішчыць паўстанцаў, якія ўдала абараняліся і своечасова адышлі. У вёсцы Пацэвічы на Мастоўшчыне ў 1933 годзе быў узведзены помнік 12 паўстанцам, загінулым у баі з дзвюма ротамі 1-га фінляндскага палка Рускай імператарскай арміі. У савецкі час памятны знак быў знішчаны. На старых каталіцкіх могілках у Лідзе каля касцёла айцоў піяраў у 1938 годзе была ўстаноўлена табліца ў гонар Людвіка Нарбута.

Сваістым сімвалам захавання памяці пра Паўстанне 1863 года ў Заходняй Беларусі стала ўсталяванне помніку Рамуальду Траўгуту ў Свіслачы. Яшчэ ў маі 1923 года ў мястэчку быў створаны Грамадскі камітэт пабудовы мемарыялу, на чале якога стаяў дырэктар настаўніцкай семінарыі Баляслаў Борыс. У выніку, у 1928 годзе, на 10-ю гадавіну аднаўлення незалежнасці Польшчы, помнік быў пастаўлены. Яго аўтарамі былі настаўнік свіслацкай семінарыі Павел Бялка і варшаўскі архітэктар Збароўскі. У верасні 1939 года мясцовыя камуністы знішчылі гэты «польскі» сімвал. Помнік быў адноўлены ў 1988 годзе па даваенных эскізах гродзенскім скульптарам Аляксандрам Анціпіным.

## Юбілейныя ўрачыстасці

Безумоўна, найбольш увагі да падзей Паўстання 1863–1864 гадоў з боку польскіх улад надавалася ў «юбілейныя» гады. Так, у 1933 годзе ў Варшаве адбыліся вялікія ўрачыстасці з нагоды 70-годдзя Студзеньскага паўстання. Дэлегацыі ветэранаў і апякунчых таварыстваў былі запрошаныя на прыём да маршала Юзафа Пілсудскага і прэзідэнта Ігнація Масціцкага. У ваяводскіх цэнтрах (у тым ліку, у Брэсце на Бугу, Наваградку і Вільне) адбыліся прыёмы ў ваявод і прэзідэнтаў гарадоў. Спецыяльна да гэтай даты быў уведзены памятны ўзнагародны Крыж Сямідзесяцігоддзя, зроблены па праекце мастака Юзафа Свірыш-Рышкевіча. Крыж 70-годдзя паўстання выдаваўся кожнаму ветэрану-паўстанцу, а таксама асобам, якія дапамагалі ветэранам. У 1933 годзе гэтую ўзнагароду атрымалі 258 чалавек.

Праз пяць гадоў II Рэч Паспалітая святкавала 75-годдзе Студзеньскага паўстання. У 1938 годзе ў Варшаве адбыўся з'езд ветэранаў-паўстанцаў. Тады на сустрэчу з прэзідэнтам Польшчы Ігнаціем Масціцкім у Каралеўскі замак прыехала некалькі дзесяткаў пажылых паўстанцаў. Усіх жывых на той момант удзельнікаў Паўстання ўзнагародзілі афіцэрскім Крыжам адраджэння Польшчы. Ля Магілы невядомага жаўнера адбылося ўрачыстае ўскладанне кветак, а пазней адбылася памінальная малітва ў гонар загінуўшых у баі і памерлых у Сібіры. У гэты час у краіне праводзіліся выставы і сустрэчы з ветэранамі.

…Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР у верасні 1939 года новыя ўлады знішчылі шмат помнікаў, звязаных з Паўстаннем 1863–1864 гадоў. Іх аднаўленне, як і выхаванне ў беларусаў павагі да гісторыі ўзброенага выступлення нашых продкаў супраць царскай тыраніі, працягваецца да сённяшняга дня.

АГЛЯД

# НАЙЛЕПШЫЯ КНІЖНЫЯ ПАДАРУНКІ–2013

**Мы так прызвычаіліся да сцвярджэння «кніга — найлепшы падарунак», што і не думаем падвяргаць яго сумневу. Над тым, якое беларускае выданне можна пакласці пад святочную ялінку, разважае крытык Ганна Кісліцына.**

Пачнем з паэзіі. Масавы чытач яе цярпець не можа. Шчаслівым выключэннем можа стаць кніга **Усевалада Сцебуракі «Бег па самаадчуванні»**. Крытык Віка Трэнас напісала: «Любы літаратурны рэдактар (...) сказаў бы: «Гэта той выпадак, калі паэт мае талент ад Бога, прычым прыродных здольнасцей настолькі багата, што творца можа нават не азадачвацца працаваць над сабой».

Каму дарыць? Мамам, татам, любімым і дарагім. Калі вы рамантык з цвёрдай нацыянальнай пазіцыяй, які дбае пра ўласны гонар, — гэтая кніга для вас таксама!

А вось калі вы хочаце зрабіць падарунак вытанчанай жанчыне — падарыце ёй **«Рыбы» Насты Кудасавай**. Крытык Марына Весялуха напісала пра гэтую кнігу: «Калі паспрабаваць вывесці рэцэпт «Рыб», то атрымаецца прыкладна наступнае: да 100 грам міфалогіі дадаць 300 грам рэлігіі, 150 грам філасофіі, 20 крылаў анёлаў, 5 птушыных гнёздаў, 3 выраі, 2 чайныя лыжкі суіцыдальнасці. Сумесь заліць літрам настойкі кахання на абсэнце і глінтвейне (алкагольныя напоі змешваць у роўнай прапорцыі), дадаць жменю шчырасці, жменю адданасці, варыць цягам гадзіны на павольным агні. Гэтае чароўнае паэтычнае зелле рэкамендуецца прымаць падчас поўні, асабліва закаханым…».

Кнігу **«Свамова» Ігара Кулікова,** калі і дарыць, то ўпярэдзіўшы доўгай лекцыяй-тлумачэннем. Чытанне яго вершаў нагадвае распутванне нітак старога пушыстага швэдра — быццам бы і нічога складанага, але як загрузнеш на якім слове, то, здаецца, і далей не можаш ісці, не парваўшы нітачку сэнсу. Калі ў вас ёсць сябры з прэтэнзіяй на інтэлектуалізм, то можаце дарыць у якасці тэста. У любым выпадку будзе пра што пагаварыць пасля.

Відавочна, з думкай пра тое, чым заняць уражлівага чытача, пісала свае **«Ночы на Плябанскіх млынах» Людміла Рублеўская**. Асабіста я — не аматар формульнай літаратуры, усіх гэтых чылераў, якія халодзяць кроў. Мне больш даспадобы яе іранічныя, удала стылізаваныя **«Старасвецкія міфы гораду Б.»**, якія таксама ўвайшлі ў кнігу. Але — калі ў вас ёсць сябры, якія любяць адначасова містыку і нацыянальную гісторыю, але ў версіі light, то кніга «Ночы на Плябанскіх млынах» у першую чаргу — для іх.

Вясёлы змест і малы памер — мае і дзіўна звярстаны **«Блог Усяслава Чарадзея»**, напісаны, вядома ж, самім Усяславам Чарадзеем. Кнігу можна дарыць выключна людзям, чыё пачуццё гумару вы спраўдзілі на сабе. Філістэр вам гэтай кнігі не даруе і будзе абмяркоўваць кожны эпізод да сканчэння часу, пераконваючы вас, што «цудам адшуканы дзённік князя-пярэваратня» — гэта «фальшыўка, зробленая ў Польшчы».

Безумоўна, грунтоўным падарункам любімай цётухне ці маме будзе зборнік дэтэктыўных апавяданняў **«Злачынства, сэр»** і зборнік містыкі **«Вусцішны пакой»**. Выдатны выбар — хай трохі адпачнуць ад серыялаў! А вось жанчынам маладзейшым варта прэзентаваць **«Хараставо жыцця» Міхаэля Кумпфмюлера** — выдатная вытанчаная вокладка сама па сабе, без любоўнай гісторыі ўнутры, стварае ўзнёслую атмасферу свята.

Асабіста для мяне самымі яркімі кніжнымі падзеямі 2013 года сталі кнігі **«Творы» Лявона Савёнка**. Не менш цікавы жыхарам нашай сталіцы — як старэйшага ўзросту, так і маладым, — будзе **«Дзённік 1943–1947» Дзмітрыя Сямёнава**, які ламае многія стэрэатыпы, закладзеныя ў нашы галовы школьнымі падручнікамі.

**«Смак Беларушчыны» Генадзя Кісялёва** — зборнік артыкулаў, прысвечаных пераважна постацям і дакументам XIX стагоддзя, напісаны настолькі ярка і цікава, што я б з задавальненнем аднесла яго ў катэгорыю мастацкай літаратуры. Думаю, што варта прапанаваць аматарам гісторыі і дзве кнігі, якія проста асуджаныя на бурнае і працяглае абмеркаванне. Гэта **«Дзевяноста першы: Год незалежнасці вачыма ўдзельніка» Сяргея Навумчыка** і свежавыдадзены зборнік дакументаў **«Рада БНР (1947–1970): Падзеі. Дакументы. Асобы» Наталлі Гардзіенкі і Лявона Юрэвіча**. Калі сярод вашых знаёмых ёсць патэнцыйныя палітыкі або дзейныя гісторыкі — гэта выдатны падарунак.

Ну і, безумоўна, самым арыгінальным кніжным падарункам стане прадукцыя электроннага выдавецтва BYBOOKS, якую можна проста скачаць з інтэрнэту. Асабліва раю кнігу **Маргарыты Аляшкевіч «Мадэль для забойства»**. Яе з задавальненнем прачытаюць усе беларускамоўныя дзяўчаты нашай краіны.

**Паводле budzma.by**

МЕРКАВАННЕ

# БЕЛАРУСКІ РЭКВІЕМ ПА ФРАНЦУЗСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Уладзіслаў ГАРБАЦКІ

**Чэзне ў свеце не толькі малая і сярэдняя культура. Чэзне французскасць і франкафонія, культура Асветніцтва і Рэвалюцыі, культура свецкасці, філасофіі, прыгожага і чорнага пісьменства.**

Культура, якая была вядомая і нашым продкам. Культура, на якой чытала беларуская эліта XIX — пачатку XX стагоддзя, аб чым сведчаць багатыя адкрытыя фонды літаратуры на французскай мове Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Культура і мова, якія сёння зведваюць татальную паразу ў нас, катастрафічна губляюць сваіх прыхільнікаў, бо Францыя моўчкі саступае, аддае свой шарм на карысць больш актыўных і прыбытковых культур.

Сучасная Францыя ў Беларусі выглядае сціпла, па-бядняцку, тутэйшыя французы і француженкі адбываюць тэрміны амаль зняволення ў чаканні пераводу ў больш перспектыўныя мясціны. Яшчэ ўчора зацятыя, амаль сляпыя франкафілы, сёння беларусы застаюцца сам-насам са сваёй любоўю да французскай культуры, мовы.

І менавіта нам, беларусам, шармаваным французскай культурай і расчараваным цяперашнімі французскімі бяздзейнасцю, нават пэўнай беларусафобіяй, і сляпым русафільствам, надышоў час выканаць рэквіем па французскай культуры, нагадаць французам, што на вачах растаюць іх колішнія слава, уплыў, шарм.

У існасці, французскай мовы і не трэба шкадаваць, яна ўзвысілася за кошт заняпаду і вынішчэння брэтонскай, карсіканскай, аксітанскай і многіх іншых. Будзьма шчырымі: французская мова — гэта імперская, гвалтоўная, крывавая мова, як руская, англійская, іспанская ці тая ж кітайская. Таму шкадаваць яе трэба крытычна і не так слепа, таму і рэквіем па гэтай мове мусіць быць стрыманым, не пераходзіць у лямант, галашэнне.

Нам не забыць, што гэта мова музыкаў, якія шармуюць наш слых (Піяф, Брэль, Даліда, Барбарб, Фармёр), гэта мова пісьменніц і пісьменнікаў, філосафаў (Кандарсэ, Дзідро, Гюго, Бавуар, Юрсёнар, Камю, Сартр, Фуко, Леві-Строс), якія далі ўдалы бой цемрашальству і вузкалобасці. Менавіта на гэтай мове рэвалюцыянеры XVIII стагоддзя давялі свету пра каштоўнасць, годнасць чалавека і правоў чалавека. І на гэтай самай мове выходзілі пастановы па абмежаванні ўжытку брэтонскай, карсіканскай ды іншых г.зв. «мінарытарных» моваў.

Учорашняя слава французаў і іх культуры блякне, зацягваецца смугою. Да гэтай спадчыны ўсё цяжэй прабіцца, яе амаль немагчыма папулярызаваць праз буферы бюракратызму малой зацікаўленасці Іншым перадусім у самой Еўропе і няведання, што сапраўды дзеецца па-за самой Францыяй. Культура, якая затохваецца ад самадастатковасці, пыхі, саслепласці і саліпсізму. Ці не праз гэта рынуліся Рым, Візантыя і іншыя нібыта неперасягнутыя сусветы?

Тым не менш, ёсць усё ж дробныя шкадаванні з нагоды паслаблення і адпаўзання ў немаведаль французскай культуры — са сцэны знікае моцны голас лявіцы, альтэрнатыўнай, некамуністычнай лявіцы, якая вінаваціць афіцыйную Францыю праз тое, што тая ігнаруе меншасці, нацыянальныя, моўныя перадусім. Лявіцы, якая не ўвальваецца ў нацыянальнае, мінулае, да ўчора павернутага, а заўсёды імкнецца да агульнага, да еўрапейскага і прынцыпова свецкага.

Лявіцы, якая непахісна стаіць на Дэкартавых рацыянальнасці і заўсёднай сумнеўнасці ва ўсім цягам апошніх амаль 400 год. Менавіта па-французску мадэрнае чалавецтва развіталася з верай у цьмянае, прыблізнае і стварыла сучасную свецкую дэмакратыю. Менавіта французскі голас разам з іншымі крытычнымі адбараніў ЕС ад выключна хрысціянацэнтрычнага бачання Еўропы, зафіксаванага ў галоўных агульнаеўрапейскіх тэкстах.

А яшчэ шкада саслабелай французскасці, нагэтулькі моцнай і ўдалай у сваіх змаганні і абераганні эстэтыкі мовы. Двубой з іншымі мовамі (італьянскай, нямецкай, англійскай) французская мова заўсёды вяла так прыгожа і амаль беспрайгральна. І так павучальна, узбагачальна яна натхняла нас, іншых еўрапейцаў… Хто, як не французы, так лёгка і натуральна замяняюць варварызмы, якія зусім не трывожаць іншых? Хто, як не французы, так проста і амаль аўтаматычна знаходзяць свае слоўцы модным амерыканізмам, англіцызмам?

Развітанне з французскімі мовай і культурай можа крыху зацягнуцца, бо ў свеце існуюць іншыя цікавыя і паспяховыя франкамоўныя праекты — квебекскі, бельгійскі ці швейцарскі, напрыклад.

Тым не менш, рэквіем па французскай мове і культуры ўжо гучыць…

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284 85 11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 986 38 05, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.info

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1577

Падпісана да друку 20.12.2013. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў. Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая. Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.